УІЛЬЯМ ШЭКСПІР

СКАРБЫ СУСВЕТНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

УІЛЬЯМ ШЭКСПІР

СКАРБЫ СУСВЕТНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

СКАРБЫ СУСВЕТНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

РЭДАКЦЫЙНАЯ
КАЛЕГІЯ:

Андраюк С. А., Брыль І. А., Бутэвіч А. І.,
Быкаў В. У., Вярцінскі А. І., Ганчароў М. І.,
Гілевіч Н. С., Грышановіч В. М., Дзялец М. І.,
Каваленка В. А., Лужанін М. (Каратай А. А.),
Мальдзіс А. І., Навуменка І. Я., Сачанка Б. І.,
Танк М. (Скурко Я. І.), Шамякін І. П.,
Шаранговіч Г. А.

Укладанне,
прадмова і каментарыі
Вадзіма Небышынца

УІЛЬЯМ ШЭКСПІР

САНЕТЫ ТРАГЕДЫІ

З англійскай

Мінск
«Мастацкая
літаратура»
1989

ББК 84.4Вл
Ш98

СЕРЫЯ ЗАСНАВАНА Ў 1989 г.

Мастацкае афармленне
Аляксандра Царова

Ілюстрацыі
Віктара Мікіты

В книгу всемирно известного английского драматурга У. Шекспира (1564—1616) вошли лучшие его трагедии и сонеты в переводах Ю. Гаврука, В. Дубовки, К. Крапивы.

4703010300—163
Ш ——————— 152—89
М 302(03)—89
ISBN 5-340-00286-1 (беларус.)

© Выдавецтва «Мастацкая літаратура», 1989

УІЛЬЯМ ШЭКСПІР
(1564—1616)

Паэзія! Край музыкі
і слова! —
Табе, як і жыццю,
мяжы няма...

Юрка Гаўрук.
Санет «Шэкспіру»

Аздобленая праўдай
прыгажосць
Нічога роўнага
не мае ў свеце.

Уільям Шэкспір. 54 санет.
Пер. Уладзіміра Дубоўкі

Глыбока рэалістычная і сапраўды народная творчасць Уільяма Шэкспіра — вяршыня літаратуры эпохі Адраджэння. «Гэта быў найвялікшы прагрэсіўны пераварот з усіх перажытых да таго часу чалавецтвам,— сцвярджаў Ф. Энгельс,— эпоха, якая мела патрэбу ў тытанах і якая парадзіла тытанаў па сіле думкі, страсці і характару, па шматбаковасці і вучонасці»[1]. Адзін з такіх тытанаў — выдатны англійскі драматург і паэт Уільям Шэкспір, які сінтэзаваў ідэйна-мастацкія набыткі рэнесансавай культуры, найбольш поўна выявіў прагрэсіўныя імкненні свайго часу, прадвызначыў шляхі, пашырыў далягляды ўсёй сусветнай літаратуры. У яго творчасці бачыў вытокі рэалізму новага часу В. Р. Бялінскі: «Нарэшце, у XVI стагоддзі, адбылася канчатковая рэформа ў мастацтве: Сервантэс забіў сваім непараўнаным Дон Кіхотам ілжываідэальны напрамак паэзіі, а Шэкспір назаўсёды памірыў і спалучыў яе з сапраўдным жыццём. Сваім бязмежным поглядам, які ахоплівае ўвесь свет, пранікнуў ён у недаступнае свяцілішча прыроды чалавечай і ісціны жыцця, падгледзеў і ўлавіў таямнічае біццё іх патаемнага пульсу. Неўсвядомлены паэт-мысліцель, ён узнаўляў у сваіх гіганцкіх творэннях духоўную прыроду, згодна з яе адвечнымі непахіснымі законамі, згодна з яе першапачатковым планам, нібыта ён сам удзельнічаў у складанні гэтых законаў, у напісанні гэтага плана»[2].

М. А. Дабралюбаў паставіў Шэкспіра сярод тых нешматлікіх дзеячаў сусветнай літаратуры, якія адыгралі вызначальную ролю ў гісторыі чалавечага самапазнання: «Гэтыя пісьменнікі былі на-

[1] Маркс К., Энгельс Ф. Соч.: 2-е изд. Т. 20. С. 346.

[2] Белинский В. Г. Избранные эстетические работы. В 2 т. М., 1986. Т. 1. С. 52.

дзелены так багата прыродаю, што маглі б як бы па інстынкце наблізіцца да натуральных паняццяў і імкненняў, якіх яшчэ толькі шукалі сучасныя ім філосафы з дапамогай строгай навукі. Менш таго: ісціны, якія філосафы толькі прадбачылі ў тэорыі, геніяльныя пісьменнікі ўмелі схопліваць у жыцці і адлюстроўваць у дзеянні. Такім чынам, служачы найбольш поўнымі прадстаўнікамі вышэйшай ступені чалавечай свядомасці ў пэўную эпоху і з гэтай вышыні азіраючы жыццё людзей і прыроды і малюючы яго перад намі, яны ўзвышаліся над службовай роляй літаратуры і станавіліся ў шэраг гістарычных дзеячаў, якія спрыялі чалавецтву ў найбольш ясным усведамленні яго жывых сіл і натуральных схільнасцей. Такі быў Шэкспір. Многія з яго п'ес могуць быць названы адкрыццямі ў галіне чалавечага сэрца; яго літаратурная дзейнасць пасунула агульную свядомасць людзей на некалькі ступеняў, на якія да яго ніхто не ўзнімаўся і на якія толькі здаля ўказвалі некаторыя філосафы. І вось чаму Шэкспір мае такое сусветнае значэнне: ім пазначана некалькі новых ступеняў чалавечага развіцця»[1].

Уільям Шэкспір нарадзіўся ў горадзе Стратфард-он-Эйване ва Уорыкшыры. У прыходскай кнізе мясцовай царквы захаваўся запіс пра яго хрэсьбіны — 26 красавіка 1564 года. Па разліках вучоных ён мог нарадзіцца 21, 22 ці 23 красавіка, апошнюю дату прынята лічыць днём яго нараджэння.

Яго бацька Джон Шэкспір на пачатку 50-х гадоў перасяліўся на сталае жыхарства ў Стратфард, набыў у 1556 годзе дом на Хенлі-стрыт і неўзабаве ажаніўся з Мэры Ардэн, дачкой заможнага фермера.

Пальчатнік і гандляр Джон Шэкспір быў паважаны гараджанін: у 1561—1563 гг. выбіраўся членам муніцыпалітэта, а ў 1565 — адным з чатырнаццаці олдэрмэнаў, быў нават у 1568 годзе бейліфам, мэрам горада. Але пазней яго фінансавае становішча пагоршылася, і ён адышоў ад грамадскай дзейнасці.

Уільям Шэкспір атрымаў адукацыю ў стратфардскай граматычнай школе, дзе побач з англійскай мовай выкладалі латынь і асновы грэчаскай, а таксама вывучалі тэксты антычных аўтараў Сенекі, Плаўта, Авідзія, Вергілія і інш.

У 1582 годзе васемнаццацігадовым юнаком ён ажаніўся з старэйшай за яго на некалькі гадоў дачкой мясцовага фермера Эн Хэтэўэй, якая ў 1583 годзе нарадзіла яму дачку Сюзан і ў 1585 годзе блізнят — дачку Джудзіт і сына Гамнета. Усе гэтыя падзеі біяграфіі Шэкспіра пацверджаны адпаведнымі дакументамі. А вось перыяд з 1585 па 1592 гады ў шэкспіразнаўстве лічыцца «страчанымі гадамі», бо ніякіх дакументальных звестак пра жыццё Шэкспіра ў гэты час не захавалася.

---

[1] Добролюбов Н. А. Избранное. М., 1986. С. 282—283.

Паводле некаторых легенд, ён бавіў час за келіхам добрага ўорыкшырскага элю ў кампаніі мясцовых забулдыг, займаўся браканьерствам у паляўнічым запаведніку сэра Томаса Люсі. Паводле іншых звестак, юны Шэкспір працаваў клеркам у натарыуса, ці вясковым настаўнікам, або рэпецітарам — выхавацелем дзяцей у сям'і знатнага вяльможы. Больш сур'ёзныя даследчыкі схільныя лічыць, што ён некаторы час быў чаляднікам у рымарскай майстэрні ў бацькі, а ў канцы 80-х гадоў апынуўся ў Лондане з трупай акцёраў, якія прыязджалі на гастролі ў Стратфард.

Пра яго першыя крокі ў сталіцы таксама не захавалася дакладных звестак. Адны біёграфы Шэкспіра сцвярджаюць, што ён пачаў сваю кар'еру ў Лондане, зарабляючы на пражытак даглядам коней арыстакратаў каля ўвахода ў тэатр, другія лічаць, што ён працаваў спачатку памочнікам суфлёра ў адным лонданскім тэатры. І толькі ў 1592 годзе ўсплывае ўскосны намёк на дзейнасць Шэкспіра, як драматурга і акцёра, у надрукаваным пасмяротна памфлеце Р. Грына «На грош розуму». Аўтар, які дажываў жыццё ў галечы, звяртаўся да сваіх калег-драматургаў з так званых «універсітэцкіх розумаў» з горкай скаргай на няўдзячных акцёраў: «Не верце ім: ёсць выскачка-варона сярод іх, аздобленая нашым апярэннем, хто «з сэрцам тыгра ў скуры прытворшчыка» лічыць, што ён здольны пампезна вымаўляць свой белы верш, як лепшыя з вас, і ён чысцейшы «майстар на ўсе рукі» — у сваім уяўленні лічыць сябе адзіным, хто ўзрушвае сцэну ў краіне...»[1] Празрысты каламбур — shake-scene (хто ўзрушвае сцэну) і Shakespeare (хто трасе кап'ём), а таксама цытата — «з сэрцам тыгра ў скуры прытворшчыка» з хронікі Шэкспіра «Генрых VI» — указваюць на адрасат гэтай гнеўнай інвектывы Р. Грына і сведчаць дакументальна, што драматургічныя творы Шэкспіра на той час ужо набылі шырокую папулярнасць.

У 1593 годзе Шэкспір далучыўся да лепшай лонданскай трупы акцёраў на чале з Джэмсам Бербеджам, а з 1599 года робіцца саўладальнікам-пайшчыкам тэатра «Глобус», для якога былі напісаны і дзе былі пастаўлены яго п'есы. Знакаміты акцёр таго часу Рычард Бербедж, сын Джэмса, быў першым выканаўцам Гамлета, Макбета, караля Ліра і іншых герояў вядомых трагедый Шэкспіра.

Неўзабаве Шэкспір збліжаецца з групай маладых арыстакратаў, у прыватнасці з графам Саўтгемптанам, якому ён прысвяціў паэмы «Венера і Адоніс» і «Збэшчаная Лукрэцыя», а магчыма, і зборнік 154-х санетаў.

Каля 1612 года Шэкспір неспадзявана спыняе творчую дзейнасць, вяртаецца на радзіму ў горад Стратфард, дзе ён і памёр 23 красавіка 1616 года.

---

[1] Шенбаум С. Шекспир. Краткая документальная биография. М., 1985. С. 205.

Недастатковасць і недакладнасць дакументальных звестак пра жыццё і творчы шлях Шэкспіра выклікалі з'яўленне так званага «шэкспіраўскага пытання», сутнасць якога ў тым, што п'есы Шэкспіра напісаны нібыта не ім, а некім іншым. У якасці прэтэндэнтаў на аўтарства яго твораў называліся філосаф Фрэнсіс Бэкан, драматург Крыстафер Марла, графы Оксфард, Пембрук, Дэрбі і іншыя. У савецкім літаратуразнаўстве аўтарства Шэкспіра аспрэчвалі В. М. Фрычэ, у метадалогіі якога былі выразныя рысы вульгарнага сацыялагізму — жорсткай прывязкі творчасці пісьменнікаў да пэўных сацыяльных класаў, і Ф. Шыпулінскі — прыхільнік біяграфічнага метаду, які паводле супадзенняў некаторых фактаў з жыцця лорда Рэтленда і асобных момантаў у п'есах Шэкспіра прыпісваў аўтарства твораў драматурга англійскаму арыстакрату. Дарэчы, «тэорыю Шэкспір — Рэтленд» некаторы час падтрымліваў сваім аўтарытэтам і А. В. Луначарскі. Антыдэмакратызм, недавер да творчых магчымасцей выхадцаў з сацыяльных нізоў, антынавуковасць падобных домыслаў, што пабудаваны на апрыёрных перадпасылках і не маюць пад сабой ніякіх фактаў, можна лічыць даказаным у сучасным шэкспіразнаўстве, і ніхто з сур'ёзных даследчыкаў зараз не падвяргае сумненню аўтарства Шэкспіра.

Творчая спадчына драматурга — так званы «шэкспіраўскі канон» — уключае ў сябе, апроч паэтычных твораў, 37 п'ес. Яна базіруецца на першым пасмяротным поўным зборы драматургічных твораў Шэкспіра, які быў надрукаваны яго сябрамі-акцёрамі Джонам Хемінгам і Генры Кондэлам у 1623 годзе і складаўся з 36 п'ес (пазней да іх была далучана трагікамедыя «Перыкл»). Гэтае выданне выйшла вялікім фарматам і атрымала назву «Фоліо 1623 года» (ад італ. folio — аркуш). Пры жыцці Шэкспіра былі надрукаваны толькі палавіна яго п'ес, якія выходзілі фарматам у чвэрць аркуша і называюцца «Кварта» (ад італ. quarto — чвэрць). Некаторыя п'есы выходзілі па некалькі разоў, як, напрыклад, «Гамлет» ці «Рамэо і Джульета». Часта гэта былі так званыя «пірацкія выданні», бо выходзілі без ведама і згоды аўтара і тэатра, якому належалі п'есы, таму тэксты ў такіх выданнях былі скарочаныя і скажоныя. У найлепшым выглядзе надрукаваны п'есы Шэкспіра ў «Фоліо 1623 года», але і там сустракаюцца тэкставалагічныя памылкі, недакладнасці і скажэнні. У XVIII стагоддзі, калі ў Вялікабрытаніі ўзмацнілася цікавасць да творчасці Шэкспіра і пачалося інтэнсіўнае яе вывучэнне, даследчыкі і рэдактары прарабілі вялікую працу па супастаўленні розных тэкстаў яго п'ес, разбілі іх на акты і дзеянні, удакладнілі рэмаркі.

Тэкставалагічная праца над творамі Шэкспіра працягваецца і ў нашыя дні.

Згодна з ідэйна-мастацкай эвалюцыяй Шэкспіра, большасць сучасных савецкіх даследчыкаў падзяляюць яго творчасць на тры перыяды: канец 80-х гадоў XVI ст.— 1600 год, 1600—1608 і 1608—1612 гады.

У першы перыяд былі напісаны жыццярадасныя, поўныя весялосці і дасціпнага гумару, светлых лірычных пачуццяў камедыі «Утаймаванне свавольніцы», «Сон у летнюю ноч», «Многа шуму з нічога», «Дванаццатая ноч» і інш., усе гістарычныя хронікі (за выключэннем «Генрыха VIII»), якім уласцівыя патрыятызм і сацыяльна-гістарычны аптымізм, ліра-эпічныя паэмы «Венера і Адоніс» і «Збэшчаная Лукрэцыя», амаль усе санеты, а таксама трагедыя «Рамэо і Джульета».

Майстэрствам Шэкспіра-камедыёграфа захапляўся Ф. Энгельс: «У адным толькі першым акце «Віндзорскіх свавольніц» больш жыцця і рэальнасці, чым ва ўсёй нямецкай літаратуры; адзін Ланс са сваім сабакам Крэбам большага варты, чым усе нямецкія камедыі разам узятыя»[1].

Санеты Шэкспіра — вяршыня англійскай паэзіі эпохі Адраджэння. Па сваёй філасофскай глыбіні, драматычнай напружанасці, дасканаласці паэтычнай формы яны — сапраўдныя шэдэўры сусветнай лірыкі. У іх гучыць непасрэдная лірычная споведзь Шэкспіра, яго роздум над праблемамі жыцця і смерці, бессмяротнасці прыгажосці і мастацтва, выказаны яго эстэтычныя погляды.

Высокае майстэрства Шэкспіра-паэта выявілася ў строгай форме санетаў. Англійскі, ці шэкспіраўскі, санет у адрозненні ад класічнага італьянскага, які падзяляецца на два чатырохрадкоўі і два трохрадкоўі, мае іншую страфічную будову: тры чатырохрадкоўі і заключнае двухрадкоўе, у якім у афарыстычнай форме даецца вынік санета. Шэкспіраўскі санет мае дакладную сістэму рыфмоўкі: abab cdcd efef gg.

У гэтай кнізе прадстаўлены ўсе 154 санеты Шэкспіра ў перакладзе Уладзіміра Дубоўкі, які здолеў узнавіць у максімальна дакладнай ступені ідэйна-мастацкі змест арыгінала, напоўніўшы напружаны драматызм думак і пачуццяў лірычнага героя жывою крывёй свайго, у многім трагічнага, жыццёвага вопыту. Да перакладу санетаў Шэкспіра звярталіся і другія беларускія паэты-перакладчыкі Язэп Семяжон, Юрка Гаўрук і іншыя, кожны з якіх узбагачаў, высвечваў новыя фарбы шматколернага свету лірыкі вялікага англійскага паэта. Глыбока самастойную інтэрпрэтацыю паасобных санетаў Шэкспіра даў Рыгор Барадулін. Вось як гучыць у яго перакладзе 66-ты санет, у якім гнеўна выкрываюцца сацыяльна-палітычныя і маральныя заганы сучаснага Шэкспіру грамадства, прычым праблематыка гэтага санета надта блізкая трагедыям сталага перыяду яго творчасці — «Гамлету», «Каралю Ліру» і інш.:

Зняможаны, малю ратунку ў смерці,
Бо ходзіць варты долі ў жабраках,
І ўсё як ёсць нікчэмнасць прагне сцерці,
І вера ўся ў зняверaных руках,

---

[1] Маркс К., Энгельс Ф. Соч.: 2-е изд., Т. 33. С. 346.

І ганьбу пакрывае пазалота,
І цноту грубасць на таргі вядзе,
І слаўная зняслаўлена істота,
І сілу немач ссільвае ў бядзе,

І затыкае рот мастацтву ўлада,
І цёмны вучыць, як знябыць імглу,
І праўда быць прасцячкай шчырай рада,
І годнае дабро слугуе злу.

Зняможаны, зірнуў бы ў вочы смерці,
Ды як любоў самотна жыцьме ў свеце?

Высока ацэньваў мастацкія вартасці паэтычнай спадчыны Шэкспіра вядомы англійскі паэт-рамантык С. Т. Кольрыдж: «Я імкнуўся давесці, што, перш чым Шэкспір стаў паэтам драматычным, ён ужо праявіў сябе як паэт, і, нават калі б ён не стварыў «Ліра», «Атэла», «Дванаццатай ночы», «Генрыха IV», мы ўсё роўна прызналі б за ім асноўныя, калі не ўсе, якасці сапраўднага паэта, а менавіта: глыбокае пачуццё і вытанчанае інтуітыўнае ўспрыманне прыгажосці, прычым і тое і другое адкрываюцца зроку праз спалучэнне вобразаў, а слыху — праз салодкую і зусім адпаведную тэме твора мелодыю верша»[1].

Натхнёнай паэзіяй напоўнена трагедыя «Рамэо і Джульета», у якой апяваецца высокае пачуццё кахання. Маналогі герояў — завершаныя лірычныя вершы: санеты, канцоны, мадрыгалы і іншыя паэтычныя жанры. Адпаведна і мова герояў узвышаная, патэтычная, у ёй шмат вытанчаных метафар, параўнанняў, аксімаронаў і іншых стылістычных фігур лірычнай паэзіі.

Нягледзячы на смерць герояў, іх каханне сапраўды бессмяротнае. І не толькі таму, што над іх трупой адбываецца прымірэнне двух варожых родаў: яны духоўна ўзвысіліся, пераадолеўшы самыя цяжкія выпрабаванні ў сцвярджэнні свайго высокага пачуцця, і нават іх пагібель зрабілася паэтычным сімвалам вернасці ў каханні да самай апошняй мяжы. І тым не менш п'еса заканчваецца горкай максімай:

Сумнейшая з аповесцей на свеце —
Аповесць аб Рамэо і Джульеце.

Светлы жыццесцвярджальны тон трагедыі «Рамэо і Джульета», тонкі псіхалагізм і пранікнёны лірызм у абмалёўцы пачуццяў яе герояў непарушна захаваны ў перакладзе выдатнага беларускага паэта і драматурга Кандрата Крапівы ў поўнай адпаведнасці з характарыстыкай, якую даў гэтаму твору В. Р. Бялінскі: «Пафас Шэкспіравай драмы «Рамэо і Джульета» складае ідэя любві,— і таму палымянымі хвалямі, якія зіхацяць яркім святлом зорак, ліюцца з вуснаў каханых захопленыя патэтычныя пра-

[1] Кольридж С. Т. Избранные труды. М.: 1987. С. 285—286.

мовы... Гэта пафас кахання, бо ў лірычных маналогах Рамэо і Джульеты відаць не толькі замілаванне адно адным, але і ўрачыстае, гордае, поўнае захапленнем прызнанне кахання, як боскага пачуцця»[1].

Сюжэты гістарычных хронік — тры часткі «Генрыха VI», «Рычард III», «Рычард II», «Кароль Іаан», дзве часткі «Генрыха IV» і «Генрых V» — былі запазычаны драматургам з працы Р. Холіншэда «Хронікі Англіі, Шатландыі і Ірландыі», але глыбока перапрацаваны ў адпаведнасці з мастацкімі задачамі Шэкспіра і надзённай палітычнай праблематыкай эпохі.

У гістарычных хроніках Шэкспір наблізіўся да стыхійнага разумення аб'ектыўных працэсаў развіцця грамадства — «час» як незалежная ад волі асобных людзей філасофская катэгорыя — і ўзняўся да прызнання рашаючай ролі народных мас у гісторыі. Ён праўдзіва паказаў працэс гібелі старой феадальнай арыстакратыі ў часы знішчальных войн Пунсовай і Белай ружы (1455—1485), умацавання абсалютнай манархіі — прагрэсіўнай на той час сілы, якая палітычна аб'ядноўвала інтарэсы буржуазіі, якая нараджалася, і новага дваранства — джэнтры, спрыяла станаўленню моцнай нацыянальнай дзяржавы. Разам з тым з пазіцый гуманізму ён даваў этычную ацэнку чалавечых якасцей самадзержцаў, выкрываючы амаралізм каралёў-злодзеяў (Рычард II і Рычард III) і ствараючы свой ідэальны вобраз манарха (Генрых V). Асабліва глыбока выявіўся рэалізм Шэкспіра ў паказе шырокага «фальстафаўскага фона» нізоў тагачаснага грамадства на чале з самім Фальстафам, сатырычны напал якога скіраваны супраць феадальных забабонаў.

Як пісьменнік-рэаліст Шэкспір не мог не бачыць і не выявіць у сваіх творах бядотнае становішча народных мас, асабліва сялянства, узмацнення іх эксплуатацыі ў працэсе «агароджвання зямель». Развіццё суконнай вытворчасці выклікала вялікі попыт на воўну, зрабіла гадоўлю авечак прыбытковай справай. Паводле распаўсюджанай тады прымаўкі: «авечкі з'елі людзей». Лорды-землеўладальнікі захоплівалі абшчынныя пашы, ворныя і сядзібныя землі сялян. Тысячныя натоўпы бадзяг напоўнілі дарогі Англіі.

Крызіс гуманізму, які назіраўся ў Англіі на рубяжы XVI—XVII стагоддзяў у апошнія гады праўлення Елізаветы, узмацніўся з прыходам да ўлады ў 1603 годзе Якава I Сцюарта. Гэты крызіс быў выкліканы, з аднаго боку, наступленнем феадальнай рэакцыі, а з другога, новая буржуазія, што выступіла пад сцягам пурытанства, прапаведавала бяздушны эгаізм і сухі разлік, варожыя жыццярадаснаму мастацтву Рэнесанса.

Усе гэтыя сацыяльна-палітычныя працэсы прывялі да абвостранага ўсведамлення Шэкспірам усеагульнага панавання зла ў грамадстве, і ў другі перыяд яго творчасці, які прыпадае на 1600—1608 гады, вядучым жанрам робіцца трагедыя — «Гамлет»,

[1] Белинский В. Г. Полн. собр. соч. Т. 7. С. 313.

«Атэла», «Кароль Лір», «Макбет», «Антоній і Клеапатра», «Карыялан», «Ціман Афінскі».

У гэтай кнізе прадстаўлены вяршыні трагедыйнай музы Шэкспіра — «Гамлет» і «Кароль Лір» — у перакладзе Юркі Гаўрука, які здолеў узнавіць дакладна іх ідэйна-мастацкі змест.

Дапытлівы розум Гамлета імкнецца дайсці да самой сутнасці з'яў і рэчаў:

Здаецца? Не, так ёсць. Не прызнаю
Я гэтага «здаецца».

Зладзейскае забойства бацькі ўспрымаецца дацкім прынцам не проста як прыватны, асобны выпадак, а як злавесны знак часу:

Век вывіхнуўся. О праклятый лёс,
Навошта ты мяне сюды прынёс
Лячыць хваробы часу!

Гамлет ясна ўсведамляе памеры зла — яму ўвесь свет здаецца турмой: «Усюды скляпенні, сутарэнні, лёхі, вартаўнікі»,— але ён мужна вырашае прыняць выклік лёсу, хоць напачатку ў яго і з'явілася думка аб магчымым «лёгкім выйсці» — самагубстве:

Бо хто цярпеў бы злыя здзекі часу,
Прымус тыранаў і знявагу гордых,
Самотны стогн разбітага кахання,
Марудны суд, чыноўнікаў нахабнасць,
Пляўкі на галаву заслузе скромнай,
Каб мог нас вызваліць ад усяго
Удар кінжалам!

Заўважце: якая празрыстая пераклічка з бязмежным адчаем і той самай праблематыкай, як і ў прыведзеным вышэй 66-м санеце: «Зняможаны, малю ратунку ў смерці...»

Але ўвесь далейшы ход падзей у трагедыі сведчыць, што Гамлет — не баязлівец, а нязломны змагар. Менавіта таму ён такі блізкі і дарагі нашаму сучаснiку — чалавеку XX стагоддзя, перад якім паўстаюць яшчэ больш вострыя і глабальныя праблемы: пад пытаннем нават далейшае існаванне людзей на зямлі. І вось гэтая духоўная стойкасць, здольнасць сустракаць зло з адкрытымі вачамі — хутчэй загінуць, чым здрадзіць светлым ідэалам гуманізму,— духоўная спадчына шэкспіраўскага героя наступным пакаленням, маральны ўрок, які гучыць у перадсмяротным звароце Гамлета да Гарацыо:

О друг, якая раненая слава,
Калі ты змоўчыш, ляжа на мяне!
Калі мяне любіў ты, ухіліся
Часова ад збавення, пагаруй
На свеце жорсткім, каб вядомай стала
Мая гісторыя.

Вуснамі галоўнага героя трагедыі Шэкспір даў формулу рэалістычнага мастацтва, якая захоўвае надзённае гучанне і да нашага часу. Настаўляючы акцёраў, Гамлет сцвярджае, што канчатковай мэтай тэатральнай ігры «... раней і цяпер, была і ёсць — трымаць як бы люстра перад прыродай: паказваць дабраце яе рысы, пагардзе яе вобраз і, у адпаведнасці з часам, кожнаму стану і ўзросту — яго форму і адбітак».

З багатай драматургічнай спадчыны Шэкспіра сучасныя даследчыкі на першае месца вылучаюць трагедыю «Кароль Лір», дзякуючы яе глыбокаму і да канца не разгаданаму ідэйна-мастацкаму зместу, шырыні і вастрыні ўзнятых у ёй філасофскіх, сацыяльна-палітычных і псіхалагічных праблем.

Праз неймаверныя маральныя і фізічныя пакуты кароль Лір паступова прыйшоў да асэнсавання сапраўднай цаны чалавечай асобы ў грамадстве, пабудаваным на несправядлівых сацыяльных законах, адчуў сябе блізкім да няшчасцяў простага чалавека, што пранікнёна выказана ў яго горкім «ціхім маленні».

Шэкспір стварыў цэлую галерэю цудоўных жаночых вобразаў: Віёла ў «Дванаццатай ночы», Джульета ў «Рамэо і Джульеце», Афелія ў «Гамлеце», Дэздэмона ў «Атэла» і інш., якіх увенчвае Кардэлія ў «Каралі Ліры» — адзін з найбольш паэтычных жаночых вобразаў сусветнай літаратуры. Нездарма, па філасофскай напоўненасці і пранікнёным лірызме, яе параўноўваюць з Беатрычэ ў «Боскай камедыі» Дантэ і з Лаурай у санетах Петраркі. Сярод разгулу самых ганебных страсцей, бездані зла, што раскрываюцца ў «Каралі Ліры», адна Кардэлія нязменна застаецца ўвасабленнем дабра і святла, чалавечай зычлівасці, сардэчнага такту, гармоніі, фізічнай і духоўнай прыгажосці. Кардэлія ў Шэкспіра абмалявана не так праз яе самахарактарыстыку — яна надзвычай сціплая ў праяўленні сваіх пачуццяў, як праз адносіны да яе другіх персанажаў.

Вобраз Кардэліі мае першаступеннае значэнне для разумення асноўнай ідэі трагедыі, якую трапна сфармуляваў савецкі шэкспіразнавец Л. Пінскі: «У адказныя моманты гісторыі сапраўдны гуманізм прасякнуты трывогай за лёс чалавека і чалавечай культуры, за маральную натуру чалавека, якая вырашае ўсё ў жыцці, за яго «сэрца», за Кардэлію»[1].

Канчатковая мудрасць караля Ліра — не ў канстатаванні панавання зла ў свеце, а ў неабходнасці актыўнага змагання за высокія ідэалы гуманізму: гэты «скрозь высмактаны горам» стары пакараў смерцю забойцу любімай Кардэліі.

Суадносіны аптымістычнага і песімістычнага пачаткаў у творах вялікага англійскага драматурга, іх складаную дыялектыку вобразна раскрыў А. В. Луначарскі: «... у Шэкспіра чуцён нейкі адвечны пахавальны марш на змрочных басах, нейкае рыданне над жыццём. І адначасова разліваецца золатам і серабром другая

[1] Пинский Л. Шекспир. Основные начала драматургии. М.: 1971. С. 383.

раскошная тэма ў гонар жыцця,— першы голас, які спявае, што жыццё цудоўнае, яркае, хмяльное, палкае, захапляльнае. Гэта і ёсць Шэкспірава музыка»[1].

П'есы апошняга трэцяга перыяду творчасці Шэкспіра (1608—1612 гг.) адзначаны вяртаннем да светлых жыццесцвярджальных матываў ранніх камедый і гістарычных хронік, поўных сацыяльна-гістарычнага аптымізму — трагікамедыі «Перыкл», «Цымбелін», «Зімовая казка» і «Бура». Не бачачы шляхоў да шчаслівай будучыні чалавецтва ў рэальных гістарычных умовах тагачаснай Англіі, Шэкспір тым не менш застаецца верны ідэалам гуманізму, пераносячы іх ажыццяўленне ў казачны свет паэтычнай фантазіі.

Творы Шэкспіра шырока выдаюцца ва ўсім свеце. Сапраўды другой радзімай для яго стаў Савецкі Саюз: яго творчая спадчына шматмільённымі тыражамі выходзіць на розных мовах нашай краіны. Сярод беларускіх перакладчыкаў Шэкспіра — К. Крапіва, Ю. Гаўрук, У. Дубоўка, Я. Семяжон, Р. Барадулін, А. Звонак, П. Макаль, У. Някляеў, А. Разанаў.

П'есы Шэкспіра трывала ўвайшлі ў рэпертуар савецкіх тэатраў. Беларуская тэатральная шэкспірыяна пачалася пастаноўкай камедыі «Сон у летнюю ноч» у перакладзе Ю. Гаўрука, якую ажыццявіла ў 1925 годзе Беларуская драматычная студыя ў Маскве пад мастацкім кіраўніцтвам вядомага рэжысёра МХАТа-2 В. Смышляева ў сцэнаграфіі мастака Л. Нікіціна, у тым жа годзе студыйцы паказалі гэты спектакль з вялікім поспехам у Мінску, а ў наступным годзе ён быў адной з першых пастановак Другога Беларускага дзяржаўнага драматычнага тэатра ў Віцебску (цяпер — тэатр імя Якуба Коласа). У гэтым спектаклі рабілі свае першыя крокі ў мастацтве вядомыя майстры беларускай сцэны П. Малчанаў, К. Саннікаў, А. Ільінскі, С. Станюта і іншыя акцёры. З таго часу п'есы Шэкспіра пастаянна ў афішах многіх тэатраў Беларусі.

Вось гэтая жывая цікавасць сучасных гледачоў і чытачоў да творчай спадчыны вялікага англійскага драматурга і паэта — яркае сведчанне бессмяротнасці яго мастацтва, пра якую ён прароча пісаў у адным з сваіх санетаў, перакладзеных У. Дубоўкам:

Калі знішчальныя паваляць войны
Ўсе статуі, разбураць камяні,—
Жывое слова пройдзе супакойна
У час наступны праз усе агні.

Вадзім Небышынец

---

[1] Луначарский А. В. Соч.: В 8 т. М.: 1954. Т. 4. С. 148.

САНЕТЫ

Пераклаў
Уладзімір
Дубоўка

1

Краса ніколі не памрэ на свеце,—
Тварэнні дзіўныя прыносяць плён.
Пялёсткі вянуць на ружовым цвеце,
Ды аднаўляе памяць іх бутон.

Зіхценнем воч сваіх зачараваны,
Ты паліш сам сябе сваім агнём.
Ты катуеш сябе не горш тырана,
Набыткі ўсе развеяўшы суздром.

Для свету лепшая акраса сёння,
Вястун вясенняй зыркай пектаны,
Сок жыватворчы тоячы ў бутоне,—
І марнатраўца ты, і скнара ты.

Шкадуй наш свет, не кінь таго ў магілу,
Што новае жыццё ускаласіла б.

2

Як пройдзе сорак зім па-над табой,
Чало збароздзяць, быццам поле плугам,
Згадае хто убор квяцісты твой,
Пабачыўшы старэцкую дзяругу?

На запытанне: «Дзе ўся прыгажосць,
Дзе скарбы дзён юнацтва залатога?» —
Пакажаш, што ў запаўшых вочах ёсць?
Красы ў іх мала, але здзеку многа!

Наколькі прыгажэй сказаць бы так:
«Усё найлепшае маё у сыне!
Яго прыняў, як спадчыну, юнак,
Мяне яна таксама не пакіне».

Калі пачне у жылах стынуць кроў,
Яна праз сына запалае зноў.

3

У люстра глянь на вобраз дзіўны свой,
Скажы яму стварыць такі ж, як гэты.
Абразіш свет, спазніўшыся сяўбой,
Благаславіць не здолеўшы кабеты.

Якой красуні люба не было б,
Каб ты ўзараў нявораныя гоні?
Які б дзівак на звод павёў свой род,
Любоў ва ўласным пахаваўшы лоне?

Ты адлюстровак матчыным вачам,
Яе прадвесні успамін дзівосны.
Ты ўцеху знойдзеш некалі і сам,
Праз вокны старасці пабачыш вёсны.

Як не пакінеш памяці такой,
Ты сам памрэш і вобраз твой з табой.

4

О марнатраўца! Спадчыну, багацце,
Якія нам прырода ў доўг дае,
Ты безрахубна толькі можаш траціць
На асалоды ўласныя свае.

Цудоўны скнара! Для цябе пазыкі,
Дабро чужое — як уласны дар.
Калі ліхвяр хавае скарб вялікі,
Які прыбытак будзе мець ліхвяр?

Гандлюючы цяпер з самім сабою,
Сябе самога ашукаць ты рад.
А што ж, як лёс прызначанай парою
Запатрабуе справаздачу страт?!

З табою ляжа і краса таксама,
Якая б накш твой здзейсніла тастамант.

5

Мастак цудоўны, незраўнаны час,
Нам творыць дзівы дзіўныя няспынна.
І ён жа ўсё, што захапляла нас,
Нібы тыран, знішчае ў міг адзіны.

Пазбыўшы лета, ён зіму вядзе
Ў наш засмучоны свет, такі знямелы,
Дзе ані кветкі, ні лістка нідзе,
Адзін прасцяг сцюдзёны, снежна-белы.

І каб не кветак харaство за шклом,
Зачыненых у ільдзяной вязніцы,
На цуды, створаныя мастаком,
Маглі б напэўна мы ураз забыцца.

Зіхценне кветкі страцілі зімой,
Але душа іх з той жа пекнатой.

6

Пільнуй, каб лета і твайго прыход
Бязлітасна зіма не зруйнавала,
Пакуль дасі красе ў скарбніцу плод
І не напоўніш слодыччу фіяла.

Ты не ліхвяр, калі за ўласны дар
Бярэш аддзяку шчыра, без умовы.
Ты сам свайму багаццю гаспадар,
Сябе паўторыш дзесяціразова.

Калі ўсе новыя ўдзесяцярых
Разоў па дзесяць вобраз твой адновяць,—
І смерць не страшна ў твой апошні міг,
Тваё патомства — вось твая адповедзь!

Занадта ты прыгожы, дасканалы,
Каб гэта ўсё здабыткам смерці стала.

7

Калі ў агні ўрачыстых, ясных шат
Ідзе з начы магутнае святіла,
Ўзнімае ўсё жывое свой пагляд,
Вітае прамяністасць дзіўнай сілы.

Калі яно у залатых агнях
Ідзе па небу да свайго узвышша,
Тады ўсе з захапленнем у вачах
Глядзяць, нібы юнак чароўны выйшаў.

Калі ж яно на небакрай зірне,
Стамлёна ў дол пакоціць каляскіцу,
Тады ўсе вочы недзе ў старане,
Пакуль яму да захаду хіліцца.

І ты без следу ў свеце знікнеш так,
Калі не застанецца сын-юнак.

8

У музыцы твая ўся асалода.
Чаму ж яе ты слухаеш з тугой?
Калі яна табе не даспадобы,
Чаму не развітаешся ты з ёй?

І хоць акорды жалем горкім поўны,
У іх сугучнасці табе дакор:
Хто без гармоніі жыве чароўнай,
Самотны той на ўвесь зямны прастор.

Ты чуў калі, як струны ў дружным ладзе
У перазвон гудзяць адна другой?
Так бацька з сынам, разам з імі маці
Шчаслівы спеў пяюць адной сям'ёй.

І сведчаць гукі шчырыя усім:
Самотны — як і не жывы зусім.

9

Каб не пакінуць любую ўдавой,
Дагэтуль ты ні з кім не заручоны.
Калі ж бы смерць устала над табой,
Апанаваў бы светам смутак чорны.

Свет плакаў бы, як удава, па тым,
Што вобраз твой загінуў беззваротна.
Сын адлюстроўкам мог бы быць тваім,
Праз сына ты і быў бы бессмяротным.

Калі растраціць скарбы хто усе,—
Другія спажывуцца іхнім коштам,
А калі знікнуць суджана красе,
Яна ў нябыт адыдзе занівошта.

Хто сам сабе гатоў прынесці шкоду,
Таму нікога на зямлі не шкода.

10

Якая ганьба! Жыць і не любіць
Людзей спагадных і сябе самога,
Любоў да свету цэлага згубіць,
Набыўшы ў сэрца пачуццё благога!..

Уласным ворагам сваім ты стаў,
Супроць сябе самога паўстаеш ты,
І дом цудоўны, ў спадчыну што ўзяў,
Не аднаўляеш, бурыш ты дарэшты.

Змяніся ты, і я змяню настрой,
Краса каханню быць павінна домам.
Як з выгляду, будзь ветлы і душой,
Не будзь ты ворагам сабе самому.

Краса твая зусім са свету згіне,
Як не пакінеш нам яе ты ў сыне.

11

Не звянеш ты, бо закрасуеш зноў
Цераз дзяцей сваіх і з іх красою.
Сваёй ты назавеш нашчадкаў кроў,
Якую даў часінай маладою.

Ёсць мудрасць, прыгажосць у думцы той.
Без іх жа радасці і шчасця мала:
Калі б згадзіўся свет увесь з табой,
Дык праз капу гадоў жыцця б не стала.

Няхай пачвары, выродкі усе
На свеце нашым згінуць без расплоду.
А ты, за ўсе дары тваёй красе,
Павінен шчыра дзякаваць прыроду.

Ты, як пячаць, што выразаў разьбяр,
Павінен шмат разоў вярнуць свой дар.

12

Калі гадзіннік адбівае час нам,
А дзень вясёлы нікне ў шэры змрок,
Ці сівізну на чорных бачу пасмах,
Фіялкі кволае паніклы зрок,

Калі пабачу дрэвы пры дарозе —
Ўсе без лістоў, без засені густой,
Або пласты сухой травы на возе,
Нядаўна што была жывой травой,—

Тады цябе міжвольна я згадаю:
Тваёй красы не вечны такжа цвет.
Адно жыве, другое памірае,
А трэцяе ў жыццё цярэбіць след.

Як стане смерць па-над табой з касой,—
Змагацца з ёй пачне нашчадак твой.

13

Каб мог ты вечна быць самім сабою!
Але жывеш на свеце да пары.
Пакуль не стане смерць перад табою,
Сабе падобны вобраз ты ствары.

Краса табе аддадзена на раты,
Але і вечнай можа стаць, калі
Твой вобраз будзе новым пераняты
І будзе красаваць з ім на зямлі.

Хто дасць, каб дом цудоўны быў зруйнован
Ці сцюжай смерці, ці ліхой зімой?
Гаспадаром руплівым апільнован,
Устоіць ён перад навалай злой.

Ты бацьку меў. Дазволь другому, мілы,
Сказаць такое ж ля тваёй магілы.

14

Ніколі я не варажыў на зорках,
Хоць разумею іх спрадвечны шлях.
Не папярэджу аб часінах горкіх,
Што нам прыносяць голад, войны, жах;

Не ведаю, ці навальніца будзе,
Ці будзе неба яснае без хмар,
Ці будуць жыць шчасліва ў свеце людзі,
Ці шчаслівейшым будзе уладар,—

Але ў тваіх вачах чытаю ясна,
У гэтых зорках вечнай чысціні,—
Што праўда з хараством тады не згасне,
Калі потомкі ўдоўжаць твае дні.

Калі ж стварыць ты гэтага не ў сіле,
Краса і праўда згінуць у магіле.

15

Калі падумаю, што ўсё жывое
Красуе на зямлі кароткі міг,
Што свет — тэатр, а мы, яго героі,
Ад зор залежым на шляхах сваіх,

Калі падумаю, што людзі, як расліны,
Жывуць і гінуць з ласкі неба ўсе,
Што поўны сіл юнацкія часіны,
А сталасць адцвітанне нам нясе,—

Тады згадаю я аб тым міжвольна,
Як бродзіць нашай маладосці сок
І як знішчальны час ідзе павольна,
Каб дзень змяніць на шэры, хмуры змрок.

Я за цябе іду на час вайною,
Каб аднавіць прышчэпкаю сваёю.

16

Чаму на час вайною сам не йдзеш ты
І не змагаешся з тыранам сам?
Мой верш слабая абарона, зрэшты,
А што ж мацнейшае ад рыфмы дам?

Ты дасягнуў цяпер свайго узвышша,
І колькі з радасцю далі б табе,
Каб ты сады іх апрацоўваць выйшаў,
Прыняў удзел у веснавой сяўбе.

Закрасавалі б там жывыя кветы
І да цябе былі б падобны лепш,
Чым самых лепшых мастакоў партрэты,
Чым выдатнейшага паэта верш.

Сваім мастацтвам створыш ты такое,
Што будзе жыць і без цябе — табою.

17

Паверыць хто ў наступным часе мне,
Калі цябе ў сваім праслаўлю вершы?
Само жыццё схавана у труне,
А верш ці можа за жыццё быць лепшым?

Каб я спрамог малюнак даць красы,
Даць вобраз твой з усёю пекнатою,
Наступны век сказаў бы: «Во хлусы!
На небе можа толькі быць такое!»

І як смяяліся б тады яны
З мяне і з аркуша рудой паперы.
Для іх старыя ўсе — балбатуны,
Якія хлусяць без ніякай меры.

Але каб сын твой быў дасюль жывым,
Ты б двойчы жыў: у вершы раз і ў ім.

18

Я з летнім днём цябе не параўнаю,
Мілей, вышэй ты хараством сваім.
Суровы вецер крышыць кветкі мая,
І лета борзда коціцца за ім.

То з неба Вока паліць нас зацята,
То знікне так, што не відаць нідзе.
Прыгожага бывае малавата,
Дзе выпадковасць нашы дні вядзе.

Тваё ж не зменіцца ніколі лета,
І смерць не зможа пахваліцца тым,
Што ты забраны назусім са свету:
Знайшоў бяссмерце ў вершы ты маім.

Ты будзеш жыць, аж покуль будуць людзі,
І будуць вочы бачыць, дыхаць грудзі.

19

О час! Льву — прытупі ты кіпцюры,
У тыгра злога — з пашчы іклы рві,
Прымусь зямлю глытаць свае дары
І фенікса спалі ў яго крыві;

Тасуй наш год, рабі што хочаш з ім,
Круці наш свет, як здумаеш калі,—
Адзін злачын забараню пры тым,
Злачын страшнейшы самы на зямлі.

Ты не чапай любімага чала,
Яго пяром старэцкім не крані,
Каб, як узор, краса яго жыла
На ўсе наступныя часы і дні.

Але калі ты ўсё ж ткі закранеш,
Яго красу мой абароніць верш!

20

Жаночы твар дала табе прырода,
З больш дасканалай нават пекнатой.
Мяне прывабіла твая урода,—
Ты пан і пані для душы маёй.

Пяшчотны погляд, шчыры і прыгожы,
У пазлацістасць апранае след.
Мужчын ён вабіць сілаю вяльможнай,
Сардэчнасцю чаруе ён кабет.

Цябе прырода ладзіла жанчынай,
Пасля адну драбнічку дадала,
Што не патрэбна мне ніякім чынам,
А для жанчын прывабнаю была.

Калі такая справа — мне любоў,
А ім — як можна больш яе пладоў.

21

Натхнення я не маю ад красы,
Якая звонку ўся нафарбавана,
Хоць многія раўнуюць галасы
Яе да неба, сонца, акіяна.

Успомніць можна перлы ўсёй зямлі
Ці параўнаць да месяца, да зорак.
І кветкі, што з-пад снегу расцвілі,
Да вершаваных прыплясці гаворак.

Але не ў гэтым праўда прадвякоў,
І харство не толькі ў зорнай шаце,—
Мая каханая, мая любоў
Прыгожа так, як роджаны ад маці.

Лепш пра любоў сказаць бы я не мог,
Мая любоў — для сэрца, не на торг.

22

Не давядзе мне люстра, што стары я,
Пакуль тваё юнацтва не міне.
Калі цябе час зморшчкамі ускрые,
Тады скажу: «Пара памерці мне!»

Краса твая мне апранае сэрца,
Яно жыве ў тваіх грудзях даўно.
І кожнае з падвойнай сілай б'ецца,
Яны хоць паасобна — як адно.

Мая любоў! Так многа ў свеце злога,
Высцерагайся ж пільна ты бяды!
Як маці сына пестуе малога,
Цябе я буду даглядаць заўжды.

Два сэрцы нашы маюць лёс адзіны:
Жыццё і смерць іх да адной хвіліны.

23

Як той акцёр, збянтэжыўшыся, стане,
Згубіўшы ролі вызубранай ніць,
Ці безразважны, ў раззлаваным стане,
Знямее, сіл не меўшы гаварыць,—

Так я замоўк, бо словаў больш не маю,
Якімі надарае нас любоў.
Але ж яна, магутная такая,
Мяне навучыць гаварыць без слоў.

Няхай тлумачыць кніга мову сэрца,
Як абаронца красамоўны мой.
Хай у радочку кожным адгукнецца,
Што варты ўзнагароды я тваёй!

Пачуем пра любоў з нямых радкоў?
Вачыма слухаць вучыць нас любоў!

24

Твой вобраз, на здзіўленне мастакам,
У сэрцы вока мне маё стварыла.
Жывая рама для яго — я сам.
У ім — выдатная мастацтва сіла.

Каб асалоду мець ад пекнаты,
Спыніцца трэба позіркам на раме.
А вокны ўсе ў маёй майстэрні ты
Зашкліла чараўнічымі вачамі.

Сябруюць нашы вочы між сабой:
Мае цябе нарысавалі ў сэрцы,
А сонца ходзіць праз твае за мной,
Каб на красу тваю лепш наглядзецца.

На жаль, мае рысуюць толькі тое,
Што бачаць, сэрца ж ім пакуль чужое.

25

Хто з-пад шчаслівай зоркі мае лёс,
Той ганарыцца тытуламі можа.
А мне любоў для шчасця ён прынёс,
З ёй самы большы ў свеце я вяльможа.

Нібыта кветкі ў сонечным святле,
Ля ўладара красуюць фаварыты.
А згасне сонца ў вечаровай мгле,
Нахмурыцца ўладар — і ўсе забыты.

Меў ваявода мноства перамог,
Яго імя гучала, як малітва.
Калі ж апошняй дасягнуць не мог —
Забыты ён са славаю ўсіх бітваў.

Маіх заслуг ніхто ніяк не здыме:
Любіў, люблю і буду век любімы.

26

Майго кахання пан! Як твой васал,
Бязмежна вартасцям тваім адданы,
Пісьмовае пасольства я паслаў,
Хоць без дасціпнасці, але з пашанай.

На жаль, прыдатных слоў я не знайшоў,
Каб выканаць пачуцці-летуценні.
Прымі ж маіх гаротнікаў паслоў
І апрані душы сваёй адзеннем.

Магчыма, зоркі, што кіруюць мной,
Вядуць мяне у край нязнаны свету,
Сваёю прамяністаю красой
Маю адзначаць і аздобяць мэту.

Тады і я прызнаюся у тым,
Як шчыра мной ты заўсягды любім.

27

У цяжкай стоме я шукаю ложак,
Каб супачыць і целам і душой.
Ды і адтуль імкнуцца ў падарожжа,
Як пілігрымы, думкі за табой.

У дальні край, пад засцілаю ночы,
Цябе шукаючы, лятуць яны.
Хоць бачу тое, што сляпога вочы,
Але мяне мае мінаюць сны.

Да дарагога ўсюды ёсць дарога,
Рысуе мне замілавання зрок
Твой дзіўны вобраз хараства такога,
Перад якім зіхціць вясёлкай змрок.

Не маю я спакою праз каханне,
Хоць прыйдзе ноч, хоць раніца устане.

28

Ды як жа мне сваёй пазбыцца стомы,
Калі няма патолі мне нідзе?
За мною скруха сцежкаю знаёмай
Праз ноч у дзень, праз дзень у ноч ідзе.

Між днём і ноччу непрыязні многа,
Але і дружбы ў іх бывае шмат,
Калі нясуць мне смутак, і трывогу,
І успаміны незваротных страт.

Каб ублагаць і улагодзіць золак,
Кажу, што ты зіхціш яго красой.
Калі няма у ночы ясных зорак,
Кажу, што ты святліш яе сабой.

Але штодня цяжэй мая пакута,
Але штоночна мой гарчэе смутак.

29

Зняслаўлены людской няпраўдай, лёсам,
У неба шлю я смутак горкі мой.
Але мой лямант не скране нябёсы
З іх абыякасцю, да слёз глухой.

Бывае зайздрасць горш самога ката,
На ўласны скарб забыцца з ёй гатоў.
Зайздрошчу ўсім, надзеямі багатым,
На таленты шчаслівым, на сяброў.

Калі ж цябе, у той хвіліне самай,
Згадаю я, дык стану ўраз другім.
Нібы жаўрук перад нябеснай брамай,
Мая душа табе спявае гімн.

За успаміны пра тваю любоў
Не ўзяў бы я багацці каралёў.

30

Калі на суд маўклівых, горных дум
Я выклікаю дзён мінулых дзеі,
Мяне пякельны агартае сум
Па ўсім, што страцілі мае надзеі.

З маіх вачэй бягуць патокі слёз
За ўсіх, аддадзеных сырой магіле.
Шукаю тых, што ўзяў дачасна лёс,
Што я любіў і што мяне любілі.

Рахунак праглядаючы даўгі,
Жахаюся над ім ад кожнай страты.
І зноў плачу, нібыта за даўгі,
За тое ўсё, за што даваў я плату.

Цябе ж згадаўшы, думаю: «Ізноў
Утраты ўсе ў табе адной знайшоў!»

31

А сэрцы тых, забраны што нябытам,
Я чую ў сэрцы і ў грудзях тваіх.
Тваё аблічча дзіўнае спавіта
Святлом вачэй і водзіркамі іх.

Я горка плакаў на магільных плітах
Па тых усіх, чый дзень дачасна згас.
Цяпер яны прыйшлі ізноў, нібыта
На час кароткі пакідалі нас.

Як бы на схоў яны табою ўзяты,
Для сэрца мілыя, любімыя усе.
І кожны з іх, замілавання варты,
Майго кахання частачку нясе.

Як адлюстровак мною ўсіх любімых,
Ты нада мной пануеш разам з імі.

32

Калі навекі лягу я ў труне,
А смерць мае засыпле прахам косці,
Згадаеш ты як-небудзь пра мяне
І пачытаеш з кнігі гэтай штосьці.

Паэтаў новых, здольных прыйдзе шмат,
Званчэй іх рыфмы будуць незраўнана.
А ўсё ж тваёй я буду ўвагі варт,—
Цябе любіў сардэчна і аддана.

Скажы ўсім ім: «Калі б мой друг не згас
І за жыццём пазнаў бы ліха меней,
Не горш бы ён тварыў за многіх вас,
Не горшым быў бы ў вашым пакаленні.

Шаную вас за гучнасць вашых слоў,
Яго люблю за шчырую любоў».

33

Я неаднойчы бачыў, як світанне,
Пацалаваўшы верхавіны гор,
Шле пазлацістае сваё вітанне
Лугам зялёным, на блакіт азёр.

Я і такое бачыў, як раптоўна,
Аддаўшыся самохаць волі хмар,
Ішоў на захад уладар чароўны,
Схаваўшы сплямлены, як катам, твар.

Так і маё ўзыходзіла святіла,
Пазалаціўшы мой шчаслівы час.
Так і маё нядоўга мне святіла,
З ім час шчаслівага кахання згас.

Калі на небе сонца мае плямы,
Чаму ж не быць ім у зямных таксама?

34

Ты мне цудоўны дзень дакляравала,
Каб без плашча ў дарогу я пайшоў.
І ты ж дазволіла, каб хмар навала
Мяне дагнала, твой зацьміўшы схоў.

І што з таго, што дождж утаймаваны,
Табой абсушан збіты бурай твар?
Ці ж то бальзам, што звонку гоіць раны,
А ў асяродку не спыняе жар?

Твая спагада не ўтаймуе сэрца,
Ад смутку зелля мне не прынясе.
Ўсё той жа крыж пакуты застанецца,
А ў сэрцы крыўды застануцца ўсе.

Але ты плачаш. Перлы шчырых слёз
На выкуп крыўд усіх мне лёс прынёс.

35

Ты не сумуй! Усюды хібы ёсць:
На ружах дзіды, твань на дне крыніцы,
Чарвяк нікчэмны блоціць прыгажосць,
А сонца ценем месяца зацьміцца.

Ўсе памыляюцца. І я не менш,
Даруючы табе грахі цяжкія.
Я грэшны сам, і грэшны гэты верш,
Калі не бачыць хібы ён такія.

Цябе я вінавачу на судзе
І на судзе ж цябе абараняю.
Куды любоў і ненавісць вядзе:
Я сам з сабой вайну распачынаю!

Ты абакраў мяне, цудоўны злодзей,
А я цяпер прашу цябе аб згодзе!

36

Хоць мы ўдваіх з табой дасюль былі,
Адна істота мы ў сваім каханні.
Калі дакор нам выслізне калі,—
Няхай да аднаго мяне прыстане.

Такая доля суджана для нас:
Бягуць асобна нашы каляіны.
Нас пазбаўляе асалоды час,
Крадзе ў кахання светлыя хвіліны.

Не разумею, ў чым мая віна,
Чаму любоў хаваць я мушу ў сэрцы?
І ты, каб ганьбу не пазнаць да дна,
Са мной не можаш пры людзях сустрэцца.

Хай так і будзе! Гонар чысты твой,
Як і любоў,— ён разам з тым і мой!

37

Старым бацькам уцеху сын дае,
Упэўненасць дае ў юнацкай сіле.
Так і мяне ўсе вартасці твае
На схіле дзён нібы уваскрасілі.

Твой розум ясны, слава, прыгажосць,
Здароўе, род славуты старадаўні —
Усё найлепшае, ў табе што ёсць,
Перадаецца мне з замілаваннем.

Больш не кульгавы, не самотны я,
З тваіх дарункаў моц ізноў я чую,
А прамяністасць чыстая твая
Маленькай частачкай мяне сілкуе.

Чаго б табе ні пажадаў цяпер,—
Усё найлепшае ёсць у цябе!

38

Што можа быць для музы цікавейшым,
Калі натхнення столькі ты даеш?
Твой вобраз варты, каб пяром найлепшым
Яму у гонар быў напісан верш.

Калі сустрэнеш добрае што ў творы,
Сабе самому і падзякуй ты,
Бо толькі той, хто змалку не гаворыць,
Тваёй не будзе славіць пекнаты.

Дзесятай музай будзь, разоў у дзесяць
За тыя лепш, што любяць рыфмачы,
Каб твой паклоннік мог такое здзейсніць,
Што памагло б нябыт перамагчы.

Наступны час па праву дасць нам славу:
За працу мне, табе за ўзлёт яскравы.

39

Як я праслаўлю вартасці твае,
Калі адна істота мы з табою,
І пахвала для часткі аднае
Прыдацца можа самапахвальбою?

Нам паасобна трэба жыць затым,
Не называць адзінствам дружбу нашу.
Тады, ў разлуцы, будзе ўсё тваім,
Што пра цябе мая любоў ні скажа.

Гарчэй за ўсё, разлука, ты ў жыцці!
Але даюць лятункі нам збавенне,
Каб асалоду мы маглі знайсці
І ашукаць самотныя імгненні.

Разлука надвая нам дзеліць сэрца,
Каб лепш хваліць таго, хто застаецца.

40

Вазьмі любоў, любімы мой, вазьмі!
Ці будзеш толькі, ўзяўшы, багацей?
Любоў, мой любы, знаная людзьмі,
Твая і так уся была раней.

Калі любоў, любімы, ўся твая,
Ці вінавачу я цябе на тым?
Дакор адзін, мой любы, маю я,
Што пагардзіў каханнем ты маім.

Цудоўны злодзей! Грэх дарую твой,
І нават той, што скрыўдзіў жабрака.
Але любові крыўды, любы мой,
Для нас цяжэй, чым ворага рука.

Любоў маю прашу я аб адным:
— Забі, ды ворагам не будзь маім!

41

Калі мне ў сэрцы месца не стае,
А захапленне змусту прынясе,—
І маладосць і прыгажосць твае
Даруюць дробныя пахібы ўсе.

Спакуса ходзіць за табою ўслед,
За пекнатой прываблівай тваёй.
А перад ласкай змуслівых кабет
Устоіць сын кабеціны якой?

Але, на жаль, юнацкі твой запал,
Але, на жаль, юнацкі твой імпэт
Прыязні нашай літасці не даў,
А двойчы пакрышыў яе ушчэнт:

Запляміў здрадаю душу сваю
І спадабанку спакусіў маю.

42

Мой жаль не ў тым, што ты ўладаеш ёй,—
Хоць я, прызнацца, сам люблю яе,—
А што яна ўладарыць над табой,
Разбіўшы нас, вось гэта жаль дае!

Я ўсё ж, гарэзнікі, прабачу вас:
Яе ты любіш, бо любіў мяне,
Яна ж, праводзячы з табою час,
Выказвае замілаванне мне.

Яе губляю — ты знаходцы рад,
Цябе — дарунак для яе такі ж.
А сам, пасля маіх падвойных страт,
Я змушаны падняць нялёгкі крыж.

Ёсць тут і радасць: ты — адно са мной,
Дык толькі я любімы ёй самой.

43

Прыемна мне, калі заплюшчу вочы,
Бо што б удзень пабачылі яны?
Цудоўны вобраз твой скрозь цемру ночы
Мне зіхатлівыя прыносяць сны.

Калі твой сцень і ноч перамагае,
Святлом барвовым разганяе змрок,—
Дык як жа ўдзень краса свяціла б тая,
Твой яснавейны, прамяністы зрок?

Якім бы дзень прыгожым стаў раптоўна,
Каб ты з'явілася ў сваёй красе,
Калі адзін твой толькі сцень цудоўны
Такую слодыч для мяне нясе!

Мне без цябе і дзень — як ноч глухая,
З табою ж ноч — як ясны дзень бывае.

44

Каб думкай стала плоць мая калі,
Яе тады б адлегласць не спыніла,
І да цябе, ў далёкі край зямлі,
Яна б мяне сваёй аднесла сілай.

Мне абыякава было б зусім,
Дзе я стаю і дзе ты ў гэтым часе.
У небе ясным, над усім зямным
Я думкай борздай да цябе б імчаўся.

Ды не пазбыцца мне сваёй журбы,
Ніяк мне думка не раскрые крылляў.
Пакуль, як створаны з зямлі й вады,
Я не магу сягнуць праз безліч міляў.

Зямля дае павольнасць у хадзе,
Вада слязамі горкімі ідзе.

45

Агонь з паветрам — розныя стыхіі:
У першай — палкасць, думка у другой.
Яны лятуць, нястрымныя такія,
У непарушнай еднасці сваёй.

Калі яны, як пасланцы кахання,
К табе кіруюць вольны свой палёт,
Зямлі й вады наступіць панаванне,
А ў ім так многа смутку і турбот.

Сумую я аж да тае часіны,
Пакуль пасольства прыляціць назад
І скажа мне, што любы мой адзіны
Жывы, здаровы, прывітанням рад.

Якое шчасце! Але без адкладу
Зноў мкнуць яны табе маю спагаду.

46

У воч і сэрца вечная вайна:
Не падзялілі ўлады над табой.
І тая і другая старана
Тваёю захапляюцца красой.

Гаворыць сэрца, што жывеш ты ў ім
І ў тайніку схаваны там на дно.
А вочы кажуць, што ў святле сваім
Адлюстравалі вобраз твой даўно.

Каб скончыць спрэчку, скліканы быў суд.
Паселі суддзі — думкі — ля стала.
Каму належыць што,— сказаў прысуд,
А ў ім развага мудрая была:

— Над сэрцам — сэрца будзе уладар,
Знадворнасць — вочам дастанецца ў дар.

47

У сэрца і вачэй умова ёсць
Дапамагаць заўжды адно другому,
Калі твая прывабіць прыгажосць,
А ў сэрца млявая прыходзіць стома.

Як вочы намілуюцца красой,
Яны даюць і сэрцу наглядзецца.
А вочам асалодаю сваёй
Дае усмак нацешыцца і сэрца.

Ці так, ці накш — а ўсё ж ткі ты пры мне
І летуценнямі, і сам сабою.
Далей маіх ты думак не сягнеш,
Я з імі заўсягды, яны — з табою.

Заснеш — твой вобраз з'явіцца у сне,
Абудзіць думкі, сэрца схамяне.

48

Як пільна я, выходзячы ў дарогу,
Паабмыкаў драбніцы ўсе свае,
Каб захаваць ад злосніка ліхога
І скарыстаць пасля да аднае.

Цябе ж, мой скарб найдаражэйшы самы,
Што за усе багацці мне мілей,
Мая ты радасць і журба таксама,
Украсці можа першы ліхадзей.

Ні ў якіх сховах не замкнуў цябе я,
Апроч таго, ў якім цябе няма.
Схоў — сэрца шчырае, куды з надзеяй
Прыйсці і выйсці можаш ты сама.

Але, баюся, быўшы нават праўдай,
Табой спакушаны цябе украў бы.

49

У часе тым,— каб лепш ён не прыйшоў! —
Калі асудзіш ты мае заганы
І, спаняверaны ў сваю любоў,
Мяне пазбавіш жаднае пашаны;

Калі мінеш, нібы чужы, мяне,
Ледзь кінуўшы сваім паглядам светлым,
І след кахання больш не мільгане
Ў тваім абліччы зімным, хоць і ветлым,—

Няхай мне горна будзе аднаму
Ў свядомасці, што я цябе не варты.
Супроць сябе руку я падніму
За праўду тую, што табою ўзнята.

Калі я права на каханне страціў,
Павінен з тым пазбыцца ўсіх багацяў.

50

Як цяжка падарожнічаць, калі
Не дакляруе радасці мне гэта.
І колькі б так я ні праехаў міль,—
Мяне ад шчасця аддаляе мэта.

Мой конь, стаміўшыся маёй бядой,
Ідзе павольна, ледзьве суне ногі,
Нібыта чуе, што перада мной
Няма нічога, апрача трывогі.

На шпоры нават не зважае ён,
А часам толькі ўздыхне ад гора.
Мне больш балюча слухаць конскі стогн,
Чымся яму прымаць удары шпораў.

Далей яшчэ цяжэй ад горкіх дум:
Пакінуў радасць, а шукаю сум.

51

Прабачыў я маркотнага каня.
Каню павольнасць дараваў яго.
Бо сапраўды навошта мне гання,
Калі ад друга еду я свайго?

Але які пачуе ён дакор,
Калі вяртацца будзе так у двор?!
Хоць засядланым быў бы сам віхор,
І той пазнаў бы смак сталёвых шпор!

Найлепшы конь жаданню не раўня.
Яно з любові выткана самой.
Ляціць жаданне з лёгкасцю агня
І скажа клячы памаўзлівай той:

— Не можаш ты, каб і хацеў, хутчэй,
А я — на крыллі паляту далей!

52

Як багатыр з ключом сваім цудоўным,
Я хоць калі магу дастаць свой скарб.
Але ў каханні сквапнасць рызыкоўна,
Бо асалоду прытупіць магла б.

Не кожны дзень у нас бывае свята,
Таму яно і дорага для нас.
Між самацветаў на святочных шатах
Найпрыгажэй нам зіхаціць алмаз.

Няхай і час цябе ў сваёй скарбніцы,
Як самацвет, пільнуе ад вачэй.
На нашым святе будзе прамяніцца
Твая краса мілей і яскравей.

Якую слодыч прынясе спатканне
За хваляваннем палкага чакання!

53

Скажы, якой стыхіі ты стварэнне?
Адзін жа цень у кожнага з людзей,
А за табою адлюстроўкаў-ценяў,
Дзівосных вобразаў мільён ідзе.

Адоніс быў для хараства узорам.
Перад тваім — адбітак ён слабы.
З красой Гелены параўнаць не сорам
Красу тваю у нашыя гады.

Вясенні дзень і восені ўсе плёны
Адлюстраваны ў вобразе тваім:
Як дзень жніва, ты шчодрасцямі поўны
І хараством убраны веснавым.

Твая ёсць частачка ва ўсім прыгожым,
Але з чым сэрца параўнаць мы можам?

54

Аздобленая праўдай прыгажосць
Нічога роўнага не мае ў свеце.
Ў цудоўных ружах водар дзіўны ёсць,
Які жыве у пурпуровым цвеце.

У квет атрутных зіхацення шмат
І водар да ружовага падобны.
Яны прывабіць могуць наш пагляд,
Калі вясной раскрыюцца бутоны.

Няма з іх цвету радасці для нас,
Атрутай адцвітанне іх спавіта.
А калі ружам вянуць прыйдзе час,—
Іх душы ў водар будуць пераліты.

Калі ж, юнацтва, вянуць ты пачнеш,
Пералію тваю ўсю праўду ў верш!

55

Ніякі мармур царскіх пахаванняў
Не будзе трывалей, чым гэты верш.
Калі ўсе пліты скрышацца дазвання,
Ў ім будзеш жыць, як і цяпер жывеш.

Калі знішчальныя паваляць войны
Ўсе статуі, разбураць камяні,—
Жывое слова пройдзе супакойна
У час наступны праз усе агні.

Ты не паддана ні уладзе смерці,
Ні забыццю, што йдзе за ёй услед.
Не здолеюць ні выкрасліць, ні сцерці
Твайго імя, пакуль існуе свет.

І так жыві ў людскіх прыхільных сэрцах,
Пакуль на свеце судны дзень пачнецца.

56

Устань, любоў мая! Устань, любоў!
Ці ж ты слабей, тупей сваіх жаданняў?
Навек не наясіся. Заўтра зноў
Для нас усіх патрэбна сілкаванне.

Цяпер ты задаволена. Твае
Заплюшчваюцца вочы з асалоды.
А новы дзень спакою не дае:
Агонь не згас, палае, як заўсёды.

Каб гэты міг для нас быў даражэй,
Няхай разлука стане акіянам
І дасць хоць прамяністасцю вачэй
Цераз яго спаткацца закаханым.

Калі разлука як зіма на сэрцы,
Дык утрая мілей з вясной сустрэцца.

57

Твой верны раб, аж покуль дзень міне,
Вартую пільна ўсе твае жаданні.
Як да сябе паклічаш ты мяне,
Тады мой час шчаслівы і настане.

Марудны час не праклінаю я,
Ягоную хаду сачу ўпарта.
Гарчэй тады бывае мне ўдвая,
Калі тваё пачую я: «Да заўтра!»

Ні словам я, ні думкаю сваёй
Не запытаюся, ўладарка, дзе ты.
Зайздрошчу тым, хто дзеліць час з табой,
Яны — шчаслівыя абранцы свету.

Любоў бязглузда і ў жыцці тваім
Не можа бачыць дрэннага зусім.

58

Хай крые бог, што рабства мне паслаў,
Каб я хоць думкай запытаўся нават,
Як час праводзіш ты. Я — твой васал.
Чакаць загадаў — вось мая ўся справа.

Нібы табой зняволены ў турму,
З табой разлучаны, з'яднаны з горам,
Пакорны знаку кожнаму твайму,—
Не папракну цябе сваім дакорам.

Жыві, як схочаш, пані над сабой,
Твая свабода жадных меж не мае.
Сама суддзя ты над сваёй віной,
Калі натрапіцца віна такая.

Чакаю я. Хоць пекла ў тым чаканні,
Цябе ніяк і ні за што не ганю.

59

Калі навін на свеце не бывае
І ўсё, што ёсць, існуе з прадвякоў,
Дык сам сябе, напэўна, ашукае
Той, хто народжанае родзіць зноў.

Хацеў бы я зірнуць у дні былыя,
За кругабегаў сонечных пяцьсот,
Каб там сказалі кнігі мне старыя,
Каго любіў і песталаў народ.

Тады пазнаў бы, ад якіх дзівосаў
З'явілася ты ў свеце праз вякі
І хто быў лепш благаславёны лёсам:
Той даўні час ці нашы мастакі.

Адно скажу: які б ні быў чый лёс,
Той час цябе узнёс бы да нябёс.

60

Як хвалі мкнуцца ў камяністы бераг,
Знікаючы адна каля адной,
Так і ў жыцці хвілін бясконцы шэраг
Ідзе ў нябыт няспыннаю хадой.

Юнацтва ўсё аздоблена праменнем.
Мінае сталасць. Ад тае пары
Змагаемся супроць ліхіх зацьменняў,
Пакуль час возьме ў нас свае дары.

Час губіць цвет цудоўнай маладосці,
Кладзе разоры на чале красы.
Узоры незраўнанай прыгажосці
Сцінае сквапнасцю сваёй касы.

А ўсё ж мой верш з красой тваёю пройдзе,
Насуперак яму, ў наступныя стагоддзі!

61

Ці праз цябе я вочы не самкну,
Калі ўначы прыходзіш летуценнем?
Ці вобраз твой мяне пазбавіў сну,
Ці карагод табе падобных сценяў?

Хіба твая з'яўляецца душа,
Каб зварушыць усё перабытое,
У памяці зайздросна ўваскрашаць
Мае памылкі, усё маё благое?

О, не! Хоць моцная твая любоў,
Ды не такая, каб у сне з'явіцца.
Мая любоў, пазбыўшыся ўсіх сноў,
Каля цябе стаіць, як вартаўніца!

Яна вартуе, не самкне вачэй,
Пакуль ты да другіх сяброў бліжэй.

62

Я самалюбствам так апанаваны,
Яно прасякла так мяне наскрозь,
Што, мне здаецца, ад яго заганы
Наўрад ці дзе на свеце лекі ёсць.

Здаецца мне, што роўнага красою,
Абліччам, станам, розумам — няма.
Здаецца мне, што вартасці такое
І дасканаласць не знайшла б сама.

Але калі перад люстэркам стану,
Пералічу ўсе зморшчкі на чале,
Тады прызнаю не адну загану,
А ўсе, адлюстраваныя на шкле.

Я падмяняў сваю — тваёй красою,
А век стары — юнацкаю парою.

63

Надыдзе час, калі мая любоў,
Падобна мне, сагнецца пад гадамі,
Калі пачне у жылах стынуць кроў,
А зморшчкі лягуць на чале радамі;

Калі ад золку маладосці шлях
На захад прыйдзе, стане там ля схілу,
І зіхаценне згасне у вачах,
І веснавая ўся пагасне сіла.

Той дзень чакаючы, цяпер ужо
Я супраць смерці падрыхтую зброю,
Каб часу ўсезнішчальны сквапны нож
Не сцяў любоў ад памяці людское.

А зброя гэта — кніг маіх радкі,
Якія будуць жыць ва ўсе вякі.

64

Калі пабачу, як красу вякоў
Знішчае час бязлітаснай рукою,
Як вежы гордыя звяргаюцца далоў
І бронзу крышыць ён сваёй хадою;

Як акіян галодны — берагі
За цаляй цалю вынішчае, рэжа,
А сухазем'е, каб спагнаць даўгі,
У воды сінія адносіць межы;

Як у дзяржавах, цераз сотні змен,
За росквітам прыходзіць угасанне,—
Дык і руіны, і стагоддзяў тлен
Мне сведчаць, што не вечна ўсё ж каханне.

Нашто ж мне лёс такое даў багацце,
Каб вечна думаць аб яго ўтраце?

65

Калі ў змаганні з часам не трывае
Зямля ці мора, камень або медзь,
Дык чым краса, нядужая такая,
Як кветка, здолела б адолець смерць?

Што зробіць лета, хараством убрана,
Супроць асады ваяўнічых дзён,
Калі муры нязломныя і брамы
Ад часу рушацца з усіх старон?

Жахлівы час! Як ад яго самога
Уратаваць, што ён жа сам стварыў?
Як захаваць ад вынішчэння злога
Дзівосныя, бясцэнныя дары?

Атрамант паратунак дасць ад згубы,
Каб вечна зіхацеў твой вобраз любы!

66

Стамлёны ўсім, я лепш сустрэў бы смерць,
Чым занядбаных бачыць жабраванне,
І здзек пустапарожнасці цярпець,
І найчысцейшай праўды зневажанне,

І бачыць пыху ў залатых страях,
І цноту, згвалчаную хіжай сілай,
І для бязглуздасці пачэсны шлях,
І моц, якую немач паланіла.

І мастакоў нізкапаклонны зброд,
І недарэк мастацтвазнаўцаў з імі,
І ісціну, якой затулен рот,
І зло, што верхаводзіць над усімі.

Стамлёны ўсім, сумую па труне,
Ды як жа друг мой будзе без мяне?

67

Нашто жыве ён між такіх заган?
Каб даць ганебным справам апраўданне?
Каб прыкрываць хлуслівасцю румян
Самотную часіну адцвітання?

Нашто шукаць патрэбна пекнаце
Да руж падобнасць шляхам нейкім кружным?
Яна ніколі больш не расцвіце,
Хоць сапраўды была жывою ружай.

Навошта жыць, калі згасае плоць,
Калі прырода ў ёй збанкрутавала,
Былых багацціяў толькі рэшткі ёсць
І кроў у жылах ходзіць так памалу?

Каб дням наступным паказаць магла б,
Які яна цудоўны мела скарб.

68

Ён сам увесь — як часу адлюстровак,
Калі краса была яшчэ красой,
Не ведала ніякіх падфарбовак,
І зіхацела кветкай веснавой.

Тады яшчэ па смерці не зразалі
Ў нябожчыц косы залатыя іх,
Каб, як цяпер, спадалі пышна хвалі
Красы чужое на плячах чужых.

Краса яго ў свае страі адзета,
Няма на ёй напазычаных фарб,
З чужой вясны сабе не творыць лета
І не рабуе дзён мінулых скарб.

Нашто яго вартуе так прырода?
Красу без фальшу паказаць народу!

69

Найлепшы друг або найгоршы вораг
Дадаць не могуць, каб хацелі нат,
Хоць рыску да праслаўленага ўзору,
Што бачыць свету цэлага пагляд.

Праслаўлена твая знадворнасць звонку,
Але калі ўсё тыя ж языкі
Пра якасць сэрца распачнуць гамонку,
Тады і водгук будзе не такі.

Тваёй душой цікавячыся вельмі,
Глядзіць на справы здзейсненыя свет.
І тут, бывае, водар пустазелля
Зглушае водар самых лепшых квет.

А ліху гэтаму адна прычына,
Што кветнік твой бадай для ўсіх адчынен.

70

Не ў тым загана, што цябе хто ганіць:
Краса спрадвеку мэта для хлусні.
Брыда ніяк да неба не прыстане,
Хоць лётае варона ў вышыні.

Калі ты цнотай будзеш, як заўсёды,
Дык ганьба вартасці падкрэсліць лепш.
Смаўжы шукаюць чысціню і слодыч,
Таму і да цябе паўзуць найперш.

Свайго юнацтва ты мінула змусты
Або ў змаганні іх перамагла.
Не знойдзеш хусты на чужыя вусты,
Хлусню не знішчыць праўды пахвала.

Калі б табе і з хмаркай не сустрэцца,
Адна б ва ўсіх ты панавала сэрцах.

71

Не плач па мне ты больш хвіліны той,
Калі абвесціць сумны звон званоў,
Што я злучаюся навек з зямлёй
І ў свет ніжэйшы да чарвей пайшоў.

Не ўспамінай, чытаючы мой верш,
Руку, напісаны ён быў якой.
Любоў мая! Забытым быць мне лепш,
Чым згадкай твой нарушыць супакой.

Не хочу я, каб водгулле радкоў,
Калі з зямлёй знітуецца зямля,
Мяне нагадвала. Твая любоў
Няхай памрэ, калі пагасну я.

Не хочу я, каб да самотных слёз
Людскі прысуд і горкі здзек прынёс.

72

Каб свет цябе не прымушаў сказаць,
За што мяне любіла так сардэчна,
Няхай твая не заблішчыць сляза,
Калі знайду я адпачынак вечны.

Не шмат чаго для памяці людской
Магла б знайсці ў мяне пры ўсім жаданні,
І мімаволі дапаўняць маной
Табе прыйшлося бы апавяданне.

Любоў тваю каб не запляміць той
Няпраўдай самых шчырых успамінаў,
Імя маё няхай памрэ са мной,
Няхай са мною ляжа ў дамавіну.

Каб не ўпікнуў ніхто цябе затым,
Што з памаўзой кахалася такім.

73

Мяне раўняць ты можаш да часіны,
Калі пажоўклы ліст адзін за 'дным
З галля таго, дзе хор звінеў птушыны,
Нясе свой жаль над полем нежывым.

Падобны я таксама да змяркання,
Калі шарэе ў захадзе заход,
Калі, як вобраз смерці, ноч устане,
А з ёю змрочных сценяў карагод.

Ва мне ты бачыш полымя згасанне
Пад прыскам юных, перабытых дзён.
І там, дзе меў нядаўна сілкаванне,
У шэры попел пераходзіць ён.

Зважай на ўсё, каб узмацніць любоў,
Пакуль апошні час твой не прыйшоў.

74

Калі абвесцяць мне прысуд такі,
Які за ўсе на свеце найцяжэйшы,
Хай будуць помнікам маім радкі
Апошняга напісанага верша.

Калі пачнеш ты іх чытаць калі,
Ў іх знойдзеш тое, што тваё па праву.
А рэшта дастанецца хай зямлі,
Бо для цябе яна і не цікава.

Табе у вершах прысвячаю я
Усё найлепшае, што мае сэрца.
А абалонка грэшная мая,
Зямля, няхай зямлі і дастанецца.

Ёй — прах і тлен, сядзіба чарвякова,
Табе — любоў майго жывога слова.

75

Ты для мяне мацунак лепшы мой,
Як дождж, што ніве смаглай дасць напіцца.
Шчаслівы я каля цябе, з табой,
Як сквапны скнара ля сваёй скарбніцы.

Яму уцеха, што багацця шмат,
Але і страх зладзейскае напасці.
А я не толькі быць з табою рад,—
Хачу, каб свет увесь глядзеў на шчасце.

Тады я задаволены зусім,
Калі са мной ты дзеліш асалоду.
Сустрэць я прагну твой пагляд сваім,
Хоць не заўсёды ён дае лагоду.

Так і вядзе няспынна час мяне:
То маю ўсё, то анічога не.

76

Чаму я не пішу на новы лад,
Не маю ў вершы модных завіхрэнняў?
Чаму мой верш ідзе за радам рад
Без хітрамудрых словаспалучэнняў?

Пішу аднолькава заўсёды я,
Ў старым адзенні ўсе мае лятункі.
У вершах словы — як пячаць мая:
Без подпісу мае пазнаюць думкі.

А ўсё таму, што я пішу ізноў,
Мая любоў, з твайго усё натхненне.
Якіх бы слоў сардэчных ні знайшоў,—
Не зменіць думкі новае адзенне.

Нам так і сонца: штодня маладое,
Хоць з прадвякоў яно адно і тое.

77

Пакажа люстра, як краса знікае,
Гадзіннік плынь імклівую хвілін.
А гэта белая старонка мае,
Як скарб, усё, што ў першым і другім.

Нам нагадаюць зморшчкі ў шкле люстраным
Дарогу, што на могілкі вядзе.
А стрэлкі часу — як бесперастанна
Ён па-зладейску ў нябыт ідзе.

Каб думак шчырых не згубіла памяць,
Ты запішы, і я іх запішу.
Як дзеці родныя, яны устануць,
Нам дапамогуць лепш пазнаць душу.

З старонкі кожнай скарб нам прамяніцца,
А ў кнізе добрай — цэлая скарбніца.

78

Цябе так часта я у вершах клікаў,
Твой вобраз так мне добра дапамог,
Што спевакоў другіх кагал вялікі
Пачаў цябе ўслаўляць, як толькі мог.

І вочы, што наўчылі пець нямога,
А невукаў — узняцца у прастор,
Мастацтва здольных збольшылі намнога,
У крылле ім далі багата пёр.

А ўсё ж ты мусіш мною ганарыцца:
Мае ўсе творы створаны з табой.
Калі ў другіх твой вобраз прамяніцца,
Дык у маіх — жыве з усёй красой.

І тое, што несамавітасць піша,
Тваёй рукой узведзена на ўзвышша.

79

Пакуль адзін я піў з твае крыніцы,—
Зіхцелі вершы дзіўнай пекнатой.
Але цяпер ім суджана зацьміцца,
А музе — месца саступіць другой.

Я згодзен: варты вартага і варты,
Але што б іншы ні стварыў пясняр,
Ён толькі аддае, што вінаваты,
Ён доўг дае, а не прыносіць дар.

Калі пачне тваю ён славіць цноту,
Дык, значыцца, крадзе ў тваіх жа дзей.
Красу ён славіць — зноў маленькі клопат:
Прыносіць дар, які ў цябе ж крадзе.

Не думай дзякаваць за «пахвалёны»,
Бо сам сабе заплаціш доўг ягоны.

80

Я спраняверыўся ў сабе зусім,
Калі падумаю, які мастак
Складае творы з іменем тваім,
Бо не магу зраўняцца з ім ніяк.

Твая душа — як мора шырынёй,
На ім прастор для ўсякіх ветразей:
І карабель ідзе сваёй хадой,
І човен мой не менш рызыкаўней.

Ты толькі можаш зратаваць мяне,
Бо човен мой — нядужы і стары.
А той плыве бяспечна праз віры,
Таго ніяк пагібель не кране.

Калі я згіну ўсё-ткі ў акіяне,—
Мая пагібель праз каханне стане.

81

Хоць да мяне памрэш ты, хоць пазней,
Калі ў зямлі мае сатлеюць косці,
Ніяк не згасне бляск тваіх вачэй,
Твой вобраз чараўнічай прыгажосці.

Бяссмертным зробіцца тваё імя,
Калі навекі згіну я аднойчы.
Звычайнай будзе могілка мая,
Красе тваёй — усе людскія вочы.

Твой вечны помнік — мой сардэчны верш,
Для нашых дзён, для часу, што настане,
Для тых людзей, з якімі ты жывеш,
Для тых, што прыйдуць пасля іх згасання.

Так, як дыханне з роду ў род ідзе,
Ты будзеш жыць на вуснах у людзей.

82

Не заручоны з музаю маёй,
Ты можаш быць паблажлівым для тых,
Што кожны твор табе прысвеціць свой,
Благаславення просячы для кніг.

Каб славіць розум, прыгажосць тваю,
Мой талент вельмі сціплы і малы.
А новы час, на сілу ўсю сваю,
Нясе табе багата пахвалы.

Але калі ад новых спевакоў
Пачуеш красамоўны іх тандэт,
Тады ацэніш праўду шчырых слоў,
Якія даў ад сэрца друг-паэт.

Малюнкі іх — як нежывыя ўсе,
А вобраз твой — радня самой красе.

83

Я думаў, што красе тваёй цудоўнай
Ніякіх штучных не патрэбна фарб
І што паэт наўдачу мерай роўнай
Аддасць табе пазычаны ім скарб.

Таму і размаўляў я цераз зубы,
Чакаючы, каб пекната сама,
Устаўшы, свету давяла ўсяму бы,
Што лепшай, чым твая, нідзе няма.

Але за грэх маё маўчанне ўзята.
Тым часам модныя ўсе песняры,
Намераў добрых маючы багата,
Цудоўны скарб хаваюць да пары.

Жыцця ў вачах ты маеш больш, чым гэта
Маглі бы выказаць і ўдвух паэты.

84

І хто больш красамоўны? Той, які,
Абмежаваўшыся найбольшай хвалай,
Сказаў, што ты — якраз, як сам, такі,
Бо скарбу большага на свеце не бывала.

Той бедны верш, які не дадае
Пры апісанні слова ці другога.
Затое збольшыць вартасці свае,
Хто скажа: «Ты падобны на самога!»

Калі праўдзіва апісаць, як ёсць,
Усё, што створана самой прыродай,—
Дзівіцца будзе свет на прыгажосць,
Здзіўленнем дасць паэту ўзнагароду.

Але і небяспека ёсць ва ўсім:
Каб не перахвалілі разам з тым.

85

Прыціхлі з музаю мы, як нямыя,
Тым часам плойма модных песняроў,
Пабраўшы ў рукі пёры залатыя,
Да кучаравых прылягла радкоў.

Пакуль яны грымзоляць спрытна словы,
Я думы думаю свае адзін
І, як дзячок да псалмаў адмысловых,
Да гладкапісаў дадаю: «Амін!»

Пачуўшы хвалу, пасылаю кожнай:
«Але!», «Папраўдзе, так!», «Во гэта — верш!» —
Хоць так пачуцці выказаць няможна,
Любоў к табе я выкажу найлепш!

Цані за пуставейнасць спевакоў,
Мяне — за думкі ціхія, без слоў.

86

Цікава б знаць, паэзіяй сваёй,
Што на ўсіх ветразях нясе імкненні,
Спыніў ён лёт фантазіі маёй
І пахаваў у месцы нараджэння?

Ці самы ён, каго якісьці дух
Вучыў ствараць пачварныя стварэнні.
Ці, аб'яднаныя, яны удвух
Мае пазабівалі летуценні?

О, не! Ні ён, ні ўсе дарадцы з ім
Маёй паэзіі забіць не могуць!
Ён, са сваім дарадчыкам начным,
Мяне жудой сваёй не перамогуць!

Але, як ты яго ўзнёс да нябёс,
Я страціў тое: што у сэрцы нёс.

87

Бывай! Цябе ніяк я не стрымаю,
Занадта ты, любоў, любіма мной.
Цябе з сваёй вязніцы вызваляю,
Сам развітаўшыся з тваёй турмой.

Як я ўладаў дарункамі тваімі
І дзе заслугі для такіх дароў?
Калі любоў назад усё адніме,
Якое б права, каб не даць, знайшоў?

Дарыла ты мне безрахубна скарбы,
За што — не ўцямлю да сяе пары.
Вялікі грэх я на душу узяў бы,
Каб не вярнуў табе твае дары.

Я над табой нібыта ў сне ўладарыў.
Калі прачнуўся — знік і след ад мараў.

88

Калі мяне знялюбіш ты зусім,
На ўсё маё нядобрым вокам глянеш,
Я пагаджуся з выракам тваім,
Сам на сябе я выйду на змаганне.

Свае пахібы ведаючы ўсе,
Супроць сябе магу сказаць такое,
Што мне бяды багата прынясе,
Яшчэ вастрэй тваю наточыць зброю.

І, зрэшты, буду ў выйгранцы і я:
Хоць у змаганні пацярплю я страту,
Памогшы перамозе, удвая
За ўсе выдаткі атрымаю плату.

Я так люблю цябе, што без дакора
Гатоў прыняць якое згодна гора.

89

Скажы, што ты знайшла ў мяне загану,
Прыйсці з якой і здрадзе балазе,
Скажы: кульгавы я. Адразу стану
Кульгаць сумысна на адной назе.

Не знойдзеш слоў ты, каб мяне пакрыўдзіць,
Такіх, як сам я на сябе знайду.
Як ты жадала, перамена прыйдзе
Табе на радасць, на маю бяду.

А знаючы, табе што даспадобы,
Парэжу дружбы нашай ніці ўсе.
І што калі між намі ні было бы,
Няхай няпамяць пылам разнясе.

Супроць сябе я на змаганне стану:
Мне вораг той, табе хто не жаданы.

90

Калі знялюбіш — знелюбі хутчэй,
Пакуль мне свет рыхтуе ўкрыжаванне.
Ліеш мне горыч — налівай паўней.
Страшней за ўсё чаканне пакарання.

Цяжкое гора пасылае лёс,—
Не трэба і табе з сваім пазніцца.
Навошта б золак мне імжу прынёс,
Калі ўсю ноч грымела навальніца?

Пакінь мяне, ды не ў апошні час,
Калі ушчэнт закатуюць нягоды.
Раптоўна кінь, каб праглынуў я ўраз
Свой горкі жаль ад найвялікшай шкоды.

І што нягоды дробныя тады,
Калі цябе губляю наўсягды?

91

Той ганарыцца талентам, багаццем,
Паходжаннем, той знатным сваяком,
Той модна скроеным, дзівосным плаццем,
Той сокалам, стаеннікам ці псом.

І кожны так: шукаючы, знаходзіць
Усё, што радасць для яго нясе.
Маё ўсё шчасце ў гэткай асалодзе,
Ў якой сабраны іншыя усе.

Твая любоў мне даражэй багацця
І гонару вяльможнага мілей.
З ёй не зраўняцца самай пышнай шаце,
Яна за слодыч нават прыямней.

Ты, адабраўшы гэты скарб знянацку,
Мяне заручыш з доляю жабрацкай.

92

Ніяк не здзейсняцца твае жаданні:
Маёй ты будзеш да апошніх дзён.
Жыццё маё залежыць ад кахання:
Канец кахання дасць мне вечны сон.

Чаго баяцца горшае напасці,
Калі найменшая прыводзіць смерць?
Маё няшчасце — можа, ў ім і шчасце —
Твайго гумору змены ўсе цярпець.

Калі жыццё залежнае такое,
Чаго ж мне добрага чакаць ад здрад?
З каханнем я і з вечным супакоем
Цяпер аднолькава спаткацца рад.

Але з дабра бывае нам і ліха:
Ты можаш здрадзіць. Здрада ходзіць ціха.

93

Я жыў бы так, як ашуканы муж,
Які цябе любіць не перастане.
Кахання цень здаваўся бы яму ж,
Нібыта як сапраўднае каханне.

Не бачу змен у позірку тваім,
У ім няма варожасці ніякай.
Не так, як на абліччы дзе-якім
Накрэслены усіх злачынстваў знакі.

Ты, з ласкі неба, што ад нас вышэй,
На твары маеш пекнаты зіхценне.
Што б ні было на сэрцы, а з вачэй
Заўжды свіціцца яснае праменне.

Красой ты яблык Евы нагадала б,
Каб цнота выгляду адпавядала.

94

Хто не пакрыўдзіў слабага нічым,
Не назаляў уладаю нікому,
Ўзрушаў хто іншых, сам жа разам з тым
Халодны быў, як камень нерухомы,—

Той ад жыцця найлепшы мае дар,
Узбагаціць яго сваёй ашчадай,
Той над сабою поўны гаспадар,
Для ўсіх другіх — узор ён і парада.

Належыць лету водар летніх квет,
Хоць кветка тая пацвіце і звяне.
Калі ж загана ў ёй праложыць след,
Нат пустазелле прыямнейшым стане.

Дзядоўнік сэрцу нашаму мілей,
Чым водар цвілых і гнілых лілей.

95

Якой красой, прывабнасцю якой
Ад воч людскіх грахі твае схаваны!
Ды, як на ружы плямачкі пад тлёй,
І на табе застаўся след заганы.

Маўчаць не змусіш ты людскі язык,
Ён так змяшае праўду і няпраўду,
Што, як, здаецца б, грэх ні быў вялік,
Хвалой табе адразу загучаў бы.

Які даеш палац дзівосны ты
Для той спакуснай і распуснай змусты!
Пад засенню цудоўнай пекнаты
Становіцца прывабнаю распуста.

Ды не забудзься, што іржа, на жаль,
З людской нядбайнасці, знішчае сталь.

96

Адны — віну кладуць на маладосць.
Не хочуць бачыць той віны другія.
А ўсе твае грахі і прыгажосць
Кахаюць маладыя і старыя.

Падобна, як тандэтны самацвет
Зіхціць зырчэй на пальцы у царыцы,
За дабрадзейнасць грэх прымае свет,
На ўсё благое можа ён забыцца.

Як спрытна статак воўк бы пратрос,
Каб мог з'явіцца ў выглядзе ягняці.
Як пакараў бы закаханых лёс,
Каб ты надумала зачараваць іх!

Так не рабі! Ты так любіма мной,
Што й гонар твой я падзялю з табой.

97

Якой зімой здаваўся мне той час,
Пакуль цябе не бачыў я, мой дружа:
І Дзед Мароз хадзіў навокал нас,
І дні і ночы ускрывала сцюжа.

А сапраўды, было каля жніва,
Калі свой плён ледзь восень паднімае,
Нібыта тая сумная ўдава,
Што ад вясны цяжар вялікі мае.

Ды для мяне патомства ўсё яе
Здавалася сям'ёй асірацелай,
Дзе ты — мне там і лета настае,
Цябе няма — і птушка б не запела.

Калі ж пачне — то цыркне, то замоўкне,
Ад песень тых і ліст на дрэвах жоўкне.

98

Вясной мы разышліся, ў той пары,
Калі з'явіўся красавік вясёлы,
Калі і ён, і бог Сатурн стары
З вясной спявалі і вадзілі кола.

Ні птушак спеў, ні водар веснавой,
Найлепшай самай, зіхатлівай краскі
Не ўзялі ўсё ж ткі ўлады нада мной,
Не памаглі ствараць і баяць казкі.

Не захапляў мяне ружовы цвет,
Не мілаваўся я лілейным цветам,—
Усё найлепшае, што мае свет,
На ўзор цябе і створана сусветам.

Хоць пачуваўся я, нібы зімой,
Я ў кветках бачыў вобраз ясны твой.

99

Фіялцы ранняй кінуў я дакор,
Што водар свой яна ў цябе украла,
Што сінь вачэй ўзяла ў цябе на ўзор
Для ўсіх валошак і для ўсіх фіялак.

Лілеі ўзялі белізну сваю
Ад рук тваіх, вынежных, незраўнаных.
Я сорам руж ніяк не утаю:
Ў цябе ўсе барвы іхнія забраны.

Адна ў дадатак да ўсяго ўзяла
І водар дзіўны ад твайго дыхання.
Затое кару жорсткую знайшла:
Ад слімака яна напэўна звяне.

І колькі б кветак я ні бачыў дзе,—
Што-небудзь кожная ў цябе крадзе.

100

Дзе муза? І чаму маўчыць яна
Аб тым, хто даў усю магутнасць ёй?
Ці, можа, ля чужога дзе акна
Складае спеў нікчэмнасці якой?

Вярніся! Стань і спевам адплаці
Таму, хто даў натхненне ў лепшы верш,
Мастацтва даў, што нас вядзе ў жыцці,
Дзеля якога ў свеце ты жывеш.

Уважна ўгледзься ты ў яго чало.
Калі заўважыш зморшчкі дзе на ім,
Паўстань на час, на ўсю няпраўду, зло,
А за разбой — кляймі пяром сваім.

Праслаў хутчэй адвечную красу,
Пакуль не ўзняў час серп свой і касу.

101

Гарэзніца! Нашто марудзіш ты,
Не нарысуеш любага майго
З усім дабром, з зіхценнем пекнаты,
Чыё святло і на цябе лягло?

Ты адкажы: няўжо, на твой пагляд,
Не трэба цноце аніякіх фарб,
А алавок няўжо зусім не варт
Увекавечыць гэты дзіўны скарб?

Няўжо краса тады і прыгажэй,
Калі яе красой не назавеш?
Хоць залаты ёй створаць маўзалей,
А вечнасць дасць ёй твой цудоўны верш.

Каб час наступны бачыў прыгажосць,
Ягоны вобраз дай такім, як ёсць.

102

Люблю, але, бадай, маўчу пра тое,
Люблю мацней, а скажа хто — слабей.
Той прадае пачуцце залатое,
Хто пра любоў крычыць ля ўсіх дзвярэй.

Пачатак быў і ў нашага кахання,
Цябе вітаў я песняю сваёй,
Як Філамель, ад змроку да світання,
Пакуль не прыйдзе лета за вясной.

І не таму, што лета горш прадвесні,
Калі ноч моўкла, слухаючы спеў.
Увосень лес увесь спявае песні,
Акорды дзікія злятаюць з дрэў.

Замоўк і я, падобна Філамелі,
Каб песні ціхія прывабу мелі.

103

Якая муза бедная мая,
Калі ёй трэба праспяваць аб тым,
Хто лепш хваленняў нашых удвая
У натуральным выглядзе сваім.

Не дакарай, калі замоўкнем з ёй.
У люстра глянь. Аблічча ўбачыш там,
Якое надзвычайнай пекнатой
Вышэй таго, што я даваў ці дам.

Вялікі грэх прыняў бы на душу,
Сваёй хвалой заблоціўшы красу.
Я вобраз твой не ў вершы запішу,
Я лепш яго у сэрцы пранясу.

Папраўдзе, люстра больш табе дае,
Чым творы могуць перадаць мае.

104

Ты для мяне старэйшаю не станеш,
І ў першы дзень, і сёння — ты адна,
Хоць тры зімы зрывалі з дрэў убранні,
Якія ім прыносіла вясна.

Хоць тры вясны змяніліся на леты,
За летам восень жоўтая ішла,
Быў тройчы красавік вясной сагрэты,—
А ты — ўсё, як і ў першы дзень, была.

На жаль, краса знікае пакрыёма,
Як нікне цень ад сонечных гадзін.
Прывабнасць, што здаецца нерухомай,
Нябачны вокам мае рух адзін.

Пакуль яшчэ ты не была на свеце,
Быў росквіт і заход у кожным леце.

105

Любоў мая не ідалапаклонства,
А мой каханы ідалам не ёсць,
Хоць пра яго, яму пяю бясконца,
Ягоную ўслаўляю прыгажосць.

Сягоння, заўтра, ён усё прыгожы,
Ён будзе вечна ў харастве такім.
Таму і верш мой без яго не можа,
Пяе пра аднаго, жыве адным.

Краса, Прыязнасць, Цнота мне так любы,
Красу, Прыязнасць, Цноту слаўлю я.
Яны — як кола, у якім я ўсюды
І у якім уся любоў мая.

Красу, Прыязнасць, Цноту — ўсе тры сілы
Жыццё шчасліва ў ім адным злучыла.

106

Калі у хроніках старых часоў
Чытаю я пра рыцараў і лэдзі,
Якія зналі харство, любоў,
Жылі, змагаліся, ўміралі недзе,—

Тады здаецца, што у спробах тых
Сказаць пра рукі, ўсмешкі вуснаў, вочы
Найлепшы кожны з песняроў старых
Намаляваць твой дзіўны вобраз хоча.

Ты — надзвычайны харства узор.
У творах іх — твой цень адлюстраваны:
Цябе не бачыўшы, хто даў бы ў твор
Твой чараўнічы вобраз незраўнаны?

А мы, сучаснікі, хоць бачыць можам,
Сказаць не можам добра аб прыгожым.

107

Ні прадчуванні, ні прарочы дух,
Што адкрывае дзень наступны свету,
Не ведаюць, не скажуць, ці дайду
З табой, любоў, да вызначанай мэты.

Як месяц пройдзе праз зацьменні ўсе,
З сваіх прароцтваў Аўгур сам смяецца.
Наступны дзень зямлі ўсёй мір нясе
Пад засенню алівавага вецця.

Так і любоў мая: ў вянку надзей
У вечнасць пройдзе цераз верш сардэчны.
Смерць страшнай можа быць для тых людзей,
Якія з цемры не выходзяць вечна.

Мой горды, непакорны, шчыры верш,—
Ты дэспатаў усіх перажывеш!

108

Што б я ў памяці людской знайшоў
Не скарыстанае табе на хвалу?
Што новае сказаў бы пра любоў,
Каб і цябе найлепей праслаўляла?

Нічога, пэўна! Як у днях былых,
Калі мы толькі стрэліся з табою,
«Любі-мая» — гучыць з радкоў маіх
На новы лад малітваю старою.

Любоў адвечную і новую прытым
Не скрыўдзіць час і не закрые пылам,—
Лістом паперы стане ён рудым,
Каб запісы на ім свае рабіла.

Што нам любоў дала у першы раз,
Жыць будзе вечна, нават і без нас.

109

Ты не кажы, што сэрца ў паняверцы,
Хоць зменшыўся агонь, напэўна, ў ім.
Мая душа ў тваім бытуе сэрцы,
З ім разлучыцца — як з сабой самім.

Кахання дом! Пасля ўсіх вандраванняў
Такім, як быў, страчаюся з табой,
Каб ганьбы след пры першым жа спатканні
Адмыць сваёй гарачаю слязой.

Хоць, як усе, і я з крыві і плоці,
Але не вер ніколі тым усім,
Што мог бы я сваё сумленне зблоціць
І не вярнуцца да цябе зусім.

На свеце радасць мне адна ты, цвеце?
Што без цябе мне ў тым прасторным свеце?

110

На жаль вялікі, гэта не мана!
Блукаў я скрозь, дзе варта і не варта.
І стала мне, як блазнюку, цана,
Сама любоў мне стала нібы жартам.

Папраўдзе, так: я крыва, ўперакос
Глядзеў на ўсё, што добрага бывае.
Ды лёс мяне праз хібы ўсе пранёс,
Ты зноў мне любай стала, дарагая.

Я ні грахоў, ні праўды не таю,
Няхай спакуса сэрца не трывожыць.
Сябе навек табе я аддаю,
А бог кахання хай мне дапаможа,—

Каб прытуліла да сваіх грудзей,
Каб неба стала для мяне бліжэй.

111

Я згодзен з тым, што доля мне не маці.
Яна на мне паставіла пячаць:
Прымусіла цяжкой штодзённай працай
Для існавання сродкі зарабляць.

Як фарбавальшчык сам афарбаваны,
Таксама я адзначан рамяством.
Каму пашана, а каму загана
Адным і тым жа выбіта кляймом.

Ты памажы пазбыцца мне хваробы.
Я воцат вып'ю, ўсё, што скажаш ты.
Я не адмоўлюся, абы дапамагло бы,
Ад самай найгарчэйшай гаркаты.

Мая любімая! Найлепшай рады
Я дачакаўся б ад тваёй спагады!

112

Твая спагада і замілаванне
Прыкрыюць след ганебнага кляйма.
Мне абыякавым цкаванне стане,
Пакуль са мною будзеш ты сама.

Твае пахвалы ці твае дакоры
Мне прынясуць патолю або жаль.
Ты для мяне адна ва ўсім прасторы,
Я пры табе, як закаваны ў сталь.

Я ад сябе адкінуў так далёка
Ўсё, што ліслівасць ці хлусня вядзе,
Каб іх і следу не было навокал,
Каб іх не бачыць, не пачуць нідзе.

Пануеш ты адна ў мяне на сэрцы,
Мне без цябе ўсё нежывым здаецца.

113

Пасля разлукі — зрок мой стаў у сэрцы,
А вочы быццам як чужыя мне.
І ўсё, што можа мне цяпер сустрэцца,
Мяне нераспазнаным абміне.

Нібы відушчы і сляпы нібыта,
Глядзіць на свет збянтэжаны пагляд,
Забыты кветкі, птушкі ўсе забыты,
А ува ўсім твой вобраз вінават.

Якія б дзе я рэчы ні пабачыў,—
Усё з тваёй нітуюцца красой.
Варона крача, галубок заплача,
Застогне мора — ўсюды вобраз твой!

Табою поўны, я не здольны цяміць
Таго, што звыш мая прыносіць памяць.

114

Няўжо, хвалой тваёю увянчаны,
Атруты царскай — лёстак — выпіў я?
Ці чараўніцтва талент надзвычайны
Дала на долю мне любоў мая?

Дакуль сягнуць яго праменне можа,
Стварае ён узоры пекнаты.
З істот пачварных ангелаў прыгожых
Стварыць ён можа — гэтакіх, як ты.

Праўдзіва першая прычына — лёсткі,
І розум прагна трунак гэты п'е.
А вочы келіх наліваюць порстка —
Яму да смаку і самім сабе.

Калі атрута — лёс даруе грэх ім,
Пакаштаваць — ім давялося першым.

115

Хлусіў я у сваіх ранейшых песнях,
Што нельга мне цябе любіць мацней.
Не ведаў я, што полымя прадвесні
Магло пасля гарэць яшчэ зырчэй.

Калі гляджу я на падзеі часу,
Дык бачу, што выпадкаў міліён
Разлучыць тых, хто б век не разлучаўся,
Нязломны самы выкрасліць закон.

На жаль, спалохаўшыся тых здарэнняў,
Я не сказаў тады як мае быць:
Сумненне мне не прынясе збавення,
А я люблю, як нельга больш любіць.

Любоў — дзіця. Дадаць бы варта тое:
Яна расце, як і усё жывое.

116

Не будзем шкодзіць злуцы сэрцаў двух;
Любоў любоўю звацца не павінна,
Калі яна мяняецца ад скрух
Або ў якую чорную гадзіну.

Любоў — маяк у часе навальніц,
Яна, як зорка, з цёмнай хмары гляне
І караблю з грымот і бліскавіц
Пакажа шлях надзейны ў акіяне.

Любоў не мерыцца на тыдні, дні,
Яна бясконца, як жыццё на свеце,
Хоць можа час ружовыя агні
Згасіць на ёй, як на ружовым цвеце.

Як хто б няпраўду слоў маіх давёў,
Дык не існуе, значыцца, й любоў.

117

Абвінаваць мяне ва ўсіх грахах,
Калі такое маеш ты жаданне,—
Што станавіўся на ганебны шлях,
Не праслаўляў я нашага кахання;

Што далучаўся да такіх сяброў,
Якія з добрым словам незнаёмы,
І што па волі чатырох вятроў
На ветразях усіх ішоў ад дому.

Каб грэх мой цяжкі стаў яшчэ цяжэй,
Маю сваволю кінь на тыя шалі.
Глянь строгім поглядам тваіх вачэй,
Абы на смерць мяне не пакаралі.

Пераканацца толькі меў на мэце,
Якую моц каханне мае ў свеце.

118

Мы ужываем вострыя прысмакі,
Каб апетыт узняўся да яды.
Мы зелле п'ём ад ліхаты ўсялякай,
Каб асяродак чыстым быў заўжды.

Вось так і я, з твайго замілавання
На сэрцы меў лагоду і спакой.
Калі хварэў, дык праз сваё жаданне
Змагацца з выдуманай ліхатой.

І захварэў урэшце не на жарты,
Лякарствы горкія адважна п'ю.
А што было ва мне пашаны варта,
Пакіне з лекамі душу маю.

Уцяміў я: атрутай стануць лекі,
Калі любоў пакіне чалавека.

119

Пітвом з сірэніных пякельных слёз
Я упіваўся, мабыць, неаднойчы.
На страты мне журбу прыносіў лёс,
Над выйгрышам з арбіты лезлі вочы.

Якіх памылак не было ў той час,
Калі я чуў сябе ў вяршыні шчасця:
То, як у трасцы, жар апошні гас,
То зноў палаў агнём шалёнай страсці.

Дабра ў благім тады я не знайшоў:
Нядоля робіць добрае найлепшым.
Калі з разлукі вернецца любоў,
Яна намнога стане трывалейшай.

Так пасля страты зноў знаходзіў я
Сваё багацце большым утрая.

120

Твае пакуты нас ізноў з'ядналі.
Ад гора сам я гнуўся у дугу,
Бо нерваў мне са сталі не кавалі,
Іх раўнаваць да медзі не магу.

Калі твой смутак, што дала разлука,
Падобны быў ці быў такі, як мой,
Дык ведаю, з якой пякельнай мукай
Хадзіла ты сцяжынкаю сваёй.

А я, тыран твой, не знайшоў і часу,
Каб хоць узважыць зла твайго цяжар.
Нашто ж адчай над намі разаслаўся,
Закрыў журбой сваёй увесь абшар?

Я адпусціўся на ўсё благое.
Павінны ж адпушчэнне даць абое.

121

Лепш быць благім, чым, не бываўшы ім,
Цярпець бязвінна ўсякія напасці.
Няма ніякай радасці і ў тым,
Калі нам нехта вызначае шчасце.

Як можа чый разбэшчаны пагляд
Мной кіраваць, маёй крывёй імпэтнай?
Я грэшны? — Так! Але грашней наўрад,
Чым вы, шпікі, з сваёю апраметнай!

Я — гэта я. А вы учынак мой
Сваёю мерай мерыце старанна.
Калі суддзя — гарбун, дык за суддзёй,
З свайго жадання, я гарбатым стану?!

І не кажыце, што на свеце ўсім
Нікога добрага няма зусім!

122

Навошта мне дарунак твой — табліцы?
Нататкі ўсе у памяці маёй.
І так запісаны, што ім скрышыцца
Прыйшлося б толькі разам з галавой.

Ты будзеш жыць аж да тае часіны,
Пакуль дарэшты знішчыцца, на тло
Усё, што да цудоўных успамінаў
Скарбніцаю надзейнаю было.

Калі нататкам шчырага кахання
Такія сховы давялося мець,
Няхай лепш некаму дарункам стане
Табліц халодных мармур або медзь.

Хто хоча мець для памяці дарункі,
Не верыць той у моц уласнай думкі.

123

Не спадзявайся, час, што я інакшы!
Ўсе піраміды — цуд малы зусім.
На новы лад стар'ё паніцаваўшы,
Як дасягненнем, хвалішся ты ім.

Наш век кароткі. Дзіва ў тым якое,
Калі стар'ё за навіну даеш.
Здаецца нам, і мы ствараем тое,
Што створана ў мінулым часе лепш.

Навошта мне усе твае табліцы?
Мінулыя і сённяшнія дні
Ты апрануў такою небыліцай,
Што не адрозніш праўду ад хлусні.

Я кляўся ў тым, што быў і буду верным,
А на цябе увагі мы не звернем.

124

З адной калыскі шчасце і няшчасце,
Ды ў іх няма аднолькавых дарог:
Ці можна кветкай у вянок папасці,
Ці пустазельнай былкаю ў быльнёг...

Любоў мая няпэўнасці не знае,
Багацце ёй не прынясе бяды.
Яна палітыканаў абмінае
І пагарджае імі заўсягды.

Навошта ёй такія мудрагерцы,
Якія твораць на кароткі час?
Любоў жыла і будзе жыць у сэрцы,
Ў якім агонь сумлення не пагас.

А тыя ўсе бязглуздыя стварэнні
Сваёю смерцю нам дадуць збавенне.

125

Навошта мне дурацкая пашана
Цягаць над некім нейкі балдахін?
Нашто для вечнасці старацца стану,
Калі яна не йдзе далей руін?

Не бачым мы, як падхалімаў зграя
У панскі кут паўзе на жываце?
І хлеб здаровы на прысмак мяняе,
Як быццам шчасце з гаркаты расце?

О, не! Дазволь твайму аддацца сэрцу,
Прымі мой бедны, але вольны дар,
Які не быў у рабскай паняверцы,
І стань яму, як я табе, ўладар.

Прэч стукачоў! Для чыстага сумлення
Не страшны ні паклёпы, ні ганенні.

126

Мой любы хлопчык! Ты адзін-адзіны
Кіруеш часам, лічыш нам хвіліны.

Пакуль расцеш і прыгажэеш, вяне
Тваіх прыхільнікаў замілаванне.

Калі табе ўладарніца-прырода
Не хоча даць у час наступны ходу,

Дык для таго, каб хітрасцю такою
Спыніць яго уладу над табою.

Высцерагайся ты яе усё ж ткі,
Пашкадаваўшы, пакарае жорстка:

Аддасць цябе, як толькі прыйдзе рата,
Яна без жаднай літасці ў адплату.

127

Красунямі не зваў ніхто чарнявых,
Хоць сапраўды яны красуні ёсць.
Каму і хто даваў на свеце права,
Каб занядбаць такую прыгажосць?

Ад тых часін, калі красу прыроды
Нам падмяняюць фальшам штучных фарб,—
Як безназоўная, жыве урода,
Як занядбаны і забыты скарб.

Дык вось чаму і зрок маёй каханай
Пад колер грудановага крыла,
Нібы жалобаю па тых убраны,
Над кім падробка ўладу узяла.

Любоў мая ў жалобе так прыгожа,
Што не адна захоча быць такой жа.

128

Калі ты, музыка душы маёй,
Абудзіш струны музыкай дзівоснай
І ўсе лады пакорна пад рукой
Пачнуць схіляцца,— як жа мне зайздросна!

Зайздрошчу я і струнам і ладам,
Што ў пераборы ходзяць, як у танцы.
І ад спакусы чырванею сам,
Калі яны твае цалуюць пальцы.

Каб гэта доля дасталася мне —
Адчуць рукі пяшчотнай ласкатанне,
Калі яна струну узварухне
З пачуццем ласкі, шчырага кахання!

Калі ім так пашэнціла — няхай!
Аддай ім рукі, вусны — мне аддай!

129

Распуста не прыносіць духу гонар.
Пакуль не задаволена яна,—
Парушыць клятву, пазнаёміць з горам,
Абразіць, схлусіць, высмакча да дна.

Сваё спагоніць — як яе адверне.
Ізноў мы гонімся, калі міне.
Апошні розум страціць, хто хоць зерне
Спакуслівай прынады той глыне.

Як утрапёная да мэты мкнецца
І мэтай служыць для людзей сама.
У пошуках прывабліваў здаецца,
У адшуканай — радасці няма.

Ніхто ж не адмаўляецца ад раю,
Цераз які у пекла ён трапляе!

130

Да зорак не падобны любай вочы,
Каралі — шмат за вусны чырваней,
Не златакосая — пад колер ночы,
А снег — бялей смугі яе грудзей.

Не параўнаць яе да руж дамаскіх,—
Бяднейшы колер твару, на руках,
І больш прыемны водар маюць краскі,
Чым ад яе духмяных вуснаў пах.

Люблю я вельмі слухаць голас мілай,
Ды ўцехі больш мне музыка нясе.
Не знаю, як багіня дзе хадзіла,
Яна ж звычайна ходзіць, як усе.

І ўсё ж, клянуся, над яе на свеце
Не адшукаеце нідзе кабецін!

131

Ты, як красуні ў нашым свеце ўсе,
Ўладарнасцю сваёй тырану роўна.
Ты ведаеш, што я ў тваёй красе
Найдаражэйшы бачу скарб цудоўны.

Няхай гавораць, што смуглявасць шчок
Не створана для палкага кахання.
Глынуўшы моўчкі пры людзях папрок,
Я з ім адзін спрачаюся дазвання.

Клянуся я з адданасцю усёй
І уздыханнем клятву падмацую,
Што са сваёй смуглявай пекнатой
Ты прыгажэй за ўсякую другую.

Ты не смуглявасцю чарней за ўсіх —
Чарней душою і у дзеях злых.

132

Люблю я вочы чорныя твае,
У іх, спачуццем да мяне, жалоба.
І хоць спакою ў сэрцы не стае,
Яно развеяць смутак мой магло бы.

Ні сонца яснае на ўсходзе дня,
Ні на заходзе зорка Мілавіца —
Табе і напалову не раўня,
Калі жалоба ў вочах прамяніцца.

О, каб ты сэрца апрануць магла
Такім пакровам смутку і самоты
І каб спагадай да мяне была
Уся твая цудоўная істота!

Пакляўся б я, што харство ўсё — чорна,
Няма нідзе красы з тваёю роўнай!

133

Я праклінаю сэрца, што нясе
Для нашых сэрцаў смутак нечуваны.
Ці ж не здаволілі цябе усе
Мае пакуты і цяжкія раны?

Мяне забраўшы ў самаго сябе,
Твае бязлітасна караюць вочы.
Калі ж і друга страціў, і цябе,—
Дык, значыцца, я пакараны тройчы.

З якім я горам толькі не знаём!
Тваё імя мне стала як вязніца.
Дазволь для друга быць вартаўніком,
Калі пры мне стаіш ты вартаўніцай.

Не згодзішся ты з думкаю такой!
І так я твой, а ўсё маё — са мной!

134

Згаджаюся, што друг мой стаў тваім,
А я цяпер — як твой падданы быццам.
Яго жаданне — я ж існую ў ім! —
Каб ад цябе як-небудзь адлучыцца.

Не згодна ты, і ён, прызнацца, не:
Ты сквапная, а ён сумленны надта.
Ён — падпісаўшы вэксаль за мяне,
А ты — ліхвярскай прагнасцю абнята.

Цяпер цябе цікавіць не заклад,
Сама не ведаеш, чаго б там болей!
Я перад другам вельмі вінават,—
Цераз мяне ён трапіў у няволю.

Над намі ўлада поўная твая:
Ў няволі ён, без волі з ім і я.

135

Імя маё ў сабе нясе «жаданне».
Ў ім прага палкая, спакуса ў ім.
Прымі ў сваё салодкае ўладанне
Яго, каб аб'ядналася з тваім.

Няўжо ў такой раскошнай і цудоўнай
Не знойдзецца куточка для мяне?
Хоць мора цераз край вадою поўна,
Прыняць паток дажджовы не міне.

І ты, жаданняў маючы не мала,
Маё ў сваю скарбніцу прытулі,
Каб у цябе яшчэ іх болей стала,
А мы самотнікамі не былі.

Сваіх прыхільнікаў ніяк не крыўдзі,
Ў адзін струмень няхай з іх кожны прыйдзе.

136

Калі душа твая сварыцца стане,
Што набліжаеш да сябе мяне,
Скажы ты ёй, што я тваім жаданнем
Павінен быць, бо ім бываў раней.

Жаданні маюць права нарадзіцца,
Любімая, не згасла каб любоў.
Няхай кахання нашага скарбніцу
Яны ізноў напоўняць да краёў.

Я непрыкметны ў ліку іншых, можа,
Але адмовай сэрца не трывож.
Яно жаданнем палкім дапаможа
Пабольшыць слодыч і тваю усё ж.

Няхай ад імені любоў пачнецца:
Яго палюбіш, любым стане й сэрца.

137

Што натварыла ты са мной, любоў!
Мяне ты слепіш і сама сляпая,
Хоць вочы знаюць, дзе б красу знайшоў,
Замест дабра якраз благое маю.

Калі, збянтэжаны, ў затоцы я
Свой якар кінуў на такой мясціне,
Дзе карабель ідзе ля карабля,
Дык хто ж за гэта адказаць павінен?

Чаму для сэрца выбіты папар
Мог выдацца сядзібай самай вартай
І вочы мкнуцца пад няпраўдай мар
Схаваць ману ганебную упарта?

Відаць, што сэрца пры сляпых вачах
З хлуснёй згубіла свой праўдзівы шлях.

138

Мая любімая клянецца мне,
Што ўся яна з адной саткана праўды,
Каб, як юнак, паддаўся я мане,
Згадзіўся з тым, што так і ёсць сапраўды.

І мне паверыць хочацца тады,
Што маладым названы ёй не з жарту.
Хоць самыя найлепшыя гады
Мае цяпер і памінаць не варта.

Выходзіць так, што праўды ў нас няма.
Чаму ж не скажам, што яна — схлусіла,
А я — стары? Але ж любоў сама
У летуценнях толькі мае сілу.

Не любіць старасць пералічваць дні,
А недахопы топіць у хлусні.

139

Не растлумачвай гора ты майго,—
Твая няласка смутку ўся прычына.
Калі ты хочаш пакараць каго,
Дык языком карай, а не вачыма.

Скажы, што любым стаў табе другі,
Ды не глядзі так нежна на другога.
Нашто да гора дадаваць тугі,
Калі ў мяне і так яе замнога?

Табе вядома моц тваіх вачэй
І што ў тваіх вачах адлюстравана.
Затым адводзіш ад мяне хутчэй
Ты гэту зброю, што насекла раны.

Так не рабі! Ахвяра я амаль.
Дабі мяне, каб разам скончыць жаль.

140

Разумнай будзь у жорсткасці самой,
Мяне сваёй пагардай не карай,
Каб не прымусіў смутак горкі мой
Сказаць пра найгарчэйшы мой адчай.

Скажы, што любіш, хоць не любіш больш,
Скажы, як доктар хвораму, калі,
Каб супакоіць прадсмяротны боль,
Сто год жыцця прарочыць на зямлі.

Баюся я, каб на твае сляды
Не кінуў з роспачы ганебных слоў,
Бо ліхамысны свет, як заўсягды,
Прыняць за праўду трызненне гатоў.

Каб не крануў нас здрадніцкі паклёп,
Мне ў вочы глянь, што ў сэрцы ні было б!

141

Вачыма я ў цябе не закаханы,
Ў табе яны знаходзяць шмат пахіб.
А сэрцу даспадобы ўсе заганы,
Ўтрапёнымі якімі ні былі б.

Твой голас не прыносіць асалоды,
Мае пачуцці — дотык, слых ці смак —
Не мкнуцца, хоць жадаеш іх прыходу,
На твой банкет юрлівы аніяк.

І ўсё ж,— ні ўсім пяці ім не ўдаецца,
Ні паасобна — сэрца ўгаварыць,
Каб назусім адмовілася сэрца
Табе служыць, тваім падданым быць.

Пакута мне прыносіць і уцеху:
Караеш ты, і ты ж наўчыла грэху!

142

Любоў — мой грэх, народжаны красою,
Ў абузу нас і завяла яна.
Ты параўнай маю віну з тваёю:
І у мяне, і у цябе — адна.

З тваіх бы вуснаў чуць дакор не варта,
Бо цноту ганьбілі яны ўвесь час.
Я сам у рабаўніцтве вінаваты:
Чужыя ложкі правяраў не раз.

Ніхто майго кахання не асудзіць,
Як і тваіх, што ёсць і што былі.
Спагаду ў сэрцы ты пасей, каб людзі
Маглі з яе расчуліцца калі.

Здараецца і так на нашым свеце:
Як ты свяціла, так табе пасвецяць.

143

Ты толькі глянь, як гаспадыня-маці,
Дзіця ссадзіўшы, ловіць певунка.
Уся яе увага на курчаці,
Паветра мацае ўвесь час рука.

Зірні, як плача беднае дзіцятка
Па той, што занята зусім другім.
Увесь свой спрыт і сілу без астатку
Яна кладзе у паляванні тым.

І ты за тым імкнешся, што ўцякае,
А я, малое, следам па зямлі.
Вярніся ж да таго, хто так чакае,
І пацалуй, як маці, прытулі.

Як толькі здзейсніш ты свае жаданні,
Тады і мне лягчэй на сэрцы стане.

144

На радасць мне і на пакуту мне
Ва мне жывуць адразу два каханні.
Адно — кабеціна, за ноч цямней,
Другое — друг у ангельскім убранні.

Каб месца даць у пекле мне хутчэй,
Дык ангела ўсё спакушае д'ябал:
Імкнецца аддаліць з маіх вачэй,
Змусціць яго агнём сваіх паглядаў.

Не знаю, хто каго адолеў там,
Але не ангел, мабыць, як здаецца.
Пайшлі, пасябраваўшы, бачыў сам,
Дык ангел трапіў пэўна ў тое месца.

Ці так, ці не — дазнаемся ў той час,
Калі ён з пекла вернецца да нас.

145

Я ненавіджу! — з вуснаў тых,
Якія створаны каханнем,
Пачуў збянтэжаны мой слых,
Калі знябыўся я дазвання.

Мая каханая тады
Язык адразу прыкусіла,
Бо ён дагэтуль заўсягды
Насіў прыемнасці ад мілай.

Як светлы дзень зганяе змрок,
Нібы якога злога духа,
Маёй каханай язычок
Маю скрышыў адразу скруху.

«Я ненавіджу!» — чую. Ўраз
За тым шчаслівае: «Не вас!»

146

Душа мая, зямлі ўсёй асяродак,
Чаму прыгон ты церпіш над сабой?
На афарбоўку сцен не шкода сродак,
А што за той фарбованай сцяной?

Чаму на свой прытулак тымчасовы
І не трывалы траціш многа так?
Збіраеш спадчыну ты адмыслова,
Каб больш здабычы меў сляпы чарвяк?!

Узбагачай, душа, сваю скарбніцу,—
Для дзён наступных застанецца скарб,
Хоць з панадворку будзе менш ільсніцца
Нікому не патрэбных, танных фарб.

Тады над смерцю станеш гаспадыняй,
Яе ўся ўлада над жыццём загіне.

147

Хварэю я. Хвароба ўся — любоў.
Неўтаймаванай смагай паліць сэрца.
Атруты раз пакаштаваўшы, зноў
Яе шукае, п'е і не нап'ецца.

Лячыў хваробу доктар — розум мой,—
Цяпер адмовіўся, бо так і варта:
Якія б лекі ён ні радзіў ёй,
Прымаць іх не згаджаецца упарта.

Як непрытомны я ў такой бядзе,
Без розуму, нібыта утрапёны.
Бадзяюцца і словы абы-дзе,
Ад іх і думкі — ў розныя староны.

Кажу, напрыклад, ты — святло для воч,
А сапраўды — пякельніца, як ноч.

148

Якія вочы мне дало каханне,
Як праўду блытае з хлуснёй пагляд!
Ці, можа, розуму прыйшло згасанне
І ён у блытаніне вінават?

Калі ўсё добра, што ім даспадобы,
Чаму ж не згодны свет і людзі з тым?
А калі не, дык ці не лепш было бы
Прызнаць, што праўды ў іх няма зусім?

І што б сказалі вочы аб прыгожым,
Калі сляза бяссоння крые зрок?
Нам сонца нават пасвяціць не можа,
Калі на небе покрыва з аблок.

Любоў сумысля слёзы шле на вочы:
Схаваць за імі ўсе заганы хоча.

149

Як можаш ты, гарэзніца, сказаць,
Што я цябе нібыта не люблю,
Калі з табой выходжу ваяваць
Я на істоту ўласную сваю?

Ці сябраваў я з ворагам тваім?
Ці заляцаўся да тваіх ліхіх?
Калі ж глядзела поглядам благім,
Ці не сустрэў яго мой сціплы ўздых?

Ці ёсць што-небудзь вартае ў мяне,
Чаго б да ног тваіх я не сіхіліў?
Як твой загад з-пад веек мільгане,
Хіба яго не выканаў калі?

Твая варожасць сведчыць аб адным:
Відушчых любіш ты, я ж стаў сляпым.

150

Дзе ты такую ўладу набыла,
Каб панаваць — бяссільная — над сілай,
Хлусіць, што дзень прыгож не ад святла,
Хлусіць на ісціну мяне схіліла?

Якім прымусам ты ўтлуміла мне
Дабром лічыць зло ўсё тваёй істоты,
І так, што грэх цяпер мне прыямней,
Чым самая прывабліваяцнота?

Цяпер за тое ўсё цябе люблю,
За што б напэўна мусіў ненавідзець.
Калі зняважыць хто любоў маю,
Дык з ім мяне ты не павінна крыўдзіць.

Калі магу нявартую любіць,
Дык варты больш я сам любімым быць.

151

Любоў не ведае згрызот сумлення,
Тым часам маці іх — сама любоў.
Каб не шукаць пасля табе збавення,—
Лепш не нагадвай мне сваіх грахоў.

Каб грэшных думак ты сама не мела,
Адкуль бы іх дазналася душа?
Пакуль не спакушае змуста цела,
Ніхто не мог бы плоці спакушаць.

Яна ўстае, як раб перад царыцай,
Тваё імя пачуўшы і загад,
Каб, мэту ўцэліўшы, да ног схіліцца,
Пачуццем гордасці напоўніўшы пагляд.

Без жадных каянняў табе той рады,
Хто ўздымы ведае і заняпады.

152

Цябе пазнаўшы, клятву я нарушыў,
Ты ж прывяла дзве здрады за сабой:
Заганьбіўшы спачатку ложак мужаў,
Пасля зграшыўшы зноў перада мной.

Але якой жа я шукаю праўды,
Калі я сам далей цябе пайшоў:
Я кляўся выкрываць твае завады
І зрокся — праз цябе — сваіх жа слоў.

Я кляўся шчырасці тваёй і ласцы,
Казаў, што любіш і аддана мне,
Змушаў свае я вочы закрывацца
На праўду ўсю, каб верыць той мане.

Але не ў тым найбольш я вінаваты:
Пакляўся я, што ты пашаны варта!

153

Бог Купідон, заснуўшы у гайку,
Паклаў паходню ля сябе пры боку,
А німфа, ўзяўшы галаўню ў руку,
Яе згасіла ў ручаі глыбокім.

Вада, нагрэўшыся агнём святым,
Хваробы лечыць ад тае часіны.
А Купідон не гараваў па тым:
Агонь здабыў з вачэй маёй дзяўчыны.

Каб той агонь пазнаць як мае быць,
Ён закрануў мне сэрца нечакана.
І вось яно ад той пары баліць,
Ручэй гаючы не ўгаіў мне раны.

Пазнаў я ўсё ж: з любімых мне вачэй
Дастану лекі я за ўсё хутчэй.

Знянацку задрамаў кахання бог.
Паходня ля яго з агнём юрлівым.
Прыбеглі німфы. Сон ім дапамог:
Адна ўхапіла той агонь імкліва.

Застаўся абяззброены ўладар,
Які спаліў багата палкіх сэрцаў.
А скрадніца такі нябесны дар
Вадою заліла ў крынічнай рэчцы.

Агнём нагрэтая, з часіны той
Гаючай стала для мужчын крыніца.
І я хадзіў, каб лекавай вадой
Мне ад сваёй хваробы як пазбыцца.

Нагрэць ваду любоў дапамагла,
Згасіць любоў крыніца не змагла.

ТРАГЕДЫ

РАМЭО І ДЖУЛЬЕТА

Пераклаў
Кандрат
Крапіва

АСОБЫ

ЭСКАЛ	*герцаг Веронскі*
ПАРЫС	*малады дваранін, сваяк герцага*
МАНТЭКІ КАПУЛЕЦІ	*старэйшыя дзвюх варожых сем'яў*
СТАРЫ	*сваяк сіньёра Капулеці*
РАМЭО	*сын Мантэкі*
МЕРКУЦЫО	*сваяк герцага і друг Рамэо*
БЕНВОЛІО	*пляменнік Мантэкі і друг Рамэо*
ТЫБАЛЬТ	*пляменнік сіньёра Капулеці*
БРАТ ЛАРЭНЦА БРАТ ДЖАВАННІ	*францысканскія манахі*
САМСОН ГРЭГОРЫО	*слугі Капулеці*
П'ЕТРА	*слуга карміліцы*
АБРАМ БАЛТАЗАР	*слугі Мантэкі*
АПТЭКАР	
ТРЫ МУЗЫКАНТЫ	
ПАЖ МЕРКУЦЫО	
ПАЖ ПАРЫСА	
ПРЫСТАЎ	
СІНЬЁРА МАНТЭКІ	*жонка Мантэкі*
СІНЬЁРА КАПУЛЕЦІ	*жонка Капулеці*
ДЖУЛЬЕТА	*дачка Капулеці*
КАРМІЛІЦА ДЖУЛЬЕТЫ	
ГАРАДЖАНЕ ВЕРОНЫ, МУЖЧЫНЫ І ЖАНЧЫНЫ, СВАЯКІ КАПУЛЕЦІ І МАНТЭКІ, МАСКІ, ВАРТА, СЛУГІ І ХОР.	

Месца дзеі — Верона і Мантуя.

Пралог

Уваходзіць х о р.

ХОР

Дзве роўныя па знатнасці сям'і
Ў Вероне, дзе сустрэнуць нас падзеі,
Здаўна вядуць упартыя баі,
І на ўзаемны мір няма надзеі.

А сэрцы іх дзяцей на век вякоў
Гарачая любоў была злучыла,
Ды толькі смерць ліхая юнакоў
Бацькоўскую варожасць патушыла.

Пра іх любоў і смерць наш сумны сказ,
Пра гнеў бацькоў, патухшы ў іхняй смерці,
Гадзіны дзве тут зойме часу ў вас,
Крануўшы спачуваннем вашы сэрцы.

Даруйце нам за слáбасці пяра,
Загладзіць іх старанная ігра.

АКТ ПЕРШЫ

Сцэна першая

Верона. Рыначны пляц.

Уваходзяць Самсон і Грэгорыо, узброеныя мячамі і шчытамі.

САМСОН

Клянуся, што мы не будзем дарэмна сыпаць словы, як гарох.

ГРЭГОРЫО

Вядома, мы ж не агароднікі, каб гарох сеяць.

САМСОН

Як толькі што якое, хапайся за меч і давай духу.

ГРЭГОРЫО

Глядзі, каб яны з цябе самога дух не выбілі.

САМСОН

Мяне толькі расшавялі — я тады зразу б'ю.

ГРЭГОРЫО

Але не так лёгка цябе расшавяліць.

САМСОН

Кожны сабака з дому Мантэкі можа ўзрушыць мяне да самых вантробаў.

ГРЭГОРЫО

Узрушаны заяц вельмі шпарка рухаецца, а мядзведзь становіцца дубка і ні з месца. Баюся, што і ты, як зрушышся, дык і ўцячэш.

САМСОН

Калі кране мяне сабака з гэтага дому, я буду стаяць цвёрда. На сцяну палезу, але вазьму верх над любым мужчынам і над любой дзеўкай з дому Мантэкі.

ГРЭГОРЫО

Значыць, ты слабы, калі табе сцяна патрэбна. Слабыя заўсёды прыпіраюцца да сцяны.

САМСОН

Гэта праўда. Таму жанчыну, як слабую пасудзіну, і прыпіраюць да сцяны. Усіх мужчын з дому Мантэкі я папру ад сцяны, а жанчын прыпру да сцяны.

ГРЭГОРЫО

Нашы паны б'юцца, а ў нас ілбы трашчаць.

САМСОН

Усё роўна, я буду бязлітасным. Прыкончыўшы панічоў, я і паненкам галовы паскручваю.

ГРЭГОРЫО

Галовы?

САМСОН

Галовы ці што іншае — разумей, як хочаш.

ГРЭГОРЫО

Няхай той разумее, хто гэта адчуе.

САМСОН

Ды ўжо ж будзе ім адчувацца, аж пакуль я змагу трымацца. А ўсім добра вядома, што мяса ў мяне пруткае.

ГРЭГОРЫО

Добра, што мяса, а не рыба, а то быў бы ты вяленай траской. Вымай сваю зброю — сюды ідуць два з дому Мантэкі.

Уваходзяць Абрам і Балтазар.

САМСОН

Мая зброя напагатове. Задзірайся, я прыкрываю твой тыл.

ГРЭГОРЫО

Ці не хочаш ты павярнуць свой тыл і даць драла?

САМСОН

Ты мяне не бойся.

ГРЭГОРЫО

Я за цябе баюся, трасца табе ў бок.

САМСОН

Трэба, каб закон быў на нашым баку — няхай яны пачнуць.

ГРЭГОРЫО

Я насуплюся, калі буду праходзіць ля іх, і няхай прымаюць гэта, як хочуць.

САМСОН

Не як хочуць, а як пасмеюць. Я пакажу ім фігу. Ганьба ім, калі яны гэта сцерпяць.

АБРАМ

Вы нам паказваеце фігу, сіньёр?

САМСОН

Я паказваю фігу.

АБРАМ

Вы нам паказваеце фігу, сіньёр?

САМСОН

(ціха да Грэгорыо)

Закон будзе на нашым баку, калі я скажу, што ім?

ГРЭГОРЫО

Не.

САМСОН

Не, сіньёр, я не паказваю вам фігі, я так сабе паказваю фігу.

ГРЭГОРЫО

Вы лезеце ў бойку, сіньёр?

АБРАМ

У бойку, сіньёр? Не, сіньёр.

САМСОН

А калі ў бойку, сіньёр, я гатоў. Мой гаспадар не горшы за вашага.

АБРАМ

Але ж і не лепшы.

САМСОН

Ладна, сіньёр.

Уваходзіць Бенволіо.

ГРЭГОРЫО

(ціха Самсону)

Скажы: «лепшы»,— сюды ідзе сваяк нашага гаспадара.

САМСОН

Лепшы, сіньёр.

АБРАМ

Вы хлусіце.

САМСОН

Мячы да бою, калі вы мужчыны. Грэгорыо, успомні свой хвалёны ўдар.

Б'юцца.

БЕНВОЛІО

(разнімае іх)

Чакайце, асталопы! Зброю ў ножны!

Падумайце, што вам за гэта будзе.

(Выбівае мячом у іх зброю.)

Уваходзіць Тыбальт.

ТЫБАЛЬТ

І ты з мячом між баязлівых слуг.
Ляпей сюды на смерць сваю ты глянь.

БЕНВОЛІО

Я іх мірыў. Схавай у ножны меч
Ці ў ход яго пусці, каб памірыць іх.

ТЫБАЛЬТ

З мячом пра мір загаварыў ты раптам.
Я нават слова гэта ненавіджу,
Як пекла, як усіх Мантэкі і цябе,
Нікчэмны баязлівец. Адбівайся!

Б'юцца.

Збягаюцца прыхільнікі з абодвух дамоў і ўвязваюцца ў бойку, а потым гараджане і прыставы з палкамі і алебардамі.

1-ШЫ ПРЫСТАЎ

Гэй, палак, алебард, дубін! Лупі іх!
Бі Капулеці, бі Мантэкі — ўсіх!

Уваходзяць стары Капулеці ў халаце і сіньёра Капулеці.

КАПУЛЕЦІ

Што тут за крык? Падаць мой доўгі меч.

СІНЬЁРА КАПУЛЕЦІ

Кастыль, кастыль! Нашто табе той меч?

КАПУЛЕЦІ

Сказаў я — меч, ідзе стары Мантэкі.
І на мяне мячом сваім махае.

Уваходзяць стары Мантэкі і сіньёра Мантэкі.

МАНТЭКІ

О, подлы Капулет! *(Жонцы.)* Пусці мяне!

СІНЬЁРА МАНТЭКІ

І кроку ты не ступіш да яго.

Уваходзіць герцаг Эскал са світай.

ГЕРЦАГ

Вы, міру ворагі, бунтаўшчыкі,
Што кроўю блізкіх пляміце мячы.
Вы чуеце! Не людзі вы — звяры.
Вы тушыце пажар шалёнай злосці
Багровымі цуркамі з вашых жыл.
Вось мой загад: пад страхам катаванняў

З крывавых рук на дол вы зброю кіньце
І герцага паслухайце прысуд.
Нялюдскай сваркаю вы трэці раз
Парушылі спакой веронскіх вуліц,
Ты, Капулеці, ды і ты, Мантэкі,
У трэці раз пачцівых гараджан
Прымусілі забыць сваю паважнасць
І зброю ржавую у рукі ўзяць,
Каб заржавелую варожасць вашу
Утаймаваць. Калі яшчэ хоць раз
Каторы з вас спакой і мір парушыць,
Жыццём сваім заплаціць ён за гэта.
Цяпер жа ўсе адгэтуль прэч ідзіце.
Вы, Капулеці, пойдзеце са мной,
А вы, Мантэкі, ў поўдзень прыйдзеце
У старажытны замак Вілафранка,
Дзе мы звычайна творым суд і праўду,
Усе пад страхам смерці — прэч адгэтуль!

Выходзяць герцаг і світа, Капулеці, сіньёра Капулеці, Тыбальт, гараджане і слугі.

МАНТЭКІ

Хто ж даўнюю варожасць абудзіў?
Ты быў, пляменнік, з самага пачатку?

БЕНВОЛІО

Варожых два слугі і нашых два
Ужо схапіліся, як я прыйшоў.
Я выхапіў свой меч, каб іх разняць,
Але Тыбальт шалёны падляцеў.
Мяне на бой ён выклікаў заўзята,
Паветра рассякаючы мячом,
Яно ж насмешліва свістала толькі.
Пакуль мы біліся, народ сабраўся,
Мацнела бойка. Герцаг тут, аднак,
Разбараніў заўзятых забіяк.

СІНЬЁРА МАНТЭКІ

Рамэо ты не бачыў? Мусіць, бог
Яго ад гэтай бойкі засцярог.

БЕНВОЛІО

Задоўга да таго, як промень сонца
Праз залатыя шыбы ўсходу глянуў
На свет, мяне душэўны неспакой
За горад выгнаў. Пад шатром смакоўніц,

Што к захаду ад гарадской сцяны,
Я сына вашага заўважыў. Да яго
Хацеў я падысці, а ён убачыў
І ў гушчары схаваўся ад мяне.
Настрой такі — знаёмы досыць мне,
Калі ты сам сабе цяжарам служыш
І ад людзей шукаеш адзіноты,—
Я даганяць яго не захацеў
І пад уплывам гэткага ж настрою
Збег ад таго, хто ад мяне ўцякаў.

МАНТЭКІ

Не раз яго там бачылі на золку,
Як ён слязамі памнажаў расу
І туманы ўздыханнямі згушчаў.
Але калі ўсерадаснае сонца
Прыпадымаць на ўсходзе пачынае
Аўрорынай пасцелі змрочны полаг,
Спяшаецца мой сын тады дадому
І замыкаецца ў сваім пакоі:
Завесіць вокны ад святла дняўнога
І штучна гэтак ноч сабе стварае.
Як рады тут не знойдзеш, дык тады
Ад смутку гэтага чакай бяды.

БЕНВОЛІО

А ці вядома вам прычына, дзядзя?

МАНТЭКІ

Даведацца ніяк вось не магу...

БЕНВОЛІО

А хіба вы пыталіся ў яго?

МАНТЭКІ

І сам пытаўся, і сябры мае,
А ён пачуццяў слухае парады,
І не скажу, каб верны быў сабе,
Так не жадае сэрцам ён адкрыцца,
Як почка, што чарвяк пражэрны точыць,
Яна ж яшчэ не ўспела распусціцца
І сонцу харaство ахвяраваць.
Каб ведалі, у чым тугі прычына,
Лякарства б мы стараліся для сына.

Уводдалі паказваецца Рамэо.

БЕНВОЛІО

Вось ён ідзе. Пакіньце нас удвух,
Ці не адкрые мне што-небудзь друг.

МАНТЭКІ

Жадаю вам па шчырасці размоў.
Бывай. Ну, жонка, мы хадзем дамоў.

Выходзяць Мантэкі і сіньёра Мантэкі.

БЕНВОЛІО

А, з добрым раннем, брат.

РАМЭО

А хіба ранне?

БЕНВОЛІО

Прабіла дзевяць.

РАМЭО

Час марудны ў смутку.
Там ці не бацька мой пайшоў так хутка?

БЕНВОЛІО

Так, ён. Ды ты мне назаві хоць раз
Прычыну, што табе так доўжыць час.

РАМЭО

Няма таго, што час нам каратае.

БЕНВОЛІО

Ага, дык вось у чым прычына тая —
Любоў?

РАМЭО

Адсутнасць.

БЕНВОЛІО

У цябе любві?

РАМЭО

Адсутнасць узаемнасці ў любві.

БЕНВОЛІО

Любоў у марах — кволая такая,
Але на справе жорстка дапякае.

РАМЭО

Хоць у любві павязка на вачах,
Але яна да сэрца знойдзе шлях.
Дзе мы абедаем? Была тут бойка?
А ўрэшце я ўжо чуў — не гавары.
Прасторна тут злабе, любві тым больш.
О, гнеў любві, пяшчотнасць гневу злога!
Страшэнны пал, народжаны з нічога.
О, пустаты цяжар і важнасць глупства!
Бязладны хаос форм, прыгожых звонку.
Свінцовы пух, дым ясны, жар халодны,
Сухотнае здароўе, сон бяссоння —
Такое вось любві маёй бяздонне.
Ты не смяешся?

БЕНВОЛІО

Не, гатоў заплакаць.

РАМЭО

Аб чым, мой друг?

БЕНВОЛІО

Аб чыстым сэрцы друга.

РАМЭО

І так туга скавала сэрца мне,
Прыбаў сваю — памножыш удвайне.
Сваім ты смуткам справы не паправіш,
А спачуваннем гора мне прыбавіш.
Любоў заўжды жартуе з закаханым:
Стань уздыхаць — развеецца туманам,
Прагоніш сум — зноў усміхнецца лёс.
Яна — смерч, полымя над морам слёз,
Вар'яцтва мудрае самой прыроды,
Змяшанае з гаркоты й асалоды.
Бывай, аднак жа, любы браце мой!

БЕНВОЛІО

Чакай, Рамэо, я пайду з табой.
Бо спадзяюся, ты мне растлумачыш...

РАМЭО

Цсс... я растаў. Дзе ты Рамэо бачыш?
Няма яго. Ён страціў сам сябе.

БЕНВОЛІО

Каго ты палюбіў — скажы мне проста.

РАМЭО

Не проста, з енкам.

БЕНВОЛІО

Пацярпі хвіліну
І гэтых енкаў назаві прычыну.

РАМЭО

Скажы, каб хворы завяшчанне склаў —
Паможаш ты, каб ён хутчэй сканаў.
Сур'ёзна, брат, я палюбіў жанчыну.

БЕНВОЛІО

Ну так і ёсць. У цэль папаў я трапна.

РАМЭО

Стралок ты слаўны і падстрэліць сквапны.

БЕНВОЛІО

Чым цэль прывабней, тым лягчэй папасці.

РАМЭО

Ты на яе не ўзводзь дарма напасці.
Сам Купідон не нанясе ёй раны.

Яна ступае па слядах Дыяны:
Закована ў нявіннасць, нібы ў латы,
І ёй не страшны той хлапчук крылаты.
Яе не ўзяць пяшчотных слоў асадай,
Ні золатам аздобленай прынадай.
Сама сабе застаючыся вернай,
Яна багатая красой бязмернай
І бедная ў той час, бо разам з ёй
Засыплюць і красу яе зямлёй.

БЕНВОЛІО

Што, паклялася вечна дзевай быць?

РАМЭО

Каб і мяне тым самым загубіць.
Краса яе ад чыстаты загіне,
На свеце нават следу не пакіне.
Чароўны скарб у святасць ахінуты
На гора мне, на страшныя пакуты.
Не ведаю, ці трапіць яна ў рай
За ўсе мае пакуты і адчай.
Я ў скаргах так, няшчасны, і памру.
Я ўжо мярцвяк — з магілы гавару.

БЕНВОЛІО

Я раіў бы не думаць пра яе.

РАМЭО

О, каб жа ты наўчыў мяне не думаць!

БЕНВОЛІО

Дай волю поўную вачам сваім
І паглядзі на іншых.

РАМЭО

Гэта спосаб,
Каб больш яшчэ пазнаць яе красу.
Пад чорнай маскай кожнай незнаёмкі
Мы спадзяёмся ўбачыць харство.
Той, хто аслеп, ніколі не забудзе
Свой скарб найдаражэйшы — зрок.
Няхай любую ўбачу я красуню,
Краса яе пацвердзіць толькі тое,
Што харство каханай — шмат вышэй.
Бывай. Не наўчыш ты мяне забыць.
(Выходзіць.)

БЕНВОЛІО

Альбо наўчу, альбо не буду жыць.

Выходзіць.

Сцэна другая

Вуліца.

Уваходзяць Капулеці, Парыс і слуга.

КАПУЛЕЦІ
Абодва мы з Мантэкі пакараны
Аднолькава. Я думаю, што мы,
Старыя людзі, зможам мірна жыць.
ПАРЫС
Абодвух паважаюць вас. Шкада,
Што цягнецца так доўга ваша сварка.
Але які вы мне дасце адказ?
КАПУЛЕЦІ
Той самы, што раней я вам даваў.
Яшчэ дачка мая не знае свету,
Ёй чатырнаццаць год яшчэ няма.
Яшчэ два разы адцвіце вясна,
Тады для шлюбу вырасце яна.
ПАРЫС
І маладзей шчаслівыя ёсць маці.
КАПУЛЕЦІ
І вянуць жа затое вельмі рана.
Зямля забрала ўсіх маіх дзяцей:
Дачка — адна ў жыцці мая надзея.
Яе любві шукайце вы заўсёды;
Мая тут згода — толькі частка згоды.
Калі яна даверыць сэрца вам,
Тады адказ я канчатковы дам.
Я вечарам сягоння бал даю,
Як некалі, сазваў радню сваю,
Сяброў і блізкіх самых дарагіх,
А вы — найдаражэйшы паміж іх.
Зямныя зоркі упрыгожаць дом,
Прымусяць ноч здавацца ясным днём.
Пабачыце дзяўчат вы і кабет
Прыгожых, нібы той вясновы цвет.
Іх радасць, іх забавы, весялосць
Раздзеліце і вы, мой любы госць.
І спыніце свой выбар вы на той,
Якая больш прывабіць вас красой.
Дачка таксама з'явіцца на бал,
Хоць мо такіх не вартая пахвал.

Хадзем жа, граф, са мной.
(Слузе, даючы яму паперу.)
А ты сягоння
Ідзі і абвяшчай па ўсёй Вероне,
Усім, хто тут запісаны ў паперы,
Што Капулеці просіць на вячэру.

Выходзяць Капулеці і Парыс.

СЛУГА

Абвяшчай усім, хто тут запісаны. А можа, тут напісана, што шавец павінен арудаваць аршынам, а кравец — шылам, рыбак — карандашом, а маляр — сеткамі. Мяне пасылаюць знайсці людзей, што тут запісаны, а я ніяк не магу дабрацца да таго, што тут напісана. Трэба запытацца ў вучоных людзей. Ды вось якраз і яны.

Уваходзяць Бенволіо і Рамэо.

БЕНВОЛІО

Клін клінам выбіваюць, галубок,
Другім агнём выпекаюць гарэнне.
Калі адчуў ты галавакружэнне,
Дык пачынай круціцца ў іншы бок.
Другая немач возьме за вантробы,
Глядзіш — як не было старой хваробы.

РАМЭО

Трыпутнік, кажуць, добра памагае.

БЕНВОЛІО

Каму і ў чым?

РАМЭО

Таму, хто закульгае.

БЕНВОЛІО

Ты, мусіць, звар'яцеў, Рамэо?

РАМЭО

Не,
Але я больш няшчасны, чым вар'ят:
Ушчэнт замучаны, ў турму загнаны,
Бязлітаснай любоўю скатаваны.

СЛУГА

Дзень добры. Ці сіньёр чытаць умее?

РАМЭО

О, так. Свой лёс чытаю я ў няшчасці.

СЛУГА

Гэта рабіць вы, мусіць, без кніг навучыліся. Але я ў вас, сіньёр, пытаюся, ці прачытаеце вы тое, што напісана?

РАМЭО

Калі я знаю літару і мову.

СЛУГА

Сумленна сказана. Ну што ж, бывайце.

(Хоча ісці.)

РАМЭО

Чакай, я прачытаю, дай сюды.

(Чытае.)

«Сіньёр Марціна з жонкай і дочкамі; граф Ансельма і яго цудоўныя сёстры; сіньёра ўдава Вітрувіо; сіньёр Плачэнцыо і яго мілыя пляменніцы; Меркуцыо і яго брат Валянцін; мой дзядзя Капулеці, яго жонка і дочкі; мая любая пляменніца Разаліна; Лівія; сіньёр Валенцыо і яго дваюрадны брат Тыбальт; Лючыо і яго весялушка Елена». Выдатная кампанія! Куды ж яе запрашаюць?

СЛУГА

Наверх.

РАМЭО

А куды наверх?

СЛУГА

На вячэру ў наш дом.

РАМЭО

Чый дом?

СЛУГА

Дом майго гаспадара.

РАМЭО

Хто ён такі, хачу я запытацца?

СЛУГА

Скажу без папытання; мой гаспадар — багаты, знатны Капулеці. І калі вы не з дому Мантэкі, дык прыходзьце да нас перакуліць бакал віна. Бывайце вясёлы.

(Выходзіць.)

БЕНВОЛІО

На вечары у Капулеці будзе
Сярод красунь праслаўленых Вероны
І Разаліна мілая твая.
Хадзем туды, ты глянь там на дзяўчат
Ды параўнай з тваёй красой хвалёнай,
Дык лебедзь твой акажацца варонай.

РАМЭО

Калі мяне так вочы ашукаюць,
Што дапушчу я гэты грэх цяжкі,
Тады няхай яны агнём шугаюць,
Няхай згараць, нібы ерэтыкі.

Ёсць прыгажэйшыя? Не, мілы мой,
Яшчэ на свеце не было такой.

БЕНВОЛІО

Цудоўнаю здавалася яна,
Бо на вачах тваіх была адна,
А ўзваж ты на вачах, нібы на чашах,
Красу яе з красой веронак нашых,
Убачыш прыгажэйшых ты ўдвайне,—
Не толькі ж, браце, свету, што ў акне.

РАМЭО

Пайду глядзець на новую красу,—
Ранейшай захапленне панясу.

Выходзяць.

Сцэна трэцяя

Пакой у доме Капулеці.

Уваходзяць сіньёра Капулеці і кармілiца.

СІНЬЁРА КАПУЛЕЦІ

А дзе дачка? Пакліч яе сюды.

КАРМІЛІЦА

Нявіннасцю сваёю ў дзесяць год
Клянуся — звала ўжо. Авечка! Птушка!
Дзяўчынка, дзе ты? Божа мой? Джульета!

Уваходзіць Джульета.

ДЖУЛЬЕТА

А хто мяне тут клікаў?

КАРМІЛІЦА

Ваша маці.

ДЖУЛЬЕТА

Я тут. Вы клікалі мяне, сіньёра?

СІНЬЁРА КАПУЛЕЦІ

Дык вось што... Няня, выйдзі на хвілінку;
Пагаварыць нам трэба. Не, чакай;
Я перадумала: ты можаш слухаць.
Ты ведаеш,— дарослая дачка.

КАРМІЛІЦА

Яе гады лічу я па гадзінках.

СІНЬЁРА КАПУЛЕЦІ

Ёй чатырнаццаці няма.

КАРМІЛІЦА

Няма.
Клянуся чатырнаццаццю зубамі,
Хоць у мяне іх усяго чатыры.
А колькі да Пятра?

СІНЬЁРА КАПУЛЕЦІ

Два тыдні з лішнім.

КАРМІЛІЦА

Ну, два ці больш, але ў Пятрову ноч
Якраз ёй чатырнаццаць год міне.
Мая Сусанна (пухам ёй зямля)
Была равесніцай, ды бог забраў:
Яе не варта я была. Ну вось
Дык на Пятра ёй чатырнаццаць будзе.
Так, чатырнаццаць. Добра памятаю —
Што адзінаццаць ад землетрасення,
Што ад грудзей я адняла яе.
Да капелькі ўсё помню, як сягоння.
Я палыном сабе нацерла грудзі,
На сонцы седзячы ля галубятні.
Вы ў Мантуі былі тады з сіньёрам.
Як зараз помню я: калі яна
Гаркоту палыну рассмакавала,
Дык так заплакала, што аж зайшлася.
І ручкай замахнулася на грудзі.
Тут раптам галубятня задрыжала,
Дык я кулём адтуль!
Сем... дзесяць... Адзінаццаць год мінула.
Тады яна стаяла ўжо... Ды што я!
Яна ўжо бегала. Зірнеш — пацеха:
Шлэп, шлэп, як тая гуска. Памятаю,
Што перед тым за дзень пабіла лобік.
Тады мой муж — спачын яго душы,—
Такі быў жартаўнік!.. узяў яе:
«Ну, што ж ты тварам падаеш? — сказаў ён.—
Чакай, малышка, як паразумнееш,
Тады ты будзеш падаць дагары.
Ці так, дзяўчо?» — І вось, клянуся богам,—
Дзяўчынка сціхла і сказала: «Так».
Цяпер той жарт і спраўдзіцца гатоў.
Хоць тысячу гадоў я пражыву,
Ніколі не забуду: «Так, дзяўчо?»

Дурніца нават плакаць перастала.
І кажа: «Так».

СІНЬЁРА КАПУЛЕЦІ

Ну, змоўкні, годзе ўжо.

КАРМІЛІЦА

Маўчу. Аж смех бярэ, калі я ўспомню,—
Раптоўна сціхла і сказала: «Так».
А гуз на лбе з курынае яйцо —
Ударылася моцна і крычала.
Муж кажа: «Што ж ты тварам падаеш?
Чакай, малышка, як паразумнееш,
Тады ты будзеш падаць дагары.
Ці так, дзяўчо?» — Яна тут сціхла: «Так».

ДЖУЛЬЕТА

І ты ўжо, няня, сціхні, калі ласка.

КАРМІЛІЦА

Ужо я сціхла. Дай бог табе шчасця,
Ты прыгажэйшая за ўсіх дзяцей,
Якіх я няньчыла. І каб яшчэ
Мне на тваім вяселлі пагуляць,
Тады б нічога больш я не хацела.

СІНЬЁРА КАПУЛЕЦІ

Дык я ж якраз пра гэта самае
Хачу пагаварыць. Скажы, Джульета,
Ці ты хоць раз падумала пра замуж?

ДЖУЛЬЕТА

Не марыла яшчэ пра гэткі гонар.

КАРМІЛІЦА

Пра гонар — бачыш ты! Каб не была
Я мамкаю тваёй, дык бы сказала,
Што розум ты ўсмактала з малаком.

СІНЬЁРА КАПУЛЕЦІ

Дык вось падумай ты цяпер пра гэта,
Ёсць дамы маладзей цябе ў Вероне,—
І маткі ўжо яны. А я сама
Шмат маладзей была, чым ты цяпер,
Калі цябе радзіла. Справа ў тым,
Што граф Парыс цябе пасвататься хоча.

КАРМІЛІЦА

Вось гэта чалавек, і я скажу!
Ах — чалавек. Вось гэта дык мужчына!
Адзін з усіх. Як з воску выліты.

СІНЬЁРА КАПУЛЕЦІ

Няма ў Вероне лепшай кветкі летам.

КАРМІЛІЦА

І праўда — кветка; кветачка, дый годзе.

СІНЬЁРА КАПУЛЕЦІ

Ну, што ты скажаш? Ён табе да густу?
На вечары сустрэнешся з ім сёння,
Яго аблічча кнігу прачытаеш,
Што напісала хараства пяро.
Угледзься ў рысы твару і правер
Таемных замыслаў яго намер,
Калі ж чаго не выявіш падчас,
Шукай на ўсё ў вачах яго адказ.
Перад табою ён, як кніга тая,
Што толькі добрай вокладкі чакае,
Ды не злавіў ніхто прыдатнай з рыб,
Што скуру ўзяць на вокладку маглі б.
Цудоўную карціну гэтаксама
Прыгожая аздобіць можа рама.
І залатому зместу добрых кніг
Патрэбны ўбор засцёжак залатых.
З красой і скарб табе падорыць ён,
Што для цябе, вядома, не урон.

КАРМІЛІЦА

Які ж урон? Нам ад мужчын прыбытак.

СІНЬЁРА КАПУЛЕЦІ

Ну, дык скажы, палюбіш ты Парыса?

ДЖУЛЬЕТА

Я гляну, мо народзіцца любоў,
Тады вачам я столькі волі дам,
Каб дагадзіць і быць паслушнай вам.

Уваходзіць с л у г а.

СЛУГА

Сіньёра, госці сабраліся, вячэра пададзена, маладую сіньёру шукаюць, кармілiцу на кухні праклінаюць, усе хвалююцца. Я павінен ісці туды прыслугоўваць. Калі ласка, ідзіце хутчэй.

(Выходзіць.)

СІНЬЁРА КАПУЛЕЦІ

Хадзем, Джульета, граф ужо прыйшоў.

КАРМІЛІЦА

Ідзі, ідзі, ды прыбаўляй хутчэй
К шчаслівым дням шчаслівых шмат начэй.

Сцэна чацвёртая

Вуліца.

Уваходзяць Рамэо, Меркуцыо, Бенволіо з пяццю ці шасцю іншымі маскамі, факельшчык і хлапчук з барабанам.

РАМЭО
Ну як жа мы — з прамовай прабачэння,
Ці ўвойдзем так, нічога не сказаўшы?
БЕНВОЛІО
О не, цяпер прамовы не ў пашане,
Мы ўвалімся да іх без Купідона
З павязкай на вачах, з татарскім лукам,
Падобнага на пудзіла ў гародзе,
Якое толькі дзевак нам распудзіць.
Не трэба нам і вуснага Пралога,
Які не ступіць слова без суфлёра.
Няхай што хочуць думаюць пра нас,
Мы патанцуем з імі — і назад.
РАМЭО
Не ў галаве мне танцы. Дайце факел.
Хоць я пахмурны, а свяціць магу.
МЕРКУЦЫО
Не, дарагі Рамэо, патанцуеш.
РАМЭО
У вас вось туфлі з лёгкаю падэшвай
І ногі лёгкія да танцаў, а ў мяне
Цяжкі свінец на змучанай душы.
Ён так гняце, што мне скрануцца цяжка.
МЕРКУЦЫО
Ты ж закаханы, здэцца, дык пазыч
У Купідона крылле і лятай.
РАМЭО
Ён так мяне стралою прасадзіў,
Што крылляў мне не ўзняць, і спутаў так,
Што мне тугі сваёй не пераскочыць.
Я ледзь не падаю пад цяжкай ношай.
МЕРКУЦЫО
Як упадзеш, дык ты ж любоў прыдушыш,
А груз цяжкі для гэткай кволай рэчы.
РАМЭО
Любоў зусім не кволая, а злая,
Калючая, як той чартапалох.

МЕРКУЦЫО

І ты будзь грубы з грубаю любоўю:
Яна цябе, а ты яе калі. *(Надзявае маску.)*
Футляр мне дайце, твар я свой схаваю.
На масцы маска. Што мне да таго,
Што я каму уродам пакажуся?
Няхай вось гэта рыла чырванее.

БЕНВОЛІО

Ну што ж, хадзем пастукаем і зойдзем;
Рыхтуйце ногі, будзе ім работы.

РАМЭО

Мне факел дайце. Жвавыя юнцы
Няхай сабе падлогу націраюць.
На пацяруху труць чарот нагамі,
Я ж прыказкі трымаюся старой:
Хто свеціць, дык той больш і ўбачыць.
Цудоўная гульня, а я прапашчы.

МЕРКУЦЫЮ

Ах, светач, палюбоўнік, шаляніца,
Ты нам агорк, як чадная газніца;
Заграз у палюбоўнай калатушы,
А мы стаім, развесілі тут вушы,
Дарэмна свечкі палім.

РАМЭО

Не дарэмна.

МЕРКУЦЫО

Маруда, мы любоў тваю клянём,
Бо трацім час, як тыя свечкі днём.
Паслухай нас, тут нашых пяць галоў,
Дык разумней цябе мы ў пяць разоў.

РАМЭО

Мы будзем там няпрошаныя госці.

МЕРКУЦЫО

Занадта ты разважлівы чагосьці.

РАМЭО

Мне сніўся сон.

МЕРКУЦЫО

І мне той самы, мусіць.

РАМЭО

Які ж табе?

МЕРКУЦЫО

Што сны страшэнна хлусяць.

РАМЭО

Ты не кажы, бывае сон прарочы.

МЕРКУЦЫО

Відаць, царыца Маб мінулай ноччу
Цябе наведала. Бабулька эльфаў —
Яна не большая за той агат,
Што ўстаўлены ў пярсцёнак олдэрмэна.
На атамах запрэжаных яна
Заўсёды ездзіць па людскіх насах,
Калі, як нежывыя, людзі спяць.
У колах спіцы — ногі павукоў,
А верх каляскі — з крылляў страказіных.
Пастронкі — з найтанчэйшай павуцінкі.
А хамуты — з паўмесяцаў бліскучых,
І пуга — з костачкі свярчка і з жылкі.
За фурмана — у шэранькай ліўрэі
Малюсенькі камарык, меншы нават
За чарвяка, што ў дзеўкі-гультая
Суставы точыць. Кузаў каляскі —
З арэхавай лупіны белкай зроблен
Ці чарвяком — карэтнікам выдатным,
Які для фей карэты вырабляе.
І так штоночы раз'язджае Маб.
Як па мазгах любоўніка праедзе,—
Любоў яму прысніцца; па каленях
Вяльможа — паклоны сняцца; па руках
Суддзі — яму адразу ўзятка сніцца;
Па вуснах дам,— дык сняцца пацалункі.
Ці вусны гэтыя балячкамі асыпле,
Бо ласыя занадта да прысмакаў.
Прыдворны нос яна кране часамі,
І падарункаў пах яму прысніцца.
А іншы раз шчаціпкаю свіною
Папоўскі нос ціхутка паказыча,
Тады яму прыход багаты сніцца.
А то яшчэ па шыі па салдацкай
Пракоціцца — і бачыць ён разню,
Вайну, клінкі іспанскія, засады
І кубкі ў паўаршына глыбінёй.
Бой барабанны раптам ён пачуе,
Усхопіцца, пачне шаптаць малітву
І зноў засне. Яшчэ вось гэта — Маб
Начамі грывы заплятае коням,
І людзям каўтуны яна камечыць;
Разблытаеш каўтун — бяду наклічаш.
Дзяўчат, што дагары ляжаць у сне,

Яна гняце, да грузу прывучае,
Каб моцныя жанчыны выйшлі з іх.
Яна...

РАМЭО

Ды сціхні ўжо, Меркуцыо.
Балбочаш ты пра глупства.

МЕРКУЦЫО

Так, пра сны.
Пра дзетак бестурботнай галавы,
Народжаных фантазіяй пустой;
Што лёгкія, нібы само паветра,
Нясталыя, як вецер той, што лашчыць
Зямлі паўночнай ледзяныя грудзі,
Пасля, ўзлаваўшыся, ляціць на поўдзень,
На росы чыстыя зямлі вільготнай.

БЕНВОЛІО

Ад нас саміх твой вецер нас адносіць:
Вячэра скончыцца, пакуль мы прыйдзем.

РАМЭО

Баюся я, што рана. Адчуваю,
Што лёс мой вырашаны ўжо на небе,
Што будзе бал пачаткам долі горкай,
Смерць наглая мяне чакае, мусіць,
Каб у магілу раннюю пакласці.
Але няхай той парус падымае,
Хто караблём маім кіруе. Пойдзем.

БЕНВОЛІО

Бі ў барабан!

Ідуць у дом.

Сцэна пятая

Зала ў доме Капулеці.

М у з ы к і чакаюць.
Уваходзяць с л у г і з сурвэткамі.

ПЕРШЫ СЛУГА

Дзе ж Макацёр? Чаму ён не памагае прыбіраць?
Гэта яго справа — мяняць талеркі, скрэбці пасуду.

ДРУГІ СЛУГА

Дрэнна, калі ўсё аддадзена ў рукі двух чалавек, ды яшчэ ў нямытыя.

1-ШЫ СЛУГА

Выносьце хутчэй крэслы, адсуньце буфет. А ты, даражэнькі, прыхавай для мяне крыху марцыпанаў. І, калі ты мне друг, скажы прыбрамніку, каб ён прапусціў сюды Сусанну Ступу і Нелі. Антон! Макацёр!

2-ГІ СЛУГА

Добра, будзе зроблена.

1-ШЫ СЛУГА

Цябе шукаюць, цябе патрабуюць, цябе завуць, цябе клічуць, табе трасцу зычаць у вялікай зале.

3-ЦІ СЛУГА

Мы ж не можам быць зразу і там і тут. Весялей, хлопцы, шавяліцеся. Хто другіх перажыве, той усё заграбе.

(Выходзіць.)

Уваходзяць Капулеці, Джульета і іншыя хатнія; яны сустракаюць гасцей і маскі.

КАПУЛЕЦІ

Прашу, сіньёры! Дамы рвуцца ў танец,
Вядома, тыя, што без мазалёў.
Ха-ха, галубачкі. Няхай цяпер
Каторая адмовіцца скакаць.
Як не танцуе, значыць — мазалі.
Ага, ага, вось я вас і злавіў.
(Да Рамэо і яго спадарожнікаў.)
Заходзьце, калі ласка! Быў жа час,
Калі і сам я маску надзяваў
І дамам нештачка шаптаў на вушка.
Мінулася. Заходзьце, калі ласка.
Музыкі, грайце! Месца больш для танцаў.
Ану, прыўдарце, мілыя мае!

Музыка грае. Госці танцуюць.

Эй, вы, святла пабольш! Сталы ўсе прэч!
Камін тушыце: вельмі цёпла стала.
Вось добрая забава нечакана!
(Да старога, свайго сваяка.)
Сядай, сядай, мой добры Капулеці!
Прайшлі ўжо дні, калі мы так скакалі.
Калі апошні раз на маскарадзе
Былі мы?

2-ГІ КАПУЛЕЦІ

Трыццаць год таму назад.

1-ШЫ КАПУЛЕЦІ

Ды што ты — менш. Адкуль жа трыццаць год?
Лючэнцыо вяселле мы гулялі.
І як ты, браце, час ні падганяй,
Дык больш як дваццаць пяць гадоў не будзе.

2-ГІ КАПУЛЕЦІ

Не, больш. Яго ўжо сыну трыццаць будзе.

1-ШЫ КАПУЛЕЦІ

Ну, што ты кажаш! Два гады назад
Непаўналетнім ён яшчэ лічыўся.

РАМЭО

(слузе з сваёй кампаніі)
Скажы, што гэта за сіньёра там
Прыгожая такая, з кавалерам?

СЛУГА

Не ведаю, сіньёр, што за яна.

РАМЭО

Агням бы у яе свяціць вучыцца.
Яна ўначы — цудоўна незямная.
Нібы алмаз у вуху маўра, ззяе.
Не на зямлі б ёй трэ было радзіцца,
Яна красуецца сярод дзяўчынак,
Як белая галубка між варон.
Яе краса красе другіх — урон.
Як толькі будзе ў танцы перапынак,
Я стану на пазіцыі такой,
Каб дакрануцца да яе рукой,
І гэта шчасцем будзе для мяне.
Ці ж ведаў я любоў дагэтуль? Не!
Ранейшага зракліся сёння вочы —
Красы не бачыў я да гэтай ночы...

ТЫБАЛЬТ

Мантэкі чую я нахабны голас.
Падай мне шпагу, паж. Нягоднік гэты
Прыйшоў пад маскаю, каб насміхацца
Над нашаю святочнаю бяседай.
Я чэсцю роду слаўнага клянуся,—
Забіць яго — граху не пабаюся.

КАПУЛЕЦІ

Што там, пляменнік? Ты чаго ўскіпеў?

ТЫБАЛЬТ

Ды вораг наш сюды прыйсці пасмеў
З намерам подлым, злосным і заўзятым —
Паздзекваццa над намі і над святам.

КАПУЛЕЦІ

Юнак Рамэо?

ТЫБАЛЬТ

Так, падлец Рамэо.

КАПУЛЕЦІ

Ты супакойся, не чапай яго;
Трымае ён сябе, як дваранін,
І, праўду кажучы, ў Вероне ён
Адзін з найбольш прыстойных юнакоў.
Яго ў сваім я доме не пакрыўджу.
А ты сцярпі і не звяртай увагі;
Я так хачу. Загад мой паважай.
Будзь ветлівым і твару не нахмурвай,
Зласлівым быць у свята непрыстойна.

ТЫБАЛЬТ

Калі падлец прыйшоў у дом — прыстойна.
Яго не пацярплю.

КАПУЛЕЦІ

Цярпець прымушу.
Маўчаць, хлапчук! Сказаў я — дык прымушу.
Хто гаспадар тут? Я ці ты? Ану!
«Не пацярплю». Ах, божа літасцівы!
Ён будзе бунтаваць гасцей маіх.
Ён будзе тут распараджацца мне.

ТЫБАЛЬТ

Дык гэта ж сорам, дзядзя.

КАПУЛЕЦІ

Прэч пайшоў!
Што ты нахабнік, гэта ўсім вядома.
Глядзі, раскаешся, ды позна будзе.
Супроць мяне ідзе ён. Не, даволі!
— Цудоўна сказана! — Ідзі, нахабнік!
Ды сціхні, бо... Святла давайце! — Сорам.
Я ўціхаміру.— Весялей, сябры!

ТЫБАЛЬТ

Ад ярасці я ўвесь успламянеў,
Цярпенне сілай не патушыць гнеў.
Пайду. Салодкасць гэтага ўварвання
Яму гарчэй атруты горкай стане.

РАМЭО

(Джульеце)

Рукою грэшнай да тваёй рукі
Я дакрануўся — дай мне паратунак!

Вось губы-пілігрымы — грэх такі
Гатоў загладзіць кволы пацалунак.

ДЖУЛЬЕТА

Судзіць так строга рукі вам няможна,
Павінны быць яшчэ вы ўдзячны ім:
Яны святыню краталі набожна,
І ад граху ўратован пілігрым.

РАМЭО

Тады нашто ўжо маем губы мы?

ДЖУЛЬЕТА

На тое толькі, каб чытаць псалмы.

РАМЭО

Але яны цябе, святую, моляць,
Каб тое, што рукам, і ім дазволіць.
Прымі маленне іх, не засмучай,
Бо выклічаш бязвер'е і адчай.

ДЖУЛЬЕТА

Святыя нерухомы пры мальбе.

РАМЭО

Дык нерухомай будзь, малю цябе.
Пакуль даткнуся я да губ святых
І гэтым грэх цяжкі зніму з сваіх.

(Цалуе яе.)

ДЖУЛЬЕТА

Дык на маіх губах павінен ён застацца?

РАМЭО

Мой грэх? Дакор салодкі мне, прызнацца.
І грэх свой я вазьму назад...

(Цалуе зноў.)

Вось так.

ДЖУЛЬЕТА

Аднак жа цалавацца вы — мастак.

КАРМІЛІЦА

(Джульеце)

Там мама кліча вас на пару слоў.

РАМЭО

Хто ж маці гэтае сіньёры?

КАРМІЛІЦА

Маці?

Ды гаспадыня гэтага вось дому,—
Надзвычай добрая, разумная,
Шаноўная жанчына. А дачку,
З якой вы гаварылі толькі што,

Карміла я грудзьмі, і вы паверце —
Шчаслівы той, хто ёю заўладае.

РАМЭО

Дык гэта Капулеці. Не гадаў,
Як ворагу ў заклад жыццё аддаў.

БЕНВОЛІО

Пайшлі дамоў. Канец гулянню тут.

РАМЭО

Канец гульні, ды не канец пакут.

КАПУЛЕЦІ

Не, не, сіньёры, крышку пачакайце,—
Вось зараз будзе лёгкая закуска.
Не можаце застацца? Ваша воля.
Усім вам дзякую. Спакойнай ночы!
Гэй, факелаў сюды. І нам пара
Ужо на бакавую.
(Другому Капулеці.)
Позна, брат!
Пайсці заснуць.

Выходзяць усе,
апрача Джульеты і кармілiцы.

ДЖУЛЬЕТА

(кармілiцы)
Ідзі сюды... Што гэта за сіньёр?

КАРМІЛІЦА

А гэта ж сын Тыберыя старога,—
Яго наследнік.

ДЖУЛЬЕТА

А ў дзверах вунь той?

КАРМІЛІЦА

А гэта быццам малады Петручыо.

ДЖУЛЬЕТА

А той вунь, што не танцаваў — хто гэта?

КАРМІЛІЦА

Не ведаю.

ДЖУЛЬЕТА

Ідзі, даведайся,
Хто ён такі, як зваць.
(Кармілiца адыходзіць.)
Жанаты, можа,
Тады труна мне будзе шлюбным ложам.

КАРМІЛІЦА

(вярнуўшыся)

Сын ворага ён вашага — Мантэкі,
Адзіны сын у бацькі, зваць — Рамэо

ДЖУЛЬЕТА

Ах, ненавісць адзіная мая!
З цябе любоў мая паўстала грозна:
Не ведаўшы, яго спаткала я,
Спаткаўшы, я даведалася позна.
Што здолела любоў са мной зрабіць!
Я ворага прымушана любіць.

КАРМІЛІЦА

Што, што?

ДЖУЛЬЕТА

Нічога... Верш я ўспамінаю.
Што мне сказаў адзін танцор сягоння.

ГОЛАС ЗА СЦЭНАЙ

Джульета!

КАРМІЛІЦА

Зараз. Годзе ўспамінаць,
Гасцей няма, і нам пара ўжо спаць.

(Выходзіць.)

АКТ ДРУГІ

Пралог

Уваходзіць х о р.

ХОР

Была адна любоў, цяпер другая,
Ад першай знік навекі ў сэрцы след.
Была любімая і дарагая,
Ды новая краса зацьміла свет.

Рамэо любяць, і Рамэо любіць,
Але не суджаны ім шчасця дні:
Варожасць злая, што іх долю губіць,
Лягла прадоннем страшнай глыбіні.

З даўных-даўна ідуць яе карэнні,
Рамэо ў доме любай — не жаніх.
Калі ж і дзе яна яго сустрэне
І ўсцеражэ ад страшнай помсты іх?

Ды возьме верх любоў над гневам лютым,
І асалода зменшыць іх пакуты.
(Выходзіць.)

Сцэна першая

Пляц, які мяжуецца з садам Капулеці.

РАМЭО
Куды ж ісці, калі маё тут сэрца?
Сюды, сюды, да цэнтра прыцяжэння.
(Пералазіць цераз сцяну і знікае за ёй.)

Уваходзяць Бенволіо і Меркуцыо.

БЕНВОЛІО
Рамэо! Брат Рамэо!
МЕРКУЦЫО
Ён разумны.
Напэўна дома ўжо і ўклаўся спаць.
БЕНВОЛІО
Ды не, пабег сюды, тут пералез.
Пакліч яго, Меркуцыо.
МЕРКУЦЫО
Вар'ят Рамэо, блазан, страсць, любоўнік!
З'явіся нам хаця, як уздыханне,
Адзін хоць верш скажы, і буду рад я.
Скажы «на жаль», зрыфмуй «любоў» і «кроў»,
Шапні слаўцо маёй куме Венеры,
Сынка яе сляпога падражні —
Амура, што ў цара так спрытна стрэльнуў,
І той жабрачку палюбіў праз гэта.
Ні водгуку ніякага, ні руху —
Памёр няшчасны. Хіба дух яго
Я заклінаннем выклічу сюды.
Вачамі Разаліны заклікаю,
Яе чалом, пунсовымі губамі,
Маленькай ножкай, трапяткім бядром

І тым дабром, што па суседству з ім,—
З'явіся нам у вобразе сваім.

БЕНВОЛІО

Ён раззлуецца, як пачуе гэта.

МЕРКУЦЫО

Чаго злавацца? Я ж прашу яго
Сюды з'явіцца у імя красуні.

БЕНВОЛІО

Хадзем, схаваўся недзе ён між дрэў;
Вільготны змрок якраз яму да сэрца:
Любоў сляпая — цемра ёй падходзіць.

МЕРКУЦЫО

Сляпая, дык у цэль ёй не папасці.
Ён недзе пад кізілавым кустом
Сядзіць і марыць, каб яго красуня
Кізілавым пладом раскрытым
Сама з галінкі ўпала на яго.
Рамэо, хай жа станецца ўсё так,
Як ты жадаеш. Ну, бывай, Рамэо!
Пайду я ў мяккую пасцель, бо тут
Я на зямлі халоднай не засну.
Ну што ж, хадзем.

БЕНВОЛІО

Хадзем, дарэмна будзем
Шукаць таго, хто сам ад нас схаваўся.

Сцэна другая

Сад Капулеці.

Уваходзіць Рамэо.

РАМЭО

Смяецца з раны той, хто ран не меў.

Джульета з'яўляецца ў акне наверсе.

Чакай! Што за святло ў акне мільгае?
Там палымнее ўсход. Джульета — сонца.
Устань жа, сонца, і забі ты месяц,
Які збялеў ад зайздрасці і злосці,
Што ты — слуга сваёю прыгажосцю
Яго зацьміла і яму балюча.
Пакінь служыць зайздросніку і скінь

Убор весталкі палінялы, бледны,
Які да твару толькі нездаровым.
Мая ўладарніца! Любоў мая!
О, каб ты ведала... Яна гаворыць...
Не, маўчыць... Гавораць толькі вочы.
Што ж, я ім адкажу... Не, гэта дзёрзка.
Не мне гавораць. Гэта зоркі дзве,
Пакінуўшы на час начное неба,
Прасілі тых вачэй, каб пасвяцілі,
Пакуль не вернуцца. Каб сапраўды
З вачамі зоркі месца памянялі,
Дык ад румянца шчок памерклі б зоры,
Як меркне лямпа перад ясным сонцам,
А вочы ў небе ярка б так гарэлі,
Што птушкі б палічылі ноч за дзень
І, як уранні, радасна б запелі.
Вунь на руку аперлася шчакой.
Каб мне пальчаткай быць яе рукі
І дакрануцца да шчакі!

ДЖУЛЬЕТА

О гора!

РАМЭО

Гаворыць. Гавары, мой светлы ангел!
Над галавой маёй ты так жа ззяеш,
Як ззяе пасланец крылаты неба,
Калі плыве на воблаках лянівых,
І смертныя, закінуўшы галовы,
У захапленні ўслед яму глядзяць.

ДЖУЛЬЕТА

Рамэо! Ах, чаму Рамэо ты?
Ад бацькі адрачыся, ад імя,
А не — дык пакляніся мне, што любіш,
І я дачкой не буду Капулеці.

РАМЭО

Паслухаць мне яшчэ ці адказаць?

ДЖУЛЬЕТА

Не ты, адно імя тваё — мой вораг,
Ты ж сам сабой, зусім ты не Мантэкі.
Бо што ж Мантэкі? Твар, рука, нага
Ці што яшчэ? Імя другое ты
Сабе вазьмі. Бо што такое назва?
Як ружу ні заві, а пах той самы.
Рамэо, каб і не Рамэо быў,
І без імя застаўся б ён цудоўным.

О, скінь імя, Рамэо, бо яно ж
Не частачка цябе, і за імя
Ты ўсю мяне вазьмі.

РАМЭО

Лаўлю на слове.
Ты любым назаві мяне, і я
Ахрышчан зноў і болей не Рамэо.

ДЖУЛЬЕТА

Хто ж ты, што ў змроку гэтай ціхай ночы
Маю падслухаў тайну?

РАМЭО

Я не смею
Імя сваё назваць, мая святыня!
Імя маё — варожае табе,
Таму яно агідна мне самому.
Калі б яго напісаным я ўбачыў,
Дык на шматкі паперу б разарваў.

ДЖУЛЬЕТА

Яшчэ і сотні слоў я не пачула,
А ўжо цябе па голасу пазнала.
Ды ты ж Рамэо. Праўда? Ты Мантэкі?

РАМЭО

Ніводзін з іх. Яны табе агідны.

ДЖУЛЬЕТА

Скажы, чаго ты тут і як ты трапіў?
Сцяна высокая — не пералезці.
Калі з радні мае цябе хто-небудзь
Застане тут, дык смерць табе на месцы.

РАМЭО

Любоў мяне на крыллях перанесла,
Бо для любві і мур — не перашкода,
На ўсё адважыцца яна пасмее;
Што значыць для мяне твая радня?

ДЖУЛЬЕТА

Яны заб'юць цябе, як толькі ўбачаць.

РАМЭО

Мне вочы мілыя твае страшней,
Чым дваццаць шпаг. Зірні прыхільна ты,
І загартован я супроць іх злосці.

ДЖУЛЬЕТА

О гора мне, калі цябе заўважаць!

РАМЭО

Мяне схавае ноч пад плашч свой чорны.
Калі ж не любіш — дык няхай знаходзяць.

Ляпей ад іх варожасці загінуць,
Чым смерці ждаць мне без тваёй любві.

ДЖУЛЬЕТА

Хто ж паказаў сюды табе дарогу?

РАМЭО

Любоў мяне на пошукі паслала,
Дала параду, я ж ёй вочы даў.
Я не марак, але каб ты была
Далёка, як зямля за акіянам,
Паплыў бы я па гэтакі тавар.

ДЖУЛЬЕТА

Начная маска твар мой прыкрывае,
А то б убачыў чырвань на шчаках
Ад слоў маіх, якія ты падслухаў.
Каб захаваць прыстойнасць, я ахвотна б
Ад сказанага мною адраклася,
Але — бывай, прыстойнасць! Любіш ты
Мяне? Вядома, скажаш ты — люблю,
І я паверу. Хоць і даўшы клятву,
Ты можаш здрадзіць. Кажуць, сам Юпітэр
З любоўнай клятвы кпіць. Рамэо, мілы!
Скажы мне праўду — любіш ты мяне?
Калі ж ты думаеш, што вельмі хутка
Здалася я, дык я насуплюся,
Упартай стану, і тады ў адказ
Пачуеш — не. І нізашто на свеце...
Я моцна так люблю, Мантэкі мілы,
Што выглядаю вельмі легкадумнай.
Павер, аднак, што я вярней за тых,
Што ўмеюць непрыступнымі здавацца.
І я трымалася б інакш, павер,
Каб ты употай не падслухаў тут
Прызнання шчырага маёй любві.
Даруй жа, не прымі за легкадумнасць
Таго, што ноч адкрыла выпадкова.

РАМЭО

Клянуся гэтым месяцам святым,
Што серабром абліў вяршыні дрэў...

ДЖУЛЬЕТА

О, не кляніся здрадлівым свяцілам,
Што кожны месяц зменьвае свой выгляд,
Каб не была любоў твая такой.

РАМЭО

А чым клясціся мне?

ДЖУЛЬЕТА

Нічым не трэба.
А не, дык бажаством любві маёй —
Самім сабою пакляніся ты,
Паверу я.

РАМЭО

Калі агонь любві...

ДЖУЛЬЕТА

Стой, не кляніся. Рада я табе,
Але не рада змове я начной...
Так гэта ўсё раптоўна, нечакана,
Як бліскавіца, што паспее згаснуць,
Пакуль ты скажаш слова — «бліскавіца».
Дабранач, мілы! Хай дыханне лета
Любві расток у кветку ператворыць,
Пакуль спаткаемся мы зноў. Дабранач!
Хай у тваёй душы спакой пануе,
Якім так поўна дышуць мае грудзі.

РАМЭО

І ты мяне пакінеш безуцешным?

ДЖУЛЬЕТА

А чым я больш магу цяпер уцешыць?

РАМЭО

Ты мне ўзамен за клятву клятву дай.

ДЖУЛЬЕТА

Дала яе раней, чым ты прасіў,
І моманту цяпер таго шкадую.

РАМЭО

Зара мая! Ты клятву ўзяць хацела б
Назад? Чаму?

ДЖУЛЬЕТА

Каб зноў яе дарыць.
Хачу ўладарыць тым, чым так багата.
Мая любоў бяздонная, а шчордасць —
Бязмежны акіян. Чым больш я іх
Дару табе, тым болей застаецца.
Яны ў мяне бясконцыя абедзве.

За сцэнай чуваць голас карміліцы.

Мяне завуць... Бывай, мой мілы!..— Зараз.
Іду, карміліца. Мантэкі, мілы,
Будзь верным! Пачакай, вярнуся я.
(Выходзіць.)

РАМЭО

О, самая шчаслівая з начэй!
Баюся я, што гэта сон прысніўся,
Чароўны вельмі ён, каб праўдай быць.

Джульета зноў паказваецца наверсе.

ДЖУЛЬЕТА

Яшчэ тры словы, мой Рамэо любы,
Тады ўжо сапраўды — бывай. Калі
Сумленна любіш і жаніцца хочаш,
Дык заўтра пасланцу майму скажы,
Дзе і калі вянчацца будзем мы,
І я свой лёс кладу к тваім нагам,
На край зямлі пайду за ўладаром.

КАРМІЛІЦА

(за сцэнай)

Сіньёра!

ДЖУЛЬЕТА

Зараз! І калі задумаў
Нядобрае. Прашу цябе...

КАРМІЛІЦА

Сіньёра!..

ДЖУЛЬЕТА

Ужо іду... Тады не дамагайся,
Пакінь мяне адну з маёй тугой.
Дык заўтра я прышлю...

РАМЭО

Душой клянуся...

ДЖУЛЬЕТА

Ну, сто разоў жадаю добрай ночы.

РАМЭО

У сто разоў мне ноч цямнейшай стала.
Як лёгка з кніжкай школьніку расстацца,
Так цяжка мне з любімай развітацца.

(Павольна ідзе да выхаду.)

ДЖУЛЬЕТА

(зноў паказваецца)

Рамэо! Ах, шкада, што не ўладаю
Я голасам сакольніка, каб зноў
Прывабіць сокала назад. Не можа
Няволі сіплы голас смела крыкнуць,
А то пячору б страсянула я,
Дзе рэха спіць, і голас бы яго

Паветраны ахрып мацней, чым мой,
Бясконца паўтараючы — Рамэо.

РАМЭО

Душа мая мяне заве. Чароўна,
Як музыкі сярэбраныя гукі,
Гучыць мне любы голас уначы.

ДЖУЛЬЕТА

Рамэо!

РАМЭО

Мілая!

ДЖУЛЬЕТА

Калі ж прыслаць
Мне заўтра?

РАМЭО

Раніцай у дзевяць.

КАРМІЛІЦА

Сіньёра.

ДЖУЛЬЕТА

Добра, я прышлю. Але ж
Да дзевяці чакаць мне — дваццаць год.
Забыла я, чаго цябе вярнула.

РАМЭО

Дазволь мне пастаяць, пакуль ты ўспомніш.

ДЖУЛЬЕТА

Не ўспомню я, каб ты даўжэй стаяў.
Адно я помню — добра мне з табой.

РАМЭО

Я пастаю, а ты ўсё забывай.
І сам забуду я пра ўсё на свеце.

ДЖУЛЬЕТА

Світае. Адпусціць цябе хачу я,
Але як птушку рэзвая дзяўчынка,
Якая дасць нявольніцы ўзляцець,
Ды за шнурок шаўковы зноў пацягне,
Раўнуючы яе да вольнай волі.

РАМЭО

Ахвотна б я тваёю птушкай быў.

ДЖУЛЬЕТА

І я хацела б гэтага, але
Пяшчотамі б замучыла цябе.
Дабранач! Ах, салодкі боль расстання!
Я расставалася б з табой да рання.

РАМЭО

Спакой і сон ўладаюць хай табою,
Твайму я сну зайздрошчу і спакою.
Пайду к Ларэнца. У айца святога
Параду я знайду і дапамогу.
(Выходзіць.)

Сцэна трэцяя

Келья брата Ларэнца.

Уваходзіць брат Ларэнца з кошыкам.

БРАТ ЛАРЭНЦА

Ужо ўсміхнуўся ранак шэравокі
Пахмурнай ночы, неба край далёкі
Падзалаціў, і змрок сышоў, як п'яны,
З дарогі вогненных калёс Тытана.
Пакуль агністым вокам дня красу
Не асвяціла сонца і расу
Не асушыла з траў, імглісты золак
Пакуль не высах, променем сагрэты,
Павінен назбіраць я ў кошык гэты
Гаючых кветак і атрутных зёлак.
Зямля — прыроды маці і магіла —
Дзяцей бясконцы лік грудзьмі ўспаіла.
Народжаныя маткаю адной —
Яны каштоўны вартасцю сваёй,
Хоць кожнае адменны выгляд мае.
Шмат сіл дзівосных у сабе хавае
Расліна кожная і кожны камень,
Шмат якасцей, не скарыстаных намі.
Няма нічога злога на зямлі,
З чаго б дабра хоць каплю не ўзялі.
Дабра ж нядобрае прыстасаванне
Становіцца крыніцай злоўжывання.
У гэтай кветцы ёсць і сок атруты,
І сродак — людзям аблягчыць пакуты.
Панюхай — целу свежасць дасць і сілу,
А паспытай — паложыць у магілу.
І сэрца чалавечае такое:

Як зло ў ім над дабром пераважае,
Чарвяк смяротны кветку паражае.

Уваходзіць Рамэо.

РАМЭО
Дзень добры, ойча!
БРАТ ЛАРЭНЦА
Будзь благаслаўленны!
Чый голас прывітаў мяне так рана?
Юнак, твой «добры дзень» парой такою —
Адзнака клопату і неспакою.
На варце клопат пры старых вачах,
Не дапускае сну ён па начах,
А дзе юнацтва, што турбот не знае,
Над ложкам там спакойны сон лунае.
Маглі цябе падняць у рань такую
Турботы нейкія, як я мяркую.
А праўдзівей яшчэ калі сказаць —
Ты гэту ноч зусім не клаўся спаць.
РАМЭО
Ты адгадаў, але праз гэта мне
Ноч прыямнейшаю была ўдвайне.
БРАТ ЛАРЭНЦА
Хай бог даруе. З Разалінай быў?
РАМЭО
Не, ойча, я зусім яе забыў.
БРАТ ЛАРЭНЦА
Ну, гэта добра. А калі не з ёй,
Дык дзе ж?
РАМЭО
Маўчы і слухай, ойча мой.
Быў на піры я ў ворага свайго,
Там раніў ён мяне, а я — яго.
Дык вось я з просьбай да айца святога:
Абодвум нам патрэбна дапамога.
Злабы на ворага я не нашу:
І за сябе і за яго прашу.
БРАТ ЛАРЭНЦА
Будзь шчырым, сын, адкрый усё зараз:
Якая споведзь, дык такі і адказ.
РАМЭО
Дык ведай жа... Мацней за ўсё на свеце
Мы любімся з дачкою Капулеці;
Як мне яна, дык так і я ёй люб,

І нас навек з'яднаць павінен шлюб.
Як мы сышліся, як пакляўся ёй,
Дарогай раскажу я, ойча мой.
Цяпер жа папрашу мне абяцаць,
Што будзеш ты сягоння нас вянчаць.

БРАТ ЛАРЭНЦА

Святы Францыск! Якая перамена!
Любіў ты Разаліну так страшэнна
І хутка так забыў. У юнакоў,
Відаць, не ў сэрцы, а ў вачах любоў.
Ах, Езус-Мар'я. Ад любві шалёнай
Яшчэ зусім нядаўна цёк з вачэй
Па бледных шчоках горкіх слёз ручэй.
Прапала марна шмат вады салёнай,
Якой ты прыпраўляў тваё каханне.
Яшчэ ж і воблакаў твайго ўздыхання
Не разагнала сонца ў небясах,
І енк твой у маіх старых вушах
Яшчэ стаіць, і на шчацэ забыты
Нядаўніх слёз я бачу след нязмыты.
Калі сабой ты быў, а боль — тваім,
Дык Разаліне ты належаў з ім.
Калі мужчына нетрывалы ў страсці,
Дык тым лягчэй слабой жанчыне пасці.

РАМЭО

Ты ж дакараў, што я люблю яе.

БРАТ ЛАРЭНЦА

Не за любоў — за дурасці твае.

РАМЭО

Ты раіў пахаваць любоў благую.

БРАТ ЛАРЭНЦА

Не для таго, каб адкапаць другую.

РАМЭО

Не гавары дакорлівых мне слоў.
Яна любоўю плаціць за любоў,
Не так, як тая.

БРАТ ЛАРЭНЦА

Разгадала тая,
Што бойка так любоў тваю чытае
На памяць, хоць не ведае складоў.
Ну што ж, хадзем. Я памагчы гатоў.
Мо шлюб дзяцей бацькам саслужыць службу
І ператворыць іх злабу у дружбу.

РАМЭО
Хутчэй, хутчэй, мяне чакае шчасце.
БРАТ ЛАРЭНЦА
Хто так спяшаецца, той можа ўпасці.

Сцэна чацвёртая

Вуліца.

Уваходзяць Бенволіо і Меркуцыо.

МЕРКУЦЫО
Куды ж таго Рамэо чэрці ўзялі?
Што, дома ён не начаваў сягоння?
БЕНВОЛІО
Не начаваў — пытаўся я ў слугі.
МЕРКУЦЫО
І ўсё тут Разаліна вінавата —
Дзяўчынка бледнашчокая і злая.
Ён звар'яцее зараз праз яе.
БЕНВОЛІО
Тыбальт — сваяк старога Капулеці —
Прыслаў сягоння ў дом пісьмо яму.
МЕРКУЦЫО
Магу ў заклад ісці, што гэта выклік.
БЕНВОЛІО
Ну што ж, Тыбальту ён адкажа.
МЕРКУЦЫО
Кожны, хто ўмее пісаць, зможа адказаць на пісьмо.
БЕНВОЛІО
Не пісьмом адкажа, а выклікам на дзёрзкі выклік.
МЕРКУЦЫО
На жаль, небарак Рамэо мёртвы ўжо. Пранізалі яго наскрозь чорныя вочы бялявай дзяўчынкі. Вуха яго прастрэлена любоўнай песенькай. У сэрца, у самую сярэдзіну, трапіла яму страла сляпога хлапчука. Ну, дзе ж яму цяпер цягацца з Тыбальтам?
БЕНВОЛІО
А што ж такое Тыбальт?
МЕРКУЦЫО
Напэўна ўжо не які-небудзь кашачы цар Тыберт, а крыху важней. О, ён герой далікатных манер. Ён б'ецца на паядынку, усё роўна як ты па нотах спяваеш.

Захоўвае адлегласць, меру, тэмп, вытрымлівае кароценькую паўзу — раз, два, а трэці ўжо ў грудзях у вас. Ён сапраўдны згубіцель гузікаў, што на канцах рапір. Дуэлянт, дуэлянт. Дваранін самага першага гатунку, знаток першых і другіх зачэпак для дуэлі. Ах, бяссмертнае: pass ado, яго punto reverso, яго hai![1]..

БЕНВОЛІО

Што?

МЕРКУЦЫО

Чорт бы іх пабраў гэтых модных блазнаў, манерных балбатуноў, што мову перакручваюць на новы лад: «Клянуся Езусам, дзівосны клінок, надзвычайны мужчына, цудоўная дзеўка». Хіба не крыўдна, друг, што нас апаноўваюць гэтыя чужаземныя мухі, гэтыя модныя pardonnez moi[2], такія сквапныя да новых убораў, што ім на старых лаўках і сядзець у іх нязручна. Агідна слухаць гэтых іх «bon, bon»[3].

Уваходзіць Рамэо.

БЕНВОЛІО

Вось і Рамэо ідзе, вось і Рамэо.

МЕРКУЦЫО

Вялы, як марынованы селядзец. О, мяса, мяса! Як ты так абрыбілася? Ён увесь цяпер расплыўся ў настроях Петраркі. Лаура — у параўнанні з яго любай — кухарка, хоць яе палюбоўнік апяваў яе куды лепш. Дыяна — няўклюда, Клеапатра — цыганка, Елена і Гера — вулічныя флюндры. Фіоба хоць і мае шэрыя вочы і яшчэ там нешта такое, але і яна ні к чорту не варта. Сіньёр Рамэо, bonjour![4] Французскае прывітанне вашым французскім штанам. Вы нас здорава падвялі ўчора вечарам.

РАМЭО

Добры дзень вам абодвум. Як я вас падвёў?

МЕРКУЦЫО

Уцяклі, сіньёр, уцяклі. Хіба не памятаеце?

РАМЭО

Даруй мне, добры Меркуцыо, у мяне былі важныя справы. У такіх выпадках, як мой, можна ўхіліцца ад правіл далікатнасці.

---

[1] Выпад, адбой, крануў! *(італ.)* — фехтавальныя тэрміны.

[2] Прашу прабачэння *(фр.)*.

[3] Добра, добра *(фр.)*.

[4] Добры дзень! *(фр.)*

МЕРКУЦЫО

Ты хочаш сказаць, што ў падобных выпадках не грэх і схіліцца.

РАМЭО

З далікатнасці, вядома.

МЕРКУЦЫО

Ну так, ты з далікатнасці даволі гнуткі.

РАМЭО

А ты ад гнуткасці такі далікатны са мною.

МЕРКУЦЫО

Я — цвет далікатнасці.

РАМЭО

Кветачка. Сапраўдны букет.

МЕРКУЦЫО

Вядома.

РАМЭО

У мяне вось на туфлях такія кветкі.

МЕРКУЦЫО

Здорава сказана. Ганяйся ж ты з гэтым жартам за мной, пакуль не стопчуцца падэшвы тваіх адзіных туфель, тады прыйдзе канец і адзінаму твайму жарту.

РАМЭО

Вось гэта жарт — сапраўды адзіны ў сваім родзе, які не варт падэшвы маіх туфель.

МЕРКУЦЫО

Ратуй, добры Бенволіо, а то мой досціп слабее.

РАМЭО

Паганяй яго і прышпорвай, паганяй і прышпорвай, а то я крыкну — абагнаў.

МЕРКУЦЫО

Калі твае жарты паляцяць адзін за адным, як дзікія гусі, дык я прапаў. У цябе ў адным пачуцці больш дзічы, чым у мяне ў пяці. Ва мне ж няма нічога гусінага.

РАМЭО

Ты сам добры гусак. Гэта ж пра цябе гавораць: «З яго, як з гусака вада».

МЕРКУЦЫО

Я табе вуха адшчыпну за гэта.

РАМЭО

Будзь добрым гусаком і не шчыпліся.

МЕРКУЦЫО

Твой жарт — страшэнная кісляціна, як дзікае яблыка.

РАМЭО

Гэта не дрэнная прыправа да тлустага гусака.

МЕРКУЦЫО

Твой жарт расцягваецца, як казіная шкура. Ён у цябе на вяршок, а ты расцягваеш яго на сажань.

РАМЭО

Я расцягну яго да поўнай меры і абкручу ім гусака, дык і выйдзе, што ты гусак у поўнай меры.

МЕРКУЦЫО

Ну вось, хіба гэта не лепш, чым стагнаць і хныкаць ад любві? Цяпер ты зноў той самы Рамэо. Як мае быць Рамэо і па натуры і па выхаванню. А гэта слінявая любоў падобна на блазна, што, высунуўшы язык, кідаецца сюды і туды, шукаючы дзіркі, каб схаваць сваю цацку.

БЕНВОЛІО

Стой, стой, даволі.

МЕРКУЦЫО

Чаму — стой?

БЕНВОЛІО

Каб твая гаворка не была бясконцай.

МЕРКУЦЫО

А калі я буду стаяць, дык, думаеш, хутчэй да канца дайду. Наадварот, я быў бы ўжо ў канцы, каб ты мяне не спыніў.

Уваходзяць кармеліца і П'етра.

РАМЭО

Вось дык убор!

МЕРКУЦЫО

Парус, парус!

БЕНВОЛІО

Два: спадніца і штаны.

КАРМІЛІЦА

П'етра.

П'ЕТРА

Чаго?

КАРМІЛІЦА

Дай мой веер, П'етра.

МЕРКУЦЫО

Падай ёй, П'етра. Няхай яна веерам прыкрые свой твар. Так будзе прыгажэй.

КАРМІЛІЦА

Добры дзень вам, сіньёры!

МЕРКУЦЫО

Добры вечар, сіньёра.

КАРМІЛІЦА

Хіба ўжо вечар?

МЕРКУЦЫО

Каля гэтага. Ужо стрэлка-распусніца стаіць на дванаццаці.

КАРМІЛІЦА

Ідзіце прэч. Што вы за чалавек?

РАМЭО

Чалавек, якога бог стварыў дый сам каецца.

КАРМІЛІЦА

Вось гэта, дальбог, добра сказана. І сам каецца... Сіньёры, ці не скажа мне хто з вас, дзе я магу знайсці маладога Рамэо?

РАМЭО

Гэта я магу сказаць. Але малады Рамэо, калі вы яго знойдзеце, будзе старэйшы, чым тады, калі вы пачалі яго шукаць. З усіх, хто носіць гэта імя, я самы малодшы, калі не самы горшы.

КАРМІЛІЦА

Як вы хораша гаворыце.

МЕРКУЦЫО

Хораша, што ён самы горшы? Здорава сказанула. Разумна, разумна.

КАРМІЛІЦА

Калі гэта вы — ён, сіньёр, дык я хачу сказаць вам нешта па сакрэту.

БЕНВОЛІО

Напэўна, запрашэнне на вячэру.

МЕРКУЦЫО

Зводніца, зводніца! Ату яе!

РАМЭО

Каго ты цкуеш?

МЕРКУЦЫО

Не зайца, сіньёр, а можа, і зайца, запечанага ў посным пірагу, які счарсцвеў і зацвіў раней, чым яго пачалі есці. *(Спявае.)*

Заяц шэры, сталы ўзростам,
Можна есці нават постам —
Не скаромная яда;
Толькі высах ён без меры,
Састарэўся заяц шэры,
І пратух ён — вось бяда.

Рамэо, будзеш ты сёння дома ў свайго бацькі? Мы ж ідзём туды абедаць.

РАМЭО

Я іду следам за вамі.

МЕРКУЦЫО

Бывайце, старэнькая сіньёра.

(Спявае.)

«Сіньёра, сіньёра, сіньёра!..»

Выходзіць з Бенволіо.

КАРМІЛІЦА

А такі ж бывайце. Скажыце, сіньёр, хто гэты нахабнік, напханы ўсялякім паскудствам?

РАМЭО

Гэта, няня, чалавек, які любіць слухаць сябе самога і за адну мінуту нагаворыць столькі, колькі сам не пераслухае за месяц.

КАРМІЛІЦА

Няхай толькі ён скажа што-небудзь наконт мяне, дык я з ім упраўлюся, хоць бы ён быў дужэйшы, чым ёсць. Спраўлюся і яшчэ з дваццаццю такімі ўрвіцелямі. А не сама, дык нехта ўправіцца. Ах, паскуднік! Што я яму — дзеўка гуляшчая ці шалахвост які з яго шайкі?

(Да П'етра.)

А ты што стаіш, разявіўшы рот? Табе і нічагуткі, што кожная шэльма мною забаўляецца.

П'ЕТРА

Я не бачыў, каб хто з вамі забаўляўся, іначай я адразу выняў бы свой меч. Я вымаю яго так жа хутка, як і кожны іншы, калі ёсць для гэтага зручны выпадак і калі закон на маім баку.

КАРМІЛІЦА

Мяне такая злосць узяла, што я аж калачуся ўся. Калі ласка, сіньёр, на адно слоўца. Як я ўжо сказала, мая маладая сіньёра даручыла мне знайсці вас... ну, а што яна загадала вам сказаць, пра гэта я памаўчу пакуль што. Спачатку дазвольце вам далажыць, што калі вы маеце намер, як той казаў, толькі пазабаўляцца з ёю, дык гэта будзе, як той казаў, вельмі дрэнны ўчынак, бо яна ж яшчэ такая маладая, і таму, калі хочаце ашукаць яе, дык гэта будзе нядобры ўчынак; ашукаць такую высакародную дзяўчыну — гэта брыдка.

РАМЭО

Няня, кланяйся ад мяне сіньёры. Клянуся...

КАРМІЛІЦА

Вось добрая душа! Клянуся, што я ўсё гэта ёй раскажу. Яна будзе найшчаслівейшай жанчынай у свеце.

РАМЭО

Што ж ты ёй раскажаш, няня? Ты ж не даслухала мяне.

КАРМІЛІЦА

Я скажу ёй, сіньёр, што вы пакляліся, а гэта, як я разумею, і ёсць якраз тое самае, што павінен рабіць высакародны чалавек.

РАМЭО

Скажы ёй,
Няхай яна прычыну знойдзе сёння
Прыйсці на споведзь. Там айцец Ларэнца
Звянчае нас. Вазьмі вось за паслугі.

КАРМІЛІЦА

Не, не, сіньёр, ды што вы! Нічога не вазьму.

РАМЭО

Ну, вось яшчэ. Бяры, кажу!

(Дае ёй грошы.)

КАРМІЛІЦА

Дык сёння адвячоркам? Добра, прыйдзе.

РАМЭО

Ты за сцяной манастыра чакай.
Слуга мой прыйдзе зараз жа туды
І лесвіцу вяровачную дасць.
Па ёй у змроку ночы я ўзнімуся
На самую вяршыню шчасця. Ну,
Бывай і вернай будзь. Я за паслугу
Аддзякую. Джульеце прывітанне.

КАРМІЛІЦА

Няхай вам бог паможа... Пачакайце!

РАМЭО

Што, дарагая няня?

КАРМІЛІЦА

Ваш слуга
Ці верны? Бо сакрэт датуль сакрэтам,
Пакуль адзін з дваіх не быў пры гэтым.

РАМЭО

Ручаюся, што верны ён, як сталь.

КАРМІЛІЦА

Ну, добра, сіньёр. Мая сіньёра — найлепшая ў свеце. Божа ты мой, божа! Калі яна была яшчэ маленькая, толькі яшчэ лепятаць пачынала... О, ёсць, ведаеце, у горадзе адзін дваранін, граф Парыс, дык вельмі ж ён ласа паглядае на яе, а яна, небарака, глядзець на яго не можа, як на жабу, як на самую сапраўдную жабу-рапуху. Я часамі, каб падражніць яе, вазьму дый скажу,

што Парыс самы падхадзяшчы для яе мужчына. Як скажу так, дык яна аж пабляднее, проста як палатно белая стане... А гэта праўда, што размарын і Рамэо пачынаюцца з аднае літары?

РАМЭО

З аднае, няня; дык і што ж? Адно і другое пачынаюцца на «р».

КАРМІЛІЦА

Які вы жартаўнік! Гэта ж сабачая літара — ррр. Не, я ведаю, што яны пачынаюцца з другой літары. Бо яна так міла, так складна гаворыць пра вас і пра размарын, што вам бы люба было паслухаць.

РАМЭО

Кланяйцеся маладой сіньёры.

(Выходзіць.)

КАРМІЛІЦА

Тысячу раз буду кланяцца. П'етра!

П'ЕТРА

Чаго?

КАРМІЛІЦА

Вазьмі мой веер, ды ідзі наперад. Хутчэй!

Выходзяць.

Сцэна пятая

Сад Капулеці.

Уваходзіць Джульета.

ДЖУЛЬЕТА

Як няню я паслала, біла дзевяць,
Сказала — вернецца праз паўгадзіны.
А можа — не знайшла? Не! Быць не можа:
Яна кульгавая, марудзіць. У любві
За пасланцоў павінны мыслі быць,
Што дзесяць раз шпарчэйшыя за промень,
Які з узгоркаў змрок начны зганяе.
І нездарма ў Венерыну каляску
Запрэжаны крылатыя галубкі,
А ў Купідона крыллі быццам вецер.
Ужо над галавою сонца — поўдзень,

Пайшла ж у дзевяць — цэлых тры гадзіны,
І ўсё няма. Ёй хоць бы што. Нябось
Каб маладая кроў у ёй кіпела
І пал юнацкі, дык яна б лятала,
Як мячык той. Яе сваім бы словам
Я кінула да мілага свайго,
А ён бы — да мяне. Але старыя,
Як мёртвыя. Цяжкія на хаду.
Ну, дзе ж яна? Я з розуму сыду.
Ідзе! О божа!

Уваходзяць кармеліца і П'етра.

Няня, залатая!
Ну што, знайшла яго? Адпраў слугу.

КАРМІЛІЦА

Ідзі, чакай нас ля каліткі, П'етра.

П'етра выходзіць.

ДЖУЛЬЕТА

Ну, няня, дарагая! Божа мой!
Чаму ж ты хмурная? Благія весткі?
А ты ўсё роўна весела расказвай,
А добрыя — тады іх музыкі
Не псуй ты выглядам сваім панурым.

КАРМІЛІЦА

Стамілася, дай мне перадыхнуць.
Ух, косці як баляць! Вось дык прагулка!

ДЖУЛЬЕТА

Вазьмі мае, а мне свае дай косці,
Хутчэй расказвай толькі, дарагая.

КАРМІЛІЦА

Паспееш. Пачакай хвілінку. Бачыш,
Што дух мне заняло.

ДЖУЛЬЕТА

Не заняло,
Калі змагла сказаць, што заняло.
Больш часу траціш ты на адгаворкі,
Чым трэба на само апавяданне.
Скажы хоць — вестка добрая ці не,
А рэшту скажаш потым. Заспакой жа!
Інакш і я табе не дам спакою.

КАРМІЛІЦА

Адно скажу — выбар твой няўдалы. Не ўмееш выбіраць мужчын. Рамэо? Ды куды ён варты? Хоць з твару ён і

прыгажэйшы за ўсіх мужчын, але затое нага яго самая дасканалая з усіх ног. А яго рукі — стан — хоць пра іх і нельга нічога сказаць, але я не ведаю, з чым іх і параўнаць. Наконт ветлівасці — не скажу, не скажу, каб вельмі ўжо, але рахманы ён, як ягнятка... Ідзі, дзеўка, памаліся богу за свой лёс... А што — у нас ужо абедалі?

ДЖУЛЬЕТА

Не, не! Я ж гэта ведала раней.
Скажы, што пра вяселле ён сказаў?

КАРМІЛІЦА

Як галава баліць! Ох, галава!
Аж разрываецца на дваццаць частак.
А паясніца! Ох ты, паясніца!
Як ломіць! І табе не грэх за гэта?
Да смерці заганяеш ты мяне.

ДЖУЛЬЕТА

Шкада мне вельмі, што табе так дрэнна...
Скажы ж мне, мілая, што ён сказаў.

КАРМІЛІЦА

Твой любы сказаў, як чэсны дваранін, і ветлівы, і мілы, і прыемны, і, магу прысягнуць, што сумленны...
Дзе маці?

ДЖУЛЬЕТА

Дзе маці? Дома маці. Дзе ж ёй быць?
Як па-дурному ты гаворыш, няня:
«Твой любы, чэсны дваранін, сказаў —
Дзе маці»...

КАРМІЛІЦА

Божа, як яна ўскіпела!
Вось дык прыпаркі для касцей балючых!
Цяпер сама будзь пасланцом сваім.

ДЖУЛЬЕТА

Не злуйся... Ну, дык што ж сказаў Рамэо?

КАРМІЛІЦА

Цябе да споведзі адпусцяць сёння?

ДЖУЛЬЕТА

Адпусцяць.

КАРМІЛІЦА

Ну, дык ідзі ты да Ларэнца ў келью,
Там муж чакае, каб ты жонкай стала.
Глядзі, як кроў зайграла на шчаках!
Вось зараз больш яны пачырванеюць.
Ідзі ў царкву хутчэй, а я пайду
Дастану лесвіцу, каб мог твой мілы

Па ёй да птушачкі ў гняздо дабрацца,
Як змеркнецца. Вам радасць, а праз вас
Я цэлы дзень у клопаце, ў хадзьбе.
Але чакай, вось ночы прыйдзе час,
Цяжар тады ўжо ляжа на цябе.
Ідзі ж у келью. Я пайду абедаць.

ДЖУЛЬЕТА

Бывай! Іду я шчасце зведаць.
(Выходзіць.)

Сцэна шостая

Келья брата Ларэнца.

Уваходзяць брат Ларэнца і Рамэо.

БРАТ ЛАРЭНЦА

Хай бог благаславіць святы абрад
І горам за яго не пакарае.

РАМЭО

Амінь, амінь. Няхай хоць гора прыйдзе,
Дык радасці яно не перавысіць,
Што за адну мінуту з ёй пазнаеш.
Малітваю з'яднай ты нашы рукі,
А там — хай прыйдзе смерць, любві забойца —
Мне досыць, што яе назваў сваёй.

БРАТ ЛАРЭНЦА

У бурных радасцей канец раптоўны,
Іх перамога — смерць. Яны згараюць,
Як порах і агонь пры датыканні.
Салодкі мёд салодкасцю празмернай
Нам прыкрым робіцца і траціць смак.
Любі ты ў меру — будзе больш трывала,
Паспешны траціць так жа, як марудны.

Уваходзіць Джульета.

Вось і яна! Такой хадою лёгкай
Не пратаптаць каменных гэтых пліт.
Любоўніка ўтрымала б павуцінка,
Што носіць ветрык восенню лагоднай.
Такая лёгкая заўсёды марнасць.

ДЖУЛЬЕТА

Маё вам прывітанне, добры ойча!

БРАТ ЛАРЭНЦА

За нас абодвух дзякуе Рамэо.

ДЖУЛЬЕТА

Дык і яму таксама прывітанне,
Каб недарэмна дзякаваў ён мне.

РАМЭО

Калі ты поўна радасці, як я,
І зможаш выказаць яе мацней,
Тады паветра навакол напоўні
Сваім дыханнем, музыкаю слоў,
Ты перадай усю бязмернасць шчасця,
Якое нам дае спатканне наша.

ДЖУЛЬЕТА

Любоў не словамі багата — зместам,
Гардзіцца сутнасцю, а не уборам,
Адзін жабрак сваё багацце злічыць,
Мая ж любоў багатая без меры,
Я не магу злічыць і паўбагацця.

БРАТ ЛАРЭНЦА

Хадзем... Усё мы зробім за хвіліну.
Пакуль царква святая ў плоць адзіну
Не злучыць вас, адных я не пакіну.

Выходзяць.

АКТ ТРЭЦІ

Сцэна першая

Верона. Рыначны пляц.

Уваходзяць Меркуцыо, Бенволіо, пажы і слугі.

БЕНВОЛІО

Мой друг Меркуцыо, хадзем адгэтуль,
Гарачы дзень, гуляюць Капулеці.
Сустрэнемся — ад бойкі не ўхіліцца,
Такой гарачынёю кроў кіпіць.

МЕРКУЦЫО

Ты страшэнна падобны на аднаго з такіх малайцоў, што, як толькі ўвойдзе ў шынок, бразне сваю шпагу на стол і скажа: «Дай божа, каб ты мне сёння не спатрэбілася», а пасля другога кубка выхватвае яе, каб парнуць шынкара, хоць у гэтым няма ніякай патрэбы.

БЕНВОЛІО

Няўжо я падобны на такога?

МЕРКУЦЫО

Вядома. Ты такі ж забіяка, як кожны італьянец: як толькі разгарачышся, дык і закіпіш, а як закіпіш, дык вельмі гарачы.

БЕНВОЛІО

А тады што?

МЕРКУЦЫО

А тады,— каб вас было два такіх, дык не засталося б ніводнага: вы зараз жа забілі б адзін другога. Ты! Ды ты гатоў пабіцца з чалавекам за тое, што ў яго барадзе адным воласам больш ці менш, чым у цябе. Ты з чалавекам паб'ешся за тое, што ён арэхі лузгае, і толькі таму, што ў цябе вочы арэхавага колеру. Ну, чые вочы ўбачаць тут прычыну для бойкі, апрача тваіх? У тваёй галаве столькі задзёру, колькі ў яйцы бялка з жаўтком... хоць яна разам з тым пустая, як выедзенае яйцо, бо ў частых бойках з яе выбілі ўсе глузды. Ты раз пабіўся з чалавекам за тое, што ён кашляў на вуліцы і кашлем пабудзіў твайго сабаку, які спаў на сонцы. Хіба ты не счапіўся з краўцом за тое, што ён надзеў новы камзол, не дачакаўшыся вялікадня? З другім чалавекам ты пабіўся за тое, што ён завязаў новыя чаравікі старой істужкай. І ты яшчэ ўздумаў стрымліваць мяне ад бойкі.

БЕНВОЛІО

Калі я быў такі забіяка, як ты, дык я даўно ўжо запрадаў бы сваё жыццё першаму сустрэчнаму, калі б ён паручыўся хоць за адну гадзіну твайго існавання.

МЕРКУЦЫО

Жыццё прадаў бы? Ах ты, прастата.

БЕНВОЛІО

Клянуся галавой — ідуць Капулеці.

Уваходзяць Тыбальт і іншыя.

МЕРКУЦЫО

Клянуся пятой — мне хоць бы што.

ТЫБАЛЬТ

(да сваіх)

За мной! Я з імі буду гаварыць.

(Да Меркуцыо і Бенволіо.)

А, добры дзень, сіньёры! Аднаму з вас
Хацеў бы я сказаць адно славечка.

МЕРКУЦЫО

Аднаму з нас і толькі слова? А вы да слова што-небудзь прыбаўце, ну, хоць бы ўдар.

ТЫБАЛЬТ

Я гатоў і на гэта, дайце толькі зручны выпадак.

МЕРКУЦЫО

А калі не даць выпадку, дык самі вы ўзяць не можаце?

ТЫБАЛЬТ

Меркуцыо, і ты з Рамэо ў адну дудку граеш!

МЕРКУЦЫО

Граю ў адну дудку? Ці не лічыш ты нас дударамі?
Граем мы з табой на розны лад.

(Бярэцца за шпагу.)

Вось мая дудка,— яна прымусіць цябе скакаць.
У адну дудку!..

БЕНВОЛІО

Тут шмат людзей, а мы заводзім спрэчку.
Альбо другога месца пашукайма,
Альбо спакойна спрэчку будзем весці,
Альбо разыдземся: на нас глядзяць.

МЕРКУЦЫО

Няхай глядзяць, на тое ж вочы ў іх,
Я ні для кога з месца не скрануся.

Уваходзіць Рамэо.

ТЫБАЛЬТ

Ну, мір, сіньёр! Мой чалавек ідзе.

МЕРКУЦЫО

Няхай мяне павесяць, калі ён
Ліўрэю вашу апрануў хоць раз,
Калі ж паклічаш ты яго на бойку,
На гэты заклік ён ахвотна пойдзе,—
У гэтым сэнсе ён заўсёды твой.

ТЫБАЛЬТ

Рамэо, да цябе мая нянавісць
Не знае слоў інакшых,— як падлец.

РАМЭО

Тыбальт, прычына, праз якую я

Люблю цябе, мне кажа гнеў стрымаць,
Які ты выклікаў. Я не падлец.
Бывай! Ты дрэнна ведаеш мяне.

ТЫБАЛЬТ

Хлапчук! Абразы гэтым не загладзіш.
Вярніся зараз жа і вымі шпагу.

РАМЭО

Ніколі я цябе не абражаў.
Што я люблю цябе, ты не паверыш,
Пакуль прычын любві не будзеш ведаць.
Дык задаволься ж, любы Капулеці,—
Імя мне гэта люба, як сваё.

МЕРКУЦЫО

О, подлая ганебная пакорнасць!
Alla stoccato[1] гэту ганьбу змые.
Тыбальт, эй, мышалоў! Выходзь сюды!

ТЫБАЛЬТ

Чаго ты хочаш ад мяне?

МЕРКУЦЫО

Нічога, кашачы цар,— я хачу толькі ўзяць адно жыццё з тваіх дзевяці жыццяў. Як упраўлюся з адным жыццём, тады, з твайго дазволу, выб'ю з цябе і астатнія восем. Выцягвай жа за вушы сваю шпагу з ножнаў. Ды хутчэй, а то мая засвішча каля тваіх вушэй.

ТЫБАЛЬТ

(вымае шпагу)

Я гатоў.

РАМЭО

Схавай ты шпагу ў ножны, друг Меркуцыо!

МЕРКУЦЫО

Ну, ну, сіньёр! Давай, не аглядайся!

Б'юцца.

РАМЭО

Бенволіо! Сюды хутчэй са шпагай.
Мы зброю выб'ем. Сорамна, сіньёры!
Тыбальт! Меркуцыо! Сурова герцаг
Забараніў на вуліцы Вероны
Такія бойкі. Стойце ж вы! Тыбальт!
Меркуцыо мой добры!

Тыбальт з-пад рукі Рамэо раніць Меркуцыо і ўцякае з сваімі спадарожнікамі.

---

[1] Працінаючы ўдар *(італ.)* — фехтавальны тэрмін.

МЕРКУЦЫО

Ранен я.
Чума на вашы дзве радні! Канец мне.
А ён уцёк? Ён цэлы?

БЕНВОЛІО

Ты паранен?

МЕРКУЦЫО

Царапіна. Ды хопіць мне яе.
Дзе паж мой? Шэльма, доктара пакліч!

РАМЭО

Крапіся, дружа, рана ж не страшная.

МЕРКУЦЫО

Ну, вядома: яна не такая глыбокая, як калодзеж, і не такая шырокая, як царкоўныя дзверы, але досыць будзе і такой. Наведайся да мяне заўтра, і ты знойдзеш мяне спакойным і нерухомым. Я ручаюся, што выбіты з гэтага свету. Чума на вашы дзве радні! Чорт вазьмі! Гэты сабака, пацук, мыш, кот мог задрапаць чалавека насмерць! Хвалько, дрэнь, нягоднік, які б'ецца паводле правілаў арыфметыкі. І якога чорта стаў ты паміж намі? Я быў ранены з-пад твае рукі.

РАМЭО

Я думаў лепш зрабіць.

МЕРКУЦЫО

А выйшла горш.
Бенволіо, дапамажы зайсці
Мне ў дом, які... Я аслабеў зусім.
Чума на вашы дзве радні! Праз іх
Я без пары пайду чарвям на ежу.
Гатоў! Канец! Ах, вашы дзве радні...

Меркуцыо і Бенволіо выходзяць.

РАМЭО

Мой друг, самога герцага сваяк
Насмерць паранены тут за мяне,
За гонар мой, зняслаўлены Тыбальтам,
Тыбальтам, што раднёй мне стаў нядаўна.
О мілая Джульета! Харство
Тваё зусім мяне расслабіла
І волю мужную ганебна размякчыла.

Уваходзіць Бенволіо.

БЕНВОЛІО

Рамэо, друг! Меркуцыо памёр.
На небе ўжо лунае смелы дух,
Які зямлю з пагардаю пакінуў.

РАМЭО

О, чорны дзень — пачатак страшных дзён,
Другія беды нам прарочыць ён.

БЕНВОЛІО

Вось зноў ідзе сюды Тыбальт шалёны.

РАМЭО

Ён жыў, ён рад. Меркуцыо ж забіты!
Прэч ад мяне лагоднасць! Мной цяпер
Хай агнявокая злаба кіруе.

Уваходзіць Тыбальт.

Ну, падляца вазьмі назад, Тыбальт.
Душа Меркуцыо яшчэ не так высока
Над нашымі галовамі ўзнялася:
Чакае ў спадарожніцы тваёй,
І з нас адзін туды ляцець павінен:
Ці ты, ці я, ці мы абодва разам.

ТЫБАЛЬТ

Хлапчук нікчэмны! Тут дружыў ты з ім,
Ляці ж за ім туды.

РАМЭО

Меч вырашыць.

Б'юцца. Тыбальт падае.

БЕНВОЛІО

Рамэо, уцякай хутчэй, ратуйся!
Народ ідзе сюды. Тыбальт забіты.
Ды ну, ачніся! Калі схопяць тут,
Дык смерць табе ад герцага. Ўцякай!

РАМЭО

Забава лёсу я.

БЕНВОЛІО

Чаго марудзіш?

Рамэо выходзіць, уваходзяць гараджане.

1-ШЫ ГАРАДЖАНІН

Куды ж уцёк той, хто забіў Меркуцыо?
Тыбальт — забойца. Ён куды ж уцёк?

БЕНВОЛІО

Тыбальт ляжыць вось тут.

1-ШЫ ГАРАДЖАНІН

За мной, сіньёр!
Ты іменем закона арыштован.

Уваходзяць герцаг са світай, Мантэкі і Капулеці з жонкамі і іншыя.

ГЕРЦАГ

Паганцы дзе, што бойку пачалі?

БЕНВОЛІО

Мой уладар! Я быў пры гэтым сам
І ўсё табе дакладна перадам.
Забіты тут рукой Рамэо той,
Кім быў забіт сваяк адважны твой.

СІНЬЁРА КАПУЛЕЦІ

Тыбальт! Сын брата роднага! Забіты!
О герцаг! О мой муж! Тут наша кроў праліта!
Адплаты я прашу і правасуддзя:
Няхай жа кроў за кроў праліта будзе.
О, мілы мой пляменнік!

ГЕРЦАГ

(да Бенволіо)

Бенволіо, хто бойку распачаў?

БЕНВОЛІО

Тыбальт, што ад рукі Рамэо паў.
Рамэо быў лагодны. Ён прасіў
Адумацца, пустую спрэчку кінуць,
Аб вашым страшным гневе папярэджваў,
Ён ветліва, спакойна гаварыў.
Але ніяк не ўціхамірыў гэтым
Буянага Тыбальта. Ён у грудзі
Меркуцыю накіраваў рапіру.
Той загарэўся ўвесь, заззяла сталь.
Адной рукой ён спрытна смерць адводзіў,
Другой жа пасылаў яе Тыбальту.
Рамэо крыкнуў ім: «Сябры, пакіньце!»
І слоў шпарчэй ён кінуўся між іх,
Адводзячы смяротныя удары.
У гэты момант з-пад яго рукі
Тыбальт ганебным, здрадніцкім ударам
Насмерць параніў храбрага Меркуцыо.
Тыбальт уцёк, ды хутка зноў вярнуўся.
Рамэо помстаю гарэў увесь,
Яны схапіліся шпарчэй маланкі.
Я не паспеў разняць іх, як ужо
Тыбальт забіты, а Рамэо збег.
Я праўду ўсю сказаў, а калі не —
Дык пакарайце смерцю вы мяне.

СІНЬЁРА КАПУЛЕЦІ

Няпраўда ўсё — Мантэкі ён радня,
Адна ў іх кроў, і гэта ўсё хлусня.

Іх дваццаць нападала на яго
І ўдваццацёх забіла аднаго.
Хай герцаг нас у крыўдзе не пакіне:
Забіў Рамэо — хай і сам загіне.

ГЕРЦАГ

Тыбальт забіт, але ж забіў ён сам,
Хто ж за Меркуцыо адкажа нам?

МАНТЭКІ

Няўжо ж Рамэо? Ўзяў за друга ён
Не больш таго, што ўзяў бы і закон —
Жыццё Тыбальта.

ГЕРЦАГ

Вось і пакаранне:
Асуджваем яго мы на выгнанне.
Праз вашу злобу я панёс ахвяру:
Праліта кроў радні маёй праз вас.
За гэта я вам дам такую кару,
Што страту вы аплачаце сто раз.
Я буду глух да просьб і апраўдання,
Дарэмны тут і мольбы і рыданні.
Рамэо хай хутчэй адсюль бяжыць,
А то на свеце больш не будзе жыць.
Вазьміце труп. Майго загаду ждаць!
Забойства тут — забойцу апраўдаць.

Выходзяць.

Сцэна другая

Пакой у доме Капулеці.

Уваходзіць Джульета.

ДЖУЛЬЕТА

Хутчэй скачыце, агнявыя коні,
К палацу Феба. Фаэтон каб быў
За фурмана, даўно б на захад вас
Загнаў, і ноч бы на зямлю сышла.
О, ноч — прыяцелька любві! Свой полаг
Над намі разапні, каб мог Рамэо
Абняць мяне нячутны і нябачны!
Для закаханых, кажуць, дастаткова
Святла ад іх жа позіркаў іскрыстых.
Сама любоў сляпая: цемра ночы
Да твару ёй. Бабулька ноч, я клічу:

Прыйдзі хутчэй і нашапчы на вуха,
Як выйграць мне прайграную ігру,
Дзе ігракі нявінныя абодва.
Акрый мяне сваім плашчом, каб людзі
Не ўбачылі, як кроў бушуе ў жылах
І чырванню на шчоках выступае.
Прыкрый мяне, пакуль любоў навучыць
Смялейшай быць і не лічыць за сорам
Таго, што крочыць следам за любоўю.
Прыйдзі, Рамэо — ясны дзень уночы,
Заззяй у цемры ты бялей за снег,
Што на крыле у ворана ляжыць.
Ноч цемнавокая, цыганка ноч,
Прышлі Рамэо! А калі памрэ ён,
Разрэж яго на дробненькія зоркі —
І неба так зазіхаціць прыгожа,
Што свет увесь улюбіцца ў цябе
І сонцу больш не будзе пакланяцца.
Палац любві сабе купіла я,
Ды не магу ўладаць яшчэ. Сама
Я куплена, і мною не ўладаюць.
Дзень доўжыцца, як перад святам ноч
Дзяўчыны той, якой купілі плацце,
Але адзець да дня яна не зможа.
Ах, вось і няня, мой вястун чаканы.
Язык, што вымавіць імя Рамэо,
Надораны нябесным красамоўствам.

Уваходзіць няня з вяроўкамі.

Якія весткі, няня? Ты вяроўкі
Дастала для Рамэо?

КАРМІЛІЦА

Так, вяроўкі.

ДЖУЛЬЕТА

Якія ж весткі? Што ты ломіш рукі?

КАРМІЛІЦА

О гора! Ён памёр, памёр, памёр!
Загінулі, сіньёра, мы зусім.
Сканаў. Насмерць забіты ён! Памёр!

ДЖУЛЬЕТА

Няўжо злабой такою дыша неба?

КАРМІЛІЦА

Калі не дыша неба, дык Рамэо.
Рамэо! О Рамэо! Хто б падумаў?

ДЖУЛЬЕТА

Што ты за д'ябал, што мяне так мучыш?
Ад гэтай мукі пекла б застагнала.
Скажы — Рамэо сам сябе забіў?
Адно такое слова, як «забіты»,
Хутчэй заб'е, чым позірк васіліска.
Калі забіты, дык скажы «забіты»,
А не, дык «не». Не муч, кажы адразу,
Залежыць лёс мой ад твайго адказу.

КАРМІЛІЦА

Сама сваімі бачыла вачамі
Вось тут во, на грудзях геройскіх, рану,
Няшчасны труп, крывёй абліты ўвесь.
Запечаная кроў... Мне млосна стала.

ДЖУЛЬЕТА

О сэрца, разарвіся на кускі!
Ты абанкруцілася. Стой, не біся!
Не плачце, вочы! Вечная цямніца
Суцешыць вас. Цяпер мне свет не мілы.
Яго ўзяла, бяры й мяне, магіла.

КАРМІЛІЦА

Тыбальт, саколік мой, мой любы хлопчык!
Такі высакародны і пачцівы!
Чаму ж ты лёг раней мяне ў магілу?

ДЖУЛЬЕТА

Адкуль прыйшло такое спусташэнне?
Забіт Рамэо? І Тыбальт таксама?
Мой мілы брат і мілы муж — абодва?
Скон свету, а трубы з нябёс не чутна.
Хто ж будзе жыць, калі такіх не стала?

КАРМІЛІЦА

Тыбальт забіты, а Рамэо выгнан.
Забіў яго Рамэо — і ў выгнанні.

ДЖУЛЬЕТА

Тыбальта кроў праліў Рамэо? Божа!

КАРМІЛІЦА

Праліў. О гора мне! Праліў, праліў!

ДЖУЛЬЕТА

О, сэрца змея пад красы абліччам!
Калі ў пячоры гэтакай цудоўнай
Ды жыў дракон? Тыран красы дзівоснай.
У выглядзе анёлка — чорт. Круган
У пер'і голуба. Ягнятка — воўк.

Стварэнне гнюснае з абліччам боскім!
Анёлак і падлюга! Процілегласць!
Што ж пеклу ты пакінула, прырода,
Калі ў жывы Эдэм красы чароўнай
Нячысты дух пякельны пасяліла?
Нашто для кнігі д'ябальскага зместу
Прыгожы пераплёт? З чыйго дазволу
Падман жыве ў палацы хараства?

КАРМІЛІЦА

Няма ў мужчын ні сораму, ні праўды —
Ўсе ашуканцы, здраднікі, лгуны.
Дзе мой слуга? Гарэлкі мне хутчэй!
Няшчасце гэтае мяне састарыць.
Рамэо ганьба!

ДЖУЛЬЕТА

Сціхні, прыкусі язык.
Не нарадзіўся ён для ганьбы,
І сорам бы ад сораму згарэў,
Чало яго крануўшы. Гэта трон:
На ім павінна чэсць каранавацца —
Адзіная ўладарніца над светам.
Звяруга я, што лаяла яго.

КАРМІЛІЦА

Ды не хваліць жа вам забойцу брата.

ДЖУЛЬЕТА

А што ж, свайго мне мужа праклінаць?
О бедны муж, які язык аблашчыць
Тваё імя, калі ўжо я сама,
Што жонкай трохгадзіннаю была,
Яго так бэсціла? Нашто ж, нягоднік,
Майго забіў ты брата? Хоць інакш
Нягоднік брат майго забіў бы мужа.
Дык прэч жа вы, дурніцы-слёзы, прэч!
Назад вярніцеся ў сваю крыніцу.
Даніну, што прызначана для смутку,
Вы радасці прынеслі памылкова.
Жывы ж мой муж, якога загубіць
Хацеў Тыбальт. Загінуў жа Тыбальт,
Што мужа загубіць хацеў майго.
Усё тут добра. Дык чаго ж я плачу?
Было тут слова — горай смерці брата
Яно прыбіла. Мне б забыць яго.
Але яно мне ўрэзалася ў памяць,
Як справы грэшніка ў яго сумленне.

«Тыбальт забіты, а Рамэо выгнан».
«Рамэо выгнан». Гэта слова — «выгнан»
Забіла зразу тысячу Тыбальтаў.
З мяне даволі ўжо і смерці брата,
На гэтым бы канец. Але ж бяда
Не любіць адзіноты, а прывыкла,
Каб чарадою ўслед ішлі другія,
Тады за словамі: «Тыбальт забіты»
Чаму б ёй не сказаць: «Памёр твой бацька
Ці маці? Нават хоць абое разам?»
І я па іх паплакала б звычайна.
Але за словамі аб смерці брата
Сказаць: «Рамэо выгнан». Гэтым словам
Насмерць забіты зразу бацька, маці,
Тыбальт, Рамэо, я. «Рамэо выгнан».
Няма тут смерці ні канца ні краю;
Каб выказаць свой боль, я слоў не маю.
Дзе бацька? Маці дзе?

КАРМІЛІЦА

Тыбальта прах
Аплакваюць у горы і слязах.
Мо вас да іх прывесці?

ДЖУЛЬЕТА

Не, хай самі
Абмыюць рану братаву слязамі.
А я... Я плакаць буду аб выгнаным,
Прымі адсюль вяроўкі. Ашуканы
Яны, як я. Па іх пяньковым целе
Падняўся б ён бы да маёй пасцелі.
Цяпер памру дзяўчынай-удавой.
Хадзем ка мне, я вас вазьму з сабой.
Нявіннаю я гэты свет пакіну,
На вас у дол апусцяць дамавіну.

КАРМІЛІЦА

Ідзіце ў свой пакой. Каб вас уцешыць,
Рамэо я знайду. Я ведаю,
Дзе ён. Вы чуеце! Сягоння ноччу
Рамэо будзе тут. Я да яго
Іду. Цяпер ён у Ларэнца ў келы.

ДЖУЛЬЕТА

Знайдзі яго, аддай пярсцёнак гэты
І папрасі, каб верны рыцар мой
Прыйшоў навек са мною развітацца.

Сцэна трэцяя

Келья брата Ларэнца.

Уваходзіць брат Ларэнца.

БРАТ ЛАРЭНЦА

Выходзь, выходзь, Рамэо нешчаслівы!
Сама туга ўлюбілася ў цябе,
З няшчасцем ты павенчаны, мой сын.

Уваходзіць Рамэо.

РАМЭО

Якія весткі, ойча? Ёсць прысуд?
З якой яшчэ нязнанаю бядою
Павінен я спазнацца?

БРАТ ЛАРЭНЦА

Мілы сын,
З няшчасцем ты здружыўся не на жарты.
Ёсць вестка ўжо аб герцагскім прысудзе.

РАМЭО

Мо ён страшней яшчэ, чым страшны суд?

БРАТ ЛАРЭНЦА

Прысуд яго не вельмі строгі: ты
Асуджан не на смерць, а на выгнанне.

РАМЭО

Выгнанне? Злітуйся! Скажы мне — смерць!
Выгнанне мне куды страшней за смерць.
У сто разоў. Не гавары «выгнанне».

БРАТ ЛАРЭНЦА

Адгэтуль толькі выгнан ты, з Вероны,
Дык будзь цярплівы — белы свет вялікі.

РАМЭО

Няма за сценамі Вероны свету:
Чысцілішча, пакуты, пекла там.
З Вероны выгнан — выгнан я са свету.
Але ж выгнанне з свету — гэта смерць.
Выгнанне — тое самае, што смерць.
А называючы яе выгнаннем,
Сячэш ты шыю залатой сякерай
І усміхаешся, наносячы удар.

БРАТ ЛАРЭНЦА

О грэх смяротны! О няўдзячнасць злая!
Тваю віну закон карае смерцю.

А герцаг наш па дабраце сваёй
Закон парушыў, стаўшы на твой бок:
Смерць чорную ён замяніў выгнаннем,
Ты ж гэтай міласці не хочаш бачыць.

РАМЭО

Такая міласць — горш за катаванне.
Там неба толькі, дзе жыве Джульета.
Сабака, кот і мыш няшчасная,
І кожнае нікчэмнае стварэнне
Жыве пад гэтым небам, бачыць рай.
У мухі болей шчасця і свабоды,
Чым у Рамэо. Дадзена ёй права
Па ўласнай волі сесці і ўзляцець
З Джульецінай рукі, дзівоснай, белай,
Ці красці асалоду з вуснаў мілых,
Што быццам у нявіннасці дзявочай
Барвеюць пры ўзаемным дакрананні,
Як ягады каліны. Муха можа,
Адзін Рамэо гэтага не можа.
Яна свабодная, а я выгнаннік.
І ты мне кажаш, што выгнанне — міласць?
Няўжо нажа не меў ты, ці атруты,
Ці іншага чаго для наглай смерці,
Апроч такога слова, як выгнанне?
Як у цябе, мой ойча, служка боскі,
Духоўнік мой і друг, хапіла духу
Забіць мяне страшэнным словам «выгнан»?

БРАТ ЛАРЭНЦА

Паслухай ты, вар'ят, што я скажу.

РАМЭО

І зноў ты загаворыш аб выгнанні.

БРАТ ЛАРЭНЦА

Ад слова гэтага я зброю дам:
Напітак філасофіі цудоўны
Цябе уцешыць нават і ў выгнанні.

РАМЭО

Ў выгнанні! К чорту філасофію!
Не створыць філасофія Джульеты,
І горада не перасунуць ёй,
Не адмяніць прысуду. Анічым
Яна мне не паможа. Дык маўчы,
Не гавары мне пра яе зусім!

БРАТ ЛАРЭНЦА

Як бачу я, вушэй няма ў вар'яцтва.

РАМЭО

А ў розуму, відаць, няма вачэй.

БРАТ ЛАРЭНЦА

Давай тваю мы справу абмяркуем.

РАМЭО

А як ты можаш гаварыць аб тым,
Чаго не ведаеш? Каб маладым
Ты быў, як я, каб так любіў Джульету,
Каб на гадзіну пажаніўся з ёй,
Забіў Тыбальта, звар'яцеў, як я,
І быў бы выгнаны, як я, тады б
Ты гаварыў. Ты рваў бы валасы
І падаў бы на землю — вось як я,
Каб загадзя сваю магілу змераць.

Стук у дзверы.

БРАТ ЛАРЭНЦА

Устань! Там стукаюць. Хутчэй схавайся!

РАМЭО

Не! Хіба хмара чорная тугі
Мяне схавае ад людскога вока.

Стук.

БРАТ ЛАРЭНЦА

Ты чуеш? Хто там? — Уцякай, Рамэо!
Цябе тут схопяць. Пачакайце! Устань!

Стук.

Бяжы ў малельню.— Зараз! — Божа мой!
Як гэта па-дурному! — Вось іду!

Стук.

Хто стукае так моцна? Што вам трэба?

КАРМІЛІЦА

Пусціце, ўсё скажу... Я ад сіньёры
Прыбегла, ад Джульеты.

БРАТ ЛАРЭНЦА

Калі ласка.

Уваходзіць карміліца.

КАРМІЛІЦА

Скажыце мне, святы айцец, скажыце,
Дзе муж маёй сіньёры, дзе Рамэо?

БРАТ ЛАРЭНЦА

Вунь на зямлі, ад слёз сваіх ён п'яны.

КАРМІЛІЦА

О, тое ж самае з маёй сіньёрай.

БРАТ ЛАРЭНЦА

Няшчаснае якое падабенства!

КАРМІЛІЦА

Вось так жа і яна — ляжыць і плача,
Няшчасная, і плача, і рыдае.
Ну, ўстаньце, ўстаньце, калі вы мужчына.
Я вас Джульетай заклінаю — ўстаньце!
Чаго ж ужо так енчыць і стагнаць?

РАМЭО

Кармеліца!

КАРМІЛІЦА

Сіньёр, мы ўсе памром.

РАМЭО

Расказвай пра Джульету — як яна?
Яна мяне забойцам, мусіць, лічыць,
Што ранак шчасця нашага запляміў
Крывёй яе радні. Дык дзе яна?
Што жонка тайная мая гаворыць
Пра наш няшчасны шлюб, што сам разбіў я?

КАРМІЛІЦА

Нічога не гаворыць, толькі плача.
То кінецца на ложак, то раптоўна
Як закрычыць: «Тыбальт», пасля «Рамэо»!
І зноў на ложак падае пластом.

РАМЭО

Яе маё імя, як куля, забівае,
Як брата любага забіла гэта
Праклятая рука. Скажы мне, ойча,
Дзе месціцца, ў якой часціне цела,
Маё імя? Скажы, каб мог я знішчыць
Агідны той прытулак.

(Вымае шпагу.)

БРАТ ЛАРЭНЦА

Прэч руку!
Ці ж ты мужчына? З выгляду мужчына,
А слёзы-то жаночыя ў цябе.
Як звер драпежны ты ў сваім шаленстве.
Жанчына ты у вобразе мужчыны,
Драпежнік у абліччы чалавека.
Клянуся, дзіва мне. Раней я думаў,

Што болей мужнасці ў цябе і волі.
Забіў Тыбальта, а цяпер ты хочаш
Забіць сябе, а разам з тым і жонку,
Якая толькі і жыве табою.
Ты ўзняў руку на род свой — на жыццё,
Клянеш зямлю і неба, а яны ж —
Жыццё, і неба, і зямля — ўсе трое —
З'ядналіся ў табе не для распаду,
І гэта ўсё зараз ты можаш знішчыць.
Саромейся! Ты гэтым самым ганьбіш
Сваю натуру, і любоў, і розум.
Цябе прырода імі надзяліла,
А ты дарэмна гэта ўсё марнуеш,
Не карыстаешся багатым дарам,
Каб вобраз свой няспынна ўдасканальваць,
Сваю любоў і розум. Вобраз твой
Ні больш ні менш як тая лялька з воску,
Пазбаўленая доблесці мужчыны;
Твая любоў — хлусня і легкадумнасць,
Так-сяк прыбраныя ў старызну клятвы,
Калі ты, мерышся парушыць клятву
І загубіць любоў, якой ты кляўся.
А розум твой, які любоў і вобраз
Павінен аздабляць, як арэолам,
Іх толькі сапсуе. Як порах той,
Які ў руках няўмелага салдата
Ўзрываецца тады, калі не трэба,
Так і ў цябе ўзарвецца раптам тое,
Што абаронаю служыць павінна,
І разнясе самога на кавалкі.
Адумайся! Жыве твая Джульета,
Што праз яе ты памірaў нядаўна,—
Ты ўжо шчаслівы. Загубіць цябе
Хацеў Тыбальт, а ты забіў яго,—
Дык зноў жа ты шчаслівы. Той закон,
Што смерцю пагражаў, табе спрыяе,
І смерць ён замяніў табе выгнаннем,—
І тут шчаслівы ты. На кожным кроку
Цябе дарамі асыпае шчасце,
Як закаханае, табе ўсё дагаджае,
Але, як наравістая дзяўчынка,
Надзьмуўся ты на шчасце, на любоў.
Адумайся, а то няшчасны будзеш.
Ідзі, як дагаворана, да любай.

Пранікні ў дом, уцеш і заспакой.
Але ўцякай, пакуль расставяць варту,
Бо ў Мантую не зможаш ты прабрацца,
Дзе жыць павінен, аж пакуль пра шлюб
Адкрыта можна будзе аб'явіць,
Пакуль мы не памірым вашы сем'і
І ўпросім герцага, каб дараваў ён.
Тады паклічам мы цябе сюды,
І радасць большай будзе ў сто разоў,
Чым сёння гора.— Ты, кармініца,
Ідзі наперад, кланяйся сіньёры.
Скажы, каб рана ўсіх уклала спаць,
Тым больш што ўсіх за дзень стаміла гора.
Рамэо прыйдзе следам за табой.

КАРМІЛІЦА

О божа, я ўсю ноч стаяла б тут
Ды слухала б разумныя парады.
Не быў бы то вучоны! Пабягу,
Скажу, сіньёр, што прыйдзеце вы зараз.

РАМЭО

Скажы, няхай рыхтуе мне дакоры.

КАРМІЛІЦА

Вось ад яе пярсцёнак вам, сіньёр.
Ды не марудзьце вы — нярана ўжо.

РАМЭО

Зноў да мяне вярнулася жыццё.

БРАТ ЛАРЭНЦА

Ідзі. Спакойнай ночы. Ды глядзі,
Да першай варты выйсці ты павінен
Альбо, пераадзеўшыся, на золку
Бяжы ты ў Мантую, а я знайду
Твайго слугу і буду праз яго
Перадаваць, што добрае пачую.
Дай мне руку! Спакойнай ночы,— позна.

РАМЭО

Каб радасць большая адсюль не звала,
Расстанне б наша мне атрутай стала.
Бывай!

(Выходзіць.)

Сцэна чацвёртая

Пакой у доме Капулеці.

Уваходзяць Капулеці, сіньёра Капулеці і Парыс.

КАПУЛЕЦІ

У нас цяпер, сіньёр, такое гора,
Што мы дачку падрыхтаваць не ўспелі.
Яна Тыбальта вельмі ўжо любіла,
І я любіў яго, але што зробіш,—
Для смерці мы радзіліся на свет.
Час позны ўжо, яна не прыйдзе ўніз.
Ды каб не ваша мілая прысутнасць,
Я сам бы ўжо ў пасцелі быў з гадзіну.

ПАРЫС

У горы не да сватаўства. Бывайце,
Сіньёра. Мой паклон Джульеце.

СІНЬЁРА КАПУЛЕЦІ

Заўтра
Я распытаю пра яе прыхільнасць,
Цяпер жа смутак агарнуў яе.

КАПУЛЕЦІ

Сіньёр Парыс, я за любоў дачкі
Магу ручацца вам. Я — ўпэўнены,—
Яна ва ўсім паслухае мяне.
Схадзі ты, жонка, да яе цяпер,
Пакуль не спіць, і пра любоў Парыса
Ёй раскажы. Скажы, што ў сераду...
Які ў нас дзень сягоння?

ПАРЫС

Панядзелак.

КАПУЛЕЦІ

Не, ў сераду занадта хутка будзе;
Няхай ужо ў чацвер... Скажы — ў чацвер
Яна вянчаецца з сіньёрам графам.
А вы гатовы? Даспадобы вам
Такая спешка? Шуму падымаць
Не будзем. Некалькі сяброў — і ўсё.
А то нядаўна так Тыбальт забіты,
Калі мы баляваць пачнём, дык скажуць,
Што сваяка свайго мы не шкадуем.
Дык чалавек пяць-шэсць сяброў — і ўсё!
Што пра чацвер вы скажаце, сіньёр?

ПАРЫС
Што я хацеў бы, каб ён заўтра быў.
КАПУЛЕЦІ
Ну, вось і добра; а цяпер ідзіце.
Дык у чацвер... Ты, жонка, зараз жа
Ідзі скажы Джульеце пра вяселле.
Бывайце, граф! — Эй, вы! Святло падайце
У мой пакой! Аднак жа позна ўжо.
Дык так жа позна, што аж чуць не рана.
Спакойнай ночы.

Сцэна пятая

Сад Капулеці.

Наверсе, у акне, відаць Рамэо і Джульета.

ДЖУЛЬЕТА
Ты ўжо ідзеш? Да дня яшчэ далёка.
Не жаваранак,— гэта салавей
Уразіў так твой палахлівы слых.
Дык ён жа там начамі кожны раз
На дрэве на гранатавым спявае.
Павер, мой любы, гэта салавей.
РАМЭО
Не салавей, а жаваранак гэта —
Звястун світання. Глянь, мая любоў,
Зара ад зайздрасці пачырванела,
Начныя свечкі гаснуць. Дзень вясёлы
На цыпачкі ўстае з-за гор туманных.
Ісці мне — жыць, застацца тут — памерці.
ДЖУЛЬЕТА
Не, там не дзень святлее, любы мой,
А метэор ад неба адлучыўся,
Каб аж да Мантуі табе свяціць.
Ісці яшчэ не трэба, пачакай!
РАМЭО
Дык хай жа схопяць і вядуць на смерць.
Я буду рад, калі так хочаш ты.
Скажу, што шэрае святло — не золак,
Што гэта месяца туманны водсвет,

Што над галовамі, высока ў небе
Не жаваранак песняю звініць.
Я больш хачу застацца, чым пайсці.
Прыходзь жа, смерць,— вітаю твой прыход!
Джульета хоча так. Мая ты радасць.
Давай пагутарым, яшчэ не дзень.

ДЖУЛЬЕТА

Не, не, ўжо дзень. Хутчэй, хутчэй ідзі!
Бо гэта жаваранак тут спявае
Прарэзліва, нескладна. Хлусяць людзі,
Што ён прыносіць песняй асалоду:
Прынёс ён горкую разлуку нам.
Вачамі з жабай памяняўся ён
І голасам няхай бы памяняўся.
Ён спевамі нам рукі раз'яднаў,
Са змрокам ночы і цябе прагнаў.
Бяжы! Што раз становіцца ясней.

РАМЭО

Чым дзень ясней, тым на душы цямней.

Уваходзіць кармілiца.

КАРМІЛІЦА

Сіньёра!

ДЖУЛЬЕТА

Няня!

КАРМІЛІЦА

Гляньце, ўжо світае,
І зараз ваша маці быць тут мае.

ДЖУЛЬЕТА

(адчыняе акно)
Зара ў акно, а радасць за акно.

РАМЭО

Яшчэ раз пацалую і — на дно
Тугі і смутку.
(Спускаецца з акна.)

ДЖУЛЬЕТА

Ты пайшоў, мой мілы?
Мой друг, мой муж любімы да магілы!
Я кожную хвіліну дня і ночы
Хацела б ведаць пра цябе і чуць,
А ў кожнай жа хвіліне многа дзён,—
Якой жа буду я тады старою,
Калі мы зноў сустрэнемся з табою!

РАМЭО

Бывай! Не прапушчу, мая любоў,
Я выпадку паклон табе прыслаць.

ДЖУЛЬЕТА

Ты думаеш, пабачымся мы зноў?

РАМЭО

Я ўпэўнены, што хутка з асалодай
Мы будзем гаварыць пра гэты боль.

ДЖУЛЬЕТА

Душа мая ў такім злавесным стане.
Здаецца мне, калі гляджу я ўніз,
Як быццам ты мярцвяк на дне магілы.
Ці вочы лгуць, ці бледны ты страшэнна.

РАМЭО

І ты здаешся бледнаю, мой рай,
Бо смутак смокча нашу кроў. Бывай!

ДЖУЛЬЕТА

О лёс! Цябе ўсе зменлівым завуць,
Дык што ж ты зробіш з тым, хто пастаянны?
Будзь зменлівым. Я буду спадзявацца,
Што доўга ты трымаць яго не будзеш
І вернеш мне.

СІНЬЁРА КАПУЛЕЦІ

(за сцэнай)

Ты ўстала ўжо, дачка?

ДЖУЛЬЕТА

Што гэта? Ці не маці кліча ўжо?
Кладзецца позна так ці рана ўстала?
У гэткі час чаго яна сюды?

Уваходзіць сіньёра Капулеці.

СІНЬЁРА КАПУЛЕЦІ

Ну што, Джульета?

ДЖУЛЬЕТА

Нешта мне нядобра.

СІНЬЁРА КАПУЛЕЦІ

Усё аб смерці брата слёзы льеш?
Размыць магілу хочаш ты слязамі?
Не ўваскрасіш яго, хоць і размыеш.
Ну, годзе, сціхні ўжо. У меру смутак
Гаворыць аб любві, але празмерны
Ад недахопу розуму бывае.

ДЖУЛЬЕТА

Аб цяжкай страце дайце мне паплакаць.

СІНЬЁРА КАПУЛЕЦІ

Так плачучы, ты страту адчуваеш,
А друга не.

ДЖУЛЬЕТА

Так адчуваючы,
Аб другу я не плакаць не магу.

СІНЬЁРА КАПУЛЕЦІ

Не столькі плачаш ты аб смерці брата,
Як больш аб тым, што жыў падлец-забойца.

ДЖУЛЬЕТА

Які падлец?

СІНЬЁРА КАПУЛЕЦІ

Ды той падлец, Рамэо.

ДЖУЛЬЕТА

(убок)

Падлец — і ён! Далёкія паняцці.

(Уголас.)

Даруе бог яму і я ад сэрца,
Хоць сэрца ён крамсае, як ніхто.

СІНЬЁРА КАПУЛЕЦІ

І ўсё таму, што жыў забойца подлы.

ДЖУЛЬЕТА

І так далёка ён ад рук маіх.
Сама б адпомсціла яму за брата.

СІНЬЁРА КАПУЛЕЦІ

За гэта мы адпомсцім, будзь спакойна.
У Мантую пашлю я чалавека,
Дзе выгнаны брадзяга жыць павінен,
Такім пітвом яго мы пачастуем,
Што хутка будзе ён з Тыбальтам разам.
Тады адразу ўцешышся і ты.

ДЖУЛЬЕТА

Ніколі я не ўцешуся, ніколі.
Пакуль сама яго не ўбачу... мёртвым...
Мярцвее сэрца беднае маё.
Знайдзіце, хто б занёс яму атруту,
А прыгатую зелле я сама;
Як вып'е, зразу ён засне спакойна.
О, як балюча чуць яго імя,
Калі не ў сілах паляцець туды
І ўліць атруту ўсю любві да брата
У вусны прагныя яго забойцы!

СІНЬЁРА КАПУЛЕЦІ

Знайдзі атруту, чалавека знойдзем.
А зараз слухай радасную вестку.

ДЖУЛЬЕТА

Дзе гэткі смутак, радасць там дарэчы.
Якую ж вестку скажаце вы мне?

СІНЬЁРА КАПУЛЕЦІ

Руплівы бацька твой, дзіця маё,
Каб разагнаць твой смутак і тугу,
Такі дзень радасці табе рыхтуе,
Што не чакала ты і я таксама.

ДЖУЛЬЕТА

А што за дзень? Скажыце мне хутчэй.

СІНЬЁРА КАПУЛЕЦІ

Дык вось паслухай: раненька ў чацвер
Бліскучы, знатны родам граф Парыс
Цябе ў царкве найсвентшага Пятра
Сваёй шчаслівай жонкай назаве.

ДЖУЛЬЕТА

Клянуся я царквою і Пятром,
Не зробіць ён мяне шчаслівай жонкай.
І што за спех? Ісці вянчацца ўжо,
Калі жаніх яшчэ не запытаўся,
Ці згодна я. Скажыце ж бацьку вы
І ўладару, што замуж не пайду я
І што хутчэй бы ўжо, клянуся я,
Пайшла за ненавіснага Рамэо,
Чым за Парыса йсці мне.— Вось дык радасць!

СІНЬЁРА КАПУЛЕЦІ

Ідзе вунь бацька, ты яму скажы:
Тады пабачыш, як ён гэта прыме.

Уваходзяць Капулеці і кармілiца.

КАПУЛЕЦІ

З заходам сонца падае раса,
А на закат пляменніка майго
Праліўся цэлы лівень.
Ну, што, водаправод-дзяўчынка?
Ліюцца слёзы? Дожджык не сціхае?
А ў целе ж у тваім маленькім гэтым
І лодка ёсць, і мора ёсць, і вецер.
Вось вочы я твае назваў бы морам:
Тут заўжды слёз адлівы і прылівы.
А цела — лодка на салёных хвалях.

Цяжкія ж уздыханні — гэта ветры,
Што ярасна змагаюцца з слязамі.
Калі не прыйдзе раптам цішыня,
Дык буры цела разаб'юць на шчэпкі.
(Да сіньёры Капулеці.)
Ты ёй сказала ўжо, што мы рашылі?

СІНЬЁРА КАПУЛЕЦІ

Сказала: дзякуе табе, не хоча.
З труной бы ёй, дурніцы, павянчацца.

КАПУЛЕЦІ

Чакай. Як, як? Не разумею, жонка.
Яна не рада? Нам яна не ўдзячна?
Не ганарыцца, ні за што не лічыць,
Што мы ёй, дрэні гэтакай, знайшлі
Выдатнага такога жаніха?

ДЖУЛЬЕТА

Не ганаруся, хоць і ўдзячна вам:
Бо ганарыцца нельга ненавісным,
Але я ўдзячна і за гэты дар,
Калі з любві прыносяць мне яго.

КАПУЛЕЦІ

Што ты вярзеш такое? Што за глупства?
«Я ганаруся», «ўдзячна», «я не ўдзячна»,
«Не ганаруся». К чорту, дарагая!
Хоць ганарыся, хоць разганарыся,
А к чацвяргу мне каб была гатова
Ісці ў царкву Пятра святога з графам.
А то я на вяроўцы зацягну.
Ах, немач бледная! Ах ты, паскуда!
Вось дрэнь!

СІНЬЁРА КАПУЛЕЦІ

Пакінь! Ты звар'яцеў, ці што?

ДЖУЛЬЕТА

Мой добры бацька, на каленях я
Прашу цябе — дай слова мне сказаць.

КАПУЛЕЦІ

Пайшла ты к чорту, ўпартая брыда.
Альбо ў царкву ты пойдзеш у чацвер,
Альбо на вочы не паказвайся. Маўчы!
Не супярэч! Не гавары ні слова!
Бо рукі ўжо і так даўно свярбяць.
(Да сіньёры Капулеці.)
Вось часта наракалі мы з табой,
Што бог адно дзіцятка нам паслаў,

Не, бачу я, і аднаго занадта.
І гэтым досыць пакараў нас бог.
Ах, чорт бы яе ўзяў!

КАРМІЛІЦА

Ратуй нас, божа!
Вам грэх, сіньёр, так праклінаць яе.

КАПУЛЕЦІ

Чаму ж мне грэх, шаноўная прамудрасць?
Мо мелі б ласку прыкусіць язык?
Ідзі пляткарыць да сваіх сябровак.

КАРМІЛІЦА

Благога ж вам я не сказала.

КАПУЛЕЦІ

Хопіць!

КАРМІЛІЦА

І слова не скажы.

КАПУЛЕЦІ

Маўчы, дурніца!
Паказвай ты з сяброўкамі за чаркай
Прамудрасць, а не тут.

СІНЬЁРА КАПУЛЕЦІ

Не гарачыся.

КАПУЛЕЦІ

Ах, божа мой, я звар'яцею зараз.
Ці ноч, ці дзень, за справай ці ў гульні,
Ці дома, ці ў гасцях — адзін мне клопат:
Знайсці ёй жаніха. І вось знайшоў —
Багаты, знатны, малады, прыгожы
І поўны талентаў, як той казаў,—
І трэба ж быць шчанём такім пісклівым,
Плаксівай лялькай, гэтакай дурніцай,
Каб адказаць: «Я маладая вельмі»,
«Я не люблю», «я не пайду», «даруйце»,
Дарую я табе, як замуж пойдзеш,
Калі ж не пойдзеш, дык жыві як хочаш:
Цябе я хлебам больш карміць не буду.
Я не жартую. Блізка ўжо чацвер,—
Адкінь свой нораў і падумай добра:
Мая ты — другу я цябе аддам,
А не мая — дык вешайся ідзі
Ці з торбамі пад вокнамі бадзяйся
І з голаду пад плотам адубей.
Клянуся я — ты не дачка мне больш,
І ты на спадчыну маю не спадзявайся.

Дык вось падумай. Нездарма я кляўся.
(Выходзіць.)

ДЖУЛЬЕТА

Няўжо на небе літасці няма?
Яно ж усю маю пакуту бачыць.
Не выганяйце вы мяне, матуля!
На месяц шлюб, на тыдзень адкладзіце.
А калі не,— рыхтуйце месца мне
У тым жа склепе, дзе ляжыць Тыбальт.

СІНЬЁРА КАПУЛЕЦІ

Не гавары, ні слова не скажу я.
Рабі, што хочаш,— я ўжо ўсё сказала.
(Выходзіць.)

ДЖУЛЬЕТА

О божа! Што ж рабіць, скажы мне, няня?
Чаму супроць мяне і бог, і людзі,
Супроць слабой, даверлівай істоты?
Скажы мне, няня. Ці ў цябе няма
І слова, каб уцешыць?

КАРМІЛІЦА

Ёсць, вядома,
Вы ж слухайце: Рамэо у выгнанні,—
Іду ў заклад на што вы хочаце,
Што ён па вас сюды прыйсці не можа,
Калі ж і прыйдзе, дык тайком як-небудзь.
Таму я раю вам ісці за графа.
Які цудоўны гэты граф Парыс!
Рамэо што? — ануча перад ім.
Такіх вачэй, як у Парыса,— быстрых,
Зялёных — і ў арла няма. Клянуся,
Што гэты шлюб вам шчасце прынясе,
Бо лепшы ён, чым той. Калі й не лепшы,
Дык першы ж муж памёр. Хоць не памёр,
Дык усё роўна — што вам за карысць?

ДЖУЛЬЕТА

Ад сэрца гэта ты?

КАРМІЛІЦА

І ад душы.
Няхай загіне сэрца і душа,
Калі я лгу.

ДЖУЛЬЕТА

Амін.

КАРМІЛІЦА

Што вы сказалі?

ДЖУЛЬЕТА

Вось гэта ды уцешыла мяне!
Ідзі скажы, што я пайшла к манаху.
Я нагрубіла бацьку і хачу
Пакаяцца і замаліць грахі.

КАРМІЛІЦА

Скажу, скажу. Вось гэта дык разумна!
(Выходзіць.)

ДЖУЛЬЕТА

Чартоўка! Грахаводніца старая!
Які страшнейшы грэх? Ці навучаць,
Каб клятву я парушыла ганебна,
Ці мужа бэсціць тым жа языком,
Якім сама яго хваліла сотні раз?
Ты мне чужая. Прэч з маіх вачэй!
Пайду к манаху — сродак дасць ён мне,
Калі ж не дасць, дык я знайду ў труне.
(Выходзіць.)

АКТ ЧАЦВЁРТЫ

Сцэна першая

Келья брата Ларэнца.

Уваходзяць брат Ларэнца і Парыс.

БРАТ ЛАРЭНЦА

Вы кажаце — ў чацвер? Занадта рана.

ПАРЫС

Так хоча Капулеці — бацька мой.
Не мне пярэчыць хуткасці такой.

БРАТ ЛАРЭНЦА

А вы пыталіся, ці любіць вас нявеста?
Не тым вы шляхам ідзяце — нядобра.

ПАРЫС

Я пра любоў з ёй мала гаварыў:
Яна бясконца плача па Тыбальту.
А бацька лічыць нават небяспечным

Яе ў вялікім смутку пакідаць,
Дык вось ён і спяшаецца з вяселлем,
Каб гэтым прыпыніць паводку слёз,
Што больш яшчэ ліюцца ў адзіноце;
Са мной яна іх высушыць хутчэй.
Цяпер вядома вам прычына спешкі.

БРАТ ЛАРЭНЦА

(убок)
Хацеў бы я не знаць тае прычыны,
Дзеля якой патрэбна замарудзіць.
(Услых.)
Глядзіце: вунь яна сюды ідзе.

Уваходзіць Джульета.

ПАРЫС

Шчаслівы я, што бачу жонку тут.

ДЖУЛЬЕТА

Так можа быць, калі я жонкай буду.

ПАРЫС

Павінна быць ужо ў чацвер, аднак.

ДЖУЛЬЕТА

Што быць павінна — будзе.

БРАТ ЛАРЭНЦА

Гэта так.

ПАРЫС

Вы спавядацца да айца святога?

ДЖУЛЬЕТА

Вам быў бы споведдзю адказ на гэта.

ПАРЫС

Прызнайцеся яму ў любві ка мне.

ДЖУЛЬЕТА

Я вам прызнаюся ў любві к яму.

ПАРЫС

Ну, а ў любві ка мне яму, вядома?

ДЖУЛЬЕТА

Каб і прызналася, дык больш каштоўна
Без вас прызнацца ў гэтым, чым пры вас.

ПАРЫС

Ах, бедная, як слёзы твар змянілі.

ДЖУЛЬЕТА

Тут слёзы мала што змяніць маглі.
Ён і да слёз быў досыць непрыгожым.

ПАРЫС

Яму шкадней за слёзы водзыў твой.

ДЖУЛЬЕТА

Але ж, сіньёр, што праўда, то не крыўда,
Я ж гавару пра свой уласны твар.

ПАРЫС

Ён мой ужо, а ты паклёп узводзіш.

ДЖУЛЬЕТА

Магчыма, так, бо ён жа ўжо не мой.
Ці вольны вы цяпер, святы айцец,
Ці мо прыйсці да вас перад вячэрай?

БРАТ ЛАРЭНЦА

Я вольны, беднае дзіця маё.
(Парысу.)
Даруйце, нам адным застацца трэба.

ПАРЫС

Парушыць святасць — божа барані.
Я рана пабуджу цябе ў чацвер,
Джульета, а пакуль чацвер — бывай.
(Выходзіць.)

ДЖУЛЬЕТА

Замкні ты дзверы, плач ідзі са мной:
Няма ні паратунку, ні надзеі
І ніадкуль ніякай дапамогі.

БРАТ ЛАРЭНЦА

Тваё я гора ведаю, Джульета,
Але не ведаю, што тут прыдумаць.
Я чуў, што ты ў чацвер павінна
Абавязкова з графам павянчацца.

ДЖУЛЬЕТА

Не гавары пра тое, што ты чуў.
Калі не можаш даць мне паратунку.
Калі твая тут мудрасць не паможа,
Дык назаві маё рашэнне мудрым,
І мне кінжал вось гэты дапаможа.
Бог сэрцы нам злучыў, ты — нашы рукі,
Дык вось раней, чым гэтая рука,
Якую ты Рамэо перадаў,
З другім саюз заключыць, і раней,
Чым здрадзіць сэрца вернае маё,
Я гэтым іх абодвух пакараю.
Перабяры свой шматгадовы вопыт
І мне параду зараз жа знайдзі,
А то іначай гэты востры нож
Рассудзіць нас — мяне з маім няшчасцем,
І рассячэ той вузел, што ні розум,

Ні вопыт сівы твой не развязалі.
І не марудзь. Я праўду гавару:
Калі няма ратунку, то памру.

БРАТ ЛАРЭНЦА

Чакай, дачка, прыдумаў нешта я,
У чым хоць капля ёсць надзеі. Толькі
Патрэбна тут адчаяннасць такая,
Як той адчай, што пагражае нам.
Калі гатова ты хутчэй забіць
Сама сябе, чым павянчацца з графам,
Дык згодзішся на падабенства смерці,
Каб толькі гэтым ганьбу адхіліць,
Якая для цябе страшней, чым смерць.
Адважышся — я сродак дам табе.

ДЖУЛЬЕТА

О, лепш, чым выйсці замуж за Парыса,
Ты загадай мне скочыць з гэтай вежы,
Ці ноччу ты запры мяне ў трупярні,
Што жоўтымі набіта чарапамі,
Бразгучымі касцямі мерцвякоў,
Альбо скажы ў магілу легчы мне
З нябожчыкам і саванам накрый.
Усё, што наганяла жах раней,
Зраблю не баючыся, толькі каб
Для любага застацца вернай жонкай.

БРАТ ЛАРЭНЦА

Дык слухай жа: ідзі цяпер дадому,
Вясёлай будзь. Скажы, што згодна ты
За графа выйсці. Заўтра серада.
Ты ноччу ляж адна, кармініцу
З пакоя вышлі; перад сном жа выпі
Усё да каплі з гэтай вось бутэлькі.
І зараз жа па жылах па тваіх
Разыдзецца вільготны, сонны холад.
Пульс біцца перастане і замрэ,
І ні дыханне, ні цяпло, нішто
Не выкажа, што ты яшчэ жывая,
І ружы шчок, і губы спапялеюць,
Павекі, як у мёртвых, западуць,
Адразу цела стане нерухомым,
Як дубяныя будуць рукі, ногі.
І так у гэтым падабенстве смерці
Ты праляжыш аж сорак дзве гадзіны,
А ўстанеш, як ад радаснага сну.

Але уранні, як жаніх твой прыйдзе
Цябе будзіць, ты будзеш быццам мёртвай.
Паводле звычаяў краіны роднай
Цябе, прыбраную, ў труне адкрытай
Тады паставяць у фамільны склеп,
Дзе спачываюць продкі Капулеці.
А я тым часам напішу Рамэо;
Сюды прыбудзе ён, і мы абодва
Чакаць тут будзем, покуль ты прачнешся,
У тую ж ноч у Мантую цябе
Рамэо возьме, і такім вось чынам
Ад ганьбы ты ўратуешся, калі
Які выпадак ці жаночы страх
Не перашкодзіць смеламу намеру.

ДЖУЛЬЕТА

Дай, дай хутчэй! Не гавары пра страх.

БРАТ ЛАРЭНЦА

Вазьмі, ідзі... Будзь цвёрдай да канца.
Я напішу Рамэо і з манахам
У Мантыю пашлю паведамленне.

ДЖУЛЬЕТА

Любоў, дай сілу мне! У ёй — збавенне.
Бывай, мой ойча!

(Выходзіць.)

Сцэна другая

У доме Капулеці.

Уваходзяць Капулеці, сіньёра Капулеці, кармілiца і двое слуг.

КАПУЛЕЦІ

(слузе)

Усіх ты запрасі, што тут у спісе.

Першы слуга выходзіць.

(Другому слузе.)

Ты дваццаць добрых павароў знайдзі.

ДРУГІ СЛУГА

Я вам дрэнных не прывяду, сіньёр. Я пагляджу, ці аблізваюць яны сабе пальцы.

КАПУЛЕЦІ

А што, калі аблізваюць?

ДРУГІ СЛУГА

Клянуся, сіньёр, дрэнны повар не будзе аблізваць пальцы. Таму я і не вазьму такіх, якія не аблізваюць пальцаў.

КАПУЛЕЦІ

Ідзі, ідзі.

Выходзіць другі слуга.

Хаця ж бы ўсё падрыхтаваць паспелі.
А як дачка? Была яна ў манаха?

КАРМІЛІЦА

Пайшла, сіньёр.

КАПУЛЕЦІ

Ну, добра, можа, ён яе навучыць.
Але ж такое ўпартае дзяўчо.

КАРМІЛІЦА

А вунь яна ад споведзі ідзе,
Ды гляньце вы, вясёлая якая!

Уваходзіць Джульета.

КАПУЛЕЦІ

Ну, дзе бадзялася, свавольніца?

ДЖУЛЬЕТА

Там, дзе мяне раскаянню наўчылі
У тым, што я была непаслухмянай
І вам пярэчыла. Святы айцец
Сказаў прасіць мне, паўшы на калені,
Каб даравалі вы. Малю — даруйце!
Цяпер я буду слухаць вас заўсёды.

КАПУЛЕЦІ

Паслаць па графа! Расказаць яму!
І заўтра гэты вузел мы развяжам.

ДЖУЛЬЕТА

Яго спаткала я ў манаха ў келы
І пра сваю любоў яму сказала,
Паколькі мне дазволіла прыстойнасць.

КАПУЛЕЦІ

Ну, добра, я здаволены, ўставай.
Даўно б вось так.— Мне трэба графа бачыць.
Кажу, паклічце мне яго сюды.
Клянуся богам я: манах — святы,
І гораду дабра зрабіў нямала.

ДЖУЛЬЕТА

Кармiліца, хадзем у мой пакой,
Ты дапаможаш там убранне выбраць,
Якое заўтра мне патрэбна будзе.

СІНЬЁРА КАПУЛЕЦІ

Да чацвярга ж яшчэ нам часу хопіць.

КАПУЛЕЦІ

Ідзі, ідзі, кармiліца, не слухай,
Мы заўтра ж у царкву.

СІНЬЁРА КАПУЛЕЦІ

Цямнее ўжо,
Калі ж мы ўсё падрыхтаваць успеем?

КАПУЛЕЦІ

Ты не турбуйся, я вазьмуся сам,
Ручаюся, што выйдзе як найлепей.
А ты Джульеце памажы ідзі
Убранне выбраць. Сёння я не лягу.
Ідзі — я сам за гаспадыню буду.
Гэй, вы! Усе разбегліся. Ну, ладна,
Я сам пайду да графа, папярэджу,
Каб рыхтаваўся ён на заўтра. Дзіўна,
Як лёгка стала мне на сэрцы ад таго,
Што ўпартае дзяўчо паразумнела.
(Выходзіць.)

Сцэна трэцяя

Пакой Джульеты.

Уваходзяць Джульета і кармiліца.

ДЖУЛЬЕТА

Так, гэты ўбор найлепшы. Дзякуй, няня!
Цяпер хацела б я адна застацца.
Маліцца трэба мне ўсю ноч, каб золак
Маёй няшчаснай долі усміхнуўся.
Я ж грэшніца, ты ведаеш сама.

Уваходзіць сіньёра Капулеці.

СІНЬЁРА КАПУЛЕЦІ

Вы тут заняты? Можа, памагчы вам?

ДЖУЛЬЕТА

Ды не, матуля; выбралі мы ўсё,
Што трэба будзе заўтра для вяселля.
Дазвольце мне цяпер адной застацца.
Кармiліцу з сабой вазьміце. Вам жа
У спешцы гэтакай усякіх спраў
Яшчэ нямала.

СІНЬЁРА КАПУЛЕЦІ

Ну, спакойнай ночы.
Табе сягоння трэба адпачыць.

Выходзяць сіньёра Капулеці і кармiліца.

ДЖУЛЬЕТА

Бывайце.— І цяпер бог ведае
Калі мы ўбачымся. Халодны страх
З нудой па жылах па маіх разліўся,
Цяпло жыцця заледзяніў. Вярну іх,
Каб страшна не было. Кармiліца!
Але нашто? Адна павінна я
Тут жудасную сцэну разыграць.
Сюды, фіял!
А што, калі слабое гэта зелле?
І заўтра з графам прыйдзецца вянчацца?
Не, не! Не дасць вось гэта. Тут ляжы.
(Кладзе на пасцель кінжал.)
А можа, зёлкі гэтыя — атрута?
Манах мо хоча атруціць мяне,
Каб другі раз ганебна не вянчаць
Пасля таго, як павянчаў з Рамэо?
Баюся... Не... Не можа гэта быць.
Дагэтуль быў ён чалавек святы.
А што, калі прачнуся ў склепе я
Раней, чым прыйдзе любы мой Рамэо,
Каб вызваліць мяне? О, гэта страшна.
Магу я задыхнуцца ў падзямеллі,
Куды не дойдзе свежае паветра,
І там памру, пакуль Рамэо прыйдзе.
Калі ж і не памру — другое страшна:
Падумаць страшна мне пра ноч і смерць,
Пра месца жудасці — магільны склеп,
Дзе косці продкаў шмат вякоў ляжаць;
Дзе акрываўлены Тыбальт гніе
У саване сваім, дзе, кажуць людзі,
Апоўначы нябожчыкі ўстаюць...

О божа мой. Магу ж і я дачасна
Прачнуцца ад агіднага смуроду,
Ад стогнаў тых, як стогны мандрагоры,
З карэннем вырванай. Ад жахаў тых
Напэўна звар'яцею я адразу
І прахам продкаў буду забаўляцца,
Дастану з савана Тыбальта труп
Альбо ў шаленстве продка косць схаплю
І, як дубінай, чэрап свой раструшчу.
Ужо, здаецца, бачу я Тыбальта,
Вунь, ходзячы, шукае ён Рамэо,
Што шпагай пракалоў яго навылет.
Стой, стой, Тыбальт! Рамэо мой! Рамэо!
Рамэо, я іду! П'ю за цябе!
(П'е і кідаецца на пасцель.)

Сцэна чацвёртая

Зала ў доме Капулеці.

Уваходзяць сіньёра Капулеці і кармініца.

СІНЬЁРА КАПУЛЕЦІ
Вазьмі ключы, нясі яшчэ прыправы.
КАРМІНІЦА
Айвы і фінікаў на кухню трэба.

Уваходзіць Капулеці.

КАПУЛЕЦІ
Хутчэй! Другія пеўні праспявалі.
У звон званілі: тры гадзіны ўжо.
Ты наглядай, Анжэліка, за кухняй,
Ды не скупіся.
СІНЬЁРА КАПУЛЕЦІ
Кіньце вы мяшацца
У нашы справы. Лепш ідзіце спаць,
Бо заўтра будзеце хварэць не спаўшы.
КАПУЛЕЦІ
Ніколі. Ночы я не спаў, бывала,
Па справах меншых шмат, ды не хварэў.

СІНЬЁРА КАПУЛЕЦІ
Была пара — гуляў-такі начамі,
Але цяпер — мінулася табе.

Выходзяць сіньёра Капулеці і кармеліца

КАПУЛЕЦІ
О, рэўнасць, рэўнасць!

Уваходзяць тры ці чатыры слугі з верцяламі, дровамі, кошыкамі.

Што нясеш, хлапчына?
ПЕРШЫ СЛУГА
Не ведаю, тут нешта повару.
КАПУЛЕЦІ
Хутчэй нясі.

Першы слуга выходзіць.

Ты лепшых дроў знайдзі.
Спытайся ў П'етра, ён пакажа дзе.
ДРУГІ СЛУГА
Ёсць галава — і сам знайсці патраплю,
Нашто дрывамі П'етра турбаваць?
КАПУЛЕЦІ
Ты хлопец — зух, і галава ў цябе,
Як бачу, дрывяная. Днее ўжо.

Другі слуга выходзіць.

Граф зараз і музыкаў прывядзе:
Так ён сказаў. Ды вось ідзе, чуваць.

За сцэнай музыка.

Кармеліца! Гэй, жонка! Дзе ты там?

Уваходзіць кармеліца.

Ідзі будзі ды прыбірай Джульету,
А я пагутару пакуль што з графам.
Ды варушыся ж ты, жаніх прыйшоў!
Хутчэй, кажу табе!
(Выходзіць.)

Сцэна пятая

Пакой Джульеты.

Уваходзіць кармілiца.

КАРМІЛІЦА

Сіньёра! Ой, сіньёра! Спіць як моцна.
Джульета! Мілая мая авечка!
Ды ну, прачніся! Фу, якая соня!
Галубка, ангел мой! Нявеста, ўстань!
Ні слова... Хоча выспацца на тыдзень.
І то сказаць, Парыс наступнай ноччу
Парупіцца, каб ты не спала шмат.
Ах, божа мой,— як здорава заснула!
А трэба ўсё ж такі будзіць. Сіньёра!
Сіньёра мілая, вы хочаце,
Каб у пасцелі вас жаніх застаў?
Ён разварушыць зразу.
(Адкрывае фіранку.)
Што такое?
Прыбралася ды спаць лягла ў убранні.
Ды ўстаньце ж вы, сіньёра! О, памерла!
Нашто я нарадзілася на свет!
Гарэлкі дайце мне! Сіньёр! Сіньёра!

Уваходзіць сіньёра Капулеці.

СІНЬЁРА КАПУЛЕЦІ

Што ты крычыш тут?

КАРМІЛІЦА

О няшчасны дзень!

СІНЬЁРА КАПУЛЕЦІ

А што такое?

КАРМІЛІЦА

Гляньце! Гора нам!

СІНЬЁРА КАПУЛЕЦІ

Ох, божа мой! Дзіця, жыццё маё!
Прачніся, глянь, ці я памру з табой.
Ратуйце! Кліч, крычы, прасі ратунку!

Уваходзіць Капулеці.

КАПУЛЕЦІ

Нявеста дзе? Жаніх чакае. Сорам.

КАРМІЛІЦА

Яна памерла. О няшчасны дзень!

СІНЬЁРА КАПУЛЕЦІ

Памерла! Божа мой! Яна сканала!

КАПУЛЕЦІ

Дай глянуць мне. Халодная. Канец.
Застыла кроў, пакарчанелі рукі,
Жыццё даўно зляцела з гэтых вуснаў.
Забіла раптам смерць яе, як кветку
Найпрыгажэйшую мароз дачасны.

КАРМІЛІЦА

Няшчасны дзень!

СІНЬЁРА КАПУЛЕЦІ

Няшчасныя мы сёння!

КАПУЛЕЦІ

Яе забрала смерць, каб я крычаў,
А мне язык скавала цяжкім горам.

Уваходзяць брат Ларэнца і Парыс з музыкантамі.

БРАТ ЛАРЭНЦА

Ну як — нявеста ўжо ў царкву гатова?

КАПУЛЕЦІ

На векі вечныя яна гатова.
(Парысу.)
О сын мой, перад самым шлюбам смерць
З тваёй нявестай спала, і яна
Ляжыць, як кветка, скошаная смерцю.
Цяпер жа смерць — мой зяць і смерць — наследнік,
З маёй дачкой звянчалася яна,
Памру, смерць возьме ўсё — жыццё, маёмасць.

ПАРЫС

Я дачакацца раніцы не мог,
А дачакаўшыся — што бачу я!

СІНЬЁРА КАПУЛЕЦІ

Праклятый, жудасны, агідны дзень!
Гадзіна горшая з усіх гадзін,
Якія толькі ведаў час бясконцы.
Адным адно любімае дзіця,
Адзіная мая уцеха, радасць,—
І тое смерць бязлітасна забрала.

КАРМІЛІЦА

О гора! горкі, горкі, горкі дзень.
Журботны самы, самы нешчаслівы

З усіх тых дзён, што я перажыла.
О дзень, о дзень, о зненавідны дзень!
Чарнейшага не бачыла я дня.
О горкі, о няшчасны дзень.

ПАРЫС

Падмануты, разведзены, забіты!
Зганьбованы! Табой падмануты!
Табой! Табой! Бязлітасная смерць!
Любоў, жыццё маё! Няма жыцця,
Але і ў смерці ты мая любоў.

КАПУЛЕЦІ

Я скатаваны, змучаны, забіты!
Жахлівы дзень, чаму да нас прыйшоў ты
Забіць вясёласць нашу, наша свята?
Дзіця маё, дзіця! Душа мая!
Памерла ты, памерла ты, дачушка,—
З табой навек мая памерла радасць.

БРАТ ЛАРЭНЦА

Як вам не сорам! Перастаньце! Гора
Вы не залечыце такім адчаем.
Валодалі вы з небам папалам
Цудоўнай дзевай, а цяпер яна
Уся належыць небу. Там ёй лепш.
Сваю часціну ўратаваць ад смерці
Вы не маглі, а неба вечнае
Жыццё дало ёй. Марылі заўсёды
Узвысіць вы яе, падняць да неба,
Цяпер жа плачаце, калі яна
Вышэй за воблакі, на самым небе.
Вы дрэнна любіце дачку сваю,
Вы вар'яцееце, калі ёй добра.
Шчаслівая не тая між жанчын,
Што доўга замужам жыве, а тая,
Што памірае маладой кабетай.
Вы слёзы асушыце. Размарынам
Пасыпце цела; хораша прыбраўшы,
Паводле звычаю, ў царкву нясіце.
У нас прырода выклікае слёзы,
Але смяецца над слязамі разум.

КАПУЛЕЦІ

Усё вясельнае падрыхтаванне
У нас абернецца на пахаванне,
І стане музыка хаўтурным звонам,
Памінкамі — вясельная бяседа,

З вясельных песень стане паніхіда,
А кветкі шлюбныя пакрыюць труп,
І процілегласць будзе тут ва ўсім.

БРАТ ЛАРЭНЦА

Сіньёр, ідзіце. Ды і вы, сіньёра,
І вы, Парыс. Рыхтуйцеся праводзіць
Чароўную нябожчыцу ў магілу.
За грэх вы пакараны боскай воляй,—
Каб нараканнем не гнявілі болей.

Выходзяць Капулеці, сіньёра Капулеці, Парыс і брат Ларэнца.

ПЕРШЫ МУЗЫКАНТ

Выходзіць — трэба складваць дудкі ды выбірацца.

КАРМІЛІЦА

Складвайце, складвайце, добрыя людзі! Вы самі бачыце, якое тут няшчаснае здарэнне.

(Выходзіць.)

ПЕРШЫ МУЗЫКАНТ

А заплаціць усё ж такі трэба.

Уваходзіць П'етра.

П'ЕТРА

Музыкі, ах, музыкі! Сыграйце «Радасць сэрца», калі вы хочаце, каб я застаўся жыць, сыграйце «Радасць сэрца».

ПЕРШЫ МУЗЫКАНТ

Чаму «Радасць сэрца»?

П'ЕТРА

Таму што маё сэрца пяе: «Сэрца поўнае смутку». О, сыграйце мне якую-небудзь вясёлую жалобную песеньку, каб мяне ўсцешыць.

ПЕРШЫ МУЗЫКАНТ

Цяпер не да вясёлых песенек.

П'ЕТРА

Значыць, вы не хочаце?

ПЕРШЫ МУЗЫКАНТ

Не хочам.

П'ЕТРА

Дык заплачу ж я вам.

ПЕРШЫ МУЗЫКАНТ

Чым жа ты нам заплаціш?

П'ЕТРА

Не грашыма, вядома, а вострым словам пад рабрыну, вулічныя вы спевакі.

ПЕРШЫ МУЗЫКАНТ

Добра, што не халуі.

П'ЕТРА

А вось я цябе халуйскім нажом па галаве.

(Выхоплівае нож.)

Без ніякіх ключоў. Будзе вам тут і «рэ», і «фа», і «соль». Я вас усіх перафасолю.

ПЕРШЫ МУЗЫКАНТ

Так ты нас можаш на музыку палажыць.

ДРУГІ МУЗЫКАНТ

Схавай лепш нож ды дастань сваё вострае слова.

П'ЕТРА

Дык сцеражыцеся ж майго вострага слова. Я схаваю нож і вострым словам праніжу вас наскрозь. Адкажвайце мне, як людзі:

«Калі душу гнятуць цяжкія мукі,
Калі яны на сэрца сум нагоняць,
Дык музыкі сярэбраныя гукі...»

Чаму гэта сярэбраныя гукі? Чаму музыкі сярэбраныя гукі? Ну, ты, Сіман Струна, што ты на гэта скажаш?

ПЕРШЫ МУЗЫКАНТ

Таму, сіньёр, што серабро прыемна гучыць.

П'ЕТРА

Сказануў. А ты што скажаш, Гуга Гудок?

ДРУГІ МУЗЫКАНТ

Па-мойму, таму «сярэбраныя гукі», што музыканты граюць за серабро.

П'ЕТРА

Добра сказана. А ты што скажаш, Якаў Пішчык?

ТРЭЦІ МУЗЫКАНТ

Я ўжо не ведаю, што і сказаць.

П'ЕТРА

Ах, выбачай, я забыўся, што ты спявак. Я скажу за цябе. «Сярэбраныя гукі» таму, што музыкантам рэдка прыходзіцца званіць золатам.

«Дык музыкі сярэбраныя гукі
Адразу боль душы загояць».

(Выходзіць.)

ПЕРШЫ МУЗЫКАНТ

Вось абармот!

ДРУГІ МУЗЫКАНТ

Ну яго к чорту! Хадзем пачакаем, пакуль пахаваюць, ды застанёмся абедаць.

Выходзяць.

АКТ ПЯТЫ

Сцэна першая

Мантуя. Вуліца.

Уваходзіць Рамэо.

РАМЭО

Каб я паверыць мог ліслівым снам!
Мне сон прарочыць радасную вестку.
Вясёлы бог любві ўладае мною,
І незвычайны дух праз цэлы дзень
У марах над зямлёй мяне насіў.
Я сніў, што мілая прыйшла. Мяне
Яна застала мёртвым.— Дзіўны сон,
Што мёртваму дае магчымасць думаць! —
І пацалункамі жыццё вярнула мне.
А я, ажыўшы, зразу стаў царом.
Якая ты салодкая, любоў,
Калі і цень любві дае нам шчасце!

Уваходзіць Балтазар.

З Вероны весткі? Балтазар, ну, што?
Ты ад манаха мне пісьмо прынёс?
Ну, як мая сіньёра, бацька як?
Як маецца Джульета, я пытаю?
Калі ёй добра, дык і ўсё нічога.

БАЛТАЗАР

Нічога дрэннага — цяпер ёй добра...
У склепе Капулеці спіць яна,
Душа яе — між ангелаў на небе.
Труну яе я ў спачывальні бачыў
І вось прыбег, каб вам сказаць пра гэта.
За вестку дрэнную — прашу прабачыць,
Вы мне, сіньёр, такую службу далі.

РАМЭО

І гэта праўда? Неба, я твой вораг!
Ты ведаеш, дзе я жыву? Ідзі
Паперу і чарніла прынясі
Ды коней мне наймі — я сёння еду.

БАЛТАЗАР

Малю вас, супакойцеся, сіньёр! —

Збялелы твар і дзікі погляд ваш
Бяду прарочаць.

РАМЭО

Кінь! Табе здаецца.
Ідзі рабі, што я сказаў табе.
Ты пісем не прынёс мне ад манаха?

БАЛТАЗАР

Не, мой сіньёр.

РАМЭО

Нічога; ты ідзі
Наймі мне коней. Зараз я прыйду.

Балтазар выходзіць.

З табой, Джульета, лягу я ў магілу
Сягоння ноччу. Як зрабіць мне гэта?
О зло, як хутка ты ў душу прыходзіш
Таму, каго гняце адчай. Я ўспомніў
Аптэкара. Ён блізка тут жыве.
Я на яго звярнуў сваю увагу:
З панурым выглядам, у лахманах —
Ён травы разбіраў, худы, няшчасны,
Абгрызены бязлітасным жабрацтвам.
У крамцы ж чарапаха, бачыў я,
Вісела, і напханы алігатар,
І скуры страшных рыб; а на паліцах
Жабрацкі склад пустых каробак, шклянак,
Зялёных гліняных гаршкоў, шнуркоў,
Насення, нейкіх прасначкоў скарэлых —
Быў выстаўлен, каб хворых спакушаць.
Я, ўбачыўшы мізэрны скарб, падумаў:
Каб чалавек хацеў купіць атруты,
Якую прадаваць пад страхам смерці
Тут забаронена, дык гэты вось
Няшчасны абармот яе прадаў бы.
Як быццам я патрэбу прадчуваў.
Бядняк напэўна мне прадасць атруту.
Я памятаю — гэта дом яго.
Зачыненая крама — сёння свята.
Гэй, гэй, аптэкар!

АПТЭКАР

Хто так моцна кліча?

РАМЭО

Ідзі сюды. Я бачу, бедны ты.
Дык вось вазьмі дукаты — тут іх сорак,

А мне ты толькі драхму дай атруты,
Але такога зелля, каб умомант
Па жылах разлілося і каб той,
Хто стомлены жыццём, адразу паў бы;
Каб вырвалася хутка так дыханне,
Як вырываецца з гарматы порах.

АПТЭКАР

Ёсць зелле, толькі Мантуі закон
Карае смерцю тых, што прадаюць.

РАМЭО

Ты ж бедны, голы і баішся смерці?
Я бачу голад на тваім абліччы,
Туга і смутак у тваіх вачах,
А на плячах — жабрацтва і знявага.
Ні свет табе не друг і ні закон;
Няма на свеце гэткага закона,
Які б цябе багатым мог зрабіць.
Забудзь жабрацтва і закон — вазьмі!

АПТЭКАР

Дае вам згоду беднасць, а не воля.

(Дае яму атруту.)

РАМЭО

Не волі я, а беднасці плачу.

АПТЭКАР

У вадкасць у любую ўсыпце гэта
І выпіце; хоць дваццаць сіл людскіх
Вы маеце ў сабе — адразу смерць.

РАМЭО

Вось золата тваё — душы атрута,
Забойца горшы ў гэтым подлым свеце,
Чым гэты твой нікчэмны парашок,
Які ты прадаваць баішся. Я
Прадаў табе атруту, а не ты мне.
Бывай, купі сабе яды і растаўсцей.
Я ж не атруту ўзяў сабе, а лекі,
Каб з любай у труне заснуць навекі.

(Выходзіць.)

Сцэна другая

Келья брата Ларэнца.

Уваходзіць брат Джаванні.

БРАТ ДЖАВАННІ

Эй, францысканец, брат святы, эй, брат!

Уваходзіць брат Ларэнца.

БРАТ ЛАРЭНЦА

Па голасу дык гэта брат Джаванні.
Ты з Мантуі? Ну, што сказаў Рамэо?
Мо напісаў, дык дай сюды пісьмо.

БРАТ ДЖАВАННІ

Я брата басаногага шукаў —
Свайго манаха, каб узяць з сабой;
Ён там у горадзе наведваў хворых.
Яго знайшоў, а гарадская варта,
Падумаўшы, што дом зачумлены,
Заперла ў гэтым доме нас абодвух,—
І вось я ў Мантую не мог папасці.

БРАТ ЛАРЭНЦА

А хто ж занёс пісьмо маё к Рамэо?

БРАТ ДЖАВАННІ

Не мог яго паслаць я — вось яно —
Табе назад вярнуць не мог таксама:
Ніхто не браў — баяліся заразы.

БРАТ ЛАРЭНЦА

Няшчасны лёс! Клянуся брацтвам я,
Не пусцяковае было пісьмо,—
Патрэбнае і вельмі важнае,—
Затрымка можа нарабіць бяды.
Знайдзі ты, брат Джаванні, лом жалезны
І прынясі мне ў келью.

БРАТ ДЖАВАННІ

Добра, зараз.

БРАТ ЛАРЭНЦА

Цяпер адзін я ў склеп ісці павінен,
Прачнецца праз гадзіны тры Джульета
І будзе праклінаць мяне за тое,
Што не паведаміў Рамэо я.
Я зноў у Мантую пашлю пісьмо,

Яе ж, пакуль Рамэо з'явіцца,
Схаваю ў келы. Бедны труп жывы,
Паложаны ў труну нябожчыка!

Сцэна трэцяя

Могільнік; на ім склеп Капулеці.

Уваходзіць Парыс і паж,
які нясе кветкі і факел.

ПАРЫС

Дай факел, хлопчык! Адыдзі далей!
Ці лепш тушы, бо нас убачыць могуць.
Кладзіся там, пад цісамі, і вуха
Да ўскопанай зямлі шчыльней прыцісні —
На могілках ты кожны крок пачуеш:
Тут крохкая і гулкая зямля.
Што б ні пачуў ты — свісні. Дай мне кветкі.
Рабі, што я табе сказаў: ідзі!

ПАЖ

(убок)
Мне страшна заставацца аднаму
На гэтых могілках, ды паспрабую.
(Хаваецца.)

ПАРЫС

Мая ты кветка, шлюбны ложак твой
Я кветкамі асыплю. Пыл і камень —
Твой полаг тут. Душыстаю вадою
Я буду арашаць яго начамі.
Вады не хопіць — горкімі слязамі.
Штоночы кветкі буду я прыносіць,
Штоноч іх слёзы горкія аросяць.

Паж свішча.

Дае мне знак хлапец: ідзе там нехта,
Чыя праклятая нага тут крочыць
І парушае мой абрад любоўны?
І нават з факелам? Хутчэй жа, ноч,
Прыкрый мяне на момант цемнатою.
(Хаваецца.)

Уваходзяць Рамэо і Балтазар
з факелам і ломам.

РАМЭО

Дай лом і жалязняк! Пісьмо вось гэта
Ты заўтра бацьку перадай майму.
Дай факел! Хочаш жыць на свеце,— помні:
Што б ты ні ўбачыў, што б ты ні пачуў,
Стой там паводдаль, не перашкаджай мне.
Хачу спусціцца я ў палацы смерці,
Апошні раз на жонку паглядзець,
Галоўнае ж — каб зняць з яе рукі
Пярсцёнак дарагі, патрэбны мне
Для вельмі важнай справы. Ну, ідзі!
Калі ж сюды адважышся вярнуцца
І будзеш падглядаць, што я раблю,
Я разарву цябе — клянуся богам,
І па ўсіх могілках параскідаю
Кавалкі цела. Позні, дзікі час,
Намеры дзікія мае страшэнна,
Бязлітасныя больш, чым тыгр галодны,
Чым мора, што ад ярасці раве!

БАЛТАЗАР

Іду, сіньёр; я вам не перашкоджу.

РАМЭО

Дакажаш гэтым, што ты друг. Вазьмі.
(Дае яму грошы.)
Жыві шчасліва і — бывай, мой мілы!

БАЛТАЗАР

(убок)
А я схаваюся дзе-небудзь тут.
Глядзіць ён страшна — страшнае задумаў.
(Хаваецца.)

РАМЭО

Ты, зяпа гнюсная, вантроба смерці,
Што лепшую красу зямлі сажрала,
(Ломіць дзверы склепа.)
Твой рот гнілы я сілай расшчаплю,
Яшчэ табе яды напхаю ў горла.

ПАРЫС

Выгнаннік тут, нахабны той Мантэкі,
Які забіў маёй нявесты брата.
Яна ад роспачы лягла ў магілу.
Цяпер сюды паздзеквацца прыйшоў ён
Над прахам дарагім. Схаплю яго.
(Выходзіць наперад.)
Агідную работу прыпыні,

Мантэкі подлы! Ты і мёртвым помсціш?
Асуджаны падлец, ты арыштован.
Ідзі за мной — памерці ты павінен.

РАМЭО

Павінен. І таму сюды прыйшоў.
Не спакушай адчаяннай душы,
Юнак мой мілы. Уцякай адгэтуль.
І без цябе нябожчыкаў тут шмат.
Пабойся. Я прашу цябе, юнак,
Не прымушай мяне яшчэ грашыць,
Не раздражняй, ідзі хутчэй адгэтуль.
Люблю цябе я болей, чым сябе,
Клянуся небам. Я прыйшоў сюды
Узброены супроць сябе самога.
Бяжы хутчэй, жыві. Пасля ты скажаш:
Шалёны той жыццё мне дараваў.

ПАРЫС

Тваё я заклінанне пагарджаю
І арыштоўваю цябе — злачынца.

РАМЭО

Ты выклікаеш? Сцеражыся, хлопчык!

(Б'юцца.)

ПАЖ

О божа, б'юцца! Пабягу па варту.

ПАРЫС

Забіты я. Калі ты маеш літасць,
З Джульетай палажы мяне ў грабніцу.

(Памірае.)

РАМЭО

Хай будзе так. Спачатку гляну ў твар.
Меркуцыо сваяк ён — граф Парыс.
Што гаварыў дарогай мне слуга?
Усхваляваны, я не чуў нічога.
Сказаў, здаецца, ён, што граф Парыс
З Джульетаю збіраецца жаніцца.
Сказаў ён так ці мне прыснілася?
Ці, можа, калі ён Джульету ўспомніў,
Я страціў розум і ўявіў сабе?
Дай мне руку. Цяпер са мною разам
У кнігу роспачы занесен ты.
Юнак забіты, ва ўрачыстым склепе
Цябе я пахаваю. Не, не ў склепе,
А ў башні светлай — там ляжыць Джульета,
І харство яе ператварае

Пануры склеп у светлы зал бяседны.
Ляжы тут, мёртвы, мёртвым пахаваны.
(Кладзе Парыса ў склеп.)
Як часта людзі перад самай смерцю
Становяцца вясёлымі раптоўна!
Завуць прадсмертнаю зарніцай гэта.
Ці ж гэта я магу назваць зарніцай?
О жонка мілая, любоў мая!
Смерць высмактала мёд твайго дыхання,
Але з тваёй красой не саўладала,
Не здолела яе. Красы адзнака —
Ружовы колер губ і шчок тваіх;
Тут смерці бледны флаг яшчэ не ўзняты.
Тыбальт, і ты ж у саване крывавым
Ляжыш тут? Для цябе я не магу
Зрабіць нічога больш, як той рукою,
Што загубіла маладосць тваю,
Забіць згубіцеля. Даруй мне, брат!
Чаму, Джульета, і цяпер яшчэ
Такое харство ў табе? Няўжо
Смерць бесцялесная ўлюбілася
Сама ў цябе? Няўжо худая поскудзь
Цябе трымае ў гэтым змрочным месцы
З тым, каб зрабіць любоўніцай сваёй?
Я гэтага баюся і таму
З табою застануся назаўсёды,
Не выйду з гэтага палаца цемры
Ніколі больш. Тут, тут з чарвямі я —
Тут будзе вечны адпачынак мой.
Я скіну тут прыгнёт варожых зор
Са стомленага ў свеце гэтым цела.
Глядзіце ж, вочы, вы апошні раз!
Апошні раз вы, рукі, абніміце!
Дыхання дзверы — губы, пацалункам
Умову з прагнай смерцю замацуйце!
Прыйдзі, мой горкі праваднік, прыйдзі,
Злавесны рулявы, і накіруй
На скалы вострыя змарнелы човен.
П'ю за сваю любоў.
(П'е.)
Аптэкар чэсны!
Сказаў ты праўду — моцны твой напітак,
І з пацалункам паміраю я.
(Памірае.)

Уваходзіць з другога боку могільніка брат Ларэнца з ліхтаром, ломам і жалезняком.

БРАТ ЛАРЭНЦА

Ратуй, святы Францыск! Як шмат разоў
Я спатыкаўся аб магілы.— Хто тут?

БАЛТАЗАР

Ваш друг, што ведае вас добра.

БРАТ ЛАРЭНЦА

Хай бог цябе благаславіць. Скажы мне,
Мой добры друг, што гэта там за факел
Дарэмна свеціць чарапам бязвокім?
Здаецца, ён у склепе Капулеці?

БАЛТАЗАР

Там, там, святы айцец. Там гаспадар мой,
Якога вы так любіце.

БРАТ ЛАРЭНЦА

А хто ж ён?

БАЛТАЗАР

Рамэо.

БРАТ ЛАРЭНЦА

Ён даўно там?

БАЛТАЗАР

З паўгадзіны.

БРАТ ЛАРЭНЦА

Хадзем са мною ў склеп.

БАЛТАЗАР

Баюся, ойча.
Не ведае мой гаспадар, што я ўсё тут.
А ён жа пагражаў мне лютай смерцю,
Калі я застануся падглядаць.

БРАТ ЛАРЭНЦА

Дык заставайся, я адзін пайду.
Бяды баюся, страх мяне бярэ.

БАЛТАЗАР

Калі пад гэтым цісам я заснуў,
Мне снілася — Рамэо з некім біўся,
Мой гаспадар забіў таго.

БРАТ ЛАРЭНЦА

Рамэо!
(Падыходзіць да склепа.)
О божа мой, чыёй жа гэта кроўю
Заплямлены ступені ў гэты склеп?
Хто шпагі акрываўленыя кінуў

Тут, у прытулку вечнага спакою?
(Уваходзіць у склеп.)
Рамэо! Бледны. Хто ж яшчэ? Парыс.
Увесь ён у крыві. Які злы момант
Віноўнік тут няшчаснага здарэння?
Яна паварушылася, здаецца.

Джульета прачынаецца і ўстае.

ДЖУЛЬЕТА

Святы айцец! А дзе ж мой уладар?
Я помню добра, дзе мне трэба быць,—
На гэтым месцы. Дзе ж Рамэо мой?

Шум за сцэнай.

БРАТ ЛАРЭНЦА

Я чую нейкі шум. Хадзем, сіньёра,
Мы з гэтага гнязда заразы, смерці
І сну ненатуральнага. Ёсць сіла
Мацнейшая, чым нашы намаганні,—
Яна разбурыла намеры нашы.
Хадзем хутчэй. Тут на грудзях тваіх
Ляжыць твой мёртвы муж; Парыс — таксама
Хадзем са мной, у манастыр цябе
Я да сяцёр набожных завяду.
Ты не распытвайся і не марудзь.
Ужо вунь варта. Мілая Джульета,
Хадзем, хадзем! Я не магу застацца.

Ларэнца адыходзіць.

ДЖУЛЬЕТА

Ідзі. Я не пайду адгэтуль. Гэта што?
Сціскае шклянку любага рука.
Атрута тут — прычына смерці ранняй.
О, прагны! Выпіў і ніводнай каплі
Для паратунку не пакінуў мне.
Я вусны буду цалаваць твае,
На іх атрута, можа, засталася,
І ад уцехі гэтай я памру.
(Цалуе Рамэо.)
А губы цёплыя твае.

ПЕРШЫ ВАРТАВЫ

(за сцэнай)
Ну дзе?
Вядзі паказвай нам, куды ісці.

ДЖУЛЬЕТА

Там шум. Спяшацца трэба мне. Кінжал,
Збавіцель мой!
(Вымае кінжал Рамэо з ножан.)
Вось ножны дзе твае.
(Заколваецца.)
Ржавей ты тут, а мне памерці дай.
(Падае на цела Рамэо і памірае.)

Уваходзіць варта з пажам Парыса.

ПАЖ

Вунь там, дзе факел той гарыць. Вунь там.

ПЕРШЫ ВАРТАВЫ

Зямля ў крыві. Абшукваць могільнік,
І хто б ні трапіўся, вязаць усіх.
Малюнак страшны. Граф ляжыць забіты;
Джульета ўся ў крыві... і цёплая,
Хоць трэці дзень ужо, як пахавалі.
Хутчэй ідзіце герцагу скажыце!
Паклічце Капулеці! Клічце ўсіх!
Мантэкі пабудзіце зараз жа!
Мы бачым месца жахаў і крыві,
А да прычын страшэннае бяды
Без росшукаў не можам мы дабрацца.

Уваходзяць некалькі вартавых з Балтазарам.

ДРУГІ ВАРТАВЫ

Манах тут; стогне ён, дрыжыць і плача.
Ішоў сюды, а мы яго схапілі
І адабралі лом і жалязняк.

ПЕРШЫ ВАРТАВЫ

О, гэта падазрона! Затрымаць!

Уваходзіць герцаг са світай.

ГЕРЦАГ

Што за бяда прачнулася так рана
І ранішні спакой наш парушае?

Уваходзяць Капулеці, сіньёра Капулеці і іншыя.

СІНЬЁРА КАПУЛЕЦІ

Народ на вуліцы крычыць «Рамэо».
А хто: «Джульета», хто: «Парыс» — і ўсе
Да склепа нашага імчацца з крыкам.

ГЕРЦАГ
Які тут жах трывожыць слых наш?
ПЕРШЫ ВАРТАВЫ Герцаг,
Вось тут ляжыць забіты граф Парыс,
Рамэо мёртвы, мёртвая Джульета —
І цёплая: забіта толькі што.
ГЕРЦАГ
Шукаць, знайсці віноўнікаў забойства!
ПЕРШЫ ВАРТАВЫ
Слуга Рамэо тут; а вось — манах.
Пры іх для ўзлому склепа гэтага
Знайшлі прылады.
КАПУЛЕЦІ
Жонка, божа мой!
Ты глянь, дачка ў крыві ўся. Памыліўся
Кінжал: вунь там, пры поясе ў Рамэо
Яго парожняе жыллё, а ён
У грудзі нашае дачкі ўвайшоў.
СІНЬЁРА КАПУЛЕЦІ
О гора! Гэты выгляд смерці мне —
Як пахавальны звон, які гаворыць,
Што старасці маёй пара ў магілу.

Уваходзяць Мантэкі і іншыя.

ГЕРЦАГ
Ты рана ўстаў, Мантэкі, каб пабачыць,
Што сын адзіны твой так рана лёг.
МАНТЭКІ
Мой уладар, сканала ўночы жонка:
Выгнанне сына ёй жыццё разбіла,
Якой жа мне яшчэ бяды чакаць?
ГЕРЦАГ
Ты глянь — і ўбачыш.
МАНТЭКІ
О невук, невук ты! Прыстойна хіба
Раней за бацьку класціся ў магілу?
ГЕРЦАГ
Для нараканняў зачыні ты вусны,
Пакуль не высветлім падзей жахлівых,
Не знойдзем іх крыніцы і прычын.
Тады правадніком жалобы вашай
Я стану сам да самае магілы.
Хай гора ваша крыху пацярпіць.
Прывесці падазроных мне сюды!

БРАТ ЛАРЭНЦА

Галоўны самы з падазроных — я,
Хоць менш за ўсіх я здольны на злачынства.
Жахлівага забойства час і месца —
Усё паказвае супроць мяне.
Я тут, каб бараніць і вінаваціць,
Каб асудзіць і апраўдаць сябе.

ГЕРЦАГ

Усё, што ведаеш, кажы адразу.

БРАТ ЛАРЭНЦА

Скажу я коратка,— іначай бы
На доўгае апавяданне мне
Хвілін маіх апошніх не хапіла.
Рамэо мёртвы быў Джульеты мужам,
І вернай жонкаю была яму
Джульета мёртвая. Я іх вянчаў;
Дзень шлюбу тайнага быў смертным днём
Тыбальта; гэта смерць была прычынай
Выгнання маладога мужа. Жонка
Па мужу плакала, не па Тыбальту.
А вы, каб разагнаць тугу яе,
Хацелі выдаць сілаю за графа.
Тут да мяне прыйшла яна з адчаем,
Маліла, каб што-небудзь я прыдумаў
І ўратаваў бы ад другога шлюбу,
А не — забіць сябе гразіла ў келыі.
Тады, навучаны сваім умельствам,
Я даў ёй соннае пітво, якое
Зрабіла тое, што прадбачыў я:
Надаўшы выгляд мёртвае жывой.
А я тады Рамэо напісаў,
Каб ён прыехаў гэтай ноччу страшнай
Джульету ўзяць з часовае магілы,
Калі надыдзе час прачнуцца ёй.
Але пасланы мною брат Джаванні
З пісьмом быў затрыманы выпадкова
І ўчора мне вярнуў яго назад.
Калі ёй тэрмін надышоў прачнуцца,
Забраць яе пайшоў я ў склеп сямейны,
Хацеў у келы я схаваць яе,
Пакуль змагу паведаміць Рамэо.
Калі ж прыйшоў за некалькі хвілін
Да тэрміну, што ёй прачнуцца трэба,
Ужо нябожчыкі ляжалі тут —

Рамэо верны і шаноўны граф.
Калі Джульета ўстала, я прасіў
Ісці са мной, скарыцца волі боскай,
Але мяне спалохаў шум раптоўны,
Яна ж ісці са мной не захацела
І, мусіць, тут сама сябе забіла.
Вось тое ўсё, што я магу сказаць;
Пра шлюб жа ведае кармілiца.
Калі чым-небудзь я тут вінават,
Дык у ахвяру строгаму закону
Раней, чым суджана памерці мне,
Аддайце вы жыццё маё старое.

ГЕРЦАГ

Заўсёды ў нас ты праведнікам быў,
Але што скажа нам слуга Рамэо?

БАЛТАЗАР

Пра смерць Джульеты вестку я прынёс
Гаспадару, і з Мантуі сюды
Ён кінуўся да гэтага вось склепа;
Сказаў, каб бацьку перадаў я ўранні
Пісьмо вось гэта. Сам спусціўся ў склеп,
А мне пад страхам смерці загадаў,
Каб я тут аднаго яго пакінуў.

ГЕРЦАГ

Дай мне пісьмо, я потым прачытаю.
Дзе графаў паж, які паклікаў варту?
Скажы, што гаспадар твой тут рабіў?

ПАЖ

Прынёс ён кветкі на труну сіньёры,
Сказаў мне стаць вунь там; я адышоўся.
І раптам нехта з факелам прыйшоў,
Пачаў узламваць склеп. Мой гаспадар
Тут на яго накінуўся з мячом,
А я пабег тады хутчэй па варту.

ГЕРЦАГ

Пісьмо манаха словы пацвярджае
Пра іх любоў, таксама, як пра смерць.
Ён піша тут, што ён купіў атруту
У беднага аптэкара і з ёй
Прыйшоў у склеп памерці ля Джульеты.
Дзе ж ворагі? Мантэкі! Капулеці!
Вы богам пакараны за варожасць:
Любоўю радасць вашу ён забіў.

А я за патуранне вам аддаў
Двух сваякоў; усе мы пакараны.

КАПУЛЕЦІ

О брат Мантэкі, дай жа мне руку.
Тут частка ўдовіна Джульеты; болей
Я не прашу.

МАНТЭКІ

А я магу даць больш.
Я з золата ёй статую пастаўлю,
Пакуль Веронаю Верона будзе,
Каштоўным самым будзе помнік гэты —
Увасабленне вернае Джульеты.

КАПУЛЕЦІ

Заззяе і Рамэо разам з ёй —
Ахвяры дзве варожасці сляпой.

ГЕРЦАГ

З жалобным мірам ранне к нам ідзе,
І сонца паказаць не хоча твару.
Хадзем жа пагаворым аб бядзе —
Каго памілаваць, каму даць кару.
Сумнейшая з аповесцей на свеце —
Аповесць аб Рамэо і Джульеце.

Выходзяць.

ГАМЛЕТ, ПРЫНЦ ДАЦКІ

Пераклаў
Юрка
Гаўрук

АСОБЫ

КЛАЎДЗІЙ	*кароль Дацкі*
ГАМЛЕТ	*сын ранейшага і пляменнік цяперашняга караля*
ФАРЦІНБРАС	*прынц Нарвежскі*
ПАЛОНІЙ	*міністр двара*
ГАРАЦЫО	*друг Гамлета*
ЛАЭРТ	*сын Палонія*
ВАЛЬЦІМАНД КАРНЕЛІЙ РАЗЕНКРАНЦ ГІЛЬДЭНСТЭРН ОЗРЫК	*прыдворныя*
ПРЫДВОРНЫ СВЯШЧЭННІК	
МАРЦЭЛ БЕРНАРДА	*афіцэры*
ФРАНСІСКА	*салдат*
РЭЙНАЛЬДА	*слуга Палонія*
АКЦЁРЫ	
ДВА БЛАЗНЫ-МАГІЛЬШЧЫКІ	
КАПІТАН	
АНГЛІЙСКІЯ ПАСЛЫ	
ГЕРТРУДА	*Каралева Дацкая, маці Гамлета*
АФЕЛІЯ	*дачка Палонія*
ВЯЛЬМОЖЫ, ДАМЫ, АФІЦЭРЫ, САЛДАТЫ, МАТРОСЫ, ПАСЛАНЦЫ І СЛУГІ	
ЗДАНЬ БАЦЬКІ ГАМЛЕТА	

Месца дзеі — Эльсінор.

АКТ ПЕРШЫ

Сцэна першая

Эльсінор. Пляцоўка перад замкам.

Францісска на варце.
Уваходзіць Бернарда.

БЕРНАРДА
Хто тут?
ФРАНСІСКА
Адказвай першы; стой і адзавіся.
БЕРНАРДА
Няхай жыве кароль!
ФРАНСІСКА
Бернарда?
БЕРНАРДА
Ён.
ФРАНСІСКА
Вы трапілі ў самую пару.
БЕРНАРДА
Прабіла поўнач. Спаць ідзі, Францісска.
ФРАНСІСКА
Удзячны за дазвол. Сабачы холад,
І нездаровіцца.
БЕРНАРДА
Усё спакойна?
ФРАНСІСКА
І мыш не перабегла.
БЕРНАРДА
Ну, дабранач;
Сустрэнуцца Гарацыо і Марцэл,
Скажы ім, каб ішлі хутчэй на варту.

Уваходзяць Гарацыо і Марцэл.

ФРАНСІСКА

Ідуць. Яны, здаецца. Стой! Хто там?

ГАРАЦЫО

Сыны айчыны.

МАРЦЭЛ

Дацкія васалы.

ФРАНСІСКА

Дабранач вам усім.

МАРЦЭЛ

Бывай, служака.

Хто заступіў?

ФРАНСІСКА

Бернарда заступіў.

Дабранач.

Выходзіць.

МАРЦЭЛ

Гэй, Бернарда!

БЕРНАРДА

Што, прыйшоў

Гарацыо?

ГАРАЦЫО

Адной нагою тут.

БЕРНАРДА

Здароў, Гарацыо! Здароў, Марцэл!

ГАРАЦЫО

Ну што, ізноў з'яўляўся гэты самы?

БЕРНАРДА

Не, не было.

МАРЦЭЛ

Гарацыо гаворыць,
Што гэта выдумка. Не верыць ён,
Што два разы такі нам выпаў страх.
Вось я і запрасіў яго к нам нанач,
Каб ён пераканаўся. Калі зноў
Пакажацца жахлівы гэты прывід,
Хай паглядзіць і сам з ім пагаворыць.

ГАРАЦЫО

Ну, глупства! Не пакажацца.

БЕРНАРДА

Прысядзем

І будзем твае вушы штурмаваць,

Бо ты глухі да нашага расказа.
Дык вось, дзве ночы ўзапар...

ГАРАЦЫО

Добра, сядзем,
Паслухаем, што нам Бернарда скажа.

БЕРНАРДА

У тую ноч, калі вунь тая зорка,
Каторая ад полюса на захад,
Нябесным шляхам адышла туды,
Дзе зараз свеціцца, Марцэл і я,
Як толькі празваніла — раз!..

МАРЦЭЛ

Маўчы! Глядзі, ён зноў ідзе сюды!

Уваходзіць здань.

БЕРНАРДА

Якраз такі, як наш кароль-нябожчык.

МАРЦЭЛ

Гарацыо, ты — вучоны, гавары.

БЕРНАРДА

Якраз як наш кароль. Заўваж, Гарацыо.

ГАРАЦЫО

Падобен вельмі. Дзіўна мне і страшна.

БЕРНАРДА

Ён слоў чакае.

МАРЦЭЛ

Гавары, Гарацыо.

ГАРАЦЫО

Хто ты, што заўладаў парою гэтай
І постаццю прыгожа-ваяўнічай
Старога караля краіны дацкай?
Я небам заклінаю, гавары.

МАРЦЭЛ

Пакрыўдзіўся.

БЕРНАРДА

Глядзі, пайшоў назад.

ГАРАЦЫО

Стой, гавары, я небам заклінаю.

Здань выходзіць.

МАРЦЭЛ

Пайшоў і не адказвае нічога.

БЕРНАРДА

Ну як, Гарацыо? Збялеў, дрыжыш?

Што — выдумка ці, можа, трошкі болей?
Як думаеш?

ГАРАЦЫО

Ніколі б не паверыў,
Калі б не бачыў сам на свае вочы.

МАРЦЭЛ

Жывы кароль-нябожчык.

ГАРАЦЫО

Акурат;
Такія ж самыя на ім даспехі,
Як і ў той дзень, калі ён біў Нарвежца,
І так жа бровы хмурыць, як тады,
Калі ён вывернуў з саней Паляка.
Так, дзіўна!

МАРЦЭЛ

Вось гэтак два разы ў глухую ноч
Праходзіў ён, узброены, паўз варту.

ГАРАЦЫО

Дакладна растлумачыць не магу,
Але наогул думаю, што будзе
Вялікая ў дзяржаве перамена.

МАРЦЭЛ

Давайце сядзем. Ці не скажа хто,
Нашто такая пільнасць? Кожну ноч
Пакутуюць падданыя на варце,
І кожны дзень ліюць гарматы з медзі,
Купляюць узбраенне за мяжой,
А карабельнікаў нагналі колькі! —
Працуюць так: ні свята ім, ні будняў.
Што мае быць? Такая ўсюды спешка,—
І дзень і ноч людскім абліты потам.
Ну, хто адкажа мне?

ГАРАЦЫО

Я адкажу;
Такое чуў я: наш кароль-нябожчык,
Той самы, што нам толькі што з'яўляўся,
Быў, як вядома, выклікан на бойку
Нарвежскім задавакам Фарцінбрасам;
І наш адважны Гамлет (за адвагу
Яго шануе ўся наша краіна)
У бойцы Фарцінбраса закалоў;
А мелася умова пры пячаці,
Пацверджаная гербам і законам,
Што, калі ён памрэ, яго зямля

У спадчыну да Гамлета пяройдзе;
Таксама і сваёй зямлі часціну
Кароль наш залажыў для Фарцінбраса,
Калі б адолеў той. Паводле ўмовы
Зямлю ўзяў Гамлет. Але ж, трэба ведаць,
Малодшы Фарцінбрас, запалу поўны,
Навербаваў гуляшчых малайцоў
За голы харч, абы была прыгода
(Дзяржаве нашай добра ўсё вядома),
І пачынаць збіраецца вайну,
Каб адхапіць ад нас зямліцу тую,
З якою прагарэў ягоны бацька.
І гэта ёсць галоўная прычына
Усіх турбот і варты надзвычайнай,
Аснова ўсіх асноў: і спешкі гэтай,
І ўсёй трывогі ў нашым каралеўстве.

БЕРНАРДА

Я думаю, што так яно і будзе;
Напэўна, гэта жудасная здань
Не без прычыны ходзіць каля замка.
Кароль-нябожчык нам прарочыць войны.

ГАРАЦЫО

Начны матыль, каб затлуміць нам розум.
У добрыя шчаслівыя дні Рыма,
Незадаўга да Цэзаравай смерці,
Раскрыліся магілы, паўставалі
І сталі выць на плошчах мерцвякі,
З'явіліся хвастатыя каметы,
Закапала крывавая раса,
Счарнела сонца, і вільготны месяц,
Нептунавай дзяржавы уладар,
Зацьміўся, як перад сканчэннем свету.
Бяда ідзе. Жахлівыя прыметы,
Як пасланцы, што абганяюць лёс
І папярэджваюць аб небяспецы,
Нам яўлены і небам і зямлёй.

Здань вяртаецца.

Цішэй! Глядзіце! Вось ізноў ён тут.
Хай губіць, затрымаю. Стой, наява!
Калі ты маеш мову, маеш голас,—
Адказвай мне!
Калі учынак ёсць такі, што можа
Табе палёгку даць, а мне збавенне,—

Адказвай мне!
Калі табе вядомы лёс краіны
І ёсць магчымасць адхіліць няшчасце,—
Адказвай!
А можа, пры жыцці хаваў ты скарбы,
Няпраўдаю здабытыя, бо, кажуць,
Душа тады блукае. Гавары!

Спявае певень.

Стой! Гавары! Спыні яго, Марцэл.

МАРЦЭЛ

Хіба яго ударыць алебардай?

ГАРАЦЫО

Дай так, каб стаў.

БЕРНАРДА

Ён тут!

ГАРАЦЫО

Ён тут.

З д а н ь выходзіць.

МАРЦЭЛ

Пайшоў;
Абразілі. Ён гэтакі паважны,
А мы напалі, нарабілі гвалту.
Ці біць паветра, ці яго — ўсё роўна;
Удары нашыя — дарэмны здзек.

БЕРНАРДА

Ён гаварыў бы, але крыкнуў певень.

ГАРАЦЫО

І ён затросся, нібы той злачынец
Пры страшным поклічы. Я чуў, што певень,
Трубач світання, будзіць бога дня
Сваёю звонкай, галасістай песняй;
І ўсякая блукаючая здань,
Што у вадзе, ў агні, ў зямлі, ў паветры,
Пры гэтым напамінку уцякае,
І гэта праўда: вось вам яўны доказ.

МАРЦЭЛ

Як певень заспяваў, ён знік адразу.
Гавораць людзі, што ў калядны вечар,
Пад самае Хрыстова нараджэнне,
Пявун світання проста не сціхае;
Тады і здань сядзіць, ані кранецца,
І ноч здаровая, і добрыя планеты,

Не ловіць фея, ведзьма не чаруе,—
Такі святы, такі выдатны час.

ГАРАЦЫО

Я гэта чуў, даю часткова веры.
А вось і золак у плашчы пурпурным
Выходзіць на расістыя узвышшы.
Пакінем варту, і, мяркую так,
Патрэбна, каб прынц Гамлет знаў аб гэтым,
Што бачылі мы ўночы; прысягаю,
Што гэты дух нямы з ім загаворыць.
Ці згодны вы ўсё расказаць яму,
Як раяць нам любоў і абавязак?

МАРЦЭЛ

Так, так, прашу. Ідзіце ўсе за мною,
Я ведаю, дзе ён бывае ўранні.

Выходзяць.

Сцэна другая

Парадны пакой у замку.

Трубы. Уваходзяць кароль, каралева, Гамлет, Палоній, Лаэрт, Вальціманд, Карнелій, вяльможы і світа.

КАРОЛЬ

Хаця нябожчык Гамлет, любы брат наш,
Пакінуў нас нядаўна і нам след
Яшчэ трымаць у сэрцы нашым смутак,
Аплакваць прах яго ўсім каралеўствам,
Аднак наш розум перамог прыроду;
У мудрым горы спалучылі мы
І памяць брата, і свае патрэбы:
Мы нашую сястру і каралеву,
Наследніцу дзяржавы ваяўнічай,
У радасці, разбаўленай маркотай,
І смех і слёзы сумясціўшы разам,
Хаўтуры і вяселле аб'яднаўшы,
Каб пораўну было таго й таго,
Ўзялі за жонку. Не хацелі ў гэтым

Пярэчыць вашай мудрасці, якая
Дапамагала нам у справе нашай.
За ўсё падзяка наша. А цяпер:
Як вам вядома, Фарцінбрас-малодшы,
Не уважаючы на нашу годнасць
Альбо мяркуючы, што калі нас
Пакінуў любы брат наш, дык ужо
Ў дзяржаве нашай і няма парадку,
Кіруемы карысным летуценнем,
Адважыўся лістамі нас трывожыць
З хадайніцтвам звароту ўсіх зямель,
Законна страчаным ягоным бацькам
І нам прыдбаных нашым любым братам.
Вось гэта пра яго. Цяпер пра нас
І пра нараду нашу. Справа ў тым,
Што намі ўжо учынена пасланне
Нарвежцу, Фарцінбрасаваму дзядзьку:
Ён ледзь жывы, наўрад ці ён дачуўся
Аб замыслах пляменніка; мы пішам,
Каб ён суняў яго далейшы наступ
І абіранне дзядзькавых васалаў
Падаткамі, вярбоўкай войск ды іншым;
І даручаем мы табе, Карнелій,
І Вальціманду перадаць прывет наш
Старому каралю Нарвежцу; мы
Абмежавалі вашую уладу
Дакладна пунктамі ў пасланні нашым.
Дык едзьце ў добры час. Да пабачэння.
Спяшайцеся явіць сваю услужнасць.

КАРНЕЛІЙ І ВАЛЬЦІМАНД

Ва ўсім гатовы праявіць услужнасць.

КАРОЛЬ

Не сумняваемся. Да пабачэння.

Вальціманд і Карнелій выходзяць.

А ты, Лаэрт, з навінамі якімі?
Ты нас прасіць хацеў, якая просьба?
Разумнае хадайніцтва Лаэрта
Паслухаем. Чаго б ты ні жадаў,
Тваё жаданне стрэне нашу ласку,—
І сэрца галаве радней не будзе,
Не будуць рукі паслухмяней вуснам,
Як дацкі трон Лаэртаваму бацьку.
Чаго жадаеш?

ЛАЭРТ

Грозны мой кароль,
Дазвольце мне у Францыю вярнуцца.
Па добрай волі я сюды прыехау
На вашу каранацыю, і я
Свой абавязак выканаў, і вось
Мае жаданні зноў назад імкнуцца
У Францыю, калі на тое ласка.

КАРОЛЬ

А бацька даў дазвол? Скажы, Палоній.

ПАЛОНІЙ

О мой кароль, ён вырваў мой дазвол
Упартым намаганнем, і, нарэшце,
Я адпусціў, хаця і неахвотна.
Калі дазволіце, няхай ён едзе.

КАРОЛЬ

Ну што ж, Лаэрт, выкарыстоўвай час:
Твая пара — лаві, лаві уцехі.
А ты, сваяк мой Гамлет, любы сыне?

ГАМЛЕТ

(убок)

Сваяк, але не сын.

КАРОЛЬ О любы сыне,
Ты ўсё яшчэ, як хмара ў небе нашым.

ГАМЛЕТ

Няпраўда, сонца свеціць — люба, сіне.

КАРАЛЕВА

Мой мілы Гамлет, скінь свой чорны колер,
Са шчырасцю зірні на караля.
І не пытай, павекі апусціўшы,
Куды сышоў, куды падзеўся бацька.
Ты ведаеш, такая наша доля:
Жывое ўсё, нарэшце, памірае,
Цераз прыроду ў вечнасць адлятае.

ГАМЛЕТ

Так, рэч звычайная.

КАРАЛЕВА А калі так,
То што табе здаецца незвычайным?

ГАМЛЕТ

Здаецца? Не, так ёсць. Не прызнаю
Я гэтага «здаецца». Маці, маці!
Ні чорны плашч, ні мой убор жалобны,
Ні уздыханне цяжкае з грудзей,

Ні рэкі слёз, ні сумнае аблічча,
Ніякі знак, ніякі доказ гора
Мяне не выявяць. Здаецца той,
Хто ўмее прытварацца, хто няшчыры.
У сэрцы праўда, праўда не відна,
А іншае ўсё — выгляд і мана.

КАРОЛЬ

Пахвальна, Гамлет, і прыемна чуць,
Што ты свайго шкадуеш гэтак бацьку.
Але павінен ведаць, што твой бацька
Таксама страціў бацьку, той — таксама.
Ну, а жывы, як гэта і належыць,
Як вымагае абавязак роду,
Галосіць нейкі час на пахаванні.
Але зацяжны смутак ёсць упартасць,
Ёсць непабожны і нялюдскі смутак,
Знявага небу, розуму буянства,
І сведчыць ён аб маласільным сэрцы,
Незагартованым і непрактычным.
Мы ведаем, што так было і будзе,—
Такі парадак рэчаў. Дык навошта
Упартым быць, усё прымаць да сэрца?
О, нельга так! — злачынства перад небам,
Перад нябожчыкам, перад прыродай
І перад розумам, які гаворыць,
Даказвае, што смерць — гэта звычайнасць,
І ад Адама да апошніх дзён
Так ёсць і будзе так. Мы прапануем
Спыніць дарэмны смутак і прызнаць
Нас родным бацькам. Хай жа бачаць людзі,
Што ты да трона нашага найблізшы.
І я не менш выдатнаю любоўю,
Чым самы дарагі на свеце бацька,
Цябе узрадую. А твой намер
Паехаць зноў вучыцца ў Вітэнберг
Жаданню нашаму праціўны цалкам.
Мы просім, мы настойваем пяшчотна:
Застанься з намі у выгодах нашых,
Наш улюбёнец, наш сваяк і сын.

КАРАЛЕВА

Будзь ласкаў, Гамлет, заставайся тут,
Не едзь у Вітэнберг, паслухай маці.

ГАМЛЕТ

Вас, маці, я паслухаю ахвотна.

КАРОЛЬ

Прыемна чуць такі адказ сардэчны.
Дык будзь у Данii, як дома; будзь,
Як мы. Хадзем, Гертруда. Сын наш Гамлет
Уцешыў наша сэрца шчырай згодай,
І ў гонар гэтага патрэбна выпіць.
Як будзем піць, то каб з гармат стралялі,
Каб наша каралеўскае здароўе
Дайшло да неба і грымела. Пойдзем.

Трубы.
Выходзяць усе, апроч Гамлета.

ГАМЛЕТ

О, растаўчы б крутое цела гэта,
Разбіць ушчэнт, рассыпаць, як расу!
Чаму нам забаронена спрадвечным
Дарога самагубства? Божа, божа!
Якім пустым, і нудным, і нікчэмным
Здаецца мне парадак свету! Дрэнь!
Брыдота! Гэта — дзікі сад, які
Расце у корань, плодзіць пустазелле,
І толькі. Каб да гэтага дайсці!
Два месяцы, як ён памёр! — не,— меней,
Не будзе двух! Такі кароль выдатны,—
Гіперыон, а гэта хто? — сатыр.
А як любіў ён маці! — нават ветру
Не дазваляў ён твар яе абвеяць!
Ці варта ўспамінаць? Зямля і неба!
Яна ж яго больш за жыццё кахала,
Жыла яго каханнем. А праз месяц? —
Падумаць страшна, толькі месяц! Слабасць
Тваё імя, жанчына! Не паспела
Стаптаць і чаравікаў, у якіх
Ішла на могілкі, як Ніабея,
Заліўшыся слязьмі, а ўжо яна,—
О неба! — нават неразумны звер
Даўжэй бы смуткаваў,— а ўжо яна
Выходзіць замуж, за каго? — за дзядзьку,
За бацькавага брата, што падобен
На бацьку так, як я на Геркулеса.
Няпоўны месяц! Не паспела ёй
Раз'есці вочы соль фальшывых слёз,
Як замужам. Што за паскудны спрыт
Хутчэй валіцца на нячысты ложак!

Не будзе з гэтага дабра, не будзе.
Прыціхні, сэрца; анямей, язык.

Уваходзяць Гарацыо, Бернарда і Марцэл.

ГАРАЦЫО
Вітанне, прынц!
ГАМЛЕТ
Я вельмі рад вас бачыць.
Гарацыо! Каб я так жыў, Гарацыо!
ГАРАЦЫО
Але, мой прынц, і бедны ваш слуга.
ГАМЛЕТ
Ты — бедны, але ты — мой лепшы друг.
Чаго ты тут, чаму не ў Вітэнбергу? —
Марцэл?
МАРЦЭЛ
Мой добры прынц...
ГАМЛЕТ
Я вельмі рад вас бачыць.
(Да Бернарда.)
Добры вечар! —
Дык, сапраўды, чаму не ў Вітэнбергу?
ГАРАЦЫО
Бо я гультай і валацуга, прынц.
ГАМЛЕТ
Ну, гэтага і вораг не сказаў бы,
Ты мне абразіў вушы. Не люблю
Паклёпаў і хлусні! — ты не гультай.
Але чаго ты тут у Эльсіноры?
Хіба мо піць прыехаў падвучыцца?
ГАРАЦЫО
Мой прынц, прыехаў я на пахаванне.
ГАМЛЕТ
Будзь ласкаў, не жартуй, студэнт-таварыш,
Ты, як відаць, прыехаў на вяселле.
ГАРАЦЫО
Але, мой прынц,— так нечакана выйшла.
ГАМЛЕТ
Інтэрас, друг Гарацыо, інтэрас!
Бо тое, што з памінак засталося,
Даесці трэба было,— вось і шлюб.
Няхай бы лепш мой вораг, самы люты,
Убачыў рай, чым я той дзень, Гарацыо!
Мой бацька, бацька мой, ён тут, ён тут.

ГАРАЦЫО
Дзе, прынц?
ГАМЛЕТ
Са мною, у душы, Гарацыо.
ГАРАЦЫО
Калісьці бачыў; добры быў кароль.
ГАМЛЕТ
Ён чалавек быў, чалавек ва ўсім,—
Такі мне не сустрэнецца ніколі.
ГАРАЦЫО
Мой прынц, сягоння ўночы ён прыходзіў.
ГАМЛЕТ
Прыходзіў? Хто?
ГАРАЦЫО
Мой прынц, кароль, ваш бацька.
ГАМЛЕТ
Кароль, мой бацька?
ГАРАЦЫО
Прашу вас, не дзівіцеся. Уважна
Праслухайце, што я вам раскажу.
Бяру за сведак гэтых афіцэраў,
Мы бачылі...
ГАМЛЕТ
Хутчэй, хутчэй як можаш.
ГАРАЦЫО
Ужо дзве ночы гэтым афіцэрам,
Марцэлу і Бернарда, ў час іх варты,
Папоўначы, у вусцішы магільнай
З'яўляўся прывід. Нехта, як ваш бацька,
Узброены ад галавы да ног,
З'яўляецца раптоўна перад імі,
Праходзіць урачыста і павольна,
Праходзіць тры разы перад вачамі,
Звыш меры здзіўленымі, і так блізка,
Што ледзь іх не кранув сваім жазлом;
Яны ж, пахаладзелыя ад страху,
Трасуцца, нібы студзень, і маўчаць;
Пра гэта дзіва пад сакрэтам строгім
Яны сказалі мне. На трэцю ноч
Я сам стаяў на варце разам з імі:
І вось у тую ж самую пару,
Дакладна так, як мне пераказалі,
Выходзіць здань. Мне памятны ваш бацька:

Як дзве рукі адна адной да пары,
Так і яны.

ГАМЛЕТ

А дзе гэта было?

МАРЦЭЛ

Прынц, на пляцоўцы, там, дзе мы вартуем.

ГАМЛЕТ

Вы з ім не гаварылі?

ГАРАЦЫО

Гаварыў,
Але ж ён мне не адказаў нічога;
Быў нешта раз ускінуў галаву,
Нібы хацеў, а тут як певень крыкне,—
Прапала ўсё, пабег як апантаны
І знік з вачэй.

ГАМЛЕТ

Дзіўна, вельмі дзіўна.

ГАРАЦЫО

Паверце, прынц, не манім і не хлусім;
І мы лічылі нашым абавязкам
Паведаміць вам аб усім.

ГАМЛЕТ

Так, так; але ўсё гэта непакоіць.
Вы будзеце на варце ўночы?

УСЕ

Будзем, прынц.

ГАМЛЕТ

Узброен, кажаце?

УСЕ

Узброен, прынц.

ГАМЛЕТ

Ад галавы да ног?

УСЕ

Ну, як абліты.

ГАМЛЕТ

А твар вы бачылі?

ГАРАЦЫО

Вядома, прынц, —
Шалом быў без забрала.

ГАМЛЕТ

Ён быў хмурны?

ГАРАЦЫО

Хутчэй здаваўся сумным, чым сярдзітым.

ГАМЛЕТ

Быў бледны ці чырвоны?

ГАРАЦЫО

Вельмі бледны.

ГАМЛЕТ

І пазіраў на вас?

ГАРАЦЫО

Надзвычай пільна.

ГАМЛЕТ

Шкада, што не было мяне пры гэтым.

ГАРАЦЫО

О, вы б зжахнуліся.

ГАМЛЕТ

Магчыма,
Магчыма, доўга быў?

ГАРАЦЫО

А так: лічыць,
То, не спяшаючыся, будзе сотня.

МАРЦЭЛ І БЕРНАРДА

Даўжэй, даўжэй.

ГАРАЦЫО

Як я быў, то якраз.

ГАМЛЕТ

А барада сівая?

ГАРАЦЫО

Такая самая, як пры жыцці:
Як собаль, чорная і з серабром.

ГАМЛЕТ

Я буду вартаваць у гэту ноч;
Ён, можа, прыйдзе.

ГАРАЦЫО

Так, напэўна прыйдзе.

ГАМЛЕТ

Калі ён будзе ў бацькавым абліччы,
Я з ім загавару, хаця б і пекла,
Разявіўшыся, пагражала мне.
Я вас прашу, калі дагэтуль вы
Нікому не казалі пра здарэнне,
Дык і далей — маўчанне перш за ўсё;
І што б ні адбылося ў гэту ноч,—
Шукайце сэнсу, прэч ад языка.
Я вам аддзякую за ўсё. Бывайце.
Там на пляцоўцы я сустрэну вас
Каля дванаццатай.

УСЕ

Прыміце доўг.

ГАМЛЕТ

Прыму любоў, а вы маю. Бывайце!

Гарацыо, Марцэл і Бернарда выходзяць.

Дух бацькі ў зброі! — гэта не к дабру.
Тут нешта ёсць. Не дачакацца ночы!
Цярпі, душа; злачынства гляне ў вочы,
Хоць бы на ім ляжала ўся зямля.
(Выходзіць.)

Сцэна трэцяя

Пакой у доме Палонія.

Уваходзяць Лаэрт і Афелія.

ЛАЭРТ

Ну, рэчы ўжо мае на караблі;
Бывай, Афелія, бывай, сястра!
Калі ў мой бок павее вецер,— ты
Не спі, дай вестачку.

АФЕЛІЯ

Ты мне не верыш?

ЛАЭРТ

А Гамлет і яго прыхільнасць — гэта
Капрыз гуляшчы, жыўчыкі ў крыві,
Фіялка, што цвіце вясною ранняй,
Салодкая, нясталая, слабая;
Прыемны пах, забава на хвіліну —
І толькі.

АФЕЛІЯ

Толькі, і не болей?

ЛАЭРТ

Не.
Прырода ў нас расце не толькі ў цела,
Не толькі ў сілу, але ў гэтым храме
Ўзрастае веліч розуму і духу.
Магчыма, што цябе ён і кахае,
Магчыма, што яшчэ ні бруд, ні хітрасць
Не плямяць чыстаты яго жаданняў;

Але, сястра, узваж яго вялікасць
І бойся, бо ў жаданнях ён нявольны.
Ён звязаны паходжаннем сваім:
Не можа ён, як просты чалавек,
Быць сам сабой, ад выбару яго
Залежыць дабрабыт усёй дзяржавы,—
Таму ён мусіць узгадняць свой выбар
З патрэбамі і меркаваннем іншых,
Паколькі ён дзяржавы галава.
Калі ён кажа, што цябе кахае,—
Разумнай будзь, не вер яму занадта,
Пакуль не дасць ён доказаў на справе
І не заручыцца грамадскай думкай;
Ўся Данія павінна сцвердзіць гэта.
Дык вось, узваж, наколькі абняславіш
Свой гонар ты, калі наставіш вуха,
Заслухаешся песень, страціш сэрца,
Калі ты чыстае сваё дзявоцтва
Распусным намаганням аддасі.
Дык сцеражыся, любая сястра,
Афелія, сястрыца, сцеражыся!
Далей ад небяспечнага кахання,
Каб не забіў цябе яго пярун.
Дзяўчына скромная красу сваю
І месяцу паказваць не павінна;
Ад нагавору не ўцячэ ніхто.
Чарвяк любуе часта квет маёвы
Яшчэ ў бутоне, з асяродка точыць;
На маладыя росы пошасць падка.
Трымайся! Страх — ратунак для жанчыны;
Бушуе маладосць і без прычыны.

АФЕЛІЯ

Тваю навуку я прыстаўлю, братка,
Вартаўніком да сэрца. Толькі ты
Не будзь і сам, як той двудушны пастыр,
Што раіць нам ісці цярністым шляхам,
А сам, як фанабэрысты свавольнік,
Бяжыць хутчэй на сцежку асалоды,
Забыўшыся на тое, што казаў.
Мой братка родненькі!..

ЛАЭРТ

Не клапаціся.
Ну, я забавіўся. Прыйшоў наш бацька.

Уваходзіць Палоній.

Благаславён благаславёны двойчы,—
Благаславіце, тата, яшчэ раз!

ПАЛОНІЙ

Ты тут, Лаэрт? Хутчэй на карабель!
На плечы ветразей уссеўся вецер,
Цябе чакаюць. Дык благаслаўляю.
Кладзе руку на галаву Лаэрту.
І памятай, табе мой запавет:
Захоўвай думку, стрымлівай язык
І не рабі таго, чаго не трэба;
Ласкавы будзь, але не панібрацтвуй:
З кім хочаш падружыцца — правярай,
А як праверыш — прыбяры да рук;
І не заводзь хаўрусу з першым стрэчным;
Не задзірайся, а калі задраўся,
То спуску не давай, каб вораг знаў;
Прыслухвайся, што кажуць,— сам маўчы;
З людзьмі згаджайся, але думку май;
Спраўляй адзенне добрае, такое,
Каб і багата і не лезла ў вочы,
Бо па адзенні судзяць чалавека,—
Французскія вяльможы і паны
Занадта пераборлівыя ў гэтым.
Сам не бяры, другому не давай:
Хто пазычае, той сяброў губляе,
А хто бярэ, той дрэнны гаспадар.
Галоўнае ж: будзь верным сам сабе,—
Тады, як дзень ідзе за ноччу следам,
Ты і другім ніколі не сфальшывіш.
Ну, дык плыві з маім благаславеннем
І памятай наказ.

ЛАЭРТ

Бывайце, тата!

ПАЛОНІЙ

Пара, пара. Цябе чакаюць слугі.

ЛАЭРТ

Бывай, Афелія, не забывай
Таго, што я сказаў.

АФЕЛІЯ.

Замкнута ў сэрцы,
А ключ ты ў мора павязеш з сабою.

ЛАЭРТ

Бывай!

Выходзіць.

ПАЛОНІЙ
Афелія, што ён сказаў табе?
АФЕЛІЯ
Ён, з вашай ласкі, гаварыў аб прынцу.
ПАЛОНІЙ
Аб Гамлеце? Якраз дарэчы гэта;
Бо маю весткі, што апошнім часам
У вас былі таемныя спатканні.
І ты яму давала вольны доступ.
А калі так (а мне ўсё даказалі
Ў парадку асцярогі), то павінен
Табе заўважыць,— ты не разумееш
Дакладна, хто ты, і чыя дачка ты,
І чый ты маеш гонар. Што у вас?
Прызнайся зараз жа.
АФЕЛІЯ
Ён, мілы татка,
Дарыў мне знакі шчырасці сардэчнай.
ПАЛОНІЙ
Ах, ах, ах, шчырасць! — Ты зусім дурная,
Не маеш практыкі ў такіх выпадках.
Як ты назвала? Знакі? І ты верыш?
АФЕЛІЯ
Не ведаю, што думаць, мілы татка.
ПАЛОНІЙ
Ну, то я навучу. Стань тут і думай,
Што ты дзіця малое. Знакі — цацкі.
Знак — не чырвонец, вось што я адзначу.
Не прадавайся танна, бо тады
(Хоць я і злоўжываю гэтым словам)
Адзначыш ты мяне за дурня.
АФЕЛІЯ
Ён спосаб выказаў зусім прыстойны.
ПАЛОНІЙ
Ну, спосаб гэта так,— хай будзе так.
АФЕЛІЯ
Ён прысягаў, што ён мяне кахае,
Ён браў за сведку неба.
ПАЛОНІЙ
Сіло для смачных птушак. Знаю сам.
Калі бунтуе кроў, тады язык
На абяцанкі шчодры. Гэты пал,
Які дае больш бляску, чым цяпла,
Як хутка выбухне, так хутка згасне,—

Дык не лічы яго агнём, дачушка.
З сягонняшняга дня — ашчаднай будзь,
Не раскідайся так сваім дзявоцтвам.
Кампанію сваю цані вышэй,
Чым танныя спатканні з ім па просьбе.
Прынц Гамлет, перш за ўсё, ён — малады,
Прывязан за даўжэйшую вяроўку,
А ты — дзяўчына: не табе гуляць.
І ты не вер яму, не вер прысягам:
Прысягі — зман, нафарбаваны зверху,—
Грахоўных спраў няўрымслівы пасрэднік,
Які гучыць, як чыстая малітва,
Каб лепей абдурыць. Ну вось, нарэшце,
Я гавару,— з сягонняшняга дня
Раз назаўсёды,— прыпыніць гулянкі,
Размоў не весці з Гамлетам. Ты чуеш?
Я патрабую! Ну, ідзі сабе.

АФЕЛІЯ

Пакорна слухаюся, мілы татка.

(Выходзіць.)

Сцэна чацвёртая

Пляцоўка.

Уваходзяць Гамлет, Гарацыо і Марцэл.

ГАМЛЕТ

Паветра золкае. Ну і мароз!

ГАРАЦЫО

Кусаецца, аж рукі дубянеюць.

ГАМЛЕТ

Каторая гадзіна?

ГАРАЦЫО

Скора поўнач.

МАРЦЭЛ

Прабіла ўжо.

ГАРАЦЫО

Ужо? А я не чуў.
Час блізіцца, калі прыходзіць здань.

Трубныя гукі і стрэлы з гармат за сцэнай.

Што гэта значыць, прынц?

ГАМЛЕТ

Кароль банкет спраўляе на ўсю ноч,
Танцуе і віншуе сам сябе;
Калі рэйнвейну келіх апарожніць,
У трубы трубяць і ў літаўры б'юць,
Каб ведалі, што ён умее выпіць.

ГАРАЦЫО

Такі парадак?

ГАМЛЕТ

Так, усё ў парадку.
Але я думаю,— хоць я тутэйшы
І мог бы прызвычаіцца,— аднак
Яго лепш адмяніць, чым захаваць.
За хмель і гульбішчы на ўсход і захад
Мы страцілі павагу між народаў;
За п'яніц лічаць нас і дадаюць
Да нашых прозвішч свінскія мянушкі,—
І, сапраўды, ад нашых лепшых спраў
Ніякага не застанецца следу.
Здараецца так часта з чалавекам,
Калі ў ім ёсць прыродная загана
(Не па яго віне, бо, як вядома,
Істота не шукае, дзе радзіцца),
Ну, тэмперамент перайшоў у крайнасць
І загарадкі розуму ламае
Альбо прынаравіўся да такога,
Што рэзка падымаецца над нормай,—
Такога чалавека, я ж кажу,
Хаця б ён меў адну ўсяго загану,
Натура ўжо такая ці удача,
Нягледзячы на ўсе яго заслугі,
На ўсе яго дадатныя бакі,—
Асудзяць, перасудзяць, абняславяць
За гэты недахоп. І лыжка дзёгцю
У бочцы мёду робіць мёд нясмачным.
О, ганьба, ганьба!

Уваходзіць здань.

ГАРАЦЫО

Прынц, глядзіце,— ён!

ГАМЛЕТ

Ратуйце нас, о серафімы неба!
Хто б ты ні быў: ці светлы дух, ці чорт,
Ці з райскім спевам, ці з пякельным енкам,

З намерам літасці ці утрапення,—
Выходзіш ты у вобразе даступным,
І я скажу табе. Я клічу: Гамлет,
Кароль, Датчанін, бацька, дай адповедзь!
Адказвай мне, ў няведанні не муч,
Чаму твае пахованыя косці
Магільны саван разадралі раптам?
Чаму той помнік, пад якім ляжаў ты,
Раскрыў свой цяжкі мармуровы зеў
І выкінуў цябе наверх яшчэ раз?
Як разумець, што ты, мярцвяк, ізноў
Пад месяцам блукаеш у жалезе
І страшыш ноч, а нам, прыроды блазнам,
Жахліва ўзрушваеш істоту думкай,
Якая па-за межамі душы?
Скажы, чаму? Навошта? Што рабіць нам?

ГАРАЦЫО

Ён знак дае, каб вы ішлі за ім,
Нібы жадае нешта растлумачыць
Вам аднаму.

МАРЦЭЛ

Глядзіце, як ласкава
Ківае вам і вабіць за сабой.
Не йдзіце з ім.

ГАРАЦЫО

Не, не, ні ў якім разе.

ГАМЛЕТ

Ён не гаворыць. Я пайду за ім.

ГАРАЦЫО

Не трэба, прынц.

ГАМЛЕТ

Чаму? Чаго баяцца?
Я не цаню свайго жыцця ні ў грош,
Душы ж маёй нічога ён не зробіць,
Бо смерці ёй няма, як і яму.
Ён заклікае — я іду, іду.

ГАРАЦЫО

А калі ён укіне вас у мора
Альбо ўзвядзе на стромкую скалу,
Што грозна па-над хвалямі навісла,
І там, прыняўшы новы страшны выгляд,
Паўстане раптам і кране ваш розум,
Угоніць у вар'яцтва,— што тады?
Там сам сабою родзіцца адчай,

Даволі толькі паглядзець у мора
З высокай кручы, як шуміць яно,
Раве і пырскае.

ГАМЛЕТ

Ён кліча зноў,—
Ідзі, я за табою.

МАРЦЭЛ

О прынц, мы не дазволім.

ГАМЛЕТ

Рукі прэч!

ГАРАЦЫО

Што робіце?

ГАМЛЕТ

Мой лёс мяне паклікаў,
І цела поўніцца маё адвагай,
І сілы прыбываюць, як у льва.

Здань вабіць.

Ён кліча зноў. Прэч рукі! — Бо, клянуся
(вырываючыся),
Той стане ценем сам, хто мне пашкодзіць.
Кажу вам, прэч! — Ідзі, я за табою.

Здань і Гамлет выходзяць.

ГАРАЦЫО

Ён ашуканы ўласным уяўленнем.

МАРЦЭЛ

Хадзем за ім; нам нельга заставацца.

ГАРАЦЫО

За ім услед.— Чым скончыцца ўсё гэта?

МАРЦЭЛ

Гніль завялася ў дацкім каралеўстве.

ГАРАЦЫО

Кіруе неба.

МАРЦЭЛ

Лепш давайце пойдзем.

Выходзяць.

Сцэна пятая

Другі бок пляцоўкі.

Уваходзяць здань і Гамлет.

ГАМЛЕТ
Куды вядзеш? Далей я не пайду.
ЗДАНЬ
Зважай!
ГАМЛЕТ
Я слухаю.
ЗДАНЬ
О, хутка, хутка
Надыдзе час, калі ў агонь пякельны
Я акунуся.
ГАМЛЕТ
О няшчасны дух!
ЗДАНЬ
Не спачувай, а выслухай уважна,
Што я табе адкрыю.
ГАМЛЕТ
Гавары.
ЗДАНЬ
І ты адпомсціш, калі ты пачуеш.
ГАМЛЕТ
Што?
ЗДАНЬ
Я твайго бацькі дух,
Асуджаны уночы на блуканне,
А днём датуль у полымі палаць,
Пакуль зямныя ўсе мае злачынствы
Не выгараць, не выйдуць з мяне вон.
Каб мне не забаронена было
Апавяшчаць аб тайнах таго свету,
Я б расказаў табе такія страхі,
Што разадралася б душа твая,
Замерзла б маладая кроў твая
І вочы, павылазіўшы з вачніц,
Упалі б і разбіліся, як знічкі;
І кожны волас стаў бы паасобку,
Як іглы на ўсшалелым дзікабразе,—
Але явіць адвечнае мне нельга

Вушам з крыві і мяса. Слухай, слухай,
О, слухай, калі бацьку ты любіў!

ГАМЛЕТ

О божа!

ЗДАНЬ

І ты адпомсціш за яго забойства.

ГАМЛЕТ

Забойства?

ЗДАНЬ

Нялюдскае і подлае забойства,
Такое подлае, якіх няма.

ГАМЛЕТ

Хутчэй кажы пра ўсё, каб я на крылах,
Як думка шпаркіх, як любоў імклівых,
Ўзляцеў да помсты.

ЗДАНЬ

Бачу, ты гатовы;
Ты б вялы быў, як тое пустазелле,
Што дагнівае каля рэчкі Леты,
Калі б не страсянуўся ў бурным гневе.
Дык слухай, Гамлет: ходзіць пагалоска,
Што соннага мяне аднойчы ў садзе
Змяя ўкусіла,— перадчасны скон мой
Ад Даніі укрыты ашуканствам.
Дык ведай, верны сын мой: люты змей,
Каторы укусіў мяне насмерць,
Цяпер надзеў маю карону.

ГАМЛЕТ

Дзядзька!
Мая душа, ты прадчувала ўсё.

ЗДАНЬ

Так, гэты хцівы звер і чужаложнік
Вядзьмарства досціпам, умельствам здрады
(О подлы досціп, подлае умельства
Так спакушаць!) дабіўся лёгкай згоды
Ад жонкі ад маёй — ад каралевы,
Такое недачэпнае на выгляд.
О Гамлет, Гамлет, як яна упала!
Калі ішлі мы з ёю пад вянец,
Я слова даў, і я трымаўся слова,
Я так кахаў яе,— яна ж, яна
Распусніку ліхому аддалася,
Што нават і нагі маёй не варты.
Ты чэснае жанчыны не звядзеш,

Хоць за святога перааправіся;
Ну, а блудніцы,— дай анёла ў пару,
Дай шчасце, то ўсё роўна не дацерпіць,—
Захоча падлы.
Але цішэй! Я чую подых рання.
Я коратка скажу. Калі я спаў
У садзіку звычайна па абедзе,
Твой дзядзька дасачыў маю бяспечнасць
З праклятым сокам клёкату у шклянцы
І ўліў у вушы мне ліхое зелле,
Якое мае тую уласцівасць,
Што уядаецца адразу ў цела,
Бяжыць па жылах, як жывое срэбра,
І там згартае і тварожыць гвалтам,
Як воцат малако, людскую кроў;
І ў той жа момант абрасло карою,
Пакрылася агіднымі струпамі
Маё ўсё цела.
Так быў я, сонны, братняю рукой —
Жыцця, кароны, жонкі — усяго
Пазбаўлены ў красе зямных грахоў,
Без адпушчэння, без прычасця, раптам;
І я, не разлічыўшыся ні з кім,
На справаздачу страшную з'явіўся:
О дзікі жах! О жудасць, жудасць, жудасць!
Калі натуру маеш, не сцярпі,
Не дапусці, каб каралеўскі ложак
Ператварыўся у свіны бярлог.
Але глядзі, калі ты будзеш помсціць,—
Рук не гнюсі, не замышляй нічога
На маці родную. Няхай яе
Карае неба! Хай ёй сэрца колюць,
Хай джаляць сэрца ёй калючкі здрады!
А ты шчаслівы будзь; жыві, бывай.
Святляк паказвае, што блізка ранне,
І кволы свой агеньчык загасіў.
Бывай, бывай! — і помні пра мяне.
(Выходзіць.)

ГАМЛЕТ

О моц нябесная! Зямля! Яшчэ што?
Хіба дадаць і пекла? — Цьфу! Стой, сэрца!
Не трэба слабасці, патрэбна дужасць.
Трымайся, сэрца! Помніць пра цябе?
Так, бедны бацька. Гэты бедны чэрап —

Яшчэ мой чэрап. Помніць пра цябе?
Хутчэй з табліцы памяці сатру
Усе свае нікчэмныя нататкі,
Усё, што з кніг, усё, што маладосць
І назіранне запісалі там,—
І твой загад няхай жыве адзін
У фаліянтах галавы маёй,
Ачышчанай ад смецця!.. Прысягаю!
О пагубіцелька!..
О подлы, подлы, пад усмешкай подлы
З падлюг падлюга!.. Дзе мае таблічкі?
Я запішу, што можна усміхацца
І, усміхаючыся, быць падлюгай;
Ва ўсякім разе ў Даніі — бясспрэчна.
(Піша.)
Так, дзядзька, так. Маім дэвізам будзе:
«Бывай, бывай! — і помні пра мяне».
Я прысягнуў.

ГАРАЦЫО

(за сцэнай)

Прынц, прынц!

МАРЦЭЛ

(за сцэнай)

Прынц Гамлет!

ГАРАЦЫО

(за сцэнай)

Хай вас бог бароніць!

ГАМЛЕТ

Хай будзе так.

ГАРАЦЫО

(за сцэнай)

Хіло, хо-хо, мой прынц!

ГАМЛЕТ

Хіло, хо-хо! Сюды, сюды, мой сокал!

Уваходзяць Гарацыо і Марцэл.

МАРЦЭЛ

Ну як, мой прынц?

ГАРАЦЫО

Што новенькага, прынц?

ГАМЛЕТ

О, надзвычайна!

ГАРАЦЫО

Прынц, скажыце!

ГАМЛЕТ

Нельга.

Вы перакажаце.

ГАРАЦЫО

Не я, мой прынц, клянуся.

МАРЦЭЛ

І не я.

ГАМЛЕТ

Вось бачыце, ну хто падумаць мог бы.
А вы маўчаць умееце?

ГАРАЦЫО І МАРЦЭЛ

Клянёмся!

ГАМЛЕТ

Няма у Данії такога шэльмы,
Які не быў бы абармотам.

ГАРАЦЫО

Каб гэта нам сказаць, шаноўны прынц,
З магілы не вылазіў бы нябожчык.

ГАМЛЕТ

Я з вамі згодзен; а таму давайце,
Без лішніх слоў, паціснем моцна рукі
І пойдзем хто куды: вы да сваіх
Заняткаў і патрэб, бо ў чалавека
Заўсёды ёсць заняткі і патрэбы
Якія-небудзь,— ну, а я, няшчасны,
Відаць, пайду маліцца.

ГАРАЦЫО

Што вы, прынц!
Адкуль такія кручаныя словы?

ГАМЛЕТ

Шкада, што я пакрыўдзіў вас; напэўна,
Я не хацеў.

ГАРАЦЫО

Ніякай крыўды, прынц.

ГАМЛЕТ

Бяру за сведку Патрыка святога,
Ёсць крыўда, і вялікая, Гарацыо.
А? — вам пра здань цікава? — я скажу:
Здань добрая. А што было між намі,—
Было — і скончылася. А цяпер,
Сябры мае, студэнты і салдаты,
Мая к вам просьба.

ГАРАЦЫО

А якая, прынц? —
Мы з радасцю.

ГАМЛЕТ

Нікому і ніколі
Не гаварыць пра тое, што было.

ГАРАЦЫО І МАРЦЭЛ

Не будзем, прынц.

ГАМЛЕТ

А вы прысягу дайце.

ГАРАЦЫО

Клянуся, прынц.

МАРЦЭЛ

І я клянуся, прынц.

ГАМЛЕТ

О не, на меч, на меч!

МАРЦЭЛ

Мы ж прысягалі.

ГАМЛЕТ

Як трэба, на маім мячы, як трэба.

ЗДАНЬ

(знізу)

Прысягу.

ГАМЛЕТ

О, о, і ён! І ты, і ты не дрэмлеш?
Вы чулі голас з-пад зямлі, вы чулі?
Хутчэй, прысягу.

ГАРАЦЫО

Прапануйце словы.

ГАМЛЕТ

Маўчаць пра ўсё, што бачылі вы тут,
Прысягу дайце на маім мячы.

ЗДАНЬ

(знізу)

Прысягу.

ГАМЛЕТ

Hic et ubique![1] Пераменім месца,
Пастаньце тут, сябры,
Кладзіце рукі зноў усе на меч:
Прысяга на мячы,—
Маўчаць пра тое, што вы чулі тут.

---

[1] Hic et ubique! — І тут і ўсюды! *(лац.)*

ЗДАНЬ

(знізу)

Прысяга на мячы.

ГАМЛЕТ

Пацвердзіў, крот стары. Як спрытна рые!
Удалы далакоп. Сябры, пяройдзем.

ГАРАЦЫО

О дзень і ноч! — вось дзіва, ну і дзіва!

ГАМЛЕТ

Дык не дзівіся, а сустрэнь з вітаннем:
Ёсць болей з'яў на свеце, друг Гарацыо,
Чым сніцца філасофіі тваёй.
Хутчэй прысягу дайце,—
Тут, як і там, няхай вам бог паможа! —
Што, як бы дзіўна ні трымаўся я,
Бо я, магчыма, палічу патрэбным
На нейкі час прыкінуцца вар'ятам,—
Ніколі вы, убачыўшы мяне,
Не будзеце ні галавой ківаць,
Ні рукі складваць гэтак альбо гэтак,
Ні вымаўляць глыбакадумных слоў,
Накшталт: «Мы гэта ведаем», альбо:
«Маглі б, але не хочам», альбо так:
«Каб мы хацелі расказаць»... Хутчэй,
Прысягу дайце,—
Нідзе, ніколі, ні адным намёкам
Не выдаваць, што вам вядома нешта.
І хай у гэтым вам паможа бог!

ЗДАНЬ

(знізу)

Прысягу.

ГАМЛЕТ

Мір, мір, устурбаваны дух! Сябры,
З любоўю даручаю вам сябе.
І ўсё, што можа бедны Гамлет вам
Зрабіць, каб выявіць сваю прыхільнасць,—
Ён зробіць з ласкі божай. Пойдем разам.
І, я прашу, трымайце рот замкнёным.
Век вывіхнуўся. О праклятый лёс,
Навошта ты мяне сюды прынёс
Лячыць хваробы часу! Пойдзем разам.

Выходзяць.

АКТ ДРУГІ

Сцэна першая

Пакой у доме Палонія.

Уваходзяць Палоній і Рэйнальда.

ПАЛОНІЙ

Аддай яму, Рэйнальда, ліст і грошы.

РЭЙНАЛЬДА

Аддам, святлейшы.

ПАЛОНІЙ

І было б разумна,
Каб ты, Рэйнальда, да сустрэчы з ім
Наконт яго паводзін распытаўся.

РЭЙНАЛЬДА

Так і зраблю, святлейшы.

ПАЛОНІЙ

Ну, то добра;
Ну, вельмі добра. Дык глядзі ж, перш-наперш
Даведайся, якія там датчане
У Парыжы, хто, ды як жывуць, ды дзе,
З кім знаюцца, ці шмат у іх выдаткаў;
І, высветліўшы гэтак не адразу,
Што ім мой сын вядомы, падыдзі
Бліжэй, нібыта і табе вядомы
Ён збольшага. Напрыклад: мне вядомы
Ягоны бацька, прыяцель адзін,
Часткова ён...
Ці зразумеў, Рэйнальда?

РЭЙНАЛЬДА

А як жа, добра зразумеў.

ПАЛОНІЙ

Часткова ён, але, кажы, не надта;
Ну, а калі то ён, дык ён буян,
Прыдатны да таго і да таго,—
Ну, і пляці сабе, плявузгай, толькі
Каб гонару не зачапіў, ні-ні,
Ну, выбрык там ці дур які, звычайны
У веку маладым.

РЭЙНАЛЬДА

Напрыклад, карты.

ПАЛОНІЙ

Вось, вось... Ці выпіўка, ці паядынак,
Ці лаянка, ці сварка, ці распуста...
Так, так, распусту можна.

РЭЙНАЛЬДА

Але ж такія словы бэсцяць гонар.

ПАЛОНІЙ

А ты не бэсці; гавары, каб мякка;
Не перабольшвай; гавары: распусны,
А ўсё ж нейк церпіць. Так, ну вось, я мыслю,—
Аб неўстрыманні нельга. Лёгка трэба
Грашкі падсоўваць, так гэта — агульна,
Каб кожны бачыў, што таму прычынай
Залішняя свабода, ці амбітнасць,
Ці фанабэрыя, альбо дзікунства
Крыві неўтаймаванай.

РЭЙНАЛЬДА

Але як жа...

ПАЛОНІЙ

Навошта гэта робіцца?

РЭЙНАЛЬДА

Ага,
Хацеў бы ведаць.

ПАЛОНІЙ

Ну, то вось нашто:
Я мыслю, гэта — мудры падыход.
Калі ты сына трошачкі запляміш,
Яго учынкі капельку абгнюсіш,
Заўваж,
Той, на каго ты маеш намярэнне,
Абы ён памянёныя правінкі
За памянёным хлопцам прымячаў,
Маўчаць не будзе, схопіцца адразу
І скажа так нарэшце: — Дружа мой,
Шаноўны мой, мой міласцівы пане,—
Залежна ад таго, хто ён такі
І як у іх прынята у краіне,—
Ты слухаеш?

РЭЙНАЛЬДА

Сачу, сачу, святлейшы.

ПАЛОНІЙ

І тады зробіць ён вось што, зробіць ён...
Што гэта я хацеў сказаць? Як перад святой імшою,
я нешта хацеў сказаць? На чым гэта я спыніўся?

РЭЙНАЛЬДА

І скончыць так нарэшце.

ПАЛОНІЙ

І скончыць так нарэшце; ну дык вось,
І скончыць так: — Мне гэты пан вядомы,
З ім бачыўся я ўчора ці заўчора,
Тады й тады, і быў ён з тым і тым,
І, добра кажаце, была ў іх п'янка,
Ён рэзаўся у карты, ён сварыўся,
Гуляючы у мячык. Альбо так:
Заходзіў ён аднойчы ў дом распусты,
У дом распусты,— ну і так далей.
Здаецца, ясна.
Закінеш чарвяка, а зловіш карпа.
Вось так мы, людзі розуму і спрыту,
Пры дапамозе розных тонкіх штучак,
Хоць крук даём, а пад'язджаем проста.
Дык вось, зыходзячы з маіх парад
І гэтых мыслей, ты павінен сына...
Павінен сына... Чуеш ты ці не?

РЭЙНАЛЬДА

Так, так, я чую.

ПАЛОНІЙ

Ну, то можаш ехаць.

РЭЙНАЛЬДА

О мой святлейшы...

ПАЛОНІЙ

Сам паглядзі, як ён сябе трымае.

РЭЙНАЛЬДА

Зраблю, зраблю усё.

ПАЛОНІЙ

Дай хлопцу волю.

РЭЙНАЛЬДА

Так, так, вядома.

ПАЛОНІЙ

Ну, то едзь шчаслівы.

Рэйнальда выходзіць.
Уваходзіць Афелія.

А ты чаго, Афелія? Ў чым справа?

АФЕЛІЯ

Ой, татачка, мяне так напужалі.

ПАЛОНІЙ

А божачка, і чым жа гэта?

АФЕЛІЯ

Я, татачка, хусцінку вышывала,
Ў пакоіку сядзела; раптам — стук;
І вось прынц Гамлет,— без капелюша,
Камзэлька нарасхліст, панчохі ў брудзе,
Аб'ехалі да пят, сам белы-белы,
Трасецца, ўздрыгвае, блукаюць вочы,
Разгублены і жаласны такі,
Нібы ён вырваўся з пякельных нетраў
І зараз жа пачне расказваць жахі,—
Убег і стаў.

ПАЛОНІЙ

Шалёны ад кахання?

АФЕЛІЯ

Не ведаю, баюся, мо і так.

ПАЛОНІЙ

І што сказаў ён?

АФЕЛІЯ

Ён схапіў маю
Руку вось гэтак; выпрастаўся гэтак;
Адной мяне трымае, а другую
Падняў угору, прылажыў да броваў
І доўга-доўга разглядаў мой твар,
Нібы хацеў яго намаляваць;
Нарэшце мне руку паціснуў лёгка,
І тройчы галавою паківаў,
І уздыхнуў так цяжка, так глыбока.
Што, мне здалося, разарвуцца грудзі,
Закалаціўся ўвесь, як перад сконам,
І адпусціў мяне, і адышоў,
Нейк дзіўна павярнуўшы галаву,
І не шукаў вачамі ён, дзе дзверы,
А ўсё глядзеў, усё глядзеў ў мой бок.

ПАЛОНІЙ

То пойдзем жа цяпер да караля.
Бо гэта ёсць экстаз, экстаз кахання,
Праява страсці, што бярэ ў палон,
Штурхае волю на адчайны крок,
Між іншым, як і ўсякая ахвота,
Што нас гняце і паліць. Я шкадую...
Што, можа, ты з ім груба абышлася?

АФЕЛІЯ

Не, татачка, а так, як вы казалі:
Лістоў не брала і к сабе яго
Не дапускала.

ПАЛОНІЙ

Ён і звар'яцеў.
Ах, ах, шкада! — недаацэнка выйшла.
І трэба ж так? Я думаў, ён жартуе,
Цябе пакрыўдзіць хоча. Падазронасць
Праклятая! То праўда, што старым
Разлік часамі заядае розум;
Але ж і моладзь надта стала спрытнай.
Хадзем да караля, даложым гэта.
Бо калі змоўчым,— не мінуць бяды,
А далажыць — яшчэ туды-сюды.
Хадзем, галубка.

Выходзяць.

Сцэна трэцяя

Пакой у замку.

Уваходзяць кароль, каралева, Разенкранц, Гільдэнстэрн і світа.

КАРОЛЬ

Прывет вам, Разенкранц і Гільдэнстэрн;
Апроч жадання шчырага вас бачыць,
Патрэбу маем выкарыстаць вас,
Таму і выклікалі адмыслова.
Вы, мабыць, чулі, што апошнім часам
Перамяніўся Гамлет. Гэта так;
Бо і знутры і звонку ён другі,
Не той, што быў раней. У чым прычына
Такое страты самаразумення
І што яшчэ, апроч нуды па бацьку,
Я не магу ўявіць. Я вас прашу,
Паколькі гадаваліся вы разам
І вам яго капрызы лепш вядомы,
Пацешыць нас, застацца пры двары
На пэўны час, каб праз сяброўства ваша
Ўцягнуць яго да слодычаў жыццёвых.
І будзе добра, калі вам удасца
Як-небудзь выпадкова дасачыць
Таемны вузел гэтае напасці,

Нам невядомы, выкрыўшы які,
Мы паспрабуем падшукаць лякарства.

КАРАЛЕВА

Панове, шмат ён гаварыў пра вас;
Няма, напэўна, двух людзей на свеце
Яму мілейшых. Калі ваша ласка
Нам будзе аказаць так многа-многа
Добраахвотнасці і далікацтва,
Каб сярод нас пабавіць тымчасова
Для падтрымання нашае надзеі,
Аддзячана вам будзе за турботы
Па-каралеўску.

РАЗЕНКРАНЦ

Вашая вялікасць
І вашая вялікасць маюць права
Распараджацца намі, не прасіўшы.

ГІЛЬДЭНСТЭРН

О найяснейшыя, мы цалкам вашы;
Пакорна слухаемся і абодва
Да вашых ног кладзём свае паслугі.
Кіруйце намі.

КАРОЛЬ

Ах, дзякуй, Разенкранц і Гільдэнстэрн!

КАРАЛЕВА

Ах, дзякуй, Гільдэнстэрн і Разенкранц!
Прашу вас зараз жа пайсці праведаць
Майго сыночка беднага. Гэй, людзі,
Вядзіце іх да Гамлета хутчэй!

ГІЛЬДЭНСТЭРН

То дай жа божа, каб прысутнасць наша
І спробы нашы памаглі яму.

КАРАЛЕВА

Так, так, амін.

Выходзяць Разенкранц, Гільдэнстэрн і некалькі прыдворных. Уваходзіць Палоній.

ПАЛОНІЙ

Паслы з Нарвегіі, мой уладар,
Вярнуліся шчасліва.

КАРОЛЬ

Ты быў заўжды тварцом прыемных вестак.

ПАЛОНІЙ

Вы думаеце, вашая вялікасць?

Паверце мне, ласкавы уладар,
Душу ўкладаю я ў свой абавязак
Як перад богам, так і перад вамі;
І мне здаецца (альбо страціў я
Свой тонкі нюх у справах палітычных),
Што я адкрыў галоўную прычыну
Вар'яцтва Гамлета.

КАРОЛЬ

О, раскажы;
Мне так цікава мець аб гэтым весткі.

ПАЛОНІЙ

Прашу спачатку выслухаць паслоў;
Мае навіны будуць на закуску.

КАРОЛЬ

Зрабі ім ласку, прывядзі іх сам.

Палоній выходзіць.

О любая Гертруда, ён мне кажа,
Што ведае, чаму змяніўся Гамлет.

КАРАЛЕВА

Ах, думаецца мне, адно і тое ж:
Смерць бацькава і наш раптоўны шлюб.

Вяртаюцца Палоній з Вальціміндам і Карнеліем.

КАРОЛЬ

Мы гэта высветлім.— Вітаю вас,
Сябры мае. Скажы нам, Вальціманд,
Што пасылае нам наш брат Нарвежац?

ВАЛЬЦІМАНД

Зваротныя прывет і пажаданні;
Ён з першых слоў аддаў загад спыніць
Наборы, што пачаў яго пляменнік;
Ён меркаваў, што той ідзе на Польшчу,
Але, прыгледзеўшыся, зразумеў,
Што гэта супраць вас; і засмучоны,
Што так яго хваробы, век і немач
Даюцца злоўжыванням, загадаў
Паклікаць Фарцінбраса; той з'явіўся
І атрымаў суровую вымову;
І тут жа, перад дзядзькам, даў зарок
Ніколі больш на вашую вялікасць
Замахаў не рабіць, пасля чаго
Стары кароль, узрадаваны вельмі,

Пяць тысяч крон у год яму прызначыў
І даручыў набранае ім войска
Вайной на Польшчу весці. А яшчэ,
Як тут паказана, ён просіць вас *(падае паперку)*
Дазволіць ім свабодны пераход
Праз землі вашыя для гэтай мэты
Пры захаванні ўсіх правоў, на льготах,
Як тут паказана.

КАРОЛЬ

Мы вельмі рады.
У вольны час мы гэта пачытаем;
Абдумаем, адпішам. А пакуль што
Падзяка вам за добрую работу,
Адпачывайце. Ўночы пагуляем.
Мы вельмі рады.

Вальціманд і Карнелій выходзяць.

ПАЛОНІЙ

Справа удалася.
Кароль вялікі наш і каралева
Тлумачаць, што такое ёсць вялікасць,
І што ёсць абавязак, і што дзень
Бывае днём, а ноч бывае ноччу,
Што час ёсць час,— усё гэта, нарэшце,
Ёсць марнаваць і дзень, і ноч, і час.
Паколькі сцісласць — розуму душа,
А мнагаслоўе — члены і прыдаткі,
Я буду сціслым. Ваш шаноўны сын —
Вар'ят; кажу, вар'ят, бо ў чым вар'яцтва,
Калі не ў тым, что людзі вар'яцеюць?
Але далей.

КАРОЛЬ

Больш справы, менш штукарства.

ПАЛОНІЙ

О каралева, галавой клянуся,—
Ніякага штукарства,— ён вар'ят,
І гэта праўда, праўда і бяда,
Бяда, што гэта праўда. Вось дурны
Зварот які! Ну, добра. Без штукарства.
Палічым за вар'ята. Застаецца
Знайсці прычыну гэтага афекту
Ці, лепш, дэфекту, бо такі афект
Дэфектны спрычыніўся ад прычыны.
Вось гэта рэшта, а нарэшце вось:

Увага!
Мая дачка (раз маю, то мая),
Прывыкшы паслухмянай быць, увага,
Дала мне вось. Мяркуйце і рашайце.
(Чытае.)
«Нябеснай, ідалу маёй душы, вельмі ўпрыгожанай Афеліі...» Гэта няўдалы сказ, брыдкі сказ; «вельмі ўпрыгожанай» — брыдкі сказ; але вы слухайце. Вось *(чытае)*: «На яе выдатна белыя грудзі, гэтыя...» Ну і так далей.

КАРАЛЕВА

І гэта ёй ад Гамлета?

ПАЛОНІЙ

Хвіліначку; я далажу парадкам.
(Чытае.)
«Не вер, што сонца свеціць,
Не вер, што зоркі ззяюць,
Што праўда ёсць на свеце,
А вер, што я кахаю.

О дарагая Афелія, мне цесна ў рамках верша, я не ўмею падлічваць свае ўздыханні, але, што я цябе люблю як найлепей, о мая найлепшая, павер мне. Бывай.
Твой назаўсёды, любая дзяўчына,
пакуль не паламаецца гэты механізм.
Гамлет».
Вось гэта мне з пакорнасцю пахвальнай
Дала мая дачка і, звыш таго,
Пераказала, як ішло каханне,
Калі, дзе, што ён ёй прапанаваў.

КАРОЛЬ

І што ж яна на гэтае каханне?

ПАЛОНІЙ

А што вы думаеце пра мяне?

КАРОЛЬ

Ты — шчыры і адданы чалавек.

ПАЛОНІЙ

Хацеў бы вельмі гэта даказаць.
Што б вы падумалі, каб я дагледзеў
Падобны ўздым і ўзлёт яго кахання
(А я дагледзеў, гавару адкрыта,
Яшчэ дачка маўчала), што б тады
Вы і мая вялікасць каралева
Маглі падумаць, калі б гэта я
Стаяў, як слуп, кішэняй для пісулек,

І глух і нем, і пазіраў праз пальцы,
Як людзі любяцца? Ну што б тады вы
Маглі падумаць? Не, я быў рашучы,
І я сказаў сваёй дзяўчыне так:
Прынц Гамлет — прынц, і ён табе не пара,
Няма чаго. І тут жа даў параду:
Замок на дзверы, пабачэнні прэч,
Ні пасланцоў яго, ні падарункаў.
Зрабіўшы ўсё, як я сказаў, яна
Плады маёй навукі спажывала,
А ён, адхілены (каб гэта карацей),
Спярша заныў, пасля пакінуў есці,
А потым страціў сон, пасля аслаб,
Пасля задумаўся і гэтак, паступова,
Скаціўся да вар'яцтва, дзе і трызніць
На гора нам.

КАРОЛЬ

Вы думаеце, гэта?

КАРАЛЕВА

Зусім магчыма.

ПАЛОНІЙ

Ці было калі,
Хацеў бы ведаць я, каб я сцвярджаў:
Кароль мой,— так, а выйшла не па-мойму?

КАРОЛЬ

Не помню.

ПАЛОНІЙ

Галаву здыміце з плеч...
(Паказвае на галаву і на плечы.)
Вось гэта з гэтага, калі не гэта;
Калі мне акалічнасці спрыяюць,
Я вышукаю праўду, каб яна там
У цэнтр зямлі залезла.

КАРОЛЬ

Як жа нам
Наладзіць дослед?

ПАЛОНІЙ

Бачыце, ён часам
Гуляе доўга ў галерэі...

КАРАЛЕВА

Так.

ПАЛОНІЙ

У гэты час я выпушчу дачку,
А, вы і я, мы станем за дыван;

Яны сустрэнуцца. Сачыце пільна.
Калі не тое, не з кахання гэта,
Калі ён не па ёй зайшоўся з думак,
То я вам болей не дзяржаўны радца,
А конюх фальварковы.

КАРОЛЬ

Зробім спробу.

Уваходзіць Гамлет, чытаючы.

КАРАЛЕВА

Вось ён ідзе, маркотны, і чытае.

ПАЛОНІЙ

Прэч, калі ласка; выйдзіце абое.
Я прыступлю, дазвольце прыступіць.

Кароль, каралева
і прыдворныя выходзяць.

Як ваша здаровейка, прынц Гамлет?

ГАМЛЕТ

Нічога, дзякуй.

ПАЛОНІЙ

Ці пазналі вы мяне, мой прынц?

ГАМЛЕТ

Вельмі добра. Ты гандлюеш рыбай.

ПАЛОНІЙ

Не, прынц.

ГАМЛЕТ

Тады я хацеў бы, каб ты быў сумленным чалавекам.

ПАЛОНІЙ

Сумленным, прынц?

ГАМЛЕТ

Так, пане мой. Быць сумленным на гэтым свеце, гэта азначае быць адным з дзесяці тысяч.

ПАЛОНІЙ

Праўду кажаце, мой прынц.

ГАМЛЕТ

Бо калі сонца плодзіць чарвей у дохлым сабаку, з'яўляючыся богам, цалуе падлу... Ці ёсць у цябе дачка?

ПАЛОНІЙ

Ёсць, прынц.

ГАМЛЕТ

Не пускай яе на сонца. Развіццё — дар божы, але ў тваёй дачкі можа развіцца плод. Дружа, сцеражыся.

ПАЛОНІЙ

Што вы хочаце гэтым сказаць? *(Убок.)* Усё чэпіцца да

маёй дачкі. Але ён не пазнаў мяне спачатку, сказаў, што я гандлюю рыбай. Далёка заехаў, далёка заехаў. І то праўда, калі я быў маладым, то бегаў за жанчынамі бадай так, як і ён. Паспрабую яшчэ раз. Што гэта вы чытаеце, прынц?

ГАМЛЕТ

Словы, словы, словы.

ПАЛОНІЙ

А што яны кажуць?

ГАМЛЕТ

Хто гэта?

ПАЛОНІЙ

Мой прынц, я пытаюся, што тут напісана ў кнізе?

ГАМЛЕТ

Хлусня, пане мой. Нягодны сатырык сцвярджае, што ў старых людзей сівыя бароды, што твары іх паморшчаны, а з вачэй цячэ жывіца і вішнёвы клей, што розуму ў іх няма, ногі слабыя. І хоць я гэтаму веру, пане мой, усёй сілаю веры, аднак лічу непрыстойным так пісаць, бо і вы, пане мой, былі б у маіх гадах, каб маглі, як рак, паўзці назад.

ПАЛОНІЙ

(убок)

У гэтым вар'яцтве ёсць свая паслядоўнасць. Хадзем, мой прынц, тут вецер, вам трэба схавацца.

ГАМЛЕТ

У магілу?

ПАЛОНІЙ

А і праўда — самы надзейны схоў. *(Убок.)* Якія трапныя адказы. Шанцуе вар'ятам. Разумны і здаровы чалавек часамі цэлы век шукае, а вар'ят знаходзіць адразу. Я яго пакіну і зараз жа зраблю так, каб ён сустрэўся з маёй дачкою. Ласкавы прынц, прашу вас вызваліць мяне.

ГАМЛЕТ

Я магу вас вызваліць ад усяго, пане мой, ад усяго; толькі не ад майго жыцця, не ад майго жыцця, не ад майго жыцця.

ПАЛОНІЙ

Бывайце, прынц.

ГАМЛЕТ

Агідныя старыя дурні.

Уваходзяць Р а з е н к р а н ц і Г і л ь д э н с т э р н.

ПАЛОНІЙ

Вы Гамлета шукаеце? Ён тут.

РАЗЕНКРАНЦ

(Палонію)

Няхай вам бог паможа.

Палоній выходзіць.

ГІЛЬДЭНСТЭРН

О найяснейшы прынц!

РАЗЕНКРАНЦ

Найдаражэйшы прынц!

ГАМЛЕТ

Найлепшыя сябры мае! Ну, як ты жывеш, Гільдэнстэрн? А, Разенкранц? Ну, як вы маецеся, хлопцы?

РАЗЕНКРАНЦ

Як звычайныя сыны зямлі.

ГІЛЬДЭНСТЭРН

І то добра, што не надта добра. На шапцы Фартуны мы не шышкі.

ГАМЛЕТ

Але ж і не падмёткі яе чаравікаў.

РАЗЕНКРАНЦ

Ні тое, ні другое, прынц.

ГАМЛЕТ

Тады ваша месца каля пояса, на ўлонні ўсіх яе дароў.

ГІЛЬДЭНСТЭРН

Не, прынц, мы займаем у яе зусім невялікі куточак.

ГАМЛЕТ

Невялікі куточак! Ну, вядома. Фартуна — жанчына падатлівая. Што новага?

РАЗЕНКРАНЦ

Нічога, прынц. Адно, што праўда з'явілася на свеце.

ГАМЛЕТ

Ну, то скора страшны суд. Але вашы весткі несапраўдныя. Запытаю канкрэтней. Дарагія сябры мае, чым вы прагнявілі так Фартуну, што яна вас паслала сюды?

ГІЛЬДЭНСТЭРН

У турму, прынц?

ГАМЛЕТ

Данія — турма.

РАЗЕНКРАНЦ

Тады ўвесь свет — турма.

ГАМЛЕТ

І яшчэ якая! Усюды скляпенні, сутарэнні, лёхі, вартаўнікі. Данія — адна з горшых.

РАЗЕНКРАНЦ

Мы так не думаем, прынц.

ГАМЛЕТ

Тады яна для вас не турма. Дабро і зло не існуюць самі па сабе, іх утварае думка. Для мяне Данія — турма.

РАЗЕНКРАНЦ

Вы жадаеце славы, вашаму духу цесна, таму і турма.

ГАМЛЕТ

О неба, я мог бы ўлезці ў арэх і лічыць сябе царом бязмежных прастораў, каб мне не сніліся нядобрыя сны.

ГІЛЬДЭНСТЭРН

І гэтыя сны — жаданне славы. Бо што такое субстанцыя амбіцыі, калі не цень сну.

ГАМЛЕТ

Сон — таксама цень.

РАЗЕНКРАНЦ

Так, правільна; але ўласцівасці амбіцыі лягчэйшыя і танчэйшыя. Цень дае цень.

ГАМЛЕТ

Тады аснова свету — беднасць. А каралі і славутыя героі — цені беднасці. Можа, пойдзем да двара? Мне надакучылі разважанні.

РАЗЕНКРАНЦ І ГІЛЬДЭНСТЭРН

Да вашых паслуг, прынц.

ГАМЛЕТ

Не трэба служыць. Я не кладу вас у кучу разам са слугамі. Шчыра вам кажу, мне вельмі дрэнна служаць. Пытаюся як стары таварыш, чаго вы тут у Эльсіноры?

РАЗЕНКРАНЦ

Хацелі пабачыцца з вамі, прынц, і болей нічога.

ГАМЛЕТ

Я — бедны, бедны. Няма ў мяне чым аддзячыць. Але ўсё ж дзякуй вам, дарагія сябры, хоць падзяка мая і недарагая.

Па вас не пасылалі? Вы самі надумаліся прыехаць? Па сваёй добрай волі? Гаварыце, гаварыце, гаварыце, будзьце шчырымі, гаварыце. Адказвайце.

РАЗЕНКРАНЦ

Што вам адказаць, прынц?

ГАМЛЕТ

Абы-што, але на пытанне. Па вас пасылалі. Вашы вочы прызнаюцца за вас, ваша скромнасць яшчэ не навучылася мяняць іх колер. Я ведаю, добры кароль і каралева па вас пасылалі.

РАЗЕНКРАНЦ

Для якое мэты, прынц?

ГАМЛЕТ

Вось гэта вы і павінны мне растлумачыць. Заклінаю вас правамі нашае дружбы, гармоніяй нашага юнацтва, абавязкамі нашай неразлучнай любові, усім тым дарагім, чым заклінаў бы вас, каб разварушыць вашу душу, прамоўца больш таленавіты, чым я, гаварыце адкрыта і проста. Пасылалі па вас ці не?

РАЗЕНКРАНЦ

(ціха Гільдэнстэрну)

Што ты скажаш?

ГАМЛЕТ

(убок)

Цяпер мне ясна.— Калі вы мяне любіце, гаварыце ўсё не тоячыся.

ГІЛЬДЭНСТЭРН

Так, прынц, па нас пасылалі.

ГАМЛЕТ

Я скажу вам навошта. Мая здагадка папярэдзіць ваша прызнанне, і ваша тайна перад каралём і каралевай застанецца ў цэласці. Не так даўно (не ведаю чаму) я страціў усю сваю весялосць, адышоў ад сваіх прывычных заняткаў, і, сапраўды, настрой у мяне цяжкі, што гэты прыгожы будынак — зямля здаецца мне бясплоднай скалою; гэты раскошны полаг — паветра,— глядзіце! — гэта высокае неба, неабсяжны дах, усыпаны залатымі агнямі, уяўляецца мне, як брудная і пошаснае злучэнне пары. Якая мастацкая работа — чалавек! Які ўзвышаны розум! Якія бяскрайнія здольнасці! Колькі цудоўнай экспрэсіі ў абліччы і рухах! Дзейнасцю падобен да анёла! Думкаю раўняецца з богам! Краса сусвету! Вянец жывога! А мне? Што мне гэта квінтэсенцыя праху! Мужчыны мне не падабаюцца, жанчыны таксама. Хаця, судзячы па вашай усмешцы, вы са мною не згодны.

РАЗЕНКРАНЦ

Прынц, я пра гэта не думаў.

ГАМЛЕТ

Дык чаго ж вы засмяяліся, калі я сказаў: мужчыны мне не падабаюцца?

РАЗЕНКРАНЦ

Прынц, вы сказалі, што мужчыны вам не падабаюцца, і я падумаў: якая ж тады посная сустрэча чакае

акцёраў. Мы з імі размінуліся па дарозе. Яны едуць сюды прапанаваць вам свае паслугі.

ГАМЛЕТ

Таго, хто іграе караля, прывітаю з радасцю; яго вялікасць атрымае ад мяне належную даніну. Адважны рыцар будзе арудаваць мячом і шчытом. Каханку не прыйдзецца ўздыхаць дарэмна. Комік дацягне спакойна ролю да канца. Блазен паказыча лёгкія смяшлівым. Гераіня выкажа свае пачуцці свабодна, калі не спатыкнецца аб белы верш. Што гэта за акцёры?

РАЗЕНКРАНЦ

Тыя самыя, што вам так падабаліся: гарадскія трагікі.

ГАМЛЕТ

Чаго ж яны вандруюць? Сталае памяшканне давала ім больш і славы і прыбыткаў.

РАЗЕНКРАНЦ

Я думаю, ім перашкаджаюць некаторыя новаўводзіны.

ГАМЛЕТ

Ці карыстаюцца яны той жа пашанай, што і раней, калі я быў у горадзе? Усё так жа ходзяць да іх?

РАЗЕНКРАНЦ

Не, ужо не так.

ГАМЛЕТ

Чаму ж? Заржавелі хіба?

РАЗЕНКРАНЦ

Не, яны стараліся і стараюцца. Але, на бяду, завялася там чарада дзяцей, дробных сакалят, якія гатовы перакрычаць любую ролю, і за гэта ім шалёна пляскаюць. На іх цяпер мода. І так яны бэсцяць і лаюць народны тэатр (гэта іх слова), што многія са шпагай, напалоханыя скрыпам гусіных пер'яў, баяцца хадзіць туды.

ГАМЛЕТ

Як? Дзеці? На чыім утрыманні? Якая аплата? Хіба яны будуць займацца гэтым рамяством, пакуль могуць спяваць? Ці не скажуць яны пасля, калі вырастуць у звычайных акцёраў (а гэта зусім магчыма, калі ў іх не знойдзецца нічога лепшага), што іх аўтары ім пашкодзілі, дазволіўшы ім пляваць у тую міску, з якой яны кормяцца?

РАЗЕНКРАНЦ

Шчыра кажучы, хапала работы і тым і другім. Народ не лічыць за грэх нацкоўваць іх на зваду. Адзін час п'еса зусім не давала збораў без кулачнага дыялогу паміж паэтам і акцёрам.

ГАМЛЕТ

Не можа быць!

ГІЛЬДЭНСТЭРН

О, такі быў мардабой, такі мардабой!

ГАМЛЕТ

І ўладу захапілі дзеці.

РАЗЕНКРАНЦ

Але, мой прынц; захапілі Геркулеса разам з глобусам.

ГАМЛЕТ

Нічога дзіўнага. Вось, напрыклад, мой дзядзька,— кароль Даніі, і тыя, што перакрыўлялі і дражнілі яго, калі жыў мой бацька, цяпер даюць дваццаць, сорак, пяцьдзесят, сто дукатаў за яго партрэт у мініяцюры. Чэрці, д'яблы! У гэтым ёсць нешта надзвычайнае, над чым варта было б пафіласофстваваць, калі б толькі філасофія памагла дакапацца...

Трубныя гукі за сцэнай.

ГІЛЬДЭНСТЭРН

Вось і акцёры.

ГАМЛЕТ

Дарагія госці, з радасцю вітаю вас у Эльсіноры. Вашы рукі! Спадарожнікамі гасціннасці павінны быць далікатнасць і ўважлівасць. Дазвольце прывітаць вас вашым жа спосабам; а то іначай маё абыходжанне з камедыянтамі, якое, кажу вам, павінна быць знадворна бліскучым, будзе здавацца ласкавейшым, чым гэтая наша сустрэча. З радасцю вітаю вас, але мой дзядзька-бацька і мая цётка-маці — памыляюцца.

ГІЛЬДЭНСТЭРН

У чым, дарагі мой прынц?

ГАМЛЕТ

Я — вар'ят толькі пры норд-норд-весце; калі вецер дзьме з поўдня, я адрозніваю сокала ад бусла.

Уваходзіць П а л о н і й.

ПАЛОНІЙ

Дзень добры, панове.

ГАМЛЕТ

Слухай, Гільдэнстэрн,— і ты таксама,— пастаньце кожны каля вуха; вось перад вамі вялікае дзіця, якое яшчэ не вылезла з плёнак.

РАЗЕНКРАНЦ

Як відаць, яно ўлезла ў іх паўторна, здзяцінеўшы пад старасць.

ГАМЛЕТ

Я прадказваю, яно прыйшло паведаміць аб акцёрах; заўважце.— Ваша праўда, пане мой, у панядзелак раніцай; так, так,— гэта было ў панядзелак.

ПАЛОНІЙ

А ў мяне ёсць свежыя навіны, прынц.

ГАМЛЕТ

І ў мяне ёсць свежыя навіны. Калі Росцый быў акцёрам у Рыме...

ПАЛОНІЙ

Акцёры прыехалі, прынц!

ГАМЛЕТ

Быць не можа!

ПАЛОНІЙ

Дальбог...

ГАМЛЕТ

«І кожны ехаў на асле...»

ПАЛОНІЙ

Найлепшыя акцёры ў свеце — для выканання камедый, трагедый, гісторый, пастаралей, п'ес пастаральна-камічных, гістарычна-пастаральных, трагічна-гістарычных, трагічна-камічна-гістарычна-пастаральных, сцэн непадзельных. І Сенека ім не лішне цяжкі, і Плаўт ім не лішне лёгкі. Для тэкстаў пісаных і тэкстаў няпісаных — незаменлівыя людзі.

ГАМЛЕТ

«Іефай, ізраільскі суддзя», якім вялікім скарбам ты валодаў!

ПАЛОНІЙ

А якім ён валодаў скарбам, прынц?

ГАМЛЕТ

Якім?

«Была ў яго адна дачка —

Адзіначка-каханачка».

ПАЛОНІЙ

(убок)

Усё пра маю дачку.

ГАМЛЕТ

Што, мо няпраўда, стары Іефай?

ПАЛОНІЙ

Калі вы мяне называеце Іефаем, прынц, то ў мяне ёсць дачка, якую я вельмі люблю.

ГАМЛЕТ

Там гэтага не сказана.

ПАЛОНІЙ

А што там сказана, прынц?

ГАМЛЕТ

Што?

«І паслаў яму лёс,—
А далей ты ведаеш.—
Прычакаў ён таго, што спаткала яго».

Працяг ты знойдзеш у першым радку каляднае песні. Выбачай, мая пацеха блізіцца.

Уваходзяць акцёры.

Прывітанне вам, майстры! Заходзьце, калі ласка! — Вельмі рад, што ты тут.— Прывітанне вам, сябры мае.— А, мой стары прыяцель! Што гэта ў цябе за махры на твары? Іх жа раней не было. Ці не думаеш ты сваёю барадою засланіць ад мяне Данію? — А-а! мая паненачка, мая панначка! Маці божая, якая высокая! Стала бліжэй да неба з таго часу, як мы бачыліся, на цэлы абцас. Дай божа, каб твой голас не патрэскаўся, як чырвонец, якім не карыстаюцца. Майстры, вітаю вас. Мы, як французскія сакольнічыя, паляцім на першае, што ўбачым. Зараз жа рыхтуйце прамову. Дайце ўзор вашага мастацтва. Гарачую прамову!

ПЕРШЫ АКЦЁР

Якую жадаеце, прынц?

ГАМЛЕТ

Аднойчы я чуў, як ты гаварыў маналог; яго не давалі на сцэне, а калі давалі, то не больш аднаго разу, бо п'еса, помніцца мне, не спадабалася гледачам. Для большасці гэта была ікра, недаступны далікатэс, але то была (як успрыняў я і другія, чыя думка ў пытаннях мастацтва перавышае маю) — дасканалая п'еса, удала падзеленая на сцэны, напісаная тонка і проста. Я помню, нехта сказаў: у вершах няма прыправы, каб закрасіць змест і зрабіць яго смачным, але сэнс кожнае фразы сведчыць аб шчырасці аўтара. Ён назваў яго метад здаровым і добрасумленным, прыгожым без афектацыі. Найбольш мне спадабаўся ў ёй адзін маналог: Энеева апавяданне Дыдоне, асабліва той урывак, дзе ён расказвае аб забойстве Прыяма. Калі ён жыве ў тваёй памяці, пачні з гэтага радка; чакайце, чакайце.

«Суровы Пір, як той гірканскі звер...»

Не так; пачынаецца з Піра.

«Суровы Пір, што быў у чорнай зброі,

Такой жа чорнай, як яго намеры,
Як тая ноч, калі ў кані злавесным
Ён, грозна прытаіўшыся, ляжаў,
Сваю пахмурна жудасную постаць
Цяпер размаляваў яшчэ страшней;
Чырвоны ўвесь ад ног да галавы,
Умурзаны у кроў мужоў і матак,
Дачок, сыноў, у полымі падпалаў,
Якімі асвятляўся шлях забойчы,
Раз'юшаны агнём, злабой і кроўю,
Што накарэла згусткамі, з вачамі,
Як два карбункулы, пякельны Пір
Выгледжвае старэнькага цара
Прыяма...»
Ну вось, гавары далей.

ПАЛОНІЙ

Дальбог, прынц, вы добра прачыталі, і вымаўленне добрае, і вытрымана ўсё, як трэба.

ПЕРШЫ АКЦЁР

«Раптам ён яго знаходзіць
У бойцы з грэкамі. Прыямаў меч
Не слухаецца больш рукі нядужай,
Дзе ўдарыць, там і ляжа. Нібы звер,
У бой няроўны кідаецца Пір;
Са страшным свістам меч яго узвіўся
І аглушыў бяссільнага Прыяма,
І ён упаў. Змярцвелы Іліён,
Нібы адчуўшы на сабе удар,
Агністае чало схіліў, хіснуўся
І паваліўся. Енк і страшны грукат
Чаруюць Піра. Гляньце, меч яго,
Занесены над снежнай галавой
Цара Прыяма, вісне у паветры.
Нібы тыран, намаляваны пэндзлем,
Пастылы Пір стаіць, не давяршае
Ліхое справы.
Але, як часта бачым перад бурай:
У небе цішыня, як горы хмары,
Вятры нямеюць, і зямля унізе
Ляжыць панурая, як смерць, і — трах!
Вось ляснуў, бліснуў грамавы пярун,—
Дрыжаць прасторы... Так пасля зацішша
Ізноў да помсты ірвануўся Пір.
Яшчэ ніколі кавалі-цыклопы

Не білі малатамі ў Марсаў панцыр
Так ярасна, як Пір мячом крывавым
Прыяма біў і сек.
Прэч, прэч, Фартуна-здрадніца! О богі,
Паўстаньце ўсе на подлую і кола
Разбіце ёй, зламайце спіцы, вобад,
А шворан так шпурніце з вышыні,
Каб даляцеў да д'яблаў!»

ПАЛОНІЙ

Доўга вельмі.

ГАМЛЕТ

Трэба пакараціць, як і тваю бараду.— Будзь ласкаў, гавары, не слухай. Калі няма скокаў альбо пахабшчыны, ён спіць. Гавары далей. Цяпер пра Гекубу.

ПЕРШЫ АКЦЁР

«Ці бачыў хто пакутніцу-царыцу...»

ГАМЛЕТ

Пакутніцу-царыцу?

ПАЛОНІЙ

Гэта добра; пакутніцу-царыцу — добра.

ПЕРШЫ АКЦЁР

«Як з плачам бегла босая яна,
Слязамі горкімі пажар гасіла;
Замест вянца на галавеануча,
Худыя лоні, змучаныя ў родах,
Наспех прыкрыты посцілкай. О гора!
Хто б гэта бачыў, той гадзючай слінай
У твар Фартуны плюнуў бы. О богі,
Дзе вы былі ў той час, калі яна
Угледзела, як мужавае цела
Крышыў мячом асцервянелы Пір?
Нялюдскі лямант залунаў над трупам,—
Яна рыдала. Богі, каб хоць кропля
У вас была спагады, то з вачэй
Нябесных, ясных паліліся б слёзы,
І вы б не выцерпелі...»

ПАЛОНІЙ

Глядзіце, ён змяніўся з твару, ён плача. Калі ласка, даволі.

ГАМЛЕТ

Добра, рэшту мне даскажаш пасля.— Не палічыце за клопат, пане, прыняць і пачаставаць акцёраў. Глядзіце, абыходзьцеся з імі добра. Гэта наглядчыкі і лета-

пісцы часу. Лепей табе мець пасля смерці паганую эпітафію, чым благое слова ад іх пры жыцці.

ПАЛОНІЙ

Прынц, я прыму іх як належыць.

ГАМЛЕТ

Прымі іх лепей. Каб кожнага прымалі як належыць, наўрад ці знайшоўся б такі чалавек, якому б не належала даць у морду. Прымі іх як належыць твайму гонару і тваёй годнасці. Чым меншыя ў іх заслугі, тым большага будзе варта твая дабрата. Вядзі іх.

ПАЛОНІЙ

Прашу вас.

ГАМЛЕТ

Ідзіце за ім, сябры. Заўтра мы даём спектакль.

Выходзяць Палоній і акцёры, за выключэннем першага.

Паслухай, стары прыяцель, ці можаце вы сыграць «Забойства Ганзага»?

ПЕРШЫ АКЦЁР

Можна, прынц.

ГАМЛЕТ

Вось гэта мы і дадзім заўтра ўвечары. А ці можна, у выпадку патрэбы, вывучыць маналог, так радкоў на дванаццаць альбо на шаснаццаць, які я напішу і ўстаўлю ў п'есу, можна будзе, а?

ПЕРШЫ АКЦЁР

Можна, прынц.

ГАМЛЕТ

Вельмі добра. Ідзі за гэтым чалавекам... Толькі, будзь ласкаў, не рабі з яго жартаў.

Першы акцёр выходзіць.

Дарагія сябры мае, я развітаюся з вамі да вечара. Рад вас бачыць у Эльсіноры.

РАЗЕНКРАНЦ

О найдабрэйшы прынц!

Разенкранц і Гільдэнстэрн выходзяць.

ГАМЛЕТ

Бывайце ўсе, і — я адзін цяпер.
Якая дрэнь, які нявольнік я!
І мне не соромна!.. Вось тут акцёр
У пустаце, у выдуманым горы

Аддаў душу ва ўладу уяўлення:
Ў запале творчым паблядняў увесь,
Набеглі слёзы буйныя на вочы,
Зламаўся голас, твар яўляе роспач,
І кожны рух яго уторыць марам.
А ўсё дзеля чаго? Дзеля Гекубы!
Што ён Гекубе, што яму Гекуба,
Каб так аб ёй рыдаць? Што ён зрабіў бы,
Каб меў прычыну сталую для смутку,
Як я!.. Ён бы заліў слязамі сцэну,
Грамадскі слых рассек бы страшным словам,
Давёў бы вінаватых да вар'яцтва,
Бязвінных да адчаю, слепакам
Адкрыў бы вочы, ўзварушыў бы ўсіх,
І ўсе б зжахнуліся. А я,—
Балван, нікчэмная разява, я
Стаю, ўздыхаю, як дзіця малое,
Не ведаючы сам, чаго мне трэба;
Маўчу, не заступаюся ні словам
За бацьку роднага, скарб і жыццё
Ў якога ўкрадзены агіднай здрадай,
Я — баязлівец?
Гэй, вы! Хто абзаве мяне падлюгай?
Хто дасць у морду мне? За нос пацягне?
Хто вырве бараду і ў твар мне кіне?
Хто скажа «здраднік», «хлус», абразу ўсадзіць
У горла мне да самых лёгкіх? Хто?
Эх!
Я б гэта выцерпеў, не абазваўся б;
Я — голуб, печань у мяне без жоўці,
Каб горыч крыўды адчуваць, а то
Даўно ўжо накарміў бы ўсіх варон
Раба разлезлым трупам. Блудадзей!
Паскуднік, крывапівец, гад, падлюга!
О, я адпомшчу!
Ну і асёл жа я! Які адважны!
Сын любага, загубленага бацькі,
Закліканы да помсты небам, я
Душу адводжу лаянкай, як шлюха,
Мялю ўпустую языком, як баба,
Як пакаёўка.
Цьфу, брыдка, брыдка! Цьфу! Мазгі да справы!
Гм? Чуў я, што ў тэатры ліхадзеі
Бывалі так мастацкаю ігрою

Узрушаны часамі, што нарэшце
Публічна прызнаваліся ў злачынствах.
Дык вось няхай акцёры перад дзядзькам
Пакажуць што-небудзь, што б нагадала
Яму забойства брата. Пагляджу,
Што будзе з гэтага, як ён успрыме.
Калі ён дрогне,— ясна ўсё. Той дух
Мог быць і д'яблам, д'ябал жа умее
З'яўляцца ў вобразе спакусным. Так,
Магчыма. Я аслаб, засумаваў;
Ён гэтым карыстаецца і хоча
Згубіць мяне. Патрэбен цвёрды грунт.
Паставім п'есу: пастка і пятля,—
І выявім сумленне караля.

(Выходзіць.)

АКТ ТРЭЦІ

Сцэна першая

Пакой у замку.

Уваходзяць кароль, каралева, Палоній, Афелія, Разенкранц і Гільдэнстэрн.

КАРОЛЬ
І вы ніяк не можаце дазнацца,
Што значыць гэты бунт, што затрымала
Так раптам плынь яго спакойных дзён
І ўкінула яго у вір шаленства?

РАЗЕНКРАНЦ
Ён прызнаецца, што яму нядобра;
Але, чаму нядобра, не гаворыць.

ГІЛЬДЭНСТЭРН
І нельга выведаць; як толькі мы
Яго на шлях прызнання накіруем,
Ён ухіляецца з вар'яцкім спрытам
У іншы бок.

КАРАЛЕВА
А як ён вас прыняў?
РАЗЕНКРАНЦ
Зусім прыстойна.
ГІЛЬДЭНСТЭРН
Але занадта стрымліваў сябе.
РАЗЕНКРАНЦ
Пытаўся мала: больш адказваў сам,
І вельмі востра.
КАРАЛЕВА
А вы не прабавалі намякнуць
Яму на гульні?
РАЗЕНКРАНЦ
Вашая вялікасць,
Дарогай нам сустрэліся акцёры,
Аб гэтым мы паведамілі прынцу;
І ён адразу нейк павесялеў.
Яны ўжо тут, і ён ім загадаў
Увечары паставіць п'есу.
ПАЛОНІЙ
Так.
І праз мяне ён запрашае вас
З'явіцца на спектакль.
КАРОЛЬ
Прыемна чуць;
Згаджаюся і вельмі задаволен
Падобным намярэннем.
Панове, я прашу вас, і далей
Уцягвайце яго ў свае забавы.
РАЗЕНКРАНЦ
О, мы з ахвотай, вашая вялікасць.

Разенкранц і Гільдэнстэрн выходзяць.

КАРОЛЬ
Пакінь і ты нас, любая Гертруда;
Мы толькі што па Гамлета паслалі,
Каб мог ён тут, нібыта ненарокам,
Знайсці Афелію.
Мы з бацькам, як законныя шпіёны,
Пастанем так, каб, бачачы нябачна,
Абмеркаваць спакойна іх спатканне
І вырашыць паводле слоў і рухаў,
Ці то каханне кроіць сэрца прынцу,
Ці мо што іншае.

КАРАЛЕВА

Дык я пайду.
Афелія, жадаю ад душы,
Каб Гамлета рабіла непрытомным
Адна твая прыгожасць; спадзяюся,
Што чыстата твая ўзвядзе яго
Ізноў на шлях звычайны і праславіць
Вас абаіх.

АФЕЛІЯ

Ах, як бы я хацела!

Каралева выходзіць.

ПАЛОНІЙ

Афелія, гуляй тут! Найяснейшы,
Схаваемся! *(Афеліі.)* Чытай, глядзі у кнігу:
Чытанне аздабляе нам самоту.
Нас варта папракнуць за гэты грэх,—
Усім вядома, што набожным тварам
І справамі святымі мы умеем
Падсаладзіць і чорта.

КАРОЛЬ

(убок)

Гэта праўда.
Сумленне мне, як бізуном пагладзіў.
Шчака блудніцы пад карой румянаў,
Напэўна, менш агідны выгляд мае,
Як мой учынак, скрашаны гаворкай.
Ох, цяжка мне!

ПАЛОНІЙ

Ідзе, я чую. Пойдзем, найяснейшы.

Кароль і Палоній выходзяць.
Уваходзіць Гамлет.

ГАМЛЕТ

Пытанне: быць альбо не быць? Што лепей,
Што разумней: альбо цярпець удары,
Каменні, стрэлы яраснага лёсу,
Альбо узброіцца на мора крыўд
І знішчыць іх змаганнем. Смерць і сон —
Адно і тое ж; і сказаць, што сном
Канчаюцца туга, і боль, і крыўды,
І тысячы пакут, што чалавеку
Дала прырода ў дар,— такі канец
Сустрэў бы з радасцю. Смерць — сон, заснуць,
Заснуць і марыць. Так. Але пытанне:

Якія мары поўняць сон смяротны,
Калі пакінеш гэты шумны свет? —
Вось што трымае нас, вось дзе прычына
Таго, што гора гэтак даўгавечна.
Бо хто цярпеў бы злыя здзекі часу,
Прымус тыранаў і знявагу гордых,
Самотны стогн разбітага кахання,
Марудны суд, чыноўнікаў нахабнасць,
Пляўкі на галаву заслузе скромнай,
Каб мог нас вызваліць ад усяго
Удар кінжалам? Хто б валок ярмо,
Пацеў бы, ныючы ў нудзе жыццёвай?
Але мы ўсё ж баімся памірaць;
Таемны край, адкуль няма звароту,
Пужае нас, і воля наша слабне,
І мірымся мы з нашаю нядоляй:
Хто ведае, што нас чакае там?
Задумаешся так — і страх агорне.
І павядае яркі квет адвагі
Пад бледнай хваткай непазбыўных дум,
І пачынанні буйнага размаху
Без рэчышча сплываюць у нябыт,
Няспраўджанымі застаюцца. Ціха!
Афелія?.. О німфа, памяні
Мае грахі ў тваіх малітвах.

АФЕЛІЯ

Прынц,
Хацела запытаць вас аб здароўі.

ГАМЛЕТ

Я вельмі дзякую.

АФЕЛІЯ

Прынц, у мяне ёсць памяткі ад вас,
Я ўсё збіралася іх вам вярнуць,
Дык вось, вазьміце, я прашу вас.

ГАМЛЕТ

Не.
Я вам нічога не даваў.

АФЕЛІЯ

Мой прынц, вы мне давалі і з дарамі
Паднеслі мілае суквецце слоў,
Няма ў іх арамату больш, вазьміце.
Прыстойная дзяўчына не жадае
Дары мець ад таго, хто не кахае.
Вазьміце, прынц.

ГАМЛЕТ

Ха, ха! Ты нявінная?

АФЕЛІЯ

Прынц?

ГАМЛЕТ

Ты прыгожая?

АФЕЛІЯ

Ваша высокасць, што вы маеце на ўвазе?

ГАМЛЕТ

А вось што: калі ты нявінная і прыгожая, то не задавайся сваім хараством.

АФЕЛІЯ

Прынц, хіба ж харство перашкаджае нявіннасці?

ГАМЛЕТ

О не. Пакуль сіла нявіннасці ачысціць харство, улада харства змяшае нявіннасць з гразёю. Раней гэта быў парадокс, а цяпер гэта пацвярджаецца практыкай. Я цябе кахаў калісьці.

АФЕЛІЯ

І я гэтаму верыла, прынц.

ГАМЛЕТ

А не трэба было верыць. Як ты ні прышчапляй нявіннасць на наш стары ствол, усё роўна парахня будзе сыпацца. Я цябе не кахаў.

АФЕЛІЯ

Падманулі мяне, ашукалі.

ГАМЛЕТ

Ідзі ў манастыр. Нашто табе пладзіць грэшнікаў. Я яшчэ трошкі сумленны, аднак я мог бы абвінаваціць сябе ў такіх рэчах, што лепш бы мая маці мяне не раджала. Я люблю славу, я помслівы, горды, да маіх паслуг столькі грахоў, што не хапіла б розуму, каб іх абдумаць, фантазіі, каб іх уявіць, і часу, каб іх зрабіць. Нашто такім слімакам, як я, поўзаць паміж небам і зямлёю. Мы ўсе шэльмы, усе! Не вер нікому з нас! Ідзі лепш у манастыр. Дзе твой бацька?

АФЕЛІЯ

Дома, прынц.

ГАМЛЕТ

Замкні за ім дзверы, хай ён сядзіць дома і строіць дурня толькі там, толькі там. Бывай!

АФЕЛІЯ

Ратуйце яго, сілы нябесныя!

ГАМЛЕТ

Калі ты выйдзеш замуж, вазьмі сабе ў пасаг мой праклён: будзь чыстая, як лёд, белая, як снег,— усё роўна абгавораць. Ідзі ў манастыр. Бывай. Ну, а калі ты вельмі хочаш замуж, бяры дурня, бо разумныя ведаюць добра, якіх пачвар вы з іх робіце. У манастыр ідзі, хутчэй. Бывай.

АФЕЛІЯ

Памажыце яму, сілы нябесныя!

ГАМЛЕТ

Чуў я і пра ваша маляванне, чуў; прырода дае вам адзін твар, а вы робіце сабе другі; вы скачаце, вы спяваеце, вы шчабечаце, вы дражніце божыя стварэнні і сваю разбэшчанасць прыкрываеце няведаннем. Хопіць, з мяне даволі! Гэта давяло мяне да вар'яцтва. Я кажу, у нас не будзе болей шлюбаў; тыя, хто пажаніліся, хай жывуць, за выключэннем аднаго; рэшта застанецца так, як ёсць. У манастыр ідзі.

(Гамлет выходзіць.)

АФЕЛІЯ

Які выдатны розум заняпаў!
Язык вучонага, вяльможы вока,
Меч воіна, акраса і надзея
Усёй дзяржавы, люстра далікацтва,
Узор узорным,— згінула усё.
А я адна, усіх жанчын няшчасней,
Пакаштаваўшы мёду абяцанняў,
Цяпер гляджу, як гэты волат мыслі,
Нібы зламаны звон, скрыгіча страшна.
О квет юнацтва, светач маладосці,
Чаму адцвіў так рана? Гора мне!
Якім ты быў, такім не будзеш, не.

Вяртаюцца кароль і Палоній.

КАРОЛЬ

Тут не каханне,— іншая хвароба;
Хоць тое, што казаў ён, і туманна,
Аднак ён не вар'ят. Яго туга
Наседжвае штось іншае; баюся,
Каб гэты плод, з'явіўшыся на свет,
Нам не пашкодзіў. А таму хутчэй,
У мэтах папярэджання, рашаю:
Ён безадкладна ў Англію паедзе

Збіраць нам недаданую даніну;
Магчыма, мора, незнаёмы край
І змена ўражанняў прагоняць тое,
Што ўлезла ў сэрца, ўстурбавала мозг
І парушае функцыі персоны
Майго пляменніка. Што скажаш нам?

ПАЛОНІЙ

Так будзе добра. Але ўсё ж, па-мойму,
Вытокам і пачаткам смутку прынца
З'яўляецца няўдача у каханні.—
Афелія, не трэба пераказваць,
Мы чулі ўсё.— Як наш кароль жадае,
Хай так і будзе. Тым не менш прасіў бы,
Каб пасля п'есы каралева-маці
Прыватна распытала пана прынца
Наконт сардэчных спраў. Хай будзе строгай.
Калі ж даведацца ёй не удасца,
Тады адпраўце ў Англію яго
Альбо яшчэ куды.

КАРОЛЬ

Так, так, не жарты;
Шаленства прынца патрабуе варты.

Выходзяць.

Сцэна другая

Пакой у замку.

Уваходзяць Гамлет і акцёры.

ГАМЛЕТ

Вымаўляй маналог, калі ласка, так, як я табе паказваў: лёгка і жвава, а калі ты будзеш драць горла, як гэта робяць многія нашы акцёры, тады я мог бы даручыць чытаць мае вершы гарадскому клікуну. Не пілуй паветра рукамі, так; рабі ўсё далікатна. У патоках, у буры і, так сказаць, у завіхрэнні свайго запалу, ты павінен заўсёды трымацца меры, якая згладзіць яго рэзкасць. Я цярпець не магу, калі які-небудзь здаравенны доўгавалосы дзяцюк ірве пачуцці на кавалкі, на шматкі, і гвалціць вушы партэра, які, у большасці выпадкаў, нічога не разумее, апроч невыразных

нямых сцэн і калатні. Я б ахвотна высек такога дзецюка. Ён табе выйдзе такім ліхадзеем, якім і Тэрмагант не быў, ён табе Ірада пераірадзіць. Калі ласка, каб гэтага не было.

ПЕРШЫ АКЦЁР

Даю гарантыю вашай высокасці.

ГАМЛЕТ

Не будзь таксама і занадта вялым; хай тваім настаўнікам будзе твая крытычная думка. Дапасоўвай дзею да слова, слова да дзеі; а галоўнае, старайся не выходзіць за межы прыроднай прастаты. Бо ўсё, што гэтак перабольшана, не адпавядае сутнасці ігры, канчатковая мэта якой, раней і цяпер, была і ёсць — трымаць як бы люстра перад прыродай; паказваць дабраце яе рысы, пагардзе яе вобраз і, у адпаведнасці з часам, кожнаму стану і ўзросту — яго форму і адбітак. Калі ж перабольшыць альбо не дацягнуць, то хоць невук і пасмяецца, але знаўцу будзе сумна, а вы павінны згадзіцца, што ацэнка знаўцы пераважае думку цэлага тэатра іншых. О, ёсць акцёры, і я бачыў іх ігру і чуў, як іх хвалілі, нават вельмі хвалілі, якія, каб не сказаць груба, не мелі ні голасу, ні фігуры, ні наогул людскага аблічча; крыўляліся і завывалі так, што я думаў: ёсць жа на свеце такія падзёншчыкі прыроды, якія бяруцца ляпіць людзей і псуюць іх — так бяздарна яны паказвалі чалавека.

ПЕРШЫ АКЦЁР

Спадзяюся, што мы гэтага ў асноўным пазбавіліся.

ГАМЛЕТ

Знішчайце, каб і знаку не было. І хай тыя, што іграюць у вас блазнаў, не гавораць больш, чым для іх напісана. Бываюць сярод іх такія, што смяюцца самі, каб насмяшыць пустых гледачоў, хаця ў гэтую хвіліну ўвага павінна быць сканцэнтравана на якім-небудзь важным моманце п'есы. Гэта брыдка і паказвае нікчэмнае зазнайства таго блазна, які так робіць. Ідзіце падрыхтуйцеся.

Акцёры выходзяць.

Уваходзяць Палоній, Разенкранц і Гільдэнстэрн.

Скажыце, будзе кароль слухаць гэту п'есу?

ПАЛОНІЙ

І сам будзе, і каралева, і каб зараз жа.

ГАМЛЕТ

Загадай акцёрам, каб не бавіліся.

П а л о н і й выходзіць.

А вы што? Ідзіце падганяйце.

РАЗЕНКРАНЦ І ГІЛЬДЭНСТЭРН

Ахвотна, прынц.

Р а з е н к р а н ц і Г і л ь д э н с т э р н выходзяць.

ГАМЛЕТ

Гэй, Гарацыо!

Уваходзіць Г а р а ц ы о.

ГАРАЦЫО

Я каля вас, мой прынц.

ГАМЛЕТ

Гарацыо, ты — слаўны чалавек,
Сярод усіх — адзіны друг сапраўдны.

ГАРАЦЫО

О прынц...

ГАМЛЕТ

Не думай, што я льшчу табе.
Якая мне карысць? Ты не багаты.
Твая апора — твой здаровы дух,
Не золата. Нашто льсціць бедняку?
Няхай язык цукровы ліжа пышнасць
І кленчыць прагавіты падхалім
Там, дзе ён бачыць свой інтэрас. Чуеш?
З тае пары, як навучыўся я
Адрозніваць людзей і стаў свабодным,
Цябе абраў я другам для душы.
Ты церпіш гора, не падаўшы віду,
З аднолькавай падзякаю прымаеш
І гнеў і ласку лёсу. Лепшы дар —
Мець розум і пачуцці у адзінстве,
Не быць за пасвісцёла у Фартуны
І не іграць чужых мелодый. Дружа,
Знайдзі мне, дай такога чалавека,
Які б не быў рабом сваіх пачуццяў,
І я да сэрца прытулю яго,
І я яго укрыю ў сэрцы сэрца
З табою побач. Кінем гэта. Зараз
Для караля акцёры ставяць п'есу.
Ты ведаеш, як паміраў мой бацька,—

Яны пакажуць гэту смерць на сцэне.
Прашу цябе, калі пачнуць спектакль,
Сачы за дзядзькам як мага ўважней.
Калі яго таемная віна
Не выявіцца пры адной прамове,
То, значыць, нам з'яўляўся дух пракляты
І уяўленне чорнае маё,
Як лёх Вулкана. Прыглядайся добра.
Я ў твар яго ўвап'юся вострым вокам,
Пасля мы параўнаем нашы думкі
І зробім пэўны вывад.

ГАРАЦЫО

Добра, прынц.
Калі абкрадзе ён маю увагу
І уцячэ, адказваю за кражу.

ГАМЛЕТ

Яны ідуць. Мне трэба быць вар'ятам.
Займі жа месца.

Дацкі марш. Трубы. Уваходзяць кароль, каралева, Палоній, Афелія, Разенкранц, Гільдэнстэрн ды іншыя.

КАРОЛЬ

Як маешся, пляменнік Гамлет?

ГАМЛЕТ

Дасканала. Харчуюся, як хамелеон. Ем паветра, закварнае абяцанкамі. Як каплун у мяшку, нават лепей.

КАРОЛЬ

Я цябе не разумею, Гамлет. Твае словы не дайшлі да мяне.

ГАМЛЕТ

А з мяне яны выйшлі. *(Палонію.)* Пане, вы гаварылі, што вы калісьці ігралі ва універсітэце?

ПАЛОНІЙ

Так, так, мой прынц, і лічыўся добрым акцёрам.

ГАМЛЕТ

На якія ролі?

ПАЛОНІЙ

Я іграў Юлія Цэзара, я быў забіты на Капітоліі, мяне забіў Брут.

ГАМЛЕТ

Якая брутальнасць! І нашто ты, Брут, забіў такое вялізнае цяля! — Акцёры гатовы?

РАЗЕНКРАНЦ

Гатовы, прынц. Загадаеце пачаць?

КАРАЛЕВА

Гамлет, ідзі сюды, мой дарагі; сядзь каля мяне.

ГАМЛЕТ

Не, мамачка, тут ёсць магніт мацнейшы.

ПАЛОНІЙ

(каралю)

Ага! Вы чуеце?

ГАМЛЕТ

Панна, дазвольце мне прылегчы да вас на калені?

Кладзецца каля ног Афеліі.

АФЕЛІЯ

Не, мой прынц.

ГАМЛЕТ

Я хачу сказаць, дазвольце палажыць галаву да вас на калені.

АФЕЛІЯ

Але, мой прынц.

ГАМЛЕТ

Вы думаеце, я недалікатны?

АФЕЛІЯ

Я нічога не думаю, мой прынц.

ГАМЛЕТ

Якая далікатная думка — ляжаць між ног у дзяўчыны.

АФЕЛІЯ

Што, мой прынц?

ГАМЛЕТ

Нічога.

АФЕЛІЯ

Вам весела, мой прынц?

ГАМЛЕТ

Каму, мне?

АФЕЛІЯ

Вам, мой прынц.

ГАМЛЕТ

О, я толькі ваш падпявала. Чалавек любіць весяліцца. Паглядзіце, у якім добрым настроі мая маці, а яшчэ не прайшло і дзвюх гадзін, як памёр мой бацька.

АФЕЛІЯ

Ах, не; ужо два месяцы, мой прынц.

ГАМЛЕТ

Так даўно. У такім выпадку, хай чорт носіць чорнае, а я начаплю сабаліную мантыю. О неба, цэлых два месяцы, як памёр, і яшчэ не забыты! Тады ёсць надзея,

што памяць аб вялікіх людзях перажыве іх на паўгода. Але трэба будаваць цэрквы, каб штодзённа паміналі, а то забудуць, як таго каляднага каня; каляды прэч — коніка з плеч.

Трубныя гукі. Нямы паказ. Уваходзяць кароль і каралева, пяшчотна абдымаючыся. Яна становіцца на калені і горача завярае яго. Ён яе падымае і туліцца галавой да яе пляча. Кладзецца на лаву з кветак. Яна, бачачы, што ён заснуў, пакідае яго. Тады з'яўляецца чалавек, здымае з яго карону, цалуе яе, налівае атруты ў вушы каралю і выходзіць. Каралева вяртаецца, знаходзіць караля мёртвым і разыгрывае адчай. Труціцель і некалькі статыстаў з'яўляюцца і робяць выгляд, што лямантуюць разам з ёю. Нябожчыка выносяць. Труціцель прапануе каралеве падарункі; спачатку яна нібыта не задаволена, не згаджаецца, але, нарэшце, прымае яго любоў. Выходзяць.

АФЕЛІЯ

Як гэта разумець, мой прынц?

ГАМЛЕТ

Вельмі проста: тут хаваецца «малечо»[1], гэта значыць — злачынства.

АФЕЛІЯ

Як відаць, гэты нямы паказ перадае сюжэт п'есы?

Уваходзіць Пралог.

ГАМЛЕТ

Вось зараз ён нам растлумачыць. Акцёры не ўмеюць трымаць сакрэтаў, яны ўсё раскажуць.

АФЕЛІЯ

І тое, што мы толькі што бачылі?

ГАМЛЕТ

І тое, што мы толькі што бачылі. Вазьміце страцьце сорам, пакажыце што-небудзь такое, дык яму і сораму траціць не трэба, адразу так і ляпне.

АФЕЛІЯ

Вы нядобры, нядобры. Я хачу глядзець п'есу.

---

[1] Malhecho — злачынства *(іспан.)*.

ПРАЛОГ

Перад пачаткам дзеяння
Мы просім вас з павагаю
Глядзець спектакль з увагаю.

ГАМЛЕТ

Не то пралог, не то надпіс на пярсцёнку.

АФЕЛІЯ

Нешта вельмі кароткае, прынц.

ГАМЛЕТ

Як жаночае каханне.

Уваходзяць два акцёры: кароль і каралева.

АКЦЁР-КАРОЛЬ

Ўжо трыццаць раз як калясніца Феба
Павольным бегам залаціла неба,
І трыццаць на дванаццаць — маладзік
І поўніўся, і шчэрбіўся, і нік.
А мы з табою ўсё жывём у пары,
А шчасця нашага не засцяць хмары.

АКЦЁР-КАРАЛЕВА

Мы можам налічыць яшчэ не столькі,—
Любоў жа не паменшыцца нікольк і.
Але, о гора мне, мой мілы муж,
Апошнім часам нешта ты нядуж,
І ў сэрца мне закралася трывога
За нашую любоў. Але нічога,
Мой страх цябе не можа турбаваць:
Жаночы страх ёсць вернасці пячаць;
Мы любім — мы баімся, так бывае,
Жанчына ў гэтым крайнасць праяўляе.
Мой мілы муж, табою даражу,
Цябе кахаю, за цябе дрыжу,
Расце і шырыцца мая трывога,
Дзе страх вялікі — там кахання многа.

АКЦЁР-КАРОЛЬ

Так, любая, цябе пакіну я,
Прадказвае канец душа мая.
Ты не гаруй, жыві, красуйся краскай,
І, можа, хто-небудзь з такой жа ласкай
Мяне заменіць.

АКЦЁР-КАРАЛЕВА

Нізашто. Маўчы!
За здрадніцу мяне ты не лічы.

Не выйду я ніколі за другога —
Я не забойца мужа дарагога.

ГАМЛЕТ

(убок)

Палын і чамярыца.

АКЦЁР-КАРАЛЕВА

Жанчынаю, што замуж хоча зноў,
Карысць кіруе, толькі не любоў;
Хто вернасць мужу мёртваму губляе,
Той мёртвага яшчэ раз забівае.

АКЦЁР-КАРОЛЬ

Я згодзен — ты так думаеш цяпер,
Але мы парушаем свой намер,
З гадамі нашая рашучасць блякне,
Спачатку цвёрдая, нарэшце мякне;
Зялёны плод на яблыньцы вісіць,
А спелы плод пад яблынькай ляжыць;
Як гэта натуральна пры разліку
Самім сабе не аддаваць пазыку:
Клянёмся мы любіць сто зім, сто лет,
Ды з цягам дзён слабее наш імпэт.
Магутнасць радасці і сіла смутку
Бушуюць бурна, уціхаюць хутка;
Смяецца смутак, плача весялосць,
Прычын жа шмат — яны заўсёды ёсць.
На свеце ўсё мяняецца; не дзіўна,
Што і любоў са шчасцем неразрыўна;
Адно другому ўслед заўжды ідзе,
Але пытанне, хто каго вядзе?
Слуга бяжыць ад быўшага вяльможы,
А выб'ецца бядняк, з ім дружыць кожны.
Любоў, як бачыш, дбае аб дабры:
Калі багаты, у цябе сябры,
А як настануць чорныя часіны,
Твае сябры табе пакажуць спіны.
Дык вось, канчаю тым, з чаго пачаў:
Хто волю з доляй разам прымячаў?
Хто можа пахваліцца з нас удачай?
Мяркуем так, а робіцца іначай.
Ты хочаш быць навекі вернай мне?
А як памру, дык і любоў міне.

АКЦЁР-КАРАЛЕВА

Каб я не ведала ні дня, ні ночы,
Каб я не бачыла скарынкі ў вочы,

Няхай я у турме сырой згнію,
Няхай адчай учэрніць кроў маю,
Чаго б я ні хацела, ні жадала,
Каб я таго не мела, не прыждала,
І тут і там пракляцце нада мной,
Калі я выйду замуж удавой!

ГАМЛЕТ

(Афеліі)

А што будзе, калі яна яму здрадзіць?

АКЦЁР-КАРОЛЬ

Прысяга моцная. Стамлёны я;
Ідзі ў пакоі, любая мая;
Хачу заснуць.

(Засынае.)

АКЦЁР-КАРАЛЕВА

Засні у добры час.
Няхай ліхое не чапае нас!

(Выходзіць.)

ГАМЛЕТ

Маці, як табе падабаецца п'еса?

КАРАЛЕВА

Па-мойму, нашто ёй было даваць такі зарок.

ГАМЛЕТ

О, яна сваё слова стрымае.

КАРОЛЬ

Табе вядомы змест? Ці няма тут якой-небудзь абразы?

ГАМЛЕТ

Ды не, яны толькі жартуюць, атручваюць жартам, якая ж тут можа быць абраза.

КАРОЛЬ

А як называецца п'еса?

ГАМЛЕТ

«Пастка». Але ў якім сэнсе? У пераносным. У гэтай п'есе паказваецца забойства, якое адбылося ў Вене. Імя герцага — Ганзага, а яго жонкі — Баптыста, вы зараз убачыце, ну і подлая гісторыя! Але ўсё роўна вашай вялікасці і нас, людзей з чыстаю душой, гэта не датычыцца. Няхай выкручваецца кляча, наш карак не намулены.

Уваходзіць Луцыян.

А вось гэта Луцыян, пляменнік караля.

АФЕЛІЯ

Вы добра замяняеце хор, мой прынц.

ГАМЛЕТ

Калі вы будзеце абдымацца з вашым каханкам, вазьміце мяне за тлумача.

АФЕЛІЯ

Прынц, вы як тая калючка.

ГАМЛЕТ

Мая калючка не скора тупіцца, прыйшлося б пастагнаць.

АФЕЛІЯ

І лепш, і горш.

ГАМЛЕТ

Якраз так, як вы сабе мужоў выбіраеце. Пачынай, забойца! Досыць табе корчыць страхоцце. Пачынай: «Да помсты заклікаюць груганы».

ЛУЦЫЯН

Змрок душ, спрыт рук і шклянка,— ўсё ў парадку;
Спрыяе час, прыступім да пачатку.
Забойчы сок, з начнога зелля ўзяты,
Гекатай тройчы тручаны і кляты,
Прыроды моц і сілу чар яві,
Кроў замарозь і цела знежыві!

(Лье атруту ў вуха соннаму каралю.)

ГАМЛЕТ

Ён атручвае яго ў садзе, каб заўладаць яго дзяржавай. Яго прозвішча — Ганзага. Ёсць такая навела, вельмі складана напісаная па-італьянску. Вы зараз убачыце, як забойца пойдзе дабівацца кахання да жонкі Ганзага, і, мушу вам сказаць, ён свайго даб'ецца.

АФЕЛІЯ

Кароль устае.

ГАМЛЕТ

Што, спалохаўся халастога стрэлу?

КАРАЛЕВА

Што з табою, мой друг?

ПАЛОНІЙ

Спыніце спектакль!

КАРОЛЬ

Пасвяціце мне,— прэч!

ПАЛОНІЙ

Святла, святла, святла!

Выходзяць усе, за выключэннем Гамлета і Гарацыо.

ГАМЛЕТ

Хай ранены алень сумуе,

Лань ведае, дзе дзецца;
Адзін заснуў, другі вартуе —
Так на зямлі вядзецца.
Вось гэта, ды яшчэ куст пер'я на галаву (на крайні выпадак, калі б мне вельмі не пашанцавала), ды дзве праванскія ружы на разразныя чаравікі, то я мог бы падацца ў акцёры і стаць пайшчыкам трупы. Як ты думаеш, Гарацыо?

ГАРАЦЫО

На палавінным акладзе.

ГАМЛЕТ

Не, на поўным.
О мой Дамон, паганы час,
Ты ведаеш усё:
Раней быў Зеўс царом у нас,
Цяпер царом... павук.

ГАРАЦЫО

Вы б маглі сказаць і ў рыфму.

ГАМЛЕТ

Гарацыо, дружа мой, кладу ў заклад тысячу чырвонцаў, здань казала праўду. Ты заўважыў?

ГАРАЦЫО

Заўважыў, прынц.

ГАМЛЕТ

Калі гаварылася аб атручванні.

ГАРАЦЫО

Я не спускаў з яго вачэй.

ГАМЛЕТ

А-а! — Гэй, музыку! Нясіце флейты!
Кароль не прызнае забаў,—
Відаць, ён іх не ўпадабаў.

Уваходзяць Разенкранц і Гільдэнстэрн.

Музыку!

ГІЛЬДЭНСТЭРН

Мой добры прынц, дазвольце мне сказаць вам кароткае слова.

ГАМЛЕТ

Хоць сабе і доўгае, пане мой.

ГІЛЬДЭНСТЭРН

Кароль...

ГАМЛЕТ

Ну, што з ім?

ГІЛЬДЭНСТЭРН

Пайшоў у свае пакоі. Яму вельмі нездаровіцца.

ГАМЛЕТ

Ад віна?

ГІЛЬДЭНСТЭРН

Не, мой прынц, ад жоўці.

ГАМЛЕТ

Лепей бы вы далажылі аб гэтым доктару, пане мой, каб ён яго прачысціў, бо калі я пачну яго чысціць, дык жоўць яго можа разліцца яшчэ больш.

ГІЛЬДЭНСТЭРН

Мой добры прынц, калі ласка, абмяжуйце вашу гутарку і не адскаквайце так дзіка ад маёй справы.

ГАМЛЕТ

Я паслухмяны, гаварыце.

ГІЛЬДЭНСТЭРН

Каралева, маці ваша, у вялікім засмучэнні сэрца, паслала мяне да вас.

ГАМЛЕТ

Рад вас бачыць.

ГІЛЬДЭНСТЭРН

Не, прынц, гэта далікатнасць не адпавядае абставінам. Калі вы пажадаеце даць мне разумны адказ, то я выканаю даручэнне маці вашай, а калі не, то, перапрашаю, дазвольце пакінуць вас, бо мая місія скончана.

ГАМЛЕТ

Я не магу.

ГІЛЬДЭНСТЭРН

Што, мой прынц?

ГАМЛЕТ

Даць вам разумны адказ; мой розум хворы. Адказ, які я магу вам даць, да вашых паслуг ці, лепш, да паслуг маёй маці. А таму без агаворак і канкрэтна. Маці, кажаце вы...

РАЗЕНКРАНЦ

Гаворыць наступнае: вашы паводзіны бязмежна здзівілі і глыбока ўразілі яе.

ГАМЛЕТ

О бязмежна дзіўны сын, які так уразіў маці. Але ці не хаваецца за гэтым матчыным уражаннем яшчэ штонебудзь? Гаварыце.

РАЗЕНКРАНЦ

Яна хоча пагутарыць з вамі ў сваім пакоі перад тым, як вы ляжаце спаць.

ГАМЛЕТ

Мы згодны, будзь яна хоць дзесяць разоў нашай маткай. Больш вам нічога не патрэбна?

РАЗЕНКРАНЦ

Калісьці вы мяне любілі, прынц.

ГАМЛЕТ

І цяпер яшчэ, клянуся гэтай парай хапуг і драпежнікаў.

РАЗЕНКРАНЦ

Мой добры прынц, чым вы так расхваляваны? Вы самі чапляеце ланцугі на сваю незалежнасць, тоячы гора сваё ад друга.

ГАМЛЕТ

Мой дарагі, мне не даюць ходу.

РАЗЕНКРАНЦ

Як гэта можа быць, калі сам кароль прызначыў вас наследнікам дацкай кароны?

ГАМЛЕТ

Так-то так, але «пакуль сонца ўзыдзе...». Старая прыказка.

Уваходзяць флейтысты.

А, флейты! Дайце мне адну. *(Бярэ флейту. Гільдэнстэрну.)* Хадзі сюды, скажу табе нешта на вушка. *(Адводзіць Гільдэнстэрна ўбок.)* Чаго ты круцішся каля мяне, як ганчак? Чаго ты ўсё вынюхваеш? Ты што, у сеці хочаш мяне заманіць?

ГІЛЬДЭНСТЭРН

О прынц, калі я перастараўся, то гэта значыць, што я вас вельмі люблю.

ГАМЛЕТ

Я нешта не разумею. Пайграй на флейце.

ГІЛЬДЭНСТЭРН

Я не магу, прынц.

ГАМЛЕТ

Калі ласка.

ГІЛЬДЭНСТЭРН

Паверце мне, я не магу.

ГАМЛЕТ

Прашу цябе.

ГІЛЬДЭНСТЭРН

Я не ведаю, як за яе брацца, прынц.

ГАМЛЕТ

Гэта так жа лёгка, як хлусіць. Пакладзі пальцы на

лады, дзьмі ў дзірачку, і гэты інструмент загаворыць прыгожаю музыкай. Глядзі сюды: вось адзін лад, вось другі.

ГІЛЬДЭНСТЭРН

Мой прынц, але ж я не маю таленту, я не ведаю законаў гармоніі.

ГАМЛЕТ

Бачыш, якую дрэнь ты з мяне робіш! Ты хочаш іграць на мне; ты думаеш, што ты ведаеш мяне; ты хочаш улезці ў маю душу, вырваць маю тайну і перабіраць лады майго сэрца ад самай нізкай да самай высокай ноты. Вось у гэтым маленькім інструменце многа гармоніі, цудоўны голас, аднак ты не можаш прымусіць яго загаварыць. Чорт вазьмі, думаеш ты, што на мне лягчэй іграць, чым на флейце? Назаві мяне якім хочаш інструментам, ты можаш расстроіць мяне, але не іграць на мне.

Уваходзіць Палоній.

Добры вечар, пане.

ПАЛОНІЙ

Мой прынц, каралева жадае мець з вамі гутарку, і каб зараз жа.

ГАМЛЕТ

Паглядзіце вунь на тую хмарку, яна вельмі падобна на вярблюда, што, мо няпраўда? Як вы мяркуеце, пане?

ПАЛОНІЙ

Як перад святою імшою,— жывы вярблюд; ваша праўда, ваша праўда.

ГАМЛЕТ

Мне здаецца, яна падобна на куніцу.

ПАЛОНІЙ

Спінка як у куніцы.

ГАМЛЕТ

Альбо як у кіта.

ПАЛОНІЙ

Зусім як у кіта.

ГАМЛЕТ

Скажыце маці, што я зараз прыйду.— Яны строяць з мяне дурня, я не вытрываю.— Я зараз прыйду.

ПАЛОНІЙ

Я так і далажу.

Палоній выходзіць

ГАМЛЕТ

Лёгка сказаць — «зараз». Пакіньце мяне аднаго, сябры мае.

Разенкранц, Гільдэнстэрн, Гарацыо ды іншыя выходзяць.

Глухая ноч; разяўлены магілы:
І пекла дыхае на свет заразай.
Цяпер упіцца б кроўю. Распачаць
Расправу лютую, зрабіць такое,
Каб здрыгануўся дзень. Пайду да маці.
О сэрца, будзь жа сэрцам! Хай ніколі
Душа Нерона у мяне не ўвойдзе!
Я буду жорсткім, але чалавечным,
З кінжаламі на вуснах, не ў руках.
Няхай язык мой супярэчыць сэрцу:
Я вострым словам ёй душу параню,
Але забойствам рук не апаганю.

(Выходзіць.)

Сцэна трэцяя

Пакой у замку.

Уваходзяць кароль, Разенкранц і Гільдэнстэрн.

КАРОЛЬ

Я не люблю яго. Дый небяспечна
Даваць вар'яту волю. А таму
Рыхтуйцеся. Я безадкладна выдам
Вам паўнамоцтвы. Ён паедзе з вамі
У Англію. Дзяржаўныя законы
Не дазваляюць нам рызыкаваць
Спакоем нашым.

ГІЛЬДЭНСТЭРН

Вашая вялікасць,
Мы падрыхтуемся. Ваш страх свяшчэнны:
Вы думаеце аб жыцці падданых,
Што кормяцца ад ласкі каралеўскай.

РАЗЕНКРАНЦ

Жывы жывое думае, і кожны
Жадае мець спакойнае жыццё,
Што ж нам сказаць аб сонцы найяснейшым,
Аб каралю, гаспадару грамадства?
Яго жыццё — гасцінец неацэнны;
Смерць караля бясследна не праходзіць:
Як ураган праносіцца яна,
Ламаючы усё, што блізка. Гэта —
Вялізазнае кола, што паднята
У высі гор, да спіц яго магутных
Прыпушчаны ў пазы і прыкаваны
Дзесяткі тысяч дробненькіх істот;
Калі яно пакоціцца, пацягне
Ўвесь гэты тлум прыдаткаў за сабою
І ўшчэнт зруйнуе. Каралю няўдача,—
То разам з ім усё грамадства плача.

КАРОЛЬ

Хутчэй рабіце зборы, я прашу,
Мы сплавім гэта наглае страшыдла —
Прэч, прэч!

РАЗЕНКРАНЦ і ГІЛЬДЭНСТЭРН

Мы хутка, вашая вялікасць!

Уваходзіць П а л о н і й.

ПАЛОНІЙ

Кароль святлейшы, ён пайшоў да маці.
А я нагледзеў для сябе і пункцік,—
За дываном: там чутна ўсё. Дык вось,
Я гарантую, што яна ўсё зробіць,
Сказалі вы, і мудра вы сказалі,
Паколькі матчына натура часта
Залішне мяккацела, то патрэбна,
Каб гэтую дыскусію засведчыў
Хто-небудзь іншы, болей аб'ектыўны.
Бывайце, мой святлейшы, перад сном
Я дам вам звесткі.

КАРОЛЬ

Дзякуй, дарагі мой.

П а л о н і й выходзіць.

Смурод майго граху ідзе да неба,
На мне ляжыць старэйшае праклянце —
Забойства брата. Не магу маліцца,

Хоць і хачу і воля прымушае,
Аднак віна мая мяне трымае.
Як той, што ў два бакі глядзіць, стаю
І думаю, з чаго цяпер пачаць:
З таго ці з гэтага? Нейк не выходзіць.
Няўжо, калі рука мая ў крыві
Па самы локаць, дык няма дажджу
У неба міласэрнага, каб вымыць
І абяліць яе? Навошта літасць,
Як не затым, каб выратоўваць грэшных?
Малітва? Ёсць дзве сілы у малітвы:
Адна — засцерагаць нас ад спакусы,
Другая — падымаць таго, хто ўпаў.
Зірну угору. Грэх мой у мінулым.
Але якім жа спосабам маліцца?
Даруй мне, божа, подлае забойства?..
Не, гэтак нельга. Ці ж магу аддаць
Назад свой скарб, што адабраў у брата:
Карону, ўладу, тытулы і жонку,—
Каб гэта мець збавенне і быць грэшным?
У мутным моры нашых спраў зямных
Рука у золаце кіруе праўдай,
Падсунеш хабар — і улесціш суд,
І ўсё табе прабачаць. Там не так,
Не скруціш там: учынак твой раздзенуць
І выставяць як міленькага голым,—
Прымусяць прызнавацца. Што рабіць?
Хіба пакаяцца,— мо што і выйдзе.
Ой, не магу я каяцца! Ой, страшна!
Ах, бедны я!.. Змрок у грудзях, як смерць.
Куды ўцячы?.. Папаўся дык папаўся.
Анёлы светлыя, дапамажыце!
Калені, гніцеся! Размякні, сэрца,
Не будзь як камень, будзь як у дзіцяці!
Ўсё будзе добра.

(Адыходзіць і становіцца на калені.)

Уваходзіць Гамлет.

ГАМЛЕТ

Цяпер у самы раз рабіць расправу,—
Ён моліцца, і я зраблю. І ён
На неба пападзе. І гэта помста?
Абдумаю спачатку. Ліхадзей
Забіў мне бацьку, і за гэта я,

Адзіны сын у бацькі, ліхадзея ,
Сам адсылаю ў рай. Хіба я найміт,
Каб гэтак помсціцца? У сытым сне
Быў той забіты, калі ўсе грахі
Былі на ім. Вядома толькі богу,
Ці лёгкая была яго расплата,—
Відаць, пакутуе там небарака.
Ці ж гэта помста на той свет адправіць
Яго цяпер, калі душу ён чысціць,
Калі ён сам рыхтуецца ў дарогу?
Не,
Схавайся, меч! — яшчэ надыдзе час;
Калі ён будзе п'яны, альбо ў гневе,
Альбо палезе на распусны ложак,
Тады сячы. У брудзе, у гнюсоце,
Сярод пацех агідных гада знішчыць,
Каб ён не спадзяваўся на збавенне,
А каб ляцеў, задраўшы пяты к небу,
У зубы к чорту, чорны, як смала,
На векі вечныя. Хай будзе так.
Жыві яшчэ, але ты ўжо мярцвяк.
Пайду да маці.
(Выходзіць.)

КАРОЛЬ
(устаючы)
Без думак словы, як без духу цела,—
Мая малітва к небу не ўзляцела.
(Выходзіць.)

Сцэна чацвёртая

Другі пакой у замку.

Уваходзяць каралева і Палоній.

ПАЛОНІЙ
Ён зараз прыйдзе. Будзьце з ім суровей,
Як след усыпце за такія штукі;
Скажыце, што яго адратавалі,
Што, каб не вы і каб не ваша просьба,
Яму б папала. Я ў куточку стану.
Больш строгасці, прашу вас.

ГАМЛЕТ
(за сцэнай)
Маці, маці!
КАРАЛЕВА
Так і зраблю. Маўчыце. Ён ідзе.

Палоній хаваецца за дыван.
Уваходзіць Гамлет.

ГАМЛЕТ
Ну, маці, што мне скажаш?
КАРАЛЕВА
Гамлет, бацька твой пакрыўджаны табою.
ГАМЛЕТ
Маці, бацька мой пакрыўджаны табою.
КАРАЛЕВА
Прашу вас, не мяліце языком.
ГАМЛЕТ
Прашу вас, не блудзіце языком.
КАРАЛЕВА
Што гэта значыць, Гамлет?
ГАМЛЕТ
Што вам трэба?
КАРАЛЕВА
Ты забываеш, хто я?
ГАМЛЕТ
Не, вось крыж:
Вы — каралева, дзеверава жонка,
І мая маці, на вялікі жаль.
КАРАЛЕВА
Тады з табой другія пагавораць.
ГАМЛЕТ
Сядзь, сядзь, не ўстанеш, не скранешся з месца,
Пакуль, як у люстэрку, не пабачыш
Сваё нутро.
КАРАЛЕВА
Што ты надумаў, Гамлет?
Ты хочаш загубіць мяне? Ратуйце!
ПАЛОНІЙ
(за дыванам)
Гэй, гэй, ратуйце!
ГАМЛЕТ
Ага, пацук! *(Вымае шпагу.)* Даю дукат, забіты.
(Пратыкае дыван.)

ПАЛОНІЙ

(за дываном)

Ой, паміраю.

(Падае і памірае.)

КАРАЛЕВА Што ты нарабіў?

ГАМЛЕТ

Я сам не ведаю. Там быў кароль?

КАРАЛЕВА

Якое зверства! Ах, якое зверства!

ГАМЛЕТ

Не большае, чым караля забіць
І жонкаю стаць мужавага брата.

КАРАЛЕВА

Чым караля забіць?

ГАМЛЕТ

Так, я сказаў.

(Адкідае дыван і знаходзіць Палонія.)

Бывай, неасцярожная праныра,
Я цэліў не ў цябе. Прымі свой лёс.
І для каго ты так стараўся, дурань? —
Ды не ламай так рукі. Ціха! Сядзь!
Я тваё сэрца зараз паламаю,
Калі яно яшчэ не скамянела,
Не зарасло агіднаю прывычкай,
Калі ёсць месца ў ім для пачуцця.

КАРАЛЕВА

Што я зрабіла, што мяне ты ганьбіш,
Крычыш так дзёрзка?

ГАМЛЕТ

Што зрабіла ты?
Ты чэсць заплямiла, прагнала сорам,
Сарвала ружу чыстую кахання
З чала свайго і начапіла язву;
Ператварыла шлюбныя зарокі
У балбатню карцёжніка; учынак,
Што з цела дагавору сэрца выняў
І гром арганных гімнаў замяніў
Пустой рапсодыяй. Ірдзее твар
Нябесны, ясны; і зямлі цвярдыня,
Балеючы у думках аб табе,
Маўчыць пахмурна, як перад скананнем.

КАРАЛЕВА

Што я зрабіла? Ох, які учынак,
Каб пачынаць з такой прадмовы грознай?

ГАМЛЕТ
Глядзі сюды, вось тут адзін малюнак,
А вось другі,— партрэты двух братоў.
Глядзі сюды,— якое харство:
Чало Юпітэра, і валасы
Віюцца — кучаравы Апалон,
А вочы, як у Марса,— гнеў, адвага,
І стройны стан, нібы ганец Меркурый
Ў надхмарных высях, азароны сонцам.
Чароўнае злучэнне форм і фарб,—
Здаецца, кожны бог пячаць паставіў,
Каб даць сусвету вобраз чалавека.
І гэта быў твой муж. Цяпер глядзі
Сюды. Вось муж твой. Як іржавы колас,
Зайздросліва ён пажырае брата.
Дзе твае вочы? Каб з нагорнай пашы
Звaліцца у смярдзючае балота
І бруд глытаць? Дзе твае вочы, маці?
Ты скажаш — закахалася,— няпраўда!
Ў тваім узросце кроў ужо сціхае
І верх бярэ развага. Як магла ты
Змяніць на гэта гэта? Адчуваць
Ты мусіш, бо жывая, але ты,
Як бервяно. Вар'ят не памыліўся б!
Бо як бы шал ні прыгнятаў пачуцці,
А ўсё ж адрозніць мог бы пры такім
Непадабенстве. Хто цябе прымусіў?
Хіба мо чэрці з бубнам праязджалі
І ўздумалі гуляць з табою ў жмуркі?
Крывое вока, дотык невідушчы,
Без рук, без вока, вуха, нюх сляпы,
Кавалак пачуцця, абрубак чулы
І той бы разабраўся.
О сорам, дзе твая пунсовасць? Пекла,
Калі ты ўзбушавалася ў касцях
Старой кабеты, то няхай юнацтва
Ў агні сваім, як воск, растопіць сорам!
Ці ж гэта ганьба маладой крыві
Кіпець, калі палае лёд, а розум
З распустай абдымаецца?
КАРАЛЕВА Даволі!
Ты вочы павярнуў мне у нутро:
Набралася там столькі чорных плям,
Што іх не вынесці.

ГАМЛЕТ

Не тое кажаш;
Жыць у гнаі, ў тухліне, на пасцелі,
І лашчыцца, і цешыцца любоўю
Ў хляве на кучы...

КАРАЛЕВА

О, даволі, Гамлет!
Твая гаворка катуе мне вуха.
О, злітуйся!

ГАМЛЕТ

Забойца! Душагуб!
Халоп, не варты і двухсотай часці
Твайго былога мужа! Блазен тронны!
Кароль-камедыянт! Зладзюга! Жулік!
Сцягнуў з паліцы царскую карону
І сунуў у кішэню.

КАРАЛЕВА

Хопіць, хопіць!

ГАМЛЕТ

Кароль з ануч...

Уваходзіць здань.

Ратуй і ахіні мяне ускрыллем,
Святое воінства! Чаго ты хочаш,
Благаславёны вобраз?

КАРАЛЕВА

А божа, ён — вар'ят!

ГАМЛЕТ

Ты хочаш папракнуць маруду-сына,
Які, дабраўшы зручны час, не змог
Зрабіць адразу тое, ў чым пакляўся;
Скажы!

ЗДАНЬ

Не забывай. Сюды прыйшоў я,
Каб навастрыць нажы твайго намеру;
Але зважай, лунае жах над маці.
Стань паміж ёю і яе змаганнем:
Магутна уяўленне у слабых.
Скажы ёй што-небудзь.

ГАМЛЕТ

Што з вамі, мама?

КАРАЛЕВА

Сыночак, што з табою?
Ты ў пустату ўтаропіў дзікі позірк

І, як лунацік, гутарыш з паветрам;
З вачэй тваіх выбліскває твой дух,
І, як жаўнеры раптам на трывогу,
Паўсталі дуба валасы твае.
Сынок, залі агонь сваёй хваробы
Халодным супакоем. Што ты бачыш?

ГАМЛЕТ

Яго, яго. Глядзі, які ён бледны,
Такая крыўда горкая ў абліччы,
Што камень зразумеў бы.— Не глядзі так,
О, не глядзі так, бо мяне расчуліш,
І я ніколі не дайду да мэты,
І страціцца суровасць спраў маіх:
Замест крыві — сляза.

КАРАЛЕВА

З кім ты гаворыш?

ГАМЛЕТ

Нічога ты не бачыш?

КАРАЛЕВА

Не, нічога;
Усё, што ёсць, я бачу.

ГАМЛЕТ

Ты нічога
Не чула?

КАРАЛЕВА

Не, нічога; толькі нас.

ГАМЛЕТ

Глядзі туды! Глядзі, ён адыходзіць!
Мой бацька, бацька мой, жывы, жывы!
Глядзі, вось ён ідзе; знікае, знік.

З д а н ь выходзіць.

КАРАЛЕВА

Сыночак мой, ты трызніш. Гэта — мары.
Пры непрытомнасці усякае зданнё
Вярзецца чалавеку.

ГАМЛЕТ

Непрытомнасць?
Мой пульс, як твой, нармальны і здаровы,
Музычна адбівае такт. Не мары
Мая гаворка. Апытай мяне,
І я даслоўна паўтару усё,
Чаго вар'ят не зробіць. Слухай, маці,
Не маж душы уцешнаю масцікай,

Што гэта шал, а не твая віна:
Балячка не загоіцца пад струпам,
Зараза ціха ўсочыцца ў нутро
І з'есць цябе. Пакайся перад небам,
Прызнай свой грэх і болей не грашы;
Не падкладай пад пустазелле гною,
Каб лепш расло. Прабач на добрым слове.
У наш адкормлены надзьмуты век
Дабро павінна кленчыць перад ліхам,
Само прапанаваць свае паслугі.

КАРАЛЕВА

Гамлет, Гамлет, ты разбіў мне сэрца!

ГАМЛЕТ

Вазьмі ды выкінь горшую палову,
А з лепшаю жыві у чыстаце.
Дабранач! Толькі не на ложку з дзядзькам.
Прыкінься чэснай, калі чэсць згубіла.
Прывычка, гэты чорт, што загрызае
Любое пачуццё, табе паможа
На гэты раз: учынак злы ці добры —
Ёй усё роўна, знойдзе гарнітур
Якраз па мерцы — і насі сабе.
Сягоння устрымайся, заўтра зноў,—
І ты пазнаеш лёгкасць устрымання.
Прывычка можа адмяніць прыроду:
Ці ўшчэміць чорта, ці яго прагоніць
Дзівоснай сілаю. Бывай, дабранач!
Калі ты вернешся на верны шлях,
Благаславі мяне.— Табе, стары,
(паказвае на Палонія)
Табе я спачуваю. Воля неба.
Ты мне быў караю, а я табе;
Я толькі зброя у руках нябесных.
Я вынесу яго і дам адказ
За гэту смерць. Яшчэ раз добрай ночы!
Я жорсткім стаў, бо я хацеў быць добрым;
Пачатак дрэнны, але будзе горш.
Яшчэ два словы, маці.

КАРАЛЕВА

Што рабіць?

ГАМЛЕТ

Рабі наадварот, мяне не слухай;
Дазволь, каб гэта пухлая пачвара,
Твой любы муж, завёў цябе на ложак,

Пачаў цябе за шыйкай казытаць
І парачкай паскудных пацалункаў
Дабіўся поўнага ва ўсім прызнання:
Мой сын, скажы, ніякі не вар'ят,
Мой сын лавушкі строіць.— Мы так любім,
Так любім весткі.— Як жа утаіць
Прыгожай, скромнай, мудрай каралеве
Ад кажана, ад жабы, ад ката
Такую справу? Хто гэта дацерпіць?
О не, узлезь, як тая малпа ў байцы,
Насуперак і розуму і чэсці,
З кашом на дах і, выпусціўшы птушак,
Сама для спробы сядзь у гэты кош,
Ды і каціся на зламанне карка.

КАРАЛЕВА

Павер мне, калі мова — гэта подых,
А подых ёсць жыццё, я нежывая,
Каб вымавіць хоць слова.

ГАМЛЕТ

Я еду ў Англію. Табе вядома?

КАРАЛЕВА

А я й забыла; так пастанавілі.

ГАМЛЕТ

Лісты падпісаны. Са мною разам
Паедуць два мае сябры па школе,
Каторым я, як дзвюм гадзюкам, веру,
І павязуць загад. Яны павінны
Расчысціць шлях мне ў пастку. Што ж, няхай!
Цікавая гульня: пад далакопаў
Падкласці іх жа міну. Дрэнна будзе,
Калі я не падрыюся глыбей
І кішкі іх не пачаплю на месяц.
Якая слодыч, сеўшы у засаду,
Прыпільнаваць і кінуцца на здраду,—
Вось хто паскорыць зборы.
Я выцягну адгэтуль мерцвяка.—
Дабранач, маці! — Ціхі і паважны
Ляжыць міністр, спакойнае чало,
А пры жыцці быў шэльма і трапло.—
Дазвольце услужыць вам, ваша светласць.—
Дабранач, маці.

Выходзяць кожны асобна;
Гамлет выцягвае Палонія.

АКТ ЧАЦВЁРТЫ

Сцэна першая

Пакой у замку.

Уваходзяць кароль, каралева, Разенкранц і Гільдэнстэрн.

КАРОЛЬ

У гэтых уздыханнях, гэтых стогнах
Павінна нешта быць. Дай тлумачэнне.
Нам трэба ведаць. Дзе твой сын?

КАРАЛЕВА

Пакіньце на мінутку нас.

Разенкранц і Гільдэнстэрн выходзяць.

Ах, друг мой,
Што бачыла я ўночы.

КАРОЛЬ

Што, Гертруда?
Што з Гамлетам?

КАРАЛЕВА

Шалёны, быццам мора
І вецер, калі ўсходзяцца абое
Спрачацца, хто дужэй. У лютым гневе,
Пачуўшы шум за дываном, умомант
Схапіў ён меч і, крыкнуўшы: «пацук!»,
Не глянуўшы, напаў і закалоў
Няшчаснага старога.

КАРОЛЬ

Ліхадзейства!
Каб я там быў, было б са мною гэтак.
Яго свабода пагражае ўсім:
Табе, і мне, і кожнаму. Ах, ах!
Хто дасць адказ за гэты чын крывавы?
Яго ўскладуць на нас. Наш абавязак
Быў утрымаць, прыбраць да рук вар'ята,
Але такая нашая любоў,
Што мы нічога не маглі прадбачыць,
І, як уласнік брыдкае хваробы,
Таіліся датуль, пакуль яна
Не выела вантробы нашы. Дзе ён?

КАРАЛЕВА

Панёс забітага. І тут явіла

Яго вар'яцтва чыстату сваю,
Як золата сярод руды звычайнай;
Ён каецца і плача.

КАРОЛЬ

О, хадзем,
Мая Гертруда!
І сонца не апусціцца за горы,
Як ён пакіне нас. Ну, а злачынства
Мы нашаю уладай і умельствам
Як-небудзь апраўдаем.— Гільдэнстэрн!

Уваходзяць Разенкранц і Гільдэнстэрн.

Сябры, ідзіце клічце дапамогу:
Прынц Гамлет, непрытомны, закалоў
Палонія і павалок кудысьці
З пакояў каралевы. Ўсе на пошук!
З ім гаварыце хораша, а труп
Перанясіце у капліцу. Хутка!

Разенкранц і Гільдэнстэрн выходзяць.

Гертруда, пойдзем; склічам на нараду
Людзей мудрэйшых і вярнейшых, трэба
Іх пазнаёміць з нашым меркаваннем
І з тым, што здарылася. Можа, плётка,
Што з хуткасцю гарматнага ядра
Па свеце мчыцца з сыканнем змяіным,
Нас абміне і ў пустату пацэліць.
Хадзем, Гертруда. У душы маёй
Трывога і няпэўнасць.

Выходзяць.

Сцэна другая

Другі пакой у замку.

Уваходзіць Гамлет.

ГАМЛЕТ

Схаваў нядрэнна.

РАЗЕНКРАНЦ І ГІЛЬДЭНСТЭРН

(за сцэнай)

Гамлет! Прынц Гамлет!

ГАМЛЕТ

Ціха! Што там за гвалт? Хто кліча Гамлета? А, вось яны.

Уваходзяць Разенкранц і Гільдэнстэрн.

РАЗЕНКРАНЦ

Што вы зрабілі з трупам, прынц?

ГАМЛЕТ

Змяшаў з зямлёю. Яна яму крыху радня.

РАЗЕНКРАНЦ

Скажыце, дзе ён, каб забраць яго і вынесці ў капліцу.

ГАМЛЕТ

Не верце.

РАЗЕНКРАНЦ

А што такое?

ГАМЛЕТ

Што я вашу тайну буду трымаць за пазухай, а сваю на языку. Апроч таго, калі пытаецца губка, што можа адказаць ёй каралеўскі сын?

РАЗЕНКРАНЦ

Прынц, якая губка?

ГАМЛЕТ

Так, пане мой,— губка, якая смокча каралеўскія міласці, падзякі і загады. Такія прыдворныя — скарб для караля. Ён іх трымае, як малпа арэхі,— за шчакою: кладзе ў рот першымі, а глытае апошнімі. Калі яму спатрэбіцца тое, чаго вы набраліся, ён вас ціскане добра — і губка сухая.

РАЗЕНКРАНЦ

Я вас не разумею, прынц.

ГАМЛЕТ

Вельмі рад. Слова шэльмы спіць у вуху дурня.

РАЗЕНКРАНЦ

Мой прынц, вы павінны сказаць, дзе знаходзіцца цела, і пайсці з намі да караля.

ГАМЛЕТ

Цела ў караля, але яно скора разваліцца. Кароль — рэч...

РАЗЕНКРАНЦ

Якая рэч, мой прынц?

ГАМЛЕТ

Непатрэбная. Вядзіце мяне да яго.

Гоп, гоп, ліска! —
Гайня блізка.

Выходзяць.

Сцэна трэцяя

Другі пакой у замку.

Уваходзіць кароль з прыдворнымі.

КАРОЛЬ
Я даў загад знайсці яго і цела.
Ён на свабодзе — гэта небяспечна;
Аднак жа мы караць яго не будзем:
Яму надзвычай чэрнь сімпатызуе,
Бо судзіць не папраўдзе, а на вока,—
Яна убачыць мукі ліхадзея,
А не яго злачынства. А таму
Пасадзім мы яго на карабель
І сплавім прэч. Але, каб выйшла гладка,
Прадставіць трэба гэтае выгнанне
Як вынік доўгіх дум. Ліхой хваробе —
Ліхія лекі.

Уваходзіць Разенкранц.

Ну, што там яшчэ?

РАЗЕНКРАНЦ
О найяснейшы, не маглі дазнацца,
Куды схаваў ён труп.

КАРОЛЬ
А дзе ён сам?

РАЗЕНКРАНЦ
Пад вартаю, чакае вашай ласкі;
Тут, тут, каля дзвярэй.

КАРОЛЬ
Прывесці.

РАЗЕНКРАНЦ
Гэй, Гільдэнстэрн! Прывесці прынца!

Уваходзяць Гамлет і Гільдэнстэрн.

КАРОЛЬ
Што скажаш, Гамлет? Дзе Палоній?

ГАМЛЕТ
На вячэры.

КАРОЛЬ
На вячэры? Дзе?

ГАМЛЕТ
Не там, дзе ён есць, а там, дзе яго ядуць; на сойме

сярод палітычных чарвей. Чарвяк — наш адзіны імператар па часці яды. Мы гадуем усякую жывёлу, каб смачна пад'есці, а сабою гадуем чарвей. Тлусты кароль і худы жабрак — гэта толькі розныя гатункі ежы, дзве стравы на адзін стол; такі канец.

КАРОЛЬ

На жаль, праўда.

ГАМЛЕТ

Чалавек можа лавіць рыбу на чарвяка, які наеўся каралеўскага мяса, і есці рыбу, якая праглынула гэтага чарвяка.

КАРОЛЬ

Што ты хочаш гэтым сказаць?

ГАМЛЕТ

Нічога. Я толькі малюю карціну працэсаў, паказваю рух каралеўскай асобы ў жабрацкіх кішках.

КАРОЛЬ

Дзе Палоній?

ГАМЛЕТ

На небе. Няхай хто-небудзь палезе паглядзець. Калі вашы паслы яго там не знойдуць, то праваліцеся ў пекла і шукайце самі. У выпадку няўдачы, праз месяц ён сам дасць аб сабе знаць: калі будзеце падымацца на галерэю, то пачуеце смурод.

КАРОЛЬ

(прыдворным)

Абшукайце галерэю!

ГАМЛЕТ

Не спяшайцеся, ён не ўцячэ.

Прыдворныя выходзяць.

КАРОЛЬ

Жадаючы табе дабра, сын Гамлет,
І шчыра замаркочаныя тым,
Што ты зрабіў, дзеля твайго спакою
Мы вырашылі як мага хутчэй
Цябе адсюль справадзіць. А таму
Збірайся, сынку. Карабель выгодны,
І вецер слаўны, і калегі ў зборы,
І Англія вам рукі прасцірае.

ГАМЛЕТ

Хто, Англія?

КАРОЛЬ

Так, любы сыне.

ГАМЛЕТ Добра.

КАРОЛЬ

Надзвычай добра, каб ты ведаў толькі.

ГАМЛЕТ

Бачу я херувіма, які гэта бачыць. Ну, што ж, паедзем у Англію. Бывай, дарагая маці.

КАРОЛЬ

Твой бацька, Гамлет.

ГАМЛЕТ

Маці; бацька і маці — муж і жонка; муж і жонка — адно цэлае. Бывай, дарагая матуля! Еду ў Англію.

Выходзіць.

КАРОЛЬ

Хутчэй за ім; бяжыце, наглядайце,
Каб выехаў яшчэ да ўсходу сонца.
Хутчэй, хутчэй! Усё падрыхтавана.

Разенкранц і Гільдэнстэрн выходзяць.

О Англія! Калі шануеш ты
Маю прыхільнасць і маю магутнасць
(Каторых знакі на тваёй спіне,
Бо не засох яшчэ рубец крывавы
Ад дацкага мяча, і вольны страх твой
Укленчыў перад намі),— ты уважыш
Дзяржаўны наш загад. Мы прапануем,
Як гэта ўсё адзначана ў лісце,
Умерцвіць Гамлета. Зрабі нам гэта.
Як трасца, як скула, ён тут лютуе.
Будзь нам за доктара. Прэч, прэч заразу!
І я адчую смак жыцця адразу.

Выходзіць.

Сцэна чацвёртая

Раўніна ў Данії.

Уваходзяць Фарцінбрас, капітан і войска, маршыруючы.

ФАРЦІНБРАС

Ідзіце перадайце, капітан,
Прывет мой каралю; і далажыце,
Што Фарцінбрас, паводле дамаўлення,

Жадае разам з войскам перайсці
Праз Данію. Пункт збору вам вядомы.
Калі ж ён мае ў нас патрэбу, мы
Засведчым нашу вернасць асабіста.
Так і скажыце.

КАПІТАН

Слухаюся, прынц.

ФАРЦІНБРАС

Наперад, крок павольны!

Фарцінбрас і войска выходзяць.
Уваходзяць Гамлет, Разенкранц,
Гільдэнстэрн ды іншыя.

ГАМЛЕТ

Чыё тут войска, капітан?

КАПІТАН

Нарвежца.

ГАМЛЕТ

А куды яно ідзе,
Дазвольце запытаць?

КАПІТАН

Ідзе на Польшчу.

ГАМЛЕТ

А хто яго начальнік?

КАПІТАН

Фарцінбрас,
Нарвежскі прынц.

ГАМЛЕТ

Скажыце, капітан,
Мяркуеце ўсю Польшчу заваёўваць
Ці толькі частку?

КАПІТАН

Сказаць па чыстай праўдзе, не зманіць,
Ваюем за кавалачак зямлі,
Карысці ў ім ніякай, толькі назва,
Я б за яго не даў і трох чырвонцаў,
Каб, скажам, у арэнду, дый прадаўшы,
Паляк з Нарвежцам больш не атрымалі б.

ГАМЛЕТ

Тады вы пройдзеце туды свабодна,—
Паляк вас пусціць.

КАПІТАН

Не, там гарнізон.

ГАМЛЕТ

Дзве тысячы людзей і дваццаць тысяч
Чырвонцаў, а не могуць развязаць
Нікчэмнай спрэчкі. Вось яна — пухліна
Багацця і спакою, скрыты рак,
Які падточвае век чалавечы.—
Бывайце, капітан, я вам удзячны.

КАПІТАН

Шчасліва заставацца.

Капітан выходзіць.

РАЗЕНКРАНЦ

Пойдзем, прынц.

ГАМЛЕТ

Ідзіце, я вас зараз даганю.

Разенкранц, Гільдэнстэрн ды іншыя выходзяць.

Усё абвінавачвае мяне,
Куды ні глянь, усё да помсты кліча;
Змаганне скрозь. А я? Што чалавек,
Калі яго адзіная патрэба —
Яда і сон?.. Бяздушны звер, і толькі.
Той, хто стварыў нас з думкаю шырокай,
Той, хто нам даў богападобны розум,
Не можа дапусціць, каб мы згнаілі
Ўсё гэта без ужытку. Што са мною?
Ці я ўжо атупеў і памяць страціў,
Сам зверам стаў, ці то паўзучы сум
Ад крайняга жадання быць дакладным?
Не ведаю; але ў развагах гэтых
На долю мудрасці — тры долі страху.
Навошта жыць і паўтараць: зрабі,
Калі ў цябе ёсць сіла, воля, сродкі —
Зрабі без слоў. Уся зямля ўшчувае.
Вось тут пратупала навала войск,
І з ёю разам лёгкі, зграбны прынц,
Якога дух, узняты прагай славы,
Глядзіць бяспечна будучыні ў твар
І выстаўляе кволае, жывое
На смерць, на рызыку, на авантуры
За жменьку праху. Сапраўды вялікі
Ідзе заўсёды да вялікай мэты,
Але вялік і той, хто будзе біцца

Насмерць за дробязь, калі гонар кліча.
А я стаю. Забіты бацька мой,
Зняслаўленая маці, абурэнне
Крыві і розуму мяне штурхаюць,
А я стаю і сплю. О ганьба! Бачу
На полі смерці дваццаць тысяч душ,
Якія праз капрыз, за водбліск славы
Кладуцца у магілы, як у ложак;
Змагаюцца за месца, на якім
Няма дзе разгарнуцца, нельга нават
Ахвяры пахаваць як след. Цяпер
Альбо нальецца кроўю мой намер,
Альбо я пракляну сябе.
(Выходзіць.)

Сцэна пятая

Эльсінор. Пакой у замку.

Уваходзяць каралева, Гарыцыо і прыдворны.

КАРАЛЕВА
...Не буду з ёю гаварыць.
ПРЫДВОРНЫ
Калі ж бо просіцца. Яна такая
Бездапаможная, зусім вар'ятка.
КАРАЛЕВА
А што ёй трэба?
ПРЫДВОРНЫ
Бацьку ўспамінае;
Гаворыць, што на свеце многа фальшу,
Ўздыхае часта, б'е сябе у грудзі,
І абы чуць, распальваецца гневам;
Яе гаворка — цёмныя намёкі,
Набор нескладных крыкаў, тым не менш
Народ сабраўся, слухае, тлумачыць,
Знаходзячы ў вар'яцкай блытаніне
Сугучнае сваім уласным думкам;
Яе ж кіўкі, падморгванні і жэсты
Падвойваюць цікавасць, можна думаць,

Хоць гэта і няпэўна і няясна,
Але тут крыецца жахлівы сэнс.

ГАРАЦЫО

Пагаварыць патрэбна, бо яна
Пасеяць можа безліч крыватолкаў
Сярод ліхіх людзей.

КАРАЛЕВА

Няхай увойдзе.

Прыдворны выходзіць.

(Убок.)
Грэх цісне мне душу, ірве на часці:
Здаецца, набліжаецца няшчасце.
Хацела б утаіць віну маю,
Але сама міжвольна выдаю.

Вяртаецца прыдворны з Афеліяй.

АФЕЛІЯ

Ці тут прыгожая царыца Данії?

КАРАЛЕВА

Чаго табе, Афелія?

АФЕЛІЯ

(спявае)
Як пазнаць, хто мілы ваш?
Мой мілы — пілігрым:
Капялюш і доўгі кій,
Сандалі на ім.

КАРАЛЕВА

Што ты спяваеш, мілае дзіця?

АФЕЛІЯ

Маўчыце, не перабівайце.
(Спявае.)
Панна, панна, ён памёр,
У магілу лёг:
На магіле той трава,
Камень каля ног...
Ага!

КАРАЛЕВА

Афелія!

АФЕЛІЯ

Маўчыце, не перабівайце.
(Спявае.)
Саван бел, як белы снег...

Уваходзіць кароль.

КАРАЛЕВА

Мой друг, ты бачыш?

АФЕЛІЯ

(спявае)

У вянку ляжыць.
Толькі панны не было
Плакаць і тужыць.

КАРОЛЬ

Як маешся, дзіця маё?

АФЕЛІЯ

Добра, дзякуй богу. Людзі кажуць, што сава была дачкой пекара. Божа мой, божа, мы ведаем, хто мы, але не ведаем, што з намі будзе. Хлеб-соль вам!

КАРОЛЬ

(убок)

Намёк на бацьку.

АФЕЛІЯ

Калі ласка, не будзем пра гэта гаварыць, але, калі ў вас запытаюцца, што гэта значыць, адказвайце так:

(Спявае.)

Вось Валянцінаў дзень настаў,
Дзень добры! — я твая,
І Валянцінай пад акном
Цябе чакаю я.
Ён запрасіў яе ў пакой,
Дзяўчыне вельмі рад.
Яна ўвайшла, але пайшла
Нячэснаю назад.

КАРАЛЕВА

О мілая Афелія!

АФЕЛІЯ

Ага, бачыце! Не трэба ніякіх прысяг, я зараз скончу.

(Спявае.)

О, гора мне, о, ліха мне,
І што ж ён нарабіў!
Што ні хлапец — адзін канец:
Дзяўчыну загубіў.
Ты ж мне казаў, ты ж прысягаў:
Вяселле будзе ў нас.
Ён адказвае: «Клянуся сонцам, я б узяў цябе замуж, каб ты не валялася са мною ў пасцелі».— Ага!

КАРОЛЬ

Даўно яна такая?

АФЕЛІЯ

Спадзяюся, што гэта к лепшаму. Трэба цярпець. Але я не магу не плакаць, калі ўспомню, што яго палажылі ў халодную зямлю. Мой брат павінен гэта ведаць, дзякуй вам, што вы мне нараілі.— Падайце мой фаэтон! — Дабранач, мілыя людзі. Дабранач. Дабранач.

Выходзіць.

КАРОЛЬ

Будзь ласкаў, выйдзі і прыглядзі за ёю.

Гарацыо выходзіць.

Вось умярцвенне розуму ад гора;
Крыніца — гібель бацькі. Ах, Гертруда,
Гертруда, ліха не ідзе ўраздроб,
А батальёнамі. Памёр Палоній;
Галоўны звадыяш і пачынальнік,
Наш любы пасынак пакінуў нас;
Народ узбаламучан, наракае
І строіць нездаровыя здагадкі
Наконт забойства. Дрэнна мы зрабілі,
Што шыта-крыта справілі хаўтуры.
Афелія-сіротка звар'яцела,
Згубіла светач мыслі, без якога
Мы толькі лялькі ці звяры. Нарэшце,
І гэта рэшта вартая ўсяго,
Лаэрт таемна з Францыі вярнуўся,
Узрушаны блукае чорнай хмарай,
Збірае чуткі пра забойства бацькі
Пад пошасныя брэхі шаптуноў;
Паколькі ж матар'ялу малавата,
То падазронасць кінецца на нас,
І ганьбаваць пачнуць персону нашу
З канца ў канец. О любая Гертруда,
Ўсё гэта, як шрапнель, па ўсёй краіне
Рыхтуе смерць маю.

Шум за сцэнай.

КАРАЛЕВА

О божа, што там?

Уваходзіць другі прыдворны.

КАРОЛЬ

Дзе мае швейцарцы?
Нікога не ўпускаць. Што там такое?

ПРЫДВОРНЫ

Ратуйцеся, ўладар!
Сам акіян, заліўшы берагі,
Не пажырае так імпэтна дол,
Як малады Лаэрт з мяцежнай зграяй
Змятае варту! Чэрнь ідзе за ім.
І, нібы толькі што пачаўся свет,
Стаптаны звычаі, забыта даўнасць —
Апора і сцвярджэнне слоў і дзей,
Яны крычаць: «Лаэрта абіраем,
Лаэрт — кароль!» Ляцяць угору шапкі,
Лес рук і пошчак аж да неба ўзвіўся:
«Лаэрт — кароль! Лаэрта каралём!»

КАРАЛЕВА

Бач, як заяхкалі, на след узбегшы;
А не даждалі, дацкія сабакі!

КАРОЛЬ

Ўзламаны дзверы.

Уваходзіць Лаэрт, узброены; за ім датчане.

ЛАЭРТ

Дзе той кароль? Чакайце, не ўваходзьце.

ДАТЧАНЕ

Пусціце нас.

ЛАЭРТ

Кажу вам, прэч. Я сам.

ДАТЧАНЕ

Мы пачакаем.

Выходзяць за дзверы.

ЛАЭРТ

Дзякуй. Стаць на варце.
Ты, пакасны кароль, аддай мне бацьку.

КАРАЛЕВА

Спакойна, друг.

ЛАЭРТ

Калі ва мне ёсць кропля
Крыві спакойнай,— я не бацькаў сын:
Няхай тады мой бацька рогі носіць,
А маці на чале бязгрэшным
Кляймо блудніцы.

КАРОЛЬ

Што з табой, Лаэрт?
Чаго ты ўзбунтаваўся, як гігант? —
Няхай ідзе; Гертруда, не пужайся,
Асоба караля недатыкальна,
Над ёю бог і здрада не памкнецца
Падняць руку сляпую.— Што з табою?
Чым ты распален? — Не трымай яго,
Гертруда.— Што нам скажаш?

ЛАЭРТ

Дзе мой бацька?

КАРОЛЬ

Памёр.

КАРАЛЕВА

Але кароль тут ні пры чым.

КАРОЛЬ

Няхай пра ўсё пытае.

ЛАЭРТ

Як памёр?
Чмуціць я не дазволю, ў зман не дамся.
Васальства к чорту! Абавязкі к чорту!
У пекла к чорту веру і сумленне!
Я не баюся кары. Заяўляю:
Мне наплявaць на той свет і на гэты,
Што мае быць, то будзе. Я адпомшчу
За бацьку поўнасцю.

КАРОЛЬ

Ніхто не кажа,
Хто можа затрымаць цябе?

ЛАЭРТ

Ніхто. Я сам. Мая дыктуе воля.
А што да сродкаў — я іх скарыстаю,
З малым даб'юся многага.

КАРОЛЬ

Лаэрт,
Калі жадаеш ты праўдзівых вестак
Аб смерці дарагога твайго бацькі,
Няўжо ты будзеш помсціць без разбору,
Зграбаць у кучу ворагаў і блізкіх,
Абы-каго?

ЛАЭРТ

Не, ворагаў адных.

КАРОЛЬ

А ты іх хочаш ведаць?

ЛАЭРТ

Сяброў яго і прыяцеляў нашых
Я абдыму магутнымі рукамі
І, як самаахвярны пелікан,
Аддам ім кроў сваю.

КАРОЛЬ

О, ты гаворыш
Як добры сын, як дваранін сапраўдны.
Што я не вінаваты ў гэтай смерці
І ў смутку сам душой за ўсё хварэю,—
Павінна ў мыслі увайсці твае,
Як сонца ў вочы.

ДАТЧАНЕ

(за сцэнай)

Хай ідзе, пусціце.

ЛАЭРТ

Што там за шум?

Уваходзіць Афелія.

Агонь, спалі мяне!
О слёзы, перасоленыя горам,
Заліце вочы мне, каб я не бачыў!
Клянуся небам, за тваё вар'яцтва
Я так сышчу, што дрогнуць шалі праўды
І стрэлка перацягне у мой бок.
О ружа майская, мая дзяўчына,
Дзіця, сястра, Афелія мая!
О неба, ці ж дзявочы светлы розум
Згасае так жа, як згасае старасць?
Якою шчырай можа быць прыхільнасць!
Свой самы лепшы, самы дзіўны дар
Яна навекі аддала таму,
Каго любіла.

АФЕЛІЯ

(спявае)

У труне ляжыць ён непакрыты,—
Цім, цім, ці-ра-рым, весялей!
Слёзы горкія над ім праліты...
Бывай, мой голуб.

ЛАЭРТ

Каб мела розум ты і гаварыла:
Адпомсці, брат,— лягчэй бы мне было.

АФЕЛІЯ

Вам трэба спяваць: «Цім, цім, ці-ра-рым, весялей».

Каб сюды калаўрот, вось бы круціўся! Злодзей цівун украў дачку ў свайго гаспадара.

ЛАЭРТ

Нікчэмнасць, але як хвалюе.

АФЕЛІЯ

Вось размарын — гэта для ўспамінаў; калі ласка, мой любы, успамінай. А вось браткі — гэта для дум.

ЛАЭРТ

Навука ў вар'яцтве: думы і ўспаміны разам.

АФЕЛІЯ

Вось гэта кроп для вас і казялец. А вось тут рута для вас і трошкі для мяне; яе можна назваць травою прабачэння ў нядзельку, але вы павінны насіць вашу руту іначай. Вось стакрстачкі. Я б вам дала і фіялак, ды яны ўсе павялі, калі памёр мой тата; кажуць, ён хораша паміраў.

(Спявае.)

Прыгожы мой Робін,
Радасць мая!..

ЛАЭРТ

Журбу і мысль, пакуты, нават пекла
Яна ператварае ў харство.

АФЕЛІЯ

(спявае)

Няўжо ён не вернецца зноў?
Няўжо ён не вернецца зноў?
Ён мёртвы, ў труне,
Не вернецца, не,
Ніколі не вернецца ён.
Яго барада, як снег;
Яго валасы, як лён.
Ён пайшоў на той свет,
Але плакаць не след,—
Ратуй яго, божа, ратуй...
І ўсе хрысціянскія душачкі.— Да пабачэння!

Выходзіць.

ЛАЭРТ

Вы чуеце? О неба!

КАРОЛЬ

Лаэрт, я маю права і хачу
Дагаварыцца з крыўдаю тваёю.
Хадзем, збяры сяброў сваіх мудрэйшых,
Хай выслухаюць і рассудзяць нас.

Калі яны нас проста альбо ўскосна
Прызнаюць вінаватым, мы гатовы
Аддаць карону, і дзяржаву нашу,
І нашае жыццё, і ўсё, што наша,
Табе ў задавальненне. Калі ж не,
Згадзіся пацярпець, і мы з табою,
Злучыўшы гнеў і душы у адно,
Адпомсцім ворагу.

ЛАЭРТ

Хай будзе так.
І смерць яго, і пахаванне ўпотай,
Без герба, без мячоў над дамавінай,
Без пышнасці належнай і абрадаў,
З нябесных высяў скаргаю грымяць.
Пара мне разлічыцца!

КАРОЛЬ

Так, пара.
Крыўдзіцель не ўцячэ ад тапара.
Прашу за мною.

Выходзяць.

Сцэна шостая

Другі пакой у замку.

Уваходзяць Гарацыо і слуга.

ГАРАЦЫО

Хто там мяне пытае?

СЛУГА

Прыйшлі матросы; кажуць, ёсць лісты на ваша імя.

ГАРАЦЫО

Пусці іх.

Слуга выходзіць.

Не ведаю, хто і з якога краю
Успомніў пра мяне, калі не Гамлет.

Уваходзяць матросы.

ПЕРШЫ МАТРОС

Благаславі вас бог, пане.

ГАРАЦЫО

І цябе таксама.

ПЕРШЫ МАТРОС

Калі захоча, то і мяне благаславіць. Вам тут ёсць ліст, калі толькі вас завуць Гарацыо, як мне казалі. Гэта ад пасла, які павінен быў ехаць у Англію.

ГАРАЦЫО

(чытае)

«Гарацыо, прачытаўшы гэта, дапамажы як-небудзь гэтым хлопцам атрымаць доступ да караля; у іх ёсць да яго лісты. Не прабылі мы і двух дзён на моры, як за намі пагнаўся моцна ўзброены ваяўнічы пірат. Бачачы, што наш паруснік дае малы ход, мы нехаця набраліся храбрасці; калі была бойка, я пераскочыў да іх, і яны адразу адплылі ад нас; такім чынам, я апынуўся ў палоне адзін. Яны абышліся са мной, як добрыя разбойнікі; але яны ведалі, што ім трэба; я павінен быў зрабіць ім паслугу. Паклапаціся, каб кароль атрымаў мае лісты, а сам хутчэй, з усіх ног, быццам уцякаеш ад смерці, імчыся да мяне. Я скажу табе на вуха такое, што ты аслупянееш, і ўсё ж гэта будзе дробязь у параўнанні з выключнасцю справы. Гэтыя слаўныя хлопцы пакажуць табе, дзе я спыніўся. Разенкранц і Гільдэнстэрн плывуць у Англію, пра іх я шмат чаго раскажу. Бывай.

Твой друг Гамлет».

Хадзем, вы аддасце свае лісты
І мне паможаце знайсці таго,
Хто вас паслаў сюды. Адкладваць нельга.

Выходзяць.

Сцэна сёмая

Другі пакой у замку.

Уваходзяць кароль і Лаэрт.

КАРОЛЬ

Цяпер ты ведаеш усё, нарэшце.
Я апраўданы. Прымацуй мяне
Пячаткай дружбы да сваёй душы.
Той, кім забіты твой шаноўны бацька,
Рабіў замах на нас.

ЛАЭРТ

Выходзіць, так.
Але скажыце мне, як вы цярпелі
Такія абураючыя факты,
Такія крымінальныя злачынствы:
Ваш супакой, ваш розум, ваша годнасць,
Усё вам дыктавала не маўчаць.

КАРОЛЬ

О, дзве прычыны ёсць; табе яны
Пакажуцца нязначнымі, аднак
Я вымушан лічыцца. Каралева
Без сына жыць не можа, сам жа я
(Загана гэта ці мая заслуга?)
Прывязан да яе усёй істотай:
Як зорка, што ў адвечным коле кружыць,
Так я пры ёй. Другая акалічнасць,
Якая перашкодаю стаіць
Між мною і публічнаю расправай,—
Народная прыхільнасць да яго.
Як той паток, што з дрэва робіць камень,
Тупая чэрнь, злачынствы патапіўшы
У спачуванні, замест ланцугоў
Яму навяжа банты. Рызыкоўна
Пускаць стралу супроць такога ветру,—
Яна б вярнулася ў мой лук назад,
А вораг быў бы цэлы.

ЛАЭРТ

Няма ў мяне больш бацькі і не будзе,
Сястра мая ў адчаі чорным гіне,
Чыя краса і чыстае дзявоцтва,
Калі б назад магла ісці хвала,
Ўздымаліся б, як сонца, над вякамі,—
Але я не дарую, я адпомшчу!

КАРОЛЬ

Не гарачыся. Можаш спаць спакойна.
Не думай, што мы чуласці не маем.
Калі раптоўна нас за бараду
Ухопіць небяспека, мы не скажам,
Што гэта жарт. Пачуеш хутка болей.
Твой бацька быў нам любы, і мы любім
Саміх сябе, адгэтуль выцякае...

Уваходзіць пасланец.

Што там? Якія весткі?

ПАСЛАНЕЦ

Уладар,
Лісты ад прынца,— вам і каралеве.

КАРОЛЬ

Ад Гамлета? Хто іх прынёс?

ПАСЛАНЕЦ

Матросы, уладар; я сам не бачыў;
Мне перадаў іх Клаўдыо, ён першы
Іх атрымаў.

КАРОЛЬ

Лаэрт, ты будзеш слухаць.—
Пакінь нас.

Пасланец выходзіць.

(Чытае.)

«Высокі і магутны, даводжу да вашага ведама, што мяне высадзілі голым на бераг вашага каралеўства. Заўтра я буду хадайнічаць аб дазволе глянуць у вашы каралеўскія вочы; і тады, папярэдне папрасіўшы ў вас прабачэння, далажу аб прычынах майго нечаканага і вельмі дзіўнага з'яўлення тут.

Гамлет».

Што гэта значыць? Рэшта дзе? Няўжо
Усе вярнуліся? Тут нешта ёсць.
Ці не падман?

ЛАЭРТ

А вам рука вядома?

КАРОЛЬ

Так, піша Гамлет. «Голым»,— і яшчэ
Тут у прыпісцы сказана — «адзін».
Што нам параіш?

ЛАЭРТ

Не разумею. Што ж, няхай прыходзіць,
Уцепліцца душы маёй хвароба,
Калі публічна крыкну ў твар яму:
«Твая работа».

КАРОЛЬ

Калі так, Лаэрт...
Не, гэтак нельга. Як іначай? Вось...
Я буду кіраваць табою, хочаш?

ЛАЭРТ

Я згодзен, уладар, але, прашу вас,
Кіруйце так, каб міру не было.

КАРОЛЬ

Я мір вярну табе. Калі цяпер
Ён тут у нас і болей не захоча
Пакінуць нас, я дам яму заданне,—
У галаве якраз наспела думка,—
На гэты раз яго падкосіць смерць;
Ні ганьбы нам не будзе, ні папрокаў,
Намеру нават маці не заўважыць,
Падумае — няшчасце.

ЛАЭРТ

Уладар,
Кіруйце мною, і было б найлепей,
Каб я быў вашай зброяй.

КАРОЛЬ

Так і будзе.
Як ты паехаў, шмат было гаворак
Аб тым, што ты валодаеш бліскуча
Адным майстэрствам. Гамлет гэта чуў.
Усе дары твае не абудзілі
У ім такое зайздрасці, як гэты,
Зусім звычайны, на мой погляд, дар.

ЛАЭРТ

Які, о мой кароль?

КАРОЛЬ

О, гэта толькі
Істужка на капелюшы юнацтва,
Але патрэбная. На кожны ўзрост
Свой звычай і адзежа: юнаку —
Прыгожыя і лёгкія уборы,
А пажылому — футра і сукно
Для большае вагі і для здароўя.
Не так даўно, два месяцы назад,
Тут быў адзін нармандскі дваранін;
Я ведаю французаў, біўся з імі,
Выдатна ездзяць; але гэты зух
Быў проста чараўнік, сядзеў так зграбна,
Такія дзівы выраблял з канём,
Нібы той конь і чалавек на ім
Былі адной натуры. Ўсё, што мне
Даводзілася бачыць на турнірах,
Ён перавысіў.

ЛАЭРТ

Кажаце, нармандзец?

КАРОЛЬ
Нармандзец.
ЛАЭРТ
Клянуся, гэта быў Ламонд.
КАРОЛЬ
Ён самы.
ЛАЭРТ
Я з ім знаёмы; сапраўды ён перл
І дыямент свайго народа.
КАРОЛЬ
А ён цябе хваліў, назваў выключным
Тваё уменне фехтаваць на шпагах,
Падкрэсліў дасканаласць абароны
І ў захапленні выказаўся так:
«Вось бы пабачыць роўнага яму!
Найлепшыя байцы краіны нашай
Губляюць вернасць зроку, рух і націск
У паядынку з ім». Ацэнка гэта
Так атруціла Гамлету нутро,
Што з зайздрасці ён месца не знаходзіў,
Усё чакаў, калі ты зноў прыедзеш,
Каб сіламі памерацца з табой.
Адгэтуль...
ЛАЭРТ
Што адгэтуль, уладар?
КАРОЛЬ
Лаэрт, ці дарагі табе твой бацька?
Няўжо, як тое гора на малюнку,
Ты маеш твар, але не маеш сэрца?
ЛАЭРТ
Нашто вам гэта ведаць?
КАРОЛЬ
Не таму
Пытаюся, што бацькі ты не любіш,—
Ён дарагі табе. Але я знаю,
Паводле практыкі і назірання:
Пачуцці падпарадкаваны часу,
Не толькі іскры, нават і пажары
Ў яго прасторах гаснуць. У каханні
Ёсць гэтак жа свой кнот і свой нагар.
Нішто не застаецца раўнацэнным;
Каштоўнае, разбухшы цераз меру,
Нарэшце лопаецца. А таму
Рабіць патрэбна тое, што мы хочам,

Тады, калі мы хочам, бо ахвота
Мяняецца; ёй могуць перашкодзіць
Язык, рука, здарэнне,— і тады
«Патрэбна» можа стаць, як цяжкі ўздых,
Што з мукай аблягчае нашы грудзі.
Наступім на балячку. Гамлет тут.
Чым ты дакажаш, што ты бацькаў сын?

ЛАЭРТ

Яму ў царкве я перарэжу горла.

КАРОЛЬ

Царква не ёсць прытулак для забойцы,
І помсце меж няма. Але, мой дружа,
Каб гэта учыніць, сядзі лепш дома.
Як толькі Гамлет з'явіцца, адразу
Даведаецца ён, што ты вярнуўся;
Мы будзем выхваляць тваё майстэрства
І славу, што надаў табе француз,
Пакрыем новым глянцам; мы звядзём вас
І выставім заклады; бесклапотны,
Велікадушны, поўны шчырай веры,
Ён шпаг глядзець не стане, і ты лёгка,
Ці трошкі змахляваўшы можаш выбраць
Клінок без наканечніка, і спрытным,
Умела накіраваным ударам
Ты расквітаешся за бацьку.

ЛАЭРТ

Згодзен.
Пры гэтым я намажу свой клінок.
Вандроўны лекар мне прадаў атруты,
Такое моцнай, што, калі нажом,
Намочаным у ёй, дастаць крыві,
Усе прыпаркі, з усіх траў гаючых,
Якія ёсць пад месяцам, не здольны
Уратаваць ад смерці. Я натру
Канец маёй рапіры гэтым зеллем,
І калі я хоць чуць яго параню,
То ён памрэ.

КАРОЛЬ

Мы гэта абмяркуем,
Узважым час і сродкі ўсебакова;
Бо калі нам не ўдасца наша справа
І выкананне дрэннае нас выдасць,
То лепш не пачынаць. Дзеля таго
Патрэбна гэты план падмацаваць

Яшчэ адным, больш пэўным. Дай падумаць.
Мы урачыста б'ёмся аб заклад...
Знайшоў:
Калі ад рухаў горача вам стане
(А ты будзь паваротлівым, старайся)
І ён папросіць піць, то будзе намі
Падрыхтавана загадзя віно;
Абы ён кубак прылажыў да губ,
Хаця б ты й не ўкалоў яго,— гатова,
Канцы яму. Чакай, што там за шум?

Уваходзіць каралева.

А! — каралева наша.

КАРАЛЕВА

Была бяда, цяпер бяда другая:
Твая сястра ўтапілася, Лаэрт.

ЛАЭРТ

Утапілася! Дзе?

КАРАЛЕВА

Над рэчкаю расце вярба старая,
У люстра вод глядзіцца сівым лісцем;
Пад той вярбой яна пляла гірлянды,
Вянкі віла: касач, і крапіва,
І кураслеп, і доўгі цвет чырвоны,
Які у пастухоў завецца груба,
А ў сельскіх дзевак — пальцам мерцвяка;
Яна хацела пачапіць на голле
Набытак свой; нядобры сук зламаўся;
І разам з кветкамі яна упала
Ў рыдаючую плынь. Яе адзенне,
Раскінуўшыся, падняло яе;
Яна ўсплыла, як німфа, і спявала
Урыўкі песень...
Далёкая ад гора і адчаю,
Нібы ў сваёй стыхіі. Ды не доўга
Было ўсё гэта. Плацце стала цяжкім,
І апусцілася яна на дно,
З улоння музыкі у багну смерці.

ЛАЭРТ

Ўтапілася?

КАРАЛЕВА

Ўтапілася, няма.

ЛАЭРТ

Афелія, табе вады даволі,

І слёзы я стрымаю. Але ўсё ж
Прырода забірае верх, хоць воля
І супярэчыць. Выцекуць яны,
І выйдзе вон жаночы дух.— Бывайце.
Сказаў бы я вам словы агнявыя,
Калі б не гэты боль.

Выходзіць.

КАРОЛЬ

Хадзем, Гертруда.
Насілу я суняў, такі быў гнеў;
Баюся, каб ізноў не ашалеў.
Не трэба пакідаць яго. Хадзем.

Выходзяць.

АКТ ПЯТЫ

Сцэна першая

Могілкі.

Уваходзяць два блазны з рыдлёўкамі ды іншым.

ПЕРШЫ БЛАЗЕН

Ці ж можна хаваць па-хрысціянску таго, хто самаўпраўна шукае сабе збавення?

ДРУГІ БЛАЗЕН

Я табе кажу, што можна; капай хутчэй яму; было следства, і вырашылі хаваць яе па-хрысціянску.

ПЕРШЫ БЛАЗЕН

Як гэта так, раз яна ўтапілася не ў парадку самаабароны?

ДРУГІ БЛАЗЕН

А табе што? Такое рашэнне.

ПЕРШЫ БЛАЗЕН

Але ж трэба, каб нехта нападаў. У гэтым жа ўся штука. Бо калі я таплюся наўмысна,— гэта азначае дзею, а ўсякая дзея мае тры галіны, а іменна: дзею, учынак і выкананне; выходзіць, што яна ўтапілася з намерам.

ДРУГІ БЛАЗЕН

Не, ты паслухай лепш, далакоп.

ПЕРШЫ БЛАЗЕН

Адчаніся. Вось тут, напрыклад, вада; добра; а вось тут, напрыклад, чалавек. Калі чалавек ідзе да вады і топіцца, выходзіць, хоча ён таго ці не хоча, але ён ідзе; заўваж гэта; калі ж вада сама ідзе да яго, то не ён топіцца, а яго топяць. Значыцца, той, хто не вінаваты ў сваёй смерці, не ўкарочвае свайго веку.

ДРУГІ БЛАЗЕН

Такі закон?

ПЕРШЫ БЛАЗЕН

А то як жа; крымінальны закон.

ДРУГІ БЛАЗЕН

А хочаш, каб я сказаў табе праўду? Не будзь яна дваранкай, яе б не хавалі па-хрысціянску.

ПЕРШЫ БЛАЗЕН

Зразумела; крыўдзяць нас,— бо каторы вялікі пан, то яму на гэтым свеце і тапіцца і вешацца можна з выгодамі, не то што нашаму брату-хрысціяніну. Капанём, рыдлёвачка! Самыя даўнія дваране — садоўнікі, грабары і магільшчыкі; у іх Адамава прафесія.

ДРУГІ БЛАЗЕН

Хіба Адам быў дваранін?

ПЕРШЫ БЛАЗЕН

А то як жа; ён першы набыў сабе ўзбраенне.

ДРУГІ БЛАЗЕН

Няпраўда; у яго зброі не было.

ПЕРШЫ БЛАЗЕН

Ты што, у бога не верыш, ці што? Як ты разумееш свяшчэннае пісанне? У пісанні сказана: Адам капаў. Не голымі ж рукамі ён капаў? Ясна, што ён быў узброены — рыдлёўкай. Я задам табе другое пытанне, калі ты мне не адкажаш, то прызнайся, што ты...

ДРУГІ БЛАЗЕН

Задавай.

ПЕРШЫ БЛАЗЕН

Хто будуе мацней за муляра, карабельніка і цесляра?

ДРУГІ БЛАЗЕН

Шыбенічны майстар; яго будынак перажывае тысячу кватарантаў.

ПЕРШЫ БЛАЗЕН

Нядрэнна; шыбеніца — добра. Але каму добра? Таму, хто дрэнна робіць. А ты робіш дрэнна, сказаўшы, што

шыбеніца пабудавана мацней, чым царква; значыцца: шыбеніца табе ў самы раз. Пачынай спачатку, ну.

ДРУГІ БЛАЗЕН

Хто будуе мацней за муляра, карабельніка і цесляра?

ПЕРШЫ БЛАЗЕН

Так, адказвай і будзеш вольны.

ДРУГІ БЛАЗЕН

Дальбог, не ведаю.

ПЕРШЫ БЛАЗЕН

Ну?

ДРУГІ БЛАЗЕН

От, чорт, забыўся.

Уваходзяць Гамлет і Гарацыо, паводдаль.

ПЕРШЫ БЛАЗЕН

Не ламай дурное галавы. Колькі ты асла ні бі, усё роўна кроку не набавіць. А калі хто ў другі раз будзе ў цябе пытацца, адказвай — магільшчык; яго хаты стаяць да страшнага суда. Вось што, схадзі лепш да Ёгена, прынясі мне кварту гарэлкі.

Другі блазен выходзіць.

ПЕРШЫ БЛАЗЕН

(капае і пяе)

Любіўся я, кахаўся я,
Калі быў малады,
Быў дужы я, ух, сіла мая!
Не ведаў я бяды.

ГАМЛЕТ

Няўжо гэты чалавек не адчувае, што ён робіць? Капае магілу і пяе.

ГАРАЦЫО

Прывычка, прынц.

ГАМЛЕТ

Заўсёды так. Чым менш рука працуе, тым больш у яе чуласці.

ПЕРШЫ БЛАЗЕН

(спявае)

Але старасць-зладзейка прыйшла
І вытрасла сілу з мяне;
І шчасце мінула, як сон,
І я апынуўся ў труне.

(Выкідвае чэрап.)

ГАМЛЕТ

Калісьці ў гэтым чэрапе быў язык, і ён мог спяваць; а гэты мужык шпурнуў яго вобземлю, нібы сківіцу Каіна, першага забойцы. Быць можа, гэта галава належала якому-небудзь палітыку, які збіраўся перахітрыць самога госпада бога, а цяпер яе перахітрыў гэты асёл. Як ты думаеш?

ГАРАЦЫО

Магчыма, прынц.

ГАМЛЕТ

Альбо прыдворнаму, які любіў паўтараць: «Добрага рання, найяснейшы прынц! Як вы маецеся, даражэнькі прынц?..» Гэта мог быць пан такі-та, які хваліў каня пана такога-та, каб мець гэтага каня на сваёй стайні? Што, мо няпраўда?

ГАРАЦЫО

Праўда, прынц.

ГАМЛЕТ

Я ж кажу; а цяпер гэта — пані Гніль, абадраная, абшарпаная, і гэты далакоп стукае яе рыдлёўкаю па пустым чэрапе. Надзвычайна цікавы пераварот, каб толькі можна было падгледзець, як гэта робіцца. Няўжо гэтыя косці ствараліся толькі на тое, каб імі гуляць у бабкі? Мае ўласныя баляць, калі падумаю аб гэтым.

ПЕРШЫ БЛАЗЕН

(спявае)

Матыка, і рыдлёвачка,
І покрывачка ёсць:
Ах, выкапана ямачка,—
Лажыся, мілы госць!

(Выкідае другі чэрап.)

ГАМЛЕТ

Вось яшчэ адзін. Чаму яму не быць чэрапам якога-небудзь законніка? Дзе цяпер яго «можна так» і «можна гэтак», яго каверзы, яго прычапкі, яго ашуканства? Чаму ён дазваляе гэтаму грубіяну таўчы яго брудным жалезняком па патыліцы і не прыцягвае «вышэйпамянёнага» да судовай адказнасці за абразу дзеяннем? Гм! А можа, гэта быў які-небудзь прайдзісвет, што скупляў маёнткі, і былі ў яго закладныя, і канчатковыя, і падвойныя пасведчанні, і штрафы, і спагнанні. І вось, у канчатку ўсіх канчаткаў і ў спагнанне ўсіх спагнанняў, яго ўласніцкая галава напоўнена брудам. Няўжо ўсе яго пасведчанні, асабліва падвойныя, не маглі

даць яму больш зямлі, чым столькі, колькі можна прыкрыць параю зямельных актаў? Наўрад ці ўлезлі б усе яго паперы ў тую скрынку, у якую ён сам улез. Мала ж тады чалавеку зямлі дастаецца.

ГАРАЦЫО

Мала, прынц.

ГАМЛЕТ

Пергамент робіцца з авечае скуры?

ГАРАЦЫО

З авечае і з цялячае, прынц.

ГАМЛЕТ

Авечкі і цяляты тыя, што спадзяюцца на пергамент. Пагутару з гэтым мужыком.— Чыя гэта магіла, чалавеча?

ПЕРШЫ БЛАЗЕН

Мая, пане.

(Спявае.)

Ах, выкапана ямачка,—
Лажыся, мілы госць!

ГАМЛЕТ

Відаць, твая, раз ты ў ёй ляжыш.

ПЕРШЫ БЛАЗЕН

Вас сюды не палажылі, дык яна і не ваша; а я хоць і не ляжу ў ёй, але яна мая.

ГАМЛЕТ

Тады ты строіш дурня, кажучы, што яна твая. Гэта для мёртвых, а не для жывых. Ты проста строіш дурня.

ПЕРШЫ БЛАЗЕН

Выбачайце, мой дурань не просты, а падкідны; дазвольце перакінуць яго вам назад.

ГАМЛЕТ

Каму ты капаеш гэта?

ПЕРШЫ БЛАЗЕН

Нікому.

ГАМЛЕТ

Жанчыне?

ПЕРШЫ БЛАЗЕН

І не жанчыне.

ГАМЛЕТ

Хто будзе тут пахаваны?

ПЕРШЫ БЛАЗЕН

Тая, што была калісьці жанчынай; цяпер яна памерла, царства ёй нябеснае.

ГАМЛЕТ

Як правільна ён адказвае! Трэба гаварыць асцярожна, каб не збіў. Клянуся небам, Гарацыо, век цяпер такі востры, што селянін, дагнаўшы прыдворнага, наступае яму не толькі на мазоль, але і на язык.— Даўно ты працуеш магільшчыкам?

ПЕРШЫ БЛАЗЕН

З усіх дзён у годзе я пачаў якраз у той дзень, калі нябожчык кароль наш Гамлет адолеў Фарцінбраса.

ГАМЛЕТ

А даўно гэта было?

ПЕРШЫ БЛАЗЕН

Хіба не ведаеце? Кожны дурань гэта ведае. Гэта было ў той дзень, калі нарадзіўся малады Гамлет; той самы, што звар'яцеў і пасланы ў Англію.

ГАМЛЕТ

Ну, што ты скажаш! Чаго ж яго паслалі туды?

ПЕРШЫ БЛАЗЕН

Як чаго? Ён жа вар'ят. Там ён павінен паразумнець; а калі не, то ў Англіі гэта не бяда.

ГАМЛЕТ

Чаму?

ПЕРШЫ БЛАЗЕН

Там гэтага не заўважаць; там усе такія ж вар'яты.

ГАМЛЕТ

Як жа ён звар'яцеў?

ПЕРШЫ БЛАЗЕН

Кажуць, вельмі дзіўна.

ГАМЛЕТ

Як жа дзіўна?

ПЕРШЫ БЛАЗЕН

Ды так, што розум страціў.

ГАМЛЕТ.

На якой глебе?

ПЕРШЫ БЛАЗЕН

На дацкай, пане; вось ужо трыццаць год, як я тут сторажам на цвінтары.

ГАМЛЕТ

Ці доўга можа праляжаць чалавек у зямлі, не згніўшы?

ПЕРШЫ БЛАЗЕН

Гледзячы які: той, што не згніў пры жыцці (цяпер гэта рэдка бывае — не паспееш пахаваць, як ужо гной

свішча),— той пратрымаецца так гадоў восем альбо дзевяць; гарбар — дзесяць гадоў.

ГАМЛЕТ

А чаму ён даўжэй?

ПЕРШЫ БЛАЗЕН

Бо яго праца такая; цэлы век скуру скрабе, чысціць, квасіць, сушыць, дык і сам робіцца як падэшва; яго труп вады не прапускае, а каторы труп прапускае ваду, той хутка разлазіцца. Вось яшчэ чэрап. Гэты чэрап праляжаў у зямлі дваццаць тры гады.

ГАМЛЕТ

Чый гэта?

ПЕРШЫ БЛАЗЕН

Вар'ята аднаго шалёнага; як вы думаеце, чый?

ГАМЛЕТ

Не ведаю.

ПЕРШЫ БЛАЗЕН

Каб на яго чорная немач, на паскудніка гэтага кручанага! Ён мне некалі выліў на галаву бутэлькі рэйнвейну. Гэта чэрап Йорыка, каралеўскага блазна.

ГАМЛЕТ

Гэты?

ПЕРШЫ БЛАЗЕН

Гэты самы.

ГАМЛЕТ

Пакажы мне. *(Бярэ чэрап.)* Бедны Йорык! Я ведаў яго, Гарацыо; гэта быў чалавек вельмі вясёлы, з невычэрпнай фантазіяй, тысячу разоў ён насіў мяне на сабе; а цяпер — як агідна мне глядзець на гэта! Мяне нудзіць, мне робіцца млосна. Тут былі вусны, якія я цалаваў так часта. Дзе цяпер твае тонкія кпіны? Твае скокі? Твае песні? Дзе выбухі іскрыстых жартаў, ад якіх рагатаў увесь стол? Няма ніводнага, каб паздзекавацца з тваіх уласных выскаленых зубоў. Адвісла сківіца. Зайдзі цяпер у спальню да якой-небудзь дамы і скажы ёй: няхай яна наложыць фарбы на цэлы палец, усё роўна нарэшце будзе такою ж; пасмяшы яе гэтым.— Калі ласка, Гарацыо, скажы мне...

ГАРАЦЫО

Што, мой прынц?

ГАМЛЕТ

Як ты думаеш, Аляксандр у зямлі ляжаў такі самы?

ГАРАЦЫО

Такі самы.

ГАМЛЕТ

І гэтак жа пахнуў? Фэ!

Кідае чэрап.

ГАРАЦЫО

Гэтак жа, прынц.

ГАМЛЕТ

Да якое нікчэмнасці мы можам апусціцца, Гарацыо! Чаму б уяўленню не прасачыць прах Аляксандра да таго моманту, калі ім замажуць дзірку ў бочцы?

ГАРАЦЫО

Разглядаць з'явы так, гэта азначала б разглядаць іх занадта падрабязна.

ГАМЛЕТ

О, не; да гэтага можна дайсці зусім проста, кіруючыся прынцыпам праўдападобнасці. Напрыклад: Аляксандр памёр, Аляксандра пахавалі, Аляксандр спарахнеў; прах — зямля, у зямлі здабываюць гліну. Чаму ж тады глінаю, у якую ператварыўся прах Аляксандра, нельга замазаць піўную бочку?

Магутны Цэзар згніў у гліне вязкай
І стаў звычайнаю для сцен замазкай;
Матэрыя, што пагражала свету,
Бароніць нас ад холаду і ветру.
Цішэй! Увага! Вунь ідзе кароль.

Уваходзяць свяшчэннікі ды іншыя, працэсіяй; нясуць цела Афеліі; за імі — Лаэрт, кароль, каралева і некалькі прыдворных.

З ім каралева, двор. Каго нясуць?
І так убога? Як відаць, хаваюць
Таго, хто сам сябе жыцця пазбавіў
Рукою роспачнаю. Нехта знатны.
Адыдзем, паглядзім.

Адыходзіць з Гарацыо.

ЛАЭРТ

Які яшчэ абрад?

ГАМЛЕТ

Тут і Лаэрт, юнак высакародны;
Глядзі, глядзі!

ЛАЭРТ

Які яшчэ абрад?

СВЯШЧЭННІК

Хаўтурны чын працягнуты і так,
Наколькі можна; скон яе няпэўны:
Каб не парушан быў царкоўны статут
Загадам найвышэйшым, то яна
Ляжала б у зямлі неасвячонай
Да страшнага суда; замест малітвы
Ёй кідалі б чарэп'е і каменне;
А мы далі ёй провады і звон,
На ёй вянкі дзявочыя і кветкі.

ЛАЭРТ

Усё, нічога больш?

СВЯШЧЭННІК

Нічога больш.
Мы б апаганілі святую службу,
Каб рэквіем над ёю праспявалі,
Як над душой, што ў міры адышла.

ЛАЭРТ

Бярыце дамавіну, апускайце,—
Няхай жа з хараства і чыстаты
Фіялкі ўзыдуць! — Знай, бяздушны поп,
Мая сястра сярод анёлаў будзе,
Калі ты ўзвыеш у смале.

ГАМЛЕТ

Афелія!..

КАРАЛЕВА

(кідаючы кветкі)

Прыгожыя — прыгожай. Выбачай!
Я думала назваць цябе нявесткай,
Твой шлюбны ложак кветкамі убраць,
А не труну тваю, маё дзіцятка.

ЛАЭРТ

О, трыццаць бед трохкратных на таго,
Хто адабраў твой розум малады
Учынкам злосніцкім! — Зямлі не рушце,
Хачу ў апошні раз яе абняць.
(Саскоквае ў магілу.)
Цяпер завальвайце жывога з мёртвай.
Жвір, жвір у вочы! Насыпайце насып
Вышэй за Пеліён і за Алімп
Да самых да нябёс.

ГАМЛЕТ

(выходзячы наперад)

Чый гэта сум
Так пышна выяўляецца? Хто той,
Што заклікае зоры ў буйным смутку
І прымушае іх нямець ад дзіва?
Я — Гамлет, дацкі прынц.

(Саскоквае ў магілу.)

ЛАЭРТ

Няхай цябе
Ухопіць д'ябал!

(Кідаецца да яго біцца.)

ГАМЛЕТ

Дрэнная малітва.
Будзь ласкаў, не душы мяне за горла:
Я стрыманы, я ціхі, але ўсё ж
Ёсць нешта небяспечнае ва мне,
Чаго табе лепш сцерагчыся. Прэч!
Прэч рукі!

КАРОЛЬ

Разніміце.

КАРАЛЕВА

Гамлет, Гамлет!

УСЕ

Панове...

ГАРАЦЫО

Супакойцеся, мой прынц.

Прыдворныя іх разнімаюць,
і яны выходзяць з магілы.

ГАМЛЕТ

О, я за гэта буду біцца з ім
Насмерць.

КАРАЛЕВА

За што, сынок?

ГАМЛЕТ

Ды я ж любіў
Афелію, любіў; і сорак тысяч
Братоў з усім сваім каханнем братнім
Са мною не зраўняцца.— Скажы мне,
Што ты гатоў зрабіць дзеля яе?

КАРОЛЬ

Лаэрт, не слухай,— ён вар'ят.

КАРАЛЕВА

Пабойся бога, пашкадуй яго.

ГАМЛЕТ

Што ты гатоў зрабіць?
Рваць валасы? Пасціцца? Біцца? Плакаць?
Ніл выпіць? Кракадзіла праглынуць?
І я таксама. Ты прыйшоў тут енчыць?
Ты мне на злосць ускочыў у магілу?
Хацеў, каб пахавалі з ёю разам?
І я таксама. Ты тут горы кідаў?
Няхай жа мільёны дзесяцін
На нас узваляць, каб курган высокі
Апёк свой лоб у зоне агнявой,
З прышчом зраўняўшы Оссу! Ты хваліўся,—
І я магу не горш.

КАРАЛЕВА

Ён непрытомны;
Але прыпадак гэты хутка пройдзе,
І стане ціхі ён, як галубіца
Над залатымі дзеткамі ў гняздзе.

ГАМЛЕТ

Скажыце,
За што вы абражаеце мяне?
Я меў да вас любоў. Але ўсё роўна,
Што б ні рабіў на свеце Геркулес,
Кот мяўкае, а воўк глядзіць у лес.

Выходзіць.

КАРОЛЬ

Гарацыо, прашу, сачы за ім.

Г а р а ц ы о выходзіць.

(Лаэрту.)
А ты не забывай умовы нашай.
Мы справе зараз жа дадзім штуршок.—
Гертруда, учыні нагляд за сынам.—
Мы тут паставім манумент жывы:
Тады супакаенне будзем мець,
А покуль што — прыходзіцца цярпець.

Выходзяць.

Сцэна другая

Зала ў замку.

Уваходзяць Гамлет і Гарацыо.

ГАМЛЕТ

Пра гэта досыць; слухай жа далей.
Ці помніш ты апошнія падзеі?

ГАРАЦЫО

Мой прынц, я помню ўсё.

ГАМЛЕТ

У маёй душы
Ішло змаганне нейкае, і сон
Мяне не браў; ляжаць было мне мулка,
Горш, чым якому арыштанту. Раптам —
Няхай жыве раптоўнасць! — Ведай, дружа:
Часамі рызыка ратуе нас
І не ўдаецца план. Адгэтуль вывад:
Ёсць нехта, хто канчае нашы справы
Па-свойму, не зважаючы на нас.

ГАРАЦЫО

Напэўна.

ГАМЛЕТ

Апрануўшыся наспех,
З каюты выйшаў я. Ноч. Цемната.
Шукаю гэтых двух. Знаходжу. Спяць.
Схапіў пакет і да сябе ў каюту.
Ад страху забываецца прыстойнасць;
Я дзёрзка ўскрыў пасланне караля.
Што ж там было, Гарацыо! О подласць!
Там быў загад, нашпігаваны густа
Траскучай балбатнёю аб дабры
Англійскае і дацкае дзяржавы,
І ў ім — о, слухай! — столькі начапляна
Чарцей і д'яблаў на маё жыццё,
Што безадкладна, у адну мінуту,
Не навастрыўшы нават тапара,
Мне б галаву адсеклі.

ГАРАЦЫО

Быць не можа!

ГАМЛЕТ

Вось гэтае пасланне; прачытай
У вольны час. Сказаць табе цяпер,
Што я зрабіў?

ГАРАЦЫО

Цікава; раскажыце.

ГАМЛЕТ

Аблытаны навокал ліхадзействам,
Мой розум не прыдумаў і пралога,
Як распачаў ігру. Я сеў за стол,
Склаў новы ліст, перапісаў прыгожа;
Я некалі, як нашыя міністры,
Лічыў за сорам мець прыгожы почырк,
Стараўся развучыцца; але тут
Маё уменне на карысць пайшло.
Ты хочаш ведаць, што я напісаў?

ГАРАЦЫО

Хачу, мой прынц.

ГАМЛЕТ

Ад караля сур'ёзнейшая просьба,—
Паколькі Англія ягоны даннік,
Паколькі паміж іх квітнець павінна
Любоў падобна пальме, гэтаксама,
Паколькі мір пшанічнаю гірляндай
Вісіць над імі, як злучок сяброўства,—
І шмат яшчэ «паколькі» і «злучкоў»,—
Па атрыманні гэтага паслання,
Без разважанняў, доўгіх ці кароткіх,
Падацеляў схапіць, звязаць і знішчыць,
Не даўшы памаліцца.

ГАРАЦЫО

А пячаць?

ГАМЛЕТ

І ў гэтым мне дапамагала неба.
Я пры сабе меў бацькаву пячатку.
Мадэль сучаснай дацкае пячаці.
Згарнуўшы ўсё так, як было раней,
Я падпісаўся, прылажыў пячаць
І не прыкметна ім падкінуў ліст.
Назаўтра быў на моры бой; далей
Ты ведаеш.

ГАРАЦЫО

Дык Гільдэнстэрн і Разенкранц плывуць?

ГАМЛЕТ

Няхай плывуць, ім гэта даспадобы.
Сумленне не гняце мяне. Іх смерць
Ёсць вынік умяшання. Небяспечна
Істотам нізкадушным поўзаць там,

Дзе скрыжаваны коп'і і мячы
Магутных ворагаў.

ГАРАЦЫО

Вось дык кароль!

ГАМЛЕТ

Скажы, ці ж не павінен я паўстаць
Супроць таго, хто атруціў мне бацьку,
Зняславіў маці мне, убіўся клінам
Паміж абраннем і маёй надзеяй,
Жыццё маё на вудачку лавіў
З такою хітрасцю? Ці ж я не ў праве
З ім расквітацца гэтаю рукой?
Ці ж не праклятым буду я навек,
Калі дазволю чарвяку ліхому
Прыроду нашу грызці?

ГАРАЦЫО

Мабыць, хутка
Ён атрымае весткі аб падзеях,
Што адбыліся ў Англіі.

ГАМЛЕТ

Напэўна;
Але пакуль што перапынак мой;
Жыццё людское — скарацечны міг.
Шкада, шкада мне вельмі, друг Гарацыо,
Што я з Лаэртам груба абышоўся,—
Мой лёс і лёс яго зусім падобны.
Хачу мірыцца з ім; але, павер,
Ён так крычаў, так задаваўся горам,
Што я не мог стрымацца.

ГАРАЦЫО

Ціха; хто там?

Уваходзіць Озрык.

ОЗРЫК

Дазвольце, прынц, павіншаваць вас з прыездам.

ГАМЛЕТ

Дзякую, пане. *(Ціха Гарацыо.)* Ты ведаеш гэтага матыля?

ГАРАЦЫО

(ціха Гамлету)
Не, мой прынц.

ГАМЛЕТ

(ціха Гарацыо)
Тваё шчасце. Той, хто яго ведае,— няшчасны. Гэта

абшарнік. Зямлі ў яго многа, поле яго родзіць; а калі скаціна пануе над быдлам, то яе жолаб будзе заўсёды пры каралеўскім стале. Гэта шпак, але, як я ўжо сказаў, прасторна абложаны брудам.

ОЗРЫК

Святлейшы прынц, калі ваша высокасць мае вольны час, то я меў бы нешта сказаць вашай высокасці ад імя яго вялікасці.

ГАМЛЕТ

Я вас уважна слухаю. Зрабіце з вашым капелюшом тое, для чаго ён прызначаны: надзеньце яго на галаву.

ОЗРЫК

Удзячны вашай высокасці; вельмі горача.

ГАМЛЕТ

Што вы? Паверце мне, вельмі холадна: вецер з поўначы.

ОЗРЫК

А яно такі халаднавата, мой прынц.

ГАМЛЕТ

Наадварот, па-мойму, вельмі горача; мне проста душна пры маёй камплекцыі.

ОЗРЫК

Надзвычайна, мой прынц. Так душна, так душна, як... я не магу вам выказаць. Ваша высокасць, яго вялікасць запрапанавалі мне давесці да ведама вашай высокасці, што яны пайшлі на вялікі заклад адносна вас; справа ў тым...

ГАМЛЕТ

Калі ласка, не забывайце.

(Прымушае яго надзець капялюш.)

ОЗРЫК

Мой добры прынц, слова гонару, мне так лепей, слова гонару. Ваша высокасць, нядаўна пры двары з'явіўся Лаэрт. Паверце мне, гэта дасканалейшы дваранін, поўны самых выдатных асаблівасцей, выключна далікатнага абыходжання і вялікай імпазантнасці. Калі гаварыць аб ім з належнай чуласцю, то гэта каляндар і карта прыстойнасці, бо вы ў ім знойдзеце злучэнне тых якасцей, якія жадаў бы мець кожны дваранін.

ГАМЛЕТ

Акрэслены вамі вобраз не пацярпеў ніякіх страт з вашага боку. Хаця я ведаю, што пералічэнне ўсіх яго ўласцівасцей можа натрудзіць арыфметыку памяці і ўсё ж застацца адсталым у параўнанні з яго

імпэтам па шляху дасканаласці; аднак у мэтах праўдзівага праслаўлення дзіўлюся яму, як істоце вялікіх артыкулаў годнасці. Перад намі футарал такіх неацэнных дыяментаў і крышталяў духу, што яму падобным можа быць толькі яго ўласнае адлюстраванне; той жа, хто ў захапленні кінецца наследаваць яму, будзе яго ценем, не болей.

ОЗРЫК

Ваша высокасць, вы атэстуеце яго беспамылкова.

ГАМЛЕТ

Але якое ён мае да нас дачыненне? Навошта мы абдаём яго высокае імя нашым грубым дыханнем?

ОЗРЫК

Прынц?

ГАРАЦЫО

Мабыць, вы разумееце толькі тое, што вы самі гаворыце. У вас пытаюцца?

ГАМЛЕТ

Навошта вы яго ўспомнілі!

ОЗРЫК

Лаэрта?

ГАРАЦЫО

(ціха Гамлету)

Яго кашалёк парожні. Чырвонцы сваіх слоў ён растраціў.

ГАМЛЕТ.

Так, Лаэрта.

ОЗРЫК

Мне вядома тое, што вы ведаеце...

ГАМЛЕТ

Рад за вас; але калі вам вядома тое, што я ведаю, то мне невялікі гонар. Прашу далей.

ОЗРЫК

...Што вы ведаеце здольнасці Лаэрта.

ГАМЛЕТ

Не адважуся гэта сцвярджаць, каб не зраўняцца з ім у здольнасцях; ведаць добра чалавека — гэта значыць ведаць самога сябе.

ОЗРЫК

Я маю на ўвазе яго здольнасці па часці зброі; паводле агульнага прызнання, у гэтым ён найвыдатнейшы мастак.

ГАМЛЕТ

Якая яго зброя?

ОЗРЫК

Рапіра і кінжал.

ГАМЛЕТ

Дзве зброі; прымем пад увагу. Ну і што ж?

ОЗРЫК

Кароль, ваша высокасць, залажыўся з ім на шэсць берберыйскіх коней, супроць якіх ён паставіў, як я дачуўся, шэсць французскіх рапір і шпаг з усімі іхнімі прыладамі, гэта значыць з паясамі, рамянямі ды іншым; сярод якіх ёсць трое набедраў самых адмысловых форм, вельмі адпавядаюць рукаяцям,— надзвычайна зграбныя набедры,— тонкага густу і добрай выдумкі.

ГАМЛЕТ

Што вы называеце набедрамі?

ГАРАЦЫО

(ціха Гамлету)

Я так і думаў, што тут без каментарыяў не абыдзецца.

ОЗРЫК

Набедры, прынц, гэта партупеі.

ГАМЛЕТ

Ваша слова было б болей дарэчы, каб мы цягалі на сабе гармату; а пакуль што няхай будуць партупеі. Такім чынам: шэсць берберыйскіх коней супроць шасці французскіх шпаг з прыналежнасцямі і трох адмысловай формы набедраў; дацкі заклад супроць французскага. Дзеля чаго ж гэта ўсё «пастаўлена», як вы толькі што вельмі трапна сказалі?

ОЗРЫК

Кароль, мой прынц, паспрачаўся, мой прынц, што пры дваццаці сутычках ён вас не абгоніць больш як на тры ўдары. Лаэрт жа закладаецца на дзевяць, і можна зрабіць зараз жа спробу, калі ваша высокасць явіць добрую волю і скажа: так.

ГАМЛЕТ

А калі я яўлю дрэнную волю і скажу: не?

ОЗРЫК

Я хачу сказаць, калі ваша высокасць дасць згоду на паядынак.

ГАМЛЕТ

Я буду хадзіць па гэтай зале. Калі яго вялікасць жадае, цяпер якраз мой адпачынак. Няхай прынясуць рапіры. Калі ёсць згода Лаэрта і кароль не адмяніў свайго намеру, то я паспрабую выйграць для яго заклад, а калі не, то будзе сорамна вачам маім і накладна бакам маім.

ОЗРЫК

Загадаеце так і перадаць?

ГАМЛЕТ

У такім сэнсе, пане, з акрасамі ў вашым гусце.

ОЗРЫК

Даручаю сябе міласці вашай высокасці.

ГАМЛЕТ

Цалкам ваш, цалкам ваш.

Озрык выходзіць.

Добра, што ён сам сябе даручае, другі б язык за яго не павярнуўся.

ГАРАЦЫО

Пабегла кнігаўка з яечкам на макаўцы.

ГАМЛЕТ

Ён, мабыць, і за матчыны грудзі не браўся без камплімента ў. Такія людзі, як ён (а іх ёсць многа — пестуноў нашай засмечанай эпохі), коўзаюцца па паверхні сучаснасці, засвойваючы толькі моду і знадворныя прыёмы абыходжання, нейкую пеністую сумесь, з якою яны плаваюць у лужыне нікчэмных і вымучаных думак. Дзьмухні на праверку, і бурбалкі палопаюцца.

Уваходзіць вяльможа.

ВЯЛЬМОЖА

Прынц, яго вялікасць вітаў вас праз маладога Озрыка, які далажыў, што вы чакаеце яго тут у зале. І выслаў ён дазнацца, ці воля ваша будзе зараз жа спаборнічаць з Лаэртам, ці вы жадаеце мець адтэрмінаванне?

ГАМЛЕТ

Я нязменны ў сваіх рашэннях; яны супадаюць з воляю караля. Калі ён хоча, то я гатоў. Цяпер альбо пасля, мне ўсё роўна, абы я быў у настроі, як цяпер.

ВЯЛЬМОЖА

Кароль, каралева і ўсе ідуць сюды.

ГАМЛЕТ

У добры час.

ВЯЛЬМОЖА

Каралева жадае, каб вы перад пачаткам паядынку як найлепш абышліся з Лаэртам.

ГАМЛЕТ

Жаданне добрае.

Вяльможа выходзіць.

ГАРАЦЫО

Вы прайграеце заклад, мой прынц.

ГАМЛЕТ

Не думаю; з таго часу, як ён паехаў у Францыю, я не пераставаў практыкавацца і налаўчыўся. Калі я буду мець ачкі наперад, я выйграю. Але, каб ты знаў, як мне сумна, як цяжка на сэрцы; але гэта ўсё роўна.

ГАРАЦЫО

Не, дарагі мой прынц...

ГАМЛЕТ

Я ведаю, што гэта глупства. У мяне нейкае як бы прадчуванне; жанчыне — той бы стала страшна.

ГАРАЦЫО

Калі ваш дух ухіляецца, не пачынайце. Я папярэджу іх, я скажу, што вы не ў настроі.

ГАМЛЕТ

Не трэба. Што нам прадчуванні! І ў гібелі вераб'я відна рука лёсу. Адбудзецца цяпер, не адбудзецца пасля; не адбудзецца пасля, адбудзецца цяпер; не адбудзецца цяпер — усё роўна калі-небудзь адбудзецца. Быць напагатове — вось і ўсё. Раз ні адзін чалавек не ведае, з чым ён разлучаецца, ці ж не ўсё роўна калі ён разлучыцца рана? Хай жа адбудзецца!

Уваходзяць кароль, каралева, Лаэрт і вяльможы, Озрык ды іншыя прыдворныя з рапірамі і рукавіцамі; стол, на ім гладышы з віном.

КАРОЛЬ

Прымі ад нас руку Лаэрта, Гамлет.

Кароль кладзе руку Лаэрта ў руку Гамлета.

ГАМЛЕТ

Прабач, Лаэрт, цябе пакрыўдзіў я;
Ты мне прабач, як дваранін і рыцар.
Вядома ўсім прысутным, ды і ты
Напэўна чуў, як цяжка пакарала
Мяне хвароба.
Учынак мой, які абразіў груба
Тваю прыроду, гонар і пачуцці,
Я ў гэтым прызнаюся, быў вар'яцтвам.
Каб Гамлет крыўдзіў друга? Не, ніколі.
Лаэрта Гамлет не хацеў пакрыўдзіць.

Калі, разлучаны з сабою, Гамлет
Лаэрта нечакана крыўдзіць,— гэта
Не Гамлет робіць; Гамлет адмаўляе.
А хто? Яго вар'яцтва. Калі так,
Сам Гамлет з ліку тых, хто быў пакрыўджан,—
Вар'яцтвам быў пакрыўджан бедны Гамлет.
І тут, перад высокай грамадою,
Адмовіўшы наўмыснае злачынства,
Я гавару: прабач велікадушна
За тое, што, стралу пусціўшы ў доме,
Параніў брата.

ЛАЭРТ

Злосці я не маю,
Адбушавала помста у душы.
Я — чалавек. Але мой гонар вольны;
Не прымірыўся, пакуль хто старэйшы,
Спрактыкаваны у пытаннях чэсці,
Нас не рассудзіць і не скажа — мір,
Каб я быў чысты. Да тае пары
Любоў я вашу як любоў прымаю
І не пакрыўджу вас.

ГАМЛЕТ

Я цалкам згодзен
І буду біцца ў братнім паядынку.
Падайце нам рапіры.

ЛАЭРТ

Мне адну.

ГАМЛЕТ

Табе маё няўменне будзе грунтам.
Як зорка на пустынным фоне ночы,
Лаэртава майстэрства заблішчыць.

ЛАЭРТ

Насмешка, прынц?

ГАМЛЕТ

О не, рукой клянуся.

КАРОЛЬ

Падай рапіры, Озрык. Любы Гамлет,
Табе заклад вядомы?

ГАМЛЕТ

Так, вядомы;
Ваш, уладар, на старане слабейшай.

КАРОЛЬ

Я не баюся, бачыў вас абодвух,
Ён мо спрытнейшы, але ў нас ачкі.

ЛАЭРТ
Не, гэта цяжкая; другую дайце.
ГАМЛЕТ
Мне да рукі; якраз. А даўжыня
У іх адна?
ОЗРЫК
Аднолькавыя, прынц.

Рыхтуюцца да паядынку.

КАРОЛЬ
Віно на стол пастаўце. Калі Гамлет
Яго кране адзін раз і другі
Альбо на трэцім разе адаб'ецца,
Давайце гучны залп з усіх гармат;
Кароль за Гамлета падыме кубак
І кіне ў кубак неацэнны жэмчуг,
Каштоўнейшы, чым той, які насілі
Чатыры дацкіх каралі. Віна!
І хай літаўры знак даюць фанфарам,
Фанфары канваірам на байніцах
І гром з зямлі уторыць грому з неба,
Што п'е за Гамлета кароль. Пачніце.
А вы уважна прымячайце, суддзі.
ГАМЛЕТ
Пачнём.
ЛАЭРТ
Пачнём, мой прынц.

Б'юцца.

ГАМЛЕТ
Раз.
ЛАЭРТ
Не.
ГАМЛЕТ
На суд.
ОЗРЫК
Удар, удар выразны.
ЛАЭРТ
Добра,— зноў.
КАРОЛЬ
Чакайце, вып'ем. Гамлет, жэмчуг — твой.
Здаровы будзь!

Трубныя гукі і стрэлы з гармат за сцэнай.

Нясіце кубак прынцу.

ГАМЛЕТ
Пастаўце. Потым. Трэба перш закончыць.
Пачнём.

Б'юцца.

Ізноў удар. Што, мо няпраўда?
ЛАЭРТ
Так, так, крануты; прызнаю.
КАРОЛЬ
Наш сын напэўна выйграе.
КАРАЛЕВА
Ён цяжкі
І задыхаецца.— Хадзі сюды,
Вось хустачка,— утрыся, Гамлет. П'е
За поспех сына каралева.
ГАМЛЕТ
Дзякуй.
КАРОЛЬ
Не пі, Гертруда!
КАРАЛЕВА
Выбачай, мой друг.
Я вып'ю.
КАРОЛЬ
(убок)
У келіху атрута. Позна, позна.
ГАМЛЕТ
Цяпер яшчэ не буду піць, пасля.
КАРАЛЕВА
Хадзі сюды, я абатру твой лоб.
ЛАЭРТ
А зараз я крану яго.
КАРОЛЬ
Наўрад.
ЛАЭРТ
(убок)
Нядобра на душы, сумленне мучыць.
ГАМЛЕТ
Давай у трэці раз, Лаэрт; без жартаў;
Будзь ласкаў, выпадай з усёю сілай,
Не трэба шкадаваць мяне, не трэба.
ЛАЭРТ
Вы так гаворыце? Пачнём.

Б'юцца.

ОЗРЫК
Абодва ўнічыю.
ЛАЭРТ
Гэй, сцеражыся!

Лаэрт раніць Гамлета; пасля,
у разгары бою, яны мяняюцца рапірамі,
і Гамлет раніць Лаэрта.

КАРОЛЬ
Яны забыліся. Разняць.
ГАМЛЕТ
О не,
Давай яшчэ.

Каралева падае.

ОЗРЫК
Ой, гляньце,— каралева!
ГАРАЦЫО
Яны ў крыві. Што з вамі, любы прынц?
ОЗРЫК
Лаэрт, і вы, што гэта значыць?
ЛАЭРТ
Озрык,
Улез кулік сам у сваё сіло.
Я паміраю за маю нявернасць.
ГАМЛЕТ
Што з каралевай?
КАРОЛЬ
Яна самлела, гледзячы на кроў.
КАРАЛЕВА
Не, не, пітво, пітво.— Сынок мой родны,
Мяне атрутай напаілі... О!
(Памірае.)
ГАМЛЕТ
Злачынства! Гэй! Замкніце дзверы! Здрада!
Шукайце, дзе яна!

Лаэрт падае.

ЛАЭРТ
Яна тут, Гамлет. Гамлет, ты забіты,
Ніхто нічым не вылечыць цябе,
І паўгадзіны ты не пражывеш;
Мая рапіра у тваёй руцэ,
Атручаная, вострая; за грэх

За свой я заплаціў; глядзі,
Вось я ляжу і больш не ўстану; маці
Твая не ўстане больш; я не магу...
Кароль... кароль падстроіў.

ГАМЛЕТ

А! І тут?
Дык давяршай, атручанае джала!
(Коле караля.)

УСЕ

Здрада! Здрада!

КАРОЛЬ

Я толькі ранены. Сябры, ратуйце!

ГАМЛЕТ

Дык вось табе,
Забойца, блудадзей, кароль праклятый!
Пітво тваё! І жэмчуг твой! Напіся!
Ідзі за маткай.

Кароль памірае.

ЛАЭРТ

Кара па заслугах;
Ён сам складаў атруту. Чэсны Гамлет,
Даруй жа мне, як я табе дарую.
Хай кроў мая і бацькава не пляміць
Тваёй душы, як і маёй — твая.
(Памірае.)

ГАМЛЕТ

Няхай табе прабачыць неба. Следам
Іду і я. Гарацыо, я гіну.—
Бывай, няшчасная царыца! — Вы,
Збялелыя і ўзрушаныя сведкі
Падзей трагічных, о, каб меў я час
(Бязлітасная смерць хапае хутка),
Я расказаў бы вам. Але ўсё роўна,—
Гарацыо, я гіну, ты жывеш.
Дык раскажы ўсю праўду пра мяне
Тым, хто не ведае.

ГАРАЦЫО

Ніколі;
Я рымлянін душой, а не датчанін;
Яшчэ не ўсё дапіта.

ГАМЛЕТ

Мужным будзь,
Дай кубак мне; пусці; я так хачу.

О друг, якая раненая слава,
Калі ты змоўчыш, ляжа на мяне!
Калі мяне любіў ты, ухіліся
Часова ад збавення, пагаруй
На свеце жорсткім, каб вядомай стала
Мая гісторыя.
Далёкі марш і стрэлы за сцяной.
Што там за стрэлы?

ОЗРЫК

Прынц Фарцінбрас нарвежскі з перамогай
Вярнуўся з Польшчы, аддае салют
Англійскаму пасольству.

ГАМЛЕТ

Гарацыо, я паміраю.
Магутная атрута цісне дух.
Не прыйдзецца мне чуць навін англійскіх,
Але кажу наперад,— каралём
Абраны будзе Фарцінбрас. Яму —
Перадсмяротны голас мой. Скажы
Яму аб гэтым; выяві прычыны
Усіх здарэнняў. Цішыня — канец.
(Памірае.)

ГАРАЦЫО

Пагас вялікі сэрцам. Спі, мой прынц,
Адпачывай сярод мелодый райскіх.
Хто там ідзе пад барабан?

Марш за сцэнай.
Уваходзяць Фарцінбрас і англійскія паслы, з барабанным боем, са сцягамі і з дружынай.

ФАРЦІНБРАС

Дзе гэтае відовішча?

ГАРАЦЫО

Чаго
Шукаюць вочы вашы? Калі дзіва,
Тугі і болю, стойце,— вы знайшлі.

ФАРЦІНБРАС

Якая жудасная бойня! Смерць,
Што за банкет у сутарэнні вечным
Спраўляеш, гордая, пасекшы столькі
Князёў зямлі?

ПЕРШЫ ПАСОЛ

О, страшная карціна!
Спазнілася англійскае пасольства;
Нас не пачуе той, каму прыйшлі мы

Паведаміць, што выканан загад,
Што Разенкранц і Гільдэнстэрн — забіты.
Хто выкажа падзяку нам?

ГАРАЦЫО

Не ён,
Хоць бы і мог ён дзякаваць; ніколі
Ён не загадваў пакараць іх смерцю.
Але паколькі на крывавы суд
Вам з Англіі, вам з Польшчы давялося
Якраз паспець, хай на памост высокі
Нябожчыкаў паложаць на віду;
Я раскажу усім, хто хоча ведаць,
Як гэта адбылося; гэта будзе
Аповесць аб забойчых, зверскіх справах,
Аб помстах, гвалтах, хітрасцях, аб тым,
Як абваліўся гмах нялюдскай здрады
На тых, хто збудаваў яго. Хай праўда
Аб'явіцца.

ФАРЦІНБРАС

Паслухаем; сабраць
На сход усіх магнатаў. Засмучоны,
Я сустракаю свой шчаслівы лёс;
Я маю права на дзяржаву гэту,
Аб чым і абвяшчаю ўсенародна.

ГАРАЦЫО

Мне і аб гэтым прыйдзецца сказаць
Таксама; ад імя таго, чый голас
Прывабіць многіх. Злосць бушуе ў людзях;
Прыступім зараз жа, каб не было
Памылак, змоў і новае бяды.

ФАРЦІНБРАС

Хай Гамлета выносяць на памост,
Як змагара, чатыры капітаны;
Напэўна, калі б ён быў каралём,
Ён даў бы прыклады вялікіх спраў;
Хай музыка і воінскі абрад
Яго суправаджаюць урачыста.
Бярыце трупы, тут не месца ім,
Лепш паміраць на полі баявым.
Загадваю страляць.

Жалобны марш.
Выходзяць, выносячы нябожчыкаў,
пасля чаго даецца залп з гармат.

КАРОЛЬ ЛІР

Пераклаў
Юрка
Гаўрук

АСОБЫ

ЛІР	*кароль Брытаніі*
КАРОЛЬ ФРАНЦУЗСКІ	
ГЕРЦАГ БУРГУНДСКІ	
ГЕРЦАГ КОРНУАЛ	
ГЕРЦАГ АЛЬБАНІ	
ГРАФ КЕНТ	
ГРАФ ГЛОСТЭР	
ЭДГАР	*сын Глостэра*
ЭДМУНД	*пабочны сын Глостэра*
КУРАН	*прыдворны*
СТАРЫ СЕЛЯНІН	*арандатар у Глостэра*
ЛЕКАР	
БЛАЗЕН	
ОСВАЛЬД	*дварэцкі Ганерылі*
АФІЦЭР ПРЫ ЭДМУНДЗЕ	
ДВАРАНІН СА СВІТЫ КАРДЭЛІІ	
ГЕРОЛЬД	
СЛУГІ ГЕРЦАГА КОРНУАЛА	
ГАНЕРЫЛЬЯ, РЭГАНА, КАРДЭЛІЯ	*дочкі караля Ліра*
РЫЦАРЫ СА СВІТЫ ЛІРА, АФІЦЭРЫ, ГАНЦЫ, САЛДАТЫ І ПРЫДВОРНЫЯ	

Месца дзеі — Брытанія.

АКТ ПЕРШЫ

Сцэна першая

Палац караля Ліра.

Уваходзяць Кент, Глостэр і Эдмунд.

КЕНТ

Я думаў, што каралю больш падабаецца герцаг Альбані, чым Корнуал.

ГЛОСТЭР

Усім нам так здавалася, але цяпер, пры падзеле каралеўства, нельга ўявіць, каторы з герцагаў яму даражэйшы: кожнаму даецца роўная доля, як ні прыкідвай.

КЕНТ

Гэта ваш сын, мілорд?

ГЛОСТЭР

Так, сэр, і прыплод мой і гадоўля мая. Калісьці я саромеўся прызнацца ў гэтым, а цяпер прывык.

КЕНТ

Не разумею вас.

ГЛОСТЭР

Затое маці гэтага хлопца зразумела адразу, жывот яе акругліўся, і прыдбала яна сына ў калыску раней, чым мужа ў пасцель. Грахі маладосці, сэр.

КЕНТ

Калі ваша сяўба, сэр, дала такія выдатныя ўсходы, я магу вас толькі павіншаваць.

ГЛОСТЭР

У мяне ёсць яшчэ адзін сын, законны, гадамі старэйшы, але гэты не менш мілы майму сэрцу. Парушыў, шэльма, усякую прыстойнасць: вылез на свет, не пачакаўшы, пакуль яго папросяць, але маці яго была

прыгожая, і абдымкі яе былі гарачыя,— прыйшлося прызнаць байструка.— Ты ведаеш гэтага джэнтльмена, Эдмунд?

ЭДМУНД

Не, мілорд.

ГЛОСТЭР

Граф Кент, мой друг і прыяцель.

ЭДМУНД

Пакорны слуга вашай светласці.

КЕНТ

Слаўны хлопец. Ад душы рад пазнаёміцца.

ЭДМУНД

Пастараюся апраўдаць ваша давер'е, сэр.

ГЛОСТЭР

Дзевяць гадоў не было яго тут, і вось трэба зноў выпраўляць у дарогу. Кароль ідзе.

Трубы за сцэнай.
Уваходзяць Лір, Корнуал, Альбані, Ганерылья, Рэгана, Кардэлія і світа.

ЛІР

Кароль Французскі і Бургундскі герцаг
Чакаюць нас. Прымі іх, Глостэр.

ГЛОСТЭР

Добра.

Глостэр і Эдмунд выходзяць.

ЛІР

Тым часам мы аб'явім нашу волю.
Падайце карту. Падзялілі мы
На тры часціны наша каралеўства.
І цвёрды наш намер, рашэнне наша:
Пазбавіцца на старасці гадоў
Дзяржаўных клопатаў, ускласці іх
На плечы маладыя, а самім
Адпачываць, ісці няспешным крокам
Насустрач смерці.— Зяць наш Корнуал
І ты, не менш нам любы, зяць Альбані,
Каб прыпыніць і папярэдзіць спрэчкі,
Жадаем мы апавясціць цяпер жа,
Які пасаг даецца нашым дочкам.
Уладары французскі і бургундскі,
Два кандыдаты на руку і сэрца
Дачкі малодшай нашае, даўно

Прыехалі і сватаюцца. Сёння
Ім будзе наш адказ. Мае вы дочкі,
Скажыце нам, мы ўсё вам аддаём —
І ўладу нашу, і прыбыткі нашы —
Каторая з вас трох нас болей любіць?
Каб мы маглі, узважыўшы пачуцці,
Натуру і заслугі кожнай з вас,
Прызначыць лепшай лепшую часціну? —
Спачатку выслухаем Ганерылью,
Старэйшую дачку.— Адказвай.

ГАНЕРЫЛЬЯ

Сэр,
Мая любоў мацнейшая, чым словы.
Я вас люблю бязмежна і бязмерна:
Больш, чым святло, чым сонца, чым свабоду,
Вы даражэй мне скарбаў і багацця,
Вы для мяне жыццё, здароўе, шчасце,
Не выказаць, як я люблю вас, бацька,—
Любоўю перапоўнена душа.

КАРДЭЛІЯ

(убок)
А што тады Кардэліі казаць?
Хлусіць не буду, лепей прамаўчу.

ЛІР

Усю зямлю, адгэтуль і дагэтуль,
Дрымучы лес і нівы залатыя,
Квяцістыя прасторы сенажацей,
І рэкі паўнаводныя, і ўсё,
Што тут акрэслена, ўвесь гэты край
Мы аддаём табе з тваім патомствам
На векі вечныя.— Што скажа нам
Рэгана, нашая дачка другая,
Па мужу Корнуал?

РЭГАНА

Высокі сэр,
Мая сястра і я адной пароды,—
Цаніце роўна нас. Я з ёю згодна,
Але павінна многае дадаць.
Я заяўляю: мне выгод не трэба;
Вас аднаго кахаючы пяшчотна,
Для вас гатова я на ўсе ахвяры.
Няма на свеце большай асалоды,
Як дагаджаць і быць уцехай вам,
Мой дарагі, мой неацэнны бацька.

КАРДЭЛІЯ

(убок)

Ні спрытнасці ў мяне, ні красамоўства:
Любіць магу, хваліцца не умею.

ЛІР

Табе і ў спадчыну тваім навечна
Вось гэта трэць Брытаніі прыгожай:
Прыволля тут і ўсякага дабра
Не меней, чым у долі Ганерылы.—
Ну, мілае дзіця, наш квет апошні,
Які прывабіў харaством сваім
Да нас у госці двух магутных прынцаў,
Француза і Бургундца, што нам скажаш,
Каб заслужыць трэць лепшую, чым сёстры?

КАРДЭЛІЯ

Нічога.

ЛІР

Нічога?

КАРДЭЛІЯ

Нічога , сэр.

ЛІР

З нічога нічога мець не будзеш.
Думай, думай!

КАРДЭЛІЯ

Якая я няшчасная! Мне цяжка
Рабіць прызнанні. Я люблю вас, сэр,
Як мне загадвае мой абавязак,
Не болей і не меней.

ЛІР

Што? Як, як?
Кардэлія, каму ты так гаворыш!
Не наклікай бяды!

КАРДЭЛІЯ

Мой добры бацька,
Мяне вы парадзілі, ўзгадавалі,
Мяне любілі вы, за гэта я
Павінна быць удзячнай, шанаваць вас,
Любіць і слухацца. Як гэта сёстры
Сабе ўзялі мужоў, а вам гавораць,
Што любяць толькі вас? Мо калі-небудзь
Мне прыйдзецца самой ісці к вянцу.
І я аддам свайго кахання часць
І сэрца часць, увагу, вернасць, ласку
Другому чалавеку. Калі б я

Любіла аднаго вас, я б ніколі
Не выйшла замуж.

ЛІР

Ты гэта шчыра кажаш?

КАРДЭЛІЯ

Шчыра, сэр.

ЛІР

Такая маладая і такая
Бяздушная!

КАРДЭЛІЯ

Калі ж бо гэта праўда.

ЛІР

Хай будзе так. Вазьмі ж ты сваю праўду
Сабе ў пасаг. Клянуся бляскам сонца,
Клянуся таямніцамі начнымі,
Клянуся дзейнасцю нябесных сфер,
Што пасылаюць нам жыццё і гібель,—
Ты не дачка мая. Я разрываю
Той кроўны вузел, што яднае нас,
І выкідаю прэч цябе, чужою,
З грудзей і сэрца. Дзікі варвар скіф,
Агідны людаед, што пажырае
Свой род і племя, мне цяпер мілей,
Радней і бліжэй, чым мая дачка,
Чым гэты выродак.

КЕНТ

Мой уладар!..

ЛІР

Маўчы, не лезь дракону ў зубы, Кент!
Яе любіў я больш за ўсіх, я думаў —
Яна мяне прытуліць і сагрэе.
(Кардэліі.)
Прэч, адыдзі! Труна мяне прытуліць,
А я табе не бацька.— Дзе Француз?
Вы чуеце? Пазваць сюды Бургундца! —
Альбані, Корнуал, бярыце ўсё,
Дзяліце між сабой і гэту трэць.
Няхай ёй гордасць будзе жаніхом.
Знайшла дзе праўду! Вас мы узвышаем
І аддаём вам двум пяршынства наша,
Правы і прывілеі караля.
І, пакідаючы сабе ад світы
Сто рыцараў, мы будзем вас наведваць
Памесячна у вызначаны тэрмін.

Жадаем адпачыць на схіле дзён
Пад вашым доглядам. Імя і тытул
За намі застаюцца; кіраўніцтва,
Расправа, суд, прыбыткі ўсе — у вас.
О любыя сыны, вось вам карона.
Жывіце, царствуйце!
(Аддае карону.)

КЕНТ

Вялікі Лір,
Я шанаваў цябе як караля,
Любіў як бацьку, праслаўляў цябе,
Маліўся на цябе, як на святога...

ЛІР

Наш лук нацягнуты, не вытыкайся!

КЕНТ

Спускай стралу сваю. Хай джала злое
Праб'е мне сэрца. Кент маўчаць не будзе,
Калі шалее Лір. Стары, што робіш?
Ты думаеш, што ўсе цябе баяцца?
Цябе улесцілі. Ты траціш гонар,
Не толькі розум. Будзь такім, як быў.
Не паддавайся гневу, адмяні
Нядобрае рашэнне. Галавой
Ручаюся, малодшая дачка
Цябе не меней любіць: не пусты
Душою той, хто ціхі.

ЛІР

Кент, маўчы
Пад страхам смерці!

КЕНТ

Што мне тая смерць!
Я ёй глядзеў у вочы, калі ў бой
Ішоў за Ліра, калі кроў сваю
За Ліра праліваў.

ЛІР

Прэч, непакорны!

КЕНТ

Адумайся, зірні ў сваё сумленне,—
Яно перад табою тут.

ЛІР

Клянуся Апалонам...

КЕНТ

Клянуся Апалонам, што дарэмна
Клянешся ты, кароль.

ЛІР

Адступнік! Здраднік!

(Хапаецца за меч.)

АЛЬБАНІ, КОРНУАЛ

Не трэба, сэр.

КЕНТ

Сячы мячом, знішчай!
Забіўшы лекара, сваю карону
Надзень хваробе. Лір, не раскідайся.
Я пратэстую, Лір. Пакуль у горле
Не задушылі крык мой, я кажу:
Ты робіш дрэнна.

ЛІР

Слухай жа, бунтар,
Калі ты рыцар, слухай наша слова.
За тое, што адважыўся ты, дзёрзкі,
Публічна ганьбіць клятвенны наш вырак
І ў сатанінскай гордасці паўстаў
Супроць рашэння нашага і нас,
Чаго натура нашая і веліч
Цярпець не могуць, мы цябе караем.
Пяць дзён даём на зборы — падрыхтуйся
Ў дарогу дальнюю; на шосты дзень
Пакінеш каралеўства наша. Прэч!
Калі праз дзесяць дзён ты будзеш тут,
Смерць ліхадзею. Выйдзі, ненавісны!
Юпітэрам клянуся, мы сказалі,
І будзе так, як мы сказалі. Прэч!

КЕНТ

Бывай, упарты Лір. Іду ў выгнанне
У незнаёмы, але вольны край.
Няма свабоды у цябе. Бывай.

(Кардэліі.)

Дзіця праўдзівае, бывай і ты.
Бог не пакрыўдзіць беднай сіраты.

(Рэгане і Ганерылы.)

А вам жадаю, каб любілі вы
Ад сэрца, не ад хітрай галавы.—
Мы самым блізкім прычыняем боль.—
Бывайце, герцагі! — Бывай, кароль!

(Выходзіць.)

Уваходзяць Глостэр, кароль Французскі, герцаг Бургундскі і світа.

ГЛОСТЭР

Яго вялікасць і яго высокасць
Кароль Французскі і Бургундскі герцаг.

ЛІР

Шаноўнейшы Бургундзец, мы спачатку
Спытаемся у вас. Вы і кароль
Абодва маеце адзін інтэрас
Да нашае дачкі. Скажыце нам,
Ці шмат вы патрабуеце пасагу?
Якая ваша крайняя цана?

ГЕРЦАГ БУРГУНДСКІ

Вялікі уладар зямлі брытанскай,
Прэтэнзій лішніх у мяне няма;
Усё, што вы прызначылі за ёю,
Я рад прыняць. Вы ж меней не дасце?

ЛІР

Шаноўны уладар зямлі бургундскай,
Была пара, мы ёю даражылі,
Цяпер тавар падзешавеў. Глядзіце,
Мяркуйце на свой густ і, калі вам
У гэтай кволай дробненькай істоце,
Нялюбай нам, пазбаўленай пасагу,
Што-небудзь даспадобы, забірайце.
Збываем з рук.

ГЕРЦАГ БУРГУНДСКІ

Я вас не разумею.

ЛІР

Жадаеце вы ўзяць сабе за жонку
Дзяўчыну, ад якой мы адракліся,
З яе заганамі, з яе красою
І з нашаю няласкаю ў прыдачу?

ГЕРЦАГ БУРГУНДСКІ

Прашу пардону, вашая вялікасць,
Шлюб немагчымы пры такіх умовах.

ЛІР

Тады яе пакіньце. Прысягаю,
Пералічыў я ўсё яе багацце.—
А вам, кароль вялікі, я не буду
Рабіць і прапановы: брыдка мне
Вам сватаць тое, што другім нягожа.
І я прашу вас пашукаць сабе
Нявесту больш дастойную, забыць
Пра гэтае няўдалае стварэнне,
Нам ненавіснае.

КАРОЛЬ ФРАНЦУЗСКІ

Якое дзіва!
Не верыцца, каб мілая прынцэса,
Прадмет хвалы і прыклад далікацтва,
Што, як бальзам, гаіла вашу душу
І, як зара пад мантыяй нябёс,
Цудоўна аздабляла вашу старасць,
Магла так раптам, за кароткі міг
Скаціцца з недасяжнай вышыні
У багну адшчапенцаў і злачынцаў.
Не можа быць! Вы ж так яе любілі.
Не веру! Не ўмяшчае галава,
І сэрца не прымае.

КАРДЭЛІЯ

Уладар.
Я не прывыкла гаварыць прамовы
І абяцаць, каб потым не выконваць.
Прашу вас, растлумачце гэтым людзям:
Каб ведалі, што я не ліхадзейка
І не разбойніца, маё сумленне
Пакуль што чыстае і чэсць мая
Не мае плям, што страціла я ласку
І стала вам нялюбаю за тое,
Што ў прастаце душой не пакрывіла,
Не гнулася, не паглядала ласа
На большы кус і языком мядовым
Падачак не выпрошвала. Ну што ж!
Хай будзе так, як ёсць. Я не зайздрошчу.
Не гневайцеся, бацька.

ЛІР

Грубіянка!
Мяне раўняеш з іншымі, пярэчыш!
Вось парадзіў змяю!

КАРОЛЬ ФРАНЦУЗСКІ

І гэта ўсё?
Быць стрыманай не значыць быць нячулай.—
Якое вашае рашэнне, герцаг?
Скажыце канчаткова ёй. Каханне
З разлікам на пасаг не ёсць каханне.
Жадаеце узяць? Вось перад вамі
Стаіць дзяўчына — залатое сэрца.

ГЕРЦАГ БУРГУНДСКІ

Ах, ваша каралеўская вялікасць,
Вы дайце толькі ёй, што абяцалі,

І я яе да шлюбу павяду
І назаву бургундскай герцагіняй.

ЛІР

Сказаў, не дам нічога — і не дам.
Я — цвёрды чалавек.

ГЕРЦАГ БУРГУНДСКІ

Шкада, шкада.
Я вельмі спачуваю вам, мілэдзі,—
Няма у вас ні бацькі больш, ні мужа.

КАРДЭЛІЯ

Удзячна вам за спачуванне, герцаг,—
Быць вашай жонкай невялікі гонар.

КАРОЛЬ ФРАНЦУЗСКІ

Кардэлія, о колькі хараства
Ў тваёй пакрыўджанасці адзінокай!
Як ты багата ў беднасці сваёй!
Цябе не любяць. Дык свяці ж мне, зорка!
Пакінутая ўсімі, будзь мая.
Як непрытульна тут, як сцюжа!
Я прыгарну цябе да сэрца, ружа,
У Францыю за мора павязу,
І сонца высушыць тваю слязу.

Скажы «бывай» радні сваёй суровай,
Ты знойдзеш шчасце у краіне новай.
Будзь каралевай! Мы цябе абралі.—
Вы прагадалі, герцаг, прагадалі.

ЛІР

Бяры яе, Француз, яна твая.
Ідзіце прэч, каб вас не бачыў я.
Благаславення вам майго не будзе,
Яе забыў я, хай мяне забудзе.—
Хадзем, шаноўны герцаг.

Трубы. Выходзяць Л і р, г е р ц а г Б у р г у н д с к і, К о р н у а л, А л ь б а н і, Г л о с т э р і с в і т а.

КАРОЛЬ ФРАНЦУЗСКІ

Развітайся з сваімі сёстрамі.

КАРДЭЛІЯ

О сёстры, сёстры,
Апора бацькава, як мне балюча,
Як горка мне у гэты час разлукі!
Я знаю вашы слабасці, але
Ліхога слова на скажу. Любіце
І даглядайце бацьку, прытуліце

Старога да грудзей сваіх. Мой божа!
Няхай бы мне даверыўся ён! Можа,
Знайшоўся б для яго прытулак лепшы.
Шчасліва аставацца.

РЭГАНА

Не вучы нас.

ГАНЕРЫЛЬЯ

Лепш навучыся мужу дагаджаць,
Што з міласці узяў цябе, жабрачку,
Не адвярнуўся. Добра, добра. Варта.
Не зазнавайся і не будзь упартай.

КАРДЭЛІЯ

Рассудзіць час, хто вінаваты болей.
Не смейцеся, сястрыцы, над нядоляй.
Жадаю шчасця.

КАРОЛЬ ФРАНЦУЗСКІ

Пойдзем, дарагая.

Выходзяць кароль Французскі і Кардэлія.

ГАНЕРЫЛЬЯ

Сястра, мне трэба з табою пагаварыць, гэта вельмі важна для нас абедзвюх. Я думаю, бацька сёння ўвечары выедзе адгэтуль.

РЭГАНА

Напэўна; спачатку будзе жыць у цябе, а праз месяц прыедзе да нас.

ГАНЕРЫЛЬЯ

І што ён сёння толькі вытварыў! Ты заўважыла, якая перамена? Сястру ж ён любіў больш, а прагнаў як міленькую. І за што? Глупства!

РЭГАНА

Ашалеў на старасці. Хоць, праўду кажучы, на яго і раней часам дурасць находзіла.

ГАНЕРЫЛЬЯ

Гарачы занадта. Яшчэ не тое будзем бачыць. За столькі год ён так урос у свой трон, што цяпер, апроч дзікага самадурства, старэчых немачаў і капрызаў, нічога добрага ад яго не дачакаешся.

РЭГАНА

Ён можа і на нас кінуцца з мячом, як на гэтага Кента.

ГАНЕРЫЛЬЯ

А як табе падабаецца развітанне з каралём Французскім? Нам трэба быць заадно, сястрыца. Бо калі даць

яму ўладу, то пры яго нораве гэтыя яго дары нам бокам вылезуць.

РЭГАНА

Падумаем, абмяркуем.

ГАНЕРЫЛЬЯ

Трэба нешта рабіць, і неадкладна.

Выходзяць.

Сцэна другая

Замак графа Глостэра.

Уваходзіць Э д м у н д з пісьмом.

ЭДМУНД

Прырода, ты — мой бог, табе служу я.
Чапляць на рукі ланцугі прывычак?
Ісці з усімі разам? Дапусціць,
Каб чалавечы гурт мяне таптаў?
За што? — за тое, што законны брат
Забег наперад, першым нарадзіўся?
А чым я горшы? Чым я незаконны?
Хіба не тое ж цела? Я — здаровы,
Разумны, зграбны, смелы, малады.
Хто даў ім права нас не прызнаваць?
Хто ім дазволіў зваць нас байструкамі?
Законныя, законныя! — Прырода
Дае законы, а не вы, і здольнасць
З'яўляецца на свет не там, дзе ў ложку,
Пратухлым ад штодзённага ужытку,
Спяць мірна дурні.— Знай, законны Эдгар:
Што я, што ты — нас бацька любіць роўна.
І ўсё ж я забяру тваю зямлю,
Прысвою ўсё сабе. Верх возьме Эдмунд,
Бо Эдмунд — сіла. Ёсць тут у мяне
Адно пісьмо для гэтай мэты. Хай
Жывуць і працвітаюць байструкі!

Уваходзіць Г л о с т э р.

ГЛОСТЭР

Прагнаны Кент! Француза угнявіў!
Усё раздаў! Адрокся ад прастола!

Сам выехаў уночы! Так раптоўна!
Хто мог чакаць! — Якія весткі, Эдмунд?

ЭДМУНД

(хаваючы пісьмо)
Ніякіх, ваша светласць.

ГЛОСТЭР

То чаго ж ты спужаўся? Што за пісьмо хаваеш?

ЭДМУНД

Нічога асаблівага, мілорд.

ГЛОСТЭР

Я пытаю, што ты чытаў? Што гэта за паперка?

ЭДМУНД

Ды так, дробязь.

ГЛОСТЭР

Хлусіш. Па вачах бачу. Дробязь так не хаваюць. Пакажы. Калі дробязь, то я разбяруся і без акуляраў.

ЭДМУНД

Прашу прабачэння, сэр, гэта пісьмо ад брата. Я яшчэ ўсяго не прачытаў, але вам яго не варта паказваць.

ГЛОСТЭР

Дай сюды.

ЭДМУНД

Пакажу ці не пакажу, вы ўсё роўна пакрыўдзіцеся. Хваліць няма за што.

ГЛОСТЭР

Пабачым, пабачым.

ЭДМУНД

У апраўданне брату, я спадзяюся... я думаю... мне здаецца... ён напісаў гэта, каб праверыць маё сумленне.

ГЛОСТЭР

(чытае)
«Гэтыя пачцівыя адносіны да старых толькі атручваюць нам лепшыя гады жыцця, льюць горыч у вясёлы кубак нашага юнацтва, пазбаўляюць нас багацця, а калі яно, нарэшце, і трапіць нам у рукі, то ўсё ў нас перагарыць, астыне, і мы ўжо не зможам ім карыстацца з належным смакам. Мне абрыдла тыранія сівой барады, надакучыла рабства. Яны маюць уладу не ад сваёй сілы, а ад нашага патурання. Прыходзь да мяне, мы з табою пагаворым. Каб мой бацька мог заснуць і не прачынацца, пакуль я сам яго не разбуджу, ты меў бы палову бацькавых прыбыткаў і жыў бы прыпяваючы маім наймілейшым братам. Эдгар». Што гэта? Змова?

«Заснуць і не прачынацца... Ты меў бы палову бацькавых прыбыткаў...» — Эдгар, сын мой! Хто гэта піша? Гэта ён піша? У яго галаве маглі з'явіцца такія мысліКалі ты атрымаў? Хто прынёс?

ЭДМУНД

Ніхто мне не прынёс, мілорд, мне ўкінулі праз акно. У тым-то ўся і штука.

ГЛОСТЭР

І гэта напісана рукой твайго брата?

ЭДМУНД

Каб што добрае, то я пакляўся б, а ў такое не хочацца верыць.

ГЛОСТЭР

Яго рука.

ЭДМУНД

Рука-то яго, ваша светласць, але сэрца чужое.

ГЛОСТЭР

А дагэтуль ён не рабіў табе ніякіх прапаноў?

ЭДМУНД

Ні разу, мілорд. Праўда, чуў я, нейк ён выказваў думку, што калі сыны дарослыя, а бацька дажывае век, то было б лепш, каб бацька аддаў усё сынам, а сам перайшоў да іх на ўтрыманне.

ГЛОСТЭР

Скаціна, нахабная скаціна! Ён гэта ж самае і піша. Драпежнік! Звер! Агідны, бесчалавечны, подлы звер! Найпадлейшы звер! — Гэй, людзі! Лавіць яго! Хапаць яго! Я згнаю яго ў падзямеллі.— Падлюга! Зладзюга! — дзе ён?

ЭДМУНД

Я добра не ведаю, мілорд. Адважуся прасіць вашу светласць стрымаць сваё абурэнне супраць майго брата, вашага сына, пакуль не будзе выяўлены корань яго намеру з усімі акалічнасцямі. Прашу супакоіцца. Справа вельмі далікатная. Найменшая памылка, якая можа з'явіцца ў выніку неасцярожнай паспешнасці, нанясе глыбокую рану вашаму гонару і разаб'е ўшчэнт яго прыхільнасць да вас. Смела ручаюся жыццём, ён напісаў гэта толькі для таго, каб выпрабаваць шчырасць маіх пачуццяў да вашай светласці. Ніякіх шкодных намераў у яго не было.

ГЛОСТЭР

Ты так думаеш?

ЭДМУНД

Калі ваш гонар не пярэчыць, то я пакажу вам, дзе схавацца, і вы зможаце падслухаць маю з ім размову пра гэта, пераканацца на свае ўласныя вушы. Я зраблю гэта сёння ж, і не пазней як увечары.

ГЛОСТЭР

Не можа ён быць такім страшыдлам, не!

ЭДМУНД

Безумоўна, ні ў якім разе.

ГЛОСТЭР

Ісці супраць бацькі, які яго любіць ад усяго сэрца!— Божа, божа! — Эдмунд, знайдзі яго. Дай мне зірнуць яму ў нутро. Рабі як знаеш, табе відней: я гатоў на ўсё, каб ведаць праўду.

ЭДМУНД

Мілорд, я яго знайду зараз жа. Я дам справе належны кірунак і буду трымаць вас у курсе ўсіх падзей.

ГЛОСТЭР

І зацьменне сонца было і зацьменне месяца... Не, не прычакаць нам дабра. Хай мудрацы тлумачаць і так і гэтак, а пакрыўджаная прырода сваё бярэ. Любоў астывае, дружба развальваецца, у гарадах бунт, у сёлах нязгода, у палацах здрада, сувязь паміж бацькамі і дзецьмі распадаецца. І збываецца прадказанне: і паўстане сын на бацьку свайго, і прагоніць бацька дзіця сваё, і затрасуцца троны, і пападаюць каралі. Аджылі мы свой лепшы час. Махлярства, пустапарожнасць, вераломства і ўсякае ліха абступілі нас і не даюць спакойна памерці.— Знайдзі мне гэтага нягодніка, Эдмунд. Пастарайся. Я аддзякую.— Мужны, праўдзівы Кент асуджаны на выгнанне. А за што? За сваю шчырасць! — Дзіўна!

(Выходзіць.)

ЭДМУНД

Вось яшчэ цемра людская! Абы-якая бяда альбо няўдача, а ў няспрытных заўсёды не ладзіцца, то мы абвінавачваем у гэтым сонца, месяц, зоркі, нібы мы прахвосты па неабходнасці, блазнюкі з ласкі божай, жулікі і шэльмы па загаду лёсу, п'яніцы, хлусы і распуснікі ад няўхільнага і неадольнага ўплыву планет. Кожны свой ганебны ўчынак мы стараемся апраўдаць воляю неба. Баіцца стары бабнік грахоў і свае казліныя пачуцці чапляе на зорку. Мой бацька абняў маю маці пад хвастом у Дракона, а нарадзіўся я пад Вялікай

Мядзведзіцай: з аднаго боку юрлівасць, з другога нахабства. Фатальная камбінацыя характару. Тфу! Бо каб нават найчысцейшая зорка нявіннасці пазірала на маё незаконнае нараджэнне, я быў бы такім, які я ёсць.

Уваходзіць Эдгар.

Лёгкі на ўспамін. Як развязка ў старажытнай камедыі: прыходзіць тады, калі яе чакаюць. Напушчу на сябе меланхолію і пачну ўздыхаць, як Том з Бедлама.— О, гэтыя зацьменні, гэтыя зацьменні! Яны сведчаць аб дысгармоніі свету! Фа, соль, ля, мі.

ЭДГАР

Эдмунд, здароў! Што ты такі сумны? Аб чым ты думаеш?

ЭДМУНД

Думаю, браце, пра гэтыя зацьменні. Нядаўна я вычытаў такія страхі, што мяне аж калоціць.

ЭДГАР

Знайшоў чым займацца.

ЭДМУНД

А я табе кажу, што прароцтвы, на жаль, збываюцца. Вось што там напісана: варожасць паміж бацькамі і дзецьмі, мор, голад, распад даўняе дружбы, усобіцы, бунт супраць караля і дваранства, празмерная падазронасць, пакаранне бязвінных, развал у войску, скасаванне шлюбаў і яшчэ шмат чаго.

ЭДГАР

З якога часу ты пачаў цікавіцца астралогіяй?

ЭДМУНД

А ты не смейся. Ты даўно бачыў бацьку?

ЭДГАР

Учора ўвечары.

ЭДМУНД

Ты з ім гаварыў?

ЭДГАР

Цэлыя дзве гадзіны.

ЭДМУНД

А як вы разышліся? Добра? Дрэнна? Ён не быў сярдзіты?

ЭДГАР

Не, не быў.

ЭДМУНД

Ты мне скажы, чым ты яго так угнявіў? Я прашу цябе, не пападайся яму на вочы. Няхай ён трохі астыне. Ён цяпер у такім абурэнні, што гатоў разарваць цябе.

ЭДГАР

Не іначай абгаварыў які-небудзь падлюга.

ЭДМУНД

Вось гэтага я і баюся. Прашу цябе як брата, будзь асцярожны, няхай яго злосць перакіпіць. А то, ведаеш што, хадзем да мяне, і я зраблю так, што ты сам пачуеш, што гаворыць бацька. Вось табе ключ ад маіх дзвярэй. Калі ласка. А захочаш выйсці, бяры зброю.

ЭДГАР

Што ты, брат! Нашто мне зброя?

ЭДМУНД

Слухай, брат, я табе раю як лепш. Я чалавек сумленны і павінен папярэдзіць: пад цябе робяць падкоп. Я сказаў тое, што чуў і бачыў, але я не ўсё сказаў. Ты нават не можаш сабе ўявіць, якая небяспека над табою навісла. Ідзі, ідзі адгэтуль.

ЭДГАР

Ты хоць бы мне растлумачыў.

ЭДМУНД

Я табе памагу, не сумнявайся.

Эдгар выходзіць.

Старому абы верыць: забабоны,
Ўсе плёткі, чуткі ён збярэ да кучы.
Брат — прастадушны, зла не прызнае
І чортам не спакушан; сяду верхам
І буду аб'язджаць, хай прывыкае.
Наперад, лейцы ў рукі і ўгалоп!
Я панаваць хачу, я — не халоп.

(Выходзіць.)

Сцэна трэцяя

Палац герцага Альбані.

Уваходзяць Ганерылья і Освальд.

ГАНЕРЫЛЬЯ

Гэта праўда, што мой бацька набіў майго прыдворнага за тое, што той пасварыўся з яго блазнам?

ОСВАЛЬД

Праўда, мілэдзі.

ГАНЕРЫЛЬЯ

Ён не дае жыцця мне. Вось мучыцель!
Наехалі, перавярнулі дом:
Крык, лямант, лаянка. Не пацярплю!
Абрыдлі мне яго прыдзіркі.— Слухай:
Калі яны прыскачуць з палявання,
То я не выйду; запытае, дзе я,—
Даложыш, што мілэдзі нездарова.
І не старайся вельмі услугоўваць,
Рабі ўсё з халадком,— так будзе лепей.

За сцяной чуваць паляўнічы рог.

ОСВАЛЬД

Мілэдзі, едуць.

ГАНЕРЫЛЬЯ

І дворня каб не бегала за ім
З паклонамі. Што, працы не хапае?
Пытанне стаўлю рубам: я ці ён?
Не падабаецца, то, калі ласка:
Вунь дзверы, вунь парог, хай выязджае
У госці да сястры: сястра Рэгана
Таксама, як і я, не надта любіць,
Каб ёй вантробы грызлі. Мулка стала
Яму на троне, злез; дык і маўчаў бы,
А то выабражае, задаецца.
Здзяцінеў ён, пражыўшы столькі веку;
Наш абавязак — узмацніць апеку,
Дурной сваволі патураць не след.
Камандаваць прыехаў, дармаед!
Не пацярплю.— Ды помні.

ОСВАЛЬД

Буду помніць,
Святлейшая мілэдзі.

ГАНЕРЫЛЬЯ

І накажы, каб дворня не заводзіла дружбы з яго рыцарамі. Холаду, холаду болей. Калі што якое, то я за вас заступлюся. Я хачу вывесці іх на чыстую ваду, і я выведу.— Я зараз жа напішу сястры, каб яна ведала.— Падавай абед.

Выходзяць.

Сцэна чацвёртая

Зала там жа.

Уваходзіць пераапрануты К е н т.

КЕНТ

Калі б я мог і голас перайначыць
Так, як змяніў аблічча, то, напэўна,
Лягчэй бы дасягнуў той добрай мэты,
Якая прывяла мяне сюды.
І прыйдзецца табе, выгнаннік Кент,
Забыўшы крыўду, паслужыць яшчэ раз
Свайму ранейшаму гаспадару.

Ражкі за сцэнай.
Уваходзяць Л і р, р ы ц а р ы і с л у г і.

ЛІР

Гэй, абедаць! Зараз жа! Чакаць не будзем.

Адзін с л у г а выходзіць.

Ты хто?

КЕНТ

Чалавек.

ЛІР

Што за чалавек? Чым займаешся? Чаго табе ад нас трэба?

КЕНТ

Чалавек я такі, якім здаюся. Хто мне верыць, таму служу верна; хто сумленны, таго паважаю; хто разумны і маўклівы, з тым гавару; судоў баюся, без прычыны не б'юся, рыбы не ем.

ЛІР

Хто ты?

КЕНТ

Чалавек з сэрцам, а яшчэ ёсць душа. Такая ж голь, як і сам кароль.

ЛІР

На тым свеце ўсе будзем голыя. Чаго ты хочаш?

КЕНТ

Хацеў бы наняцца служыць.

ЛІР

Каму?

КЕНТ

Вам.

ЛІР

А ты мяне ведаеш?

КЕНТ

Не, сэр, я вас не ведаю, але ў вашым абліччы ёсць нешта такое, што я хацеў бы служыць толькі вам.

ЛІР

Што ты знайшоў у маім абліччы?

КЕНТ

Сляды магутнасці.

ЛІР

А што ты ўмееш?

КЕНТ

Умею даць добрую параду, ездзіць конна, хадзіць пеша, пацешныя казкі лгаць; чалавек я просты: тупават, грубават; здольнасці ў мяне малыя, але работу люблю: што загадаюць, тое і раблю.

ЛІР

Колькі табе гадоў?

КЕНТ

Не такі малады, сэр, каб пакахаць дзяўчыну за прыгожыя спевы, і не такі стары, каб палюбіць чорт ведае што. Дзякуй богу, маю ўжо сорак восем гадочкаў.

ЛІР

Аставайся, прымаю на службу. Калі не ўгнявіш мяне да вечара, то ўнаровіш і заўтра.— Гэй, абедаць, зараз жа! — А дзе мой блазен? Дзе гэтая круцёлка? — Пазваць сюды майго блазна.

Уваходзіць Освальд.

Гэй, ты, парсюк, дзе мая дачка?

ОСВАЛЬД

З вашага дазволу...

(Выходзіць.)

ЛІР

Што сказаў гэты хамуйла? Падаць мне сюды яго морду!

Адзін з рыцараў выходзіць.

Гэй, вы там, дзе мой блазен? — Ды што гэта такое, што гэта вы ўсё ходзіце, як сонныя!

Вяртаецца рыцар.

Ну, што? Дзе гэта свіння ў гамашах, знайшлі?

РЫЦАР

Ваша вялікасць, ён гаворыць, што вашаи дачцэ нездаровіцца.

ЛІР

А чаму гэты халоп не вярнуўся, калі я яго клікаў?

РЫЦАР

Не хоча, ваша вялікасць, так і сказаў. Не хоча.

ЛІР

Не хоча?

РЫЦАР

Сэр, не магу дазнацца, у чым справа, але, на мой погляд, у дачыненні да вашай вялікасці няма таго агульнага замілавання, якое было раней. Назіраецца ўпадак павагі і паслушэнства. І не толькі слугі выходзяць з рамак прыстойнасці, а нават сам герцаг і ваша дачка.

ЛІР

А! Ты гэта заўважыў?

РЫЦАР

Прашу прабачэння, сэр, можа, гэта не так, але я не магу маўчаць, калі крыўдзяць вашу вялікасць.

ЛІР

Ты мне толькі напомніў тое, аб чым я і сам здагадваюся. Нядаўна я адчуў адзін тонкі ўкол, але я толькі папракнуў сябе за сваю падазронасць. Мала што. Нельга ж думаць, што ўсё ліхое робіцца знарок. Пагляджу, што будзе далей.— Дзе ж гэта мой блазен падзеўся? Два дні я яго не бачу.

РЫЦАР

З таго часу, як прынцэса Кардэлія выехала ў Францыю, блазен вельмі занудзіўся.

ЛІР

Не напамінай, я сам гэта заўважыў.— Ідзі, скажы маёй дачцэ, што я жадаю з ёю гаварыць.

Рыцар выходзіць

Гэй, вы, знайдзіце майго блазна.

Другі слуга выходзіць.

Уваходзіць Освальд.

А, сэр! Гэта вы, сэр! Падыдзіце сюды, сэр. Хто я такі?

ОСВАЛЬД

Бацька яе светласці.

ЛІР

Бацька яе светласці? Ах ты, шэльма яе светласці! Паршывы шчанюк! Халоп! Раб!

ОСВАЛЬД

Выбачайце, мілорд, я не шчанюк і не раб. Прашу прабачэння.

ЛІР

Ты яшчэ агрызаешся! Падлюга! *(Б'е яго.)*

ОСВАЛЬД

Я не дазволю, каб мяне білі.

КЕНТ

Любіш, каб цябе гладзілі? Цяльпук чараваты! *(Перакульвае яго ўніз галавой.)*

ЛІР

Дзякуй табе, хлопча. Ты служыш добра, і ты мне падабаешся.

КЕНТ

Ну-ну, сэр, стаў на ногі сваю бочку і каціся. Што, людзей не ўмееш адрозніваць? Дык я навучу. Направа, налева, марш! А будзеш падшпільваць свой мяшок, то я так дам, што як на санках выедзеш адгэтуль. Вон! *(Выпіхвае Освальда за дзверы.)*

ЛІР

Дзякуй, дружа. Маладзец! Вось табе ў задатак за верную службу. *(Дае Кенту грошы.)*

Уваходзіць блазен.

БЛАЗЕН

І я яму нешта дам, і я яму нешта дам.— На табе, галубчык, гэту шапачку з вушкамі. *(Працягвае Кенту сваю шапку.)*

ЛІР

Ах ты, мой блазен дарагі! А я без цябе засумаваў.

БЛАЗЕН

Ты бяры, бяры шапачку, калі даюць.

КЕНТ

А навошта мне, блазен, твая шапка?

БЛАЗЕН

Як навошта? Дурной галаве — асліныя вушы. Не прыставай да таго, хто ляжыць, а даганяй таго, хто бяжыць. Круці нос за ветрам: туды, дзе мяса, а не туды, дзе юшка. Бяры, бяры шапачку. Вось у гэтага дзеда былі тры дачкі: прагнаў ён адну, прагнаў другую, а трэцюю благаславіў за мора шукаць шчасця. Калі ты хочаш яму служыць, то бяры шапачку — яна табе спатрэбіцца.— Як маешся, кум? Эх, каб у мяне былі дзве дачкі і дзве шапкі!

ЛІР

Што б ты з імі рабіў, мой хлопчык?

БЛАЗЕН

Аддаў бы дочкам усю маёмасць, а сабе на памяць пакінуў бы шапкі. У мяне ёсць адна, вазьмі, а другую папрасі ў дочак, яны табе не адмовяць.

ЛІР

Сцеражыся: бізун.

БЛАЗЕН

Праўда, як сабака,— павінна сядзець у будцы. І нават тады, калі перад носам спраўляюць сабачае вяселле.

ЛІР

Горкая праўда, горкія словы.

БЛАЗЕН

А я цябе пацешу.

ЛІР

Пацеш.

БЛАЗЕН

Слухай, кум.
Не знаеш — вучыся;
Не ўмееш — лаўчыся;
Не прасіся, не гніся,
Сваім не хваліся,
За чужым не ганіся,
З людзьмі не сварыся;
Да баб не хадзі,
Ў карчме не сядзі;
Шануй сваю хатку —
Пражывеш у дастатку.

КЕНТ

Гародзіш ты глупства, блазен.

БЛАЗЕН

Як адвакат у судзе, якому не заплацілі.— Скажы, кум, што можна высмактаць з сухое косткі?

ЛІР

Нічога.

БЛАЗЕН

Правільна. У сухой костцы і ў пустой галаве мозгу няма. Не хацеў есці кашку з маслам, дык еш нішчымніцу. *(Кенту.)* Растлумач яму ты, я — дурань, мне ён не паверыць.

ЛІР

Дурань ты горкі.

БЛАЗЕН

А якая розніца паміж дурнем горкім і дурнем салодкім?

ЛІР

Не ведаю, скажы.

БЛАЗЕН

Каб таго пана, які навучыў цябе раздаць зямлю, вымазаць мёдам і паставіць з табою побач, то былі б два дурні: адзін — горкі, а другі — салодкі.

ЛІР

Ты мяне называеш дурнем, мой хлопчык?

БЛАЗЕН

А як жа іначай? Тое, што ты меў, ты раздаў, а гэта у цябе прыроднае.

КЕНТ

Сэр, гэты дурань — не зусім дурань.

БЛАЗЕН

Бо мне не дазваляюць. Каб я адзін меў манаполію на дурасць, то паны і лорды палопаліся б ад зайздрасці: кожны хоча мець сваю долю, асабліва жанчыны.— Кум, прадай яйка, дам табе дзве кроны.

ЛІР

Якія дзве кроны?

БЛАЗЕН

Беленькія. Яйка я вып'ю, а шкарлупіны аддам табе: чапляй на галаву і насі здароў. Эх, кум, кум, зіхацела на табе карона залатая, а цяпер толькі лысіна свеціць. Злезла курка са свайго гняздзечка, згубіла курка залатое яечка.— І пашкадаваў ён асла свайго, узваліў на плечы і перанёс цераз лужыну.— Я кажу табе гэта, бо я дурань, а калі хто іншы пачне брахаць — дай яму бізуна. *(Спявае.)*

Настаў для блазнаў цяжкі час,
Хоць у труну кладзіся:
Дурных прыбавілася ў нас,
Разумныя звяліся.

ЛІР

Калі ты вывучыў столькі песень?

БЛАЗЕН

Нядаўна. З таго часу, як твае дочкі сталі табе нянькамі; калі ты даў ім розгу і спусціў свае парадныя штаны. *(Спявае.)*

Яны ад шчасця зарыдалі,
Я з гора засмяяўся:

Вялікі Лір, кароль брытанскі,
У дурні запісаўся.
Слухай, кум, наймі мне трапача ў настаўнікі — хачу вучыцца хлусіць.

ЛІР

Будзеш хлусіць, адлупцую.

БЛАЗЕН

Бач ты які! — які сам, такія ў цябе і дочкі. Яны збіраюцца біць мяне за праўду, а ты за хлусню. Калі я маўчу, мяне таксама б'юць. Не хачу быць блазнам. Лепш наняцца ў пастухі, чым служыць у адстаўнога караля. Кум, у цябе дзірка ў макаўцы — вераб'і розум выпілі.— Сцеражыся! — дыбае птуха-сакатуха, дзюбу навастрыла, хвост распусціла. Кудах-кудах-кудах!

Уваходзіць Ганерылья.

ЛІР

Што з табою, дачка мая? Чаму ты такая хмурная?
Нешта ты апошнім часам пачала моршчыцца.

БЛАЗЕН

Які ты, кум, стаў прыветлівы, харошы. Раней ты не прыглядаўся так да чужых маршчын, у цябе свае былі, ты быў кароль — персона, а цяпер я — персона, бо я дурань, а ты нуль без палачкі. *(Ганерылі.)* Маўчу, маўчу, мілэдзі. Ваш ледзяны позірк пранізвае мяне наскрозь. Брр!
Дажыліся кулікі:
Ані хлеба, ні мукі.
(Паказвае на Ліра.)
Перад вамі вылушчаны бабовы струк.

ГАНЕРЫЛЬЯ

Не толькі, сэр, вы распусцілі блазна,
Але ўся ваша чэлядзь, волю ўзяўшы,
Дайшла да непрыстойнасці. Як можна?
Што ні хвіліна — бойкі, сваркі. Сэр,
Я спадзявалася, зрабіўшы вам
Належнае паведамленне, мець
І адпаведны вынік, а тым часам,
Паводле вашых слоў і вашых спраў,
Я маю страх, што вы ў хаўрусе з імі,
Што вы — пратэктар гэтых звадыяшаў.
І, з вашага дазволу, я рашыла
Устанавіць парадак, даць спакой
Сабе і вам. Абразы тут няма,

І гневацца не трэба. Асцярожнасць
І клопаты аб вас дыктуюць мне
Быць жорсткай і суровай.

БЛАЗЕН

Што, кум?
Палюбіла зязюлька старога дразда:
Павыкідвала зязюлька яго дзетак з гнязда.
Свечка пагасла — цёмная ноч.

ЛІР

Ты нам дачка ці не?

ГАНЕРЫЛЬЯ

Пара вам, сэр, узяць сябе у рукі.
Я вымушана вам падкрэсліць, сэр,
Што вашыя ўсе гэтыя гуморы
Вам толькі шкодзяць.

БЛАЗЕН

Ты што, не бачыш, карова, што воз вязе конь? — Гэй, гэй, сівы! Трымай хвост дудкай. Я цябе люблю.

ЛІР

Хто я такі, скажыце? Я — не Лір!
Лір так не ходзіць! Лір так не гаворыць!
Ці, можа, я аслеп? Мо страціў розум?
А можа, гэта сон? Не, я не сплю.
Хто я такі, скажыце мне?

БЛАЗЕН

Цень Ліра.

ЛІР

Тут нешта не так, у гэтым трэба разабрацца. Мне здаецца ўсё-такі, што я кароль. Але я не бачу каля сябе маіх дочак. Дзе я знаходжуся?

БЛАЗЕН

У багадзельні.

ЛІР

Як вас зваць, прыгожая дама!

ГАНЕРЫЛЬЯ

Сэр, вашы кампліменты недарэчы.
Без жартаў, калі ласка. Я прашу вас
Уразумець як след мае намеры.
Вы — чалавек стары, паважны, мудры,
А пры сабе трымаеце сто слуг:
Сто рыцараў, сто гультаёў і п'яніц.
І гэтая узброеная банда,
Як саранча, дарваўшыся да хлеба,
Знішчае ўсё. Дэбошы, гульні, песні.

Я — не прыхільніца эпікурэйства.
Мой мірны замак — не начлежны дом
І не карчма. Я проста чырванею.
Як дапусцілі вы! Мы прапануем,
Мы просім вас, хоць і без просьбы можам
Распарадзіцца самі, скараціць
Лік вашай світы. Хопіць з вас паловы.
Пакіньце пры сабе людзей пачцівых,
Сур'ёзных, пажылых.

ЛІР

Гром і маланкі!
Хутчэй сядлайце коней! Клічце світу! —
О ненавісны выradак! Паеду!
Нагі маёй не будзе ў вашым доме!
Ёсць у мяне яшчэ адна дачка.

ГАНЕРЫЛЬЯ

Вы многа дазваляеце сабе:
Вы сталі біць маіх людзей, а вашы
Галаварэзы задзіраюць нос!

Уваходзіць Альбані.

ЛІР

Бяда таму, хто каецца, ды позна.
(Да Альбані.)
І вы, сэр, тут? Прымаеце удзел?
Вы з ёю згодны? — Падавайце коней! —
Няўдзячнасць, д'ябал з мармуровым сэрцам! —
Калі ты ўлезла ў грудзі да дзіцяці,
То ты страшней пачвары з дна марскога!

АЛЬБАНІ

Сэр, супакойцеся.

ЛІР

(да Ганерылі)

Ілжэш, ілжэш, о ненавісны коршак!
Народ мой чэсны, я іх выбраў сам,
Ім этыкет вядомы дасканала,
Ніхто парадкаў вашых не парушыў,
Яны ахоўваюць мой гонар.— Эх!
Кардэлія, даруй, маё дзіцятка!
Як мог яе учынак нечаканы
З маёй натуры добрай вырваць сэрца,
Каб разлілася жоўць? О Лір, Лір, Лір!
(Б'е сябе па галаве.)
Прагнаў ты розум і ўпусціў шаленства! —

Народ мой дарагі, не стойце тут,
Ідзіце.

АЛЬБАНІ

Я не вінаваты, сэр,
Не ведаў я.

ЛІР

Магчыма, ўсё магчыма.—
Прырода-маці, добрая багіня,
Ці чуеш ты мяне? Калі ты ёй
Прызначыла мець дзетачак маленькіх,
Не дай ёй гэтай радасці ніколі!
Ссушы яе, пазбаў, ваўчыцу, сокаў,
Каб у яе нутры закажанелым
Не развіваўся плод! А калі ты
Пашлеш дзіця ёй, то пашлі калеку
На муку ёй, на доўгую пакуту,
Каб вычарнела ад начэй бяссонных,
Каб твар яе барознамі пакрыўся
Ад безуцешных слёз, каб без пары
Старою стала, каб яе старанне,
І ласка матчына, і ўся любоў
Прапалі марна! Хай тады адчуе,
Што ў сто разоў вастрэй зубоў змяіных
Няўдзячнасць роднага дзіцяці.— Прэч!

(Выходзіць.)

АЛЬБАНІ

Што за прычына гэтаму, о неба?

ГАНЕРЫЛЬЯ

Ат! — клопат невялікі. Не зважай.
На ўсякае шаленства не ўнаровіш.
Ён хоча выехаць. Трымаць не будзем.

Вяртаецца Л і р.

ЛІР

Дзе мая світа? Толькі пяцьдзесят.
Двух тыдняў не прайшло.

АЛЬБАНІ

У чым тут справа
Скажыце, вашая вялікасць?

ЛІР

Скажу, скажу.

(Да Ганерылы.)

Мне сорамна, клянуся,
Што я так аслабеў перад табою,

Што слёзы, як вада, з мяне цякуць
Нястрымнай плынню, і ты бачыш гэта.
Праклятая, глядзі, як бацька плача!
Гнілы туман табе на галаву!
Балячкі, немач чорную у печань!
Каб ты так аблівалася крывёю,
Як я слязьмі! Мае старыя вочы,
Мае дурныя вочы, перад кім
Вы плачаце? Даволі! Я — кароль.
Ёсць у мяне яшчэ дачка другая,
Яна харошая, яна нас прыме;
Калі яна дачуецца аб тым,
Як ты пакрыўдзіла мяне, зладзейка,
Яна учэпіцца ў твой воўчы твар
Зубамі, кіпцямі. Яшчэ папомніш!
Мы вернемся, мы возьмем нашу ўладу.
Папомніш нас!

Лір, Кент і світа Ліра выходзяць.

ГАНЕРЫЛЬЯ

Ты чуў? Ён пагражае.

АЛЬБАНІ

Пры ўсім маім каханні да цябе,
Я не магу быць жорсткім, Ганерылья.

ГАНЕРЫЛЬЯ

Прашу цябе, не ўмешвайся.— Гэй, Освальд!
(Блазну.)
А ты, відаць, не дурань — хітры, шэльма.
Ты што вынюхваеш тут? Вон адгэтуль!

БЛАЗЕН

Дзядзечка! Дзядзечка Лір! Пачакай! Дурань астаўся.
Вазьмі дурня з сабою.
Лісіца-сястрыца,
Каб ёй удавіцца,—
Намыліць вяроўку,
Усунуць галоўку.
Гу-та-та! Гу-ля-ля!
Даганяю караля.
(Выходзіць.)

ГАНЕРЫЛЬЯ

Сто рыцараў! Падумаць толькі! Сто!
Карміць такое войска! Каб ён мог
Свой кожны бзік, капрыз, нездавальненне,
Свае фантазіі, свае дзівацтвы

Навязваць гвалтам. Не, не будзе гэтак!
Я не жадаю жыць пад вечным срахам.—
Каму кажу я! Освальд!

АЛЬБАНІ

Страх і пільнасць
Патрэбны не заўсёды.

ГАНЕРЫЛЬЯ

Давярацца
Не варта гэтак жа. Лепш папярэдзіць,
Чым каяцца пасля. Я добра знаю
Яго натуру. Напісала я
Сястры сваёй. Цікава, як сустрэне
Яна яго і гэтых гарлахватаў,
Якім не спадабаўся двор наш? — Освальд!

Уваходзіць Освальд.

Пісьмо гатова да сястры?

ОСВАЛЬД

Гатова.

ГАНЕРЫЛЬЯ

Бяры людзей, садзіся на каня
І выязджай. Раскажаш ёй дакладна
Пра клопат наш. І ад сябе дадай,
Каб быў малюнак поўны. Разумееш?
Хутчэй! І там не баўся!

Освальд выходзіць.

Не, мілорд.
Хоць я не папракаю вас за мяккасць,
Але тым часам гэты ваш кісель,
Прашу мне дараваць, вам не да твару.
Вы — джэнтльмен, мужчына і павінны
Глядзець не ўніз, а ўгору.

АЛЬБАНІ

Жаданням чалавечым меж няма.
Сваю ты сцежку выбрала сама.

ГАНЕРЫЛЬЯ

І правільна.

АЛЬБАНІ

А гэта мы пабачым.

Выходзяць.

Сцэна пятая

Двор перад палацам Альбані.

Уваходзяць Лір, Кент і блазен.

ЛІР

Завязеш гэтыя пісьмы ў Глостэр. Не кажы маёй дачцэ нічога, пакуль яна сама ў цябе не запытаецца, прачытаўшы пісьмо. І не марудзь, а то я прыеду туды першы.

КЕНТ

Спаць не буду, вачэй не сплюшчу, а даручэнне выканаю, ваша вялікасць. *(Выходзіць.)*

БЛАЗЕН

Каб гэта мазгі ўмясціць у пяты, от быў бы вялікі гуз! Праўда, кум?

ЛІР

Праўда, мой хлопчык.

БЛАЗЕН

Не журыся, кум: падмазалі нам пяты добра, а каб не свярбелі мазгі, я іх табе зараз пачухаю.

ЛІР

Ха-ха-ха!

БЛАЗЕН

Твая другая дачка прыме цябе з радасцю. Укусіў ты ад грушы-камянічкі, паспытаеш цяпер ад райскага яблычка, але я ведаю...

ЛІР

Што ты ведаеш?

БЛАЗЕН

Што ў райскіх яблычках чарвей многа. А ведаеш, кум, чаму нос тырчыць пасярэдзіне?

ЛІР

Не.

БЛАЗЕН

Каб не драмалі вочы. Чаго не даглядзеў вокам, данюхаеш носам.

ЛІР

Я быў несправядлівы да яе...

БЛАЗЕН

А можаш ты сказаць, як вустрыца будуе сваю ракавіну?

ЛІР

Не.

БЛАЗЕН

І я не магу. Але я магу сказаць, чаму слімак ніколі не вылазіць са свайго доміка.

ЛІР

Чаму?

БЛАЗЕН

Бо яму дзеці рожкі паабрываюць.

ЛІР

Мне трэба перайначыць сваю натуру.— Прагнаць такога добрага бацьку! — Коні гатовы?

БЛАЗЕН

Іх сядлаюць твае аслы. Цікава, чаму, калі на небе сем зорак, то іх толькі сем?

ЛІР

Бо восьмая не ўзышла.

БЛАЗЕН

Правільна, кум. Ты адбіраеш у мяне хлеб.

ЛІР

Я вазьму ўладу сілаю. Я табе пакажу, ненавісная пачвара!

БЛАЗЕН

Каб не я ў цябе, а ты ў мяне быў блазнам, то я б табе ўсыпаў за тое, што ты так рана састарэў.

ЛІР

Чаму так?

БЛАЗЕН

Не набраўшы розуму, нельга старэць.

ЛІР

Дай мне цярпення, божа! Дай цярпення! Я вар'яцею...

Уваходзіць дваранін.

Што? Гатовы коні?

ДВАРАНІН

Гатовы, уладар.

ЛІР

Хадзем, мой хлопчык.

БЛАЗЕН

Хачу і дзяўчатам сказаць я славечка:
Дзе блудзіць баранчык, там стогне авечка.

Выходзяць.

АКТ ДРУГІ

Сцэна першая

Двор у замку Глостэра.

Уваходзіць Эдмунд, яму насустрач Куран.

ЭДМУНД

Прывітанне, Куран.

КУРАН

Маё вам таксама, сэр. Я толькі што ад вашага бацькі, перадаў яму паведамленне, што герцаг Корнуал і герцагіня Рэгана сёння ўночы будуць у нас.

ЭДМУНД

З чаго ж бы гэта?

КУРАН

Не ведаю. А вы чулі апошнія навіны? Ведаеце, на што намякаюць людзі? Пакуль што гэта вялікі сакрэт.

ЭДМУНД

Што такое? Скажы, будзь ласкаў.

КУРАН

Як? Хіба вы не чулі, што будзе вайна паміж герцагам Альбані і герцагам Корнуалам?

ЭДМУНД

Не, не чуў.

КУРАН

Ну, то хутка пачуеце. Бывайце здаровы, сэр.

(Выходзіць.)

ЭДМУНД

Сюды прыедзе герцаг. Вельмі добра!
Усё складаецца як мае быць.
Стары крычыць і енчыць, даў каманду
Узяць пад варту сына. Скарыстаю
Яшчэ адзін я далікатны спосаб.
Без рызыкі няма і ўдачы.— Брат!
Сюды ідзі, спускайся! Чуеш, Эдгар!

Уваходзіць Эдгар.

Дазнаўся бацька. Брат, бяжы адгэтуль.
І хто гэта данёс, дзе ты схаваўся?
Знайшоўся ж нехта!.. Ноч табе спрыяе.
Ты супраць герцага не гаварыў?
Бо герцаг Корнуал і з ім Рэгана
Да нас раптоўна едуць. Іх чакаюць

З хвіліны на хвіліну. Што ім трэба? —
А на двары так цёмна! — Можа, ты
Падтрымліваеш герцага Альбані?
Ты не заблытаны у іхніх спрэчках?
Успомні, брат.

ЭДГАР

Нічога не казаў я
І не заблытаны ні ў чым.

ЭДМУНД

Цішэй!
Сюды йдзе бацька.— Выбачай.— І вымі
Для віду меч, нібыта будзем біцца.—
Абараняйся! — Вельмі трапны выпад! —
Цяпер бяжы, каб бацька не злавіў.—
Гэй, пасвяціце мне! — Ратуйся, брат! —
Агню, агню! — Шчаслівае дарогі.

Эдгар выходзіць.

Крыху крыві, і ён тады паверыць,
Што бой быў люты.
(Раніць сабе руку.)
У п'янцы часам і не гэтак колюць.—
Стой, стой! — Дапамажыце! — Бацька, бацька!

Уваходзіць Глостэр і слугі з паходнямі.

ГЛОСТЭР

Дзе гэты злодзей, Эдмунд?

ЭДМУНД

Ён быў тут;
Стаяў у змроку, агаліўшы меч,
І, пазіраючы на месяц бледны,
Шаптаў закляцці жудасныя.

ГЛОСТЭР

Дзе ён?

ЭДМУНД

Мяне паранілі...

ГЛОСТЭР

Дзе гэты злодзей?

ЭДМУНД

Пабег туды. Дарэмна ён хацеў...

ГЛОСТЭР

Лавіць! Хапаць!

Слугі выходзяць.

Чаго хацеў ён, Эдмунд?

ЭДМУНД

Схіліць, каб я забіў вас, ваша светласць.
Я даў яму адповедзь, я сказаў:

Вялікі грэшнік, не гняві багоў,
Не спакушай мяне на душагубства;
Апомніся, свяшчэнна сувязь родных,
Пярун нябесны пакарае тых,
Хто замышляе ліха супраць бацькі.
Убачыўшы, што я, агіды поўны,
Не паддаюся на ўгаворы, ён,
Раз'юшаны, мячом мяне параніў,—
Вось — у крыві рука. Але мой дух
Быў так узняты і ў вачах гарэў
Такі агонь нянавісці, што здраднік
Спужаўся і, пачуўшы крык трывожны,
Уцёк адразу.

ГЛОСТЭР

Не ўцячэ далёка.
Дзе б ён ні быў, яго чакае кара.
У гэту ноч да нас прыедзе герцаг,
Мой гаспадар і дарагі заступнік.
І ад яго імя я аб'яўляю,
Што кожнаму, хто ліхадзея знойдзе
І прывядзе, аддзякуем мы шчодра,
Таму ж, хто дасць яму прытулак,— смерць.

ЭДМУНД

І колькі я яго ні пераконваў,
Як ні упрошваў, ён быў непахісны.
Расхваляваўшыся, я прыгразіў,
Што выкрыю яго. А ён мне кажа:
«Байструк ты незаконны! Як ты смееш
Са мной раўняцца! Думаеш, сумленне
Паможа выслужыцца? Паспрабуй!
Галяк бяспраўны, хто табе паверыць?
Я не баюся, што ў цябе пісьмо,—
Пісьмо фальшывае. Перад усімі
Я дакажу, што ты ілгун, зайздроснік,
Што ты заняўся практыкай вядзьмарскай,
Каб зжыць са свету брата і прысвоіць
Сабе яго дабро».

ГЛОСТЭР

О чорны змей!
Што чую? — і пісьмо не прызнае?
Як мог я парадзіць такога сына!

Трубы за сцэнай.

Ага, наш герцаг трубіць! — Не ўцячэ

Нікуды ён. Я гавані замкну
І выстаўлю пасты па ўсіх дарогах
З дазволу герцага. Яго прыкметы
Я разашлю ва ўсе канцы дзяржавы,
І гада затрымаюць. Любы Эдмунд,
Сынок мой дарагі, цяпер ты будзеш
Адзін маім наследнікам законным.

Уваходзяць Корнуал, Рэгана і світа.

КОРНУАЛ
Што здарылася, друг мой? Не паспеў
З каня я злезці, як мяне здзівілі
Жахлівай навіной.

РЭГАНА Няўжо ён мог?
Ды за такое ліхадзейства мала
Садраць з жывога скуру. Як здароўе,
Шаноўны Глостэр?

ГЛОСТЭР
Ох, мая мілэдзі,
Разбілі мне маё старое сэрца.

РЭГАНА
Ваш Эдгар, бацькаў хроснік, той, якому
Мой бацька даў імя, шукаў вам смерці?

ГЛОСТЭР
Мне так балюча! Ах, мая мілэдзі,
І прызнавацца сорамна.

РЭГАНА Скажыце,
А ці не быў ён там — пры маім бацьку?
Не кампаньён яго разбойнай світы?

ГЛОСТЭР
Не ведаю. Не ведаю. Нягоднік!

ЭДМУНД
А як жа. Быў, святлейшая мілэдзі.

РЭГАНА
Тады ўсё ясна. Школа і навука
Яго злачынстваў — дрэнныя сябры.
Бандыты гэтыя, каб разам з ім
Прагульваць скарбы, піць і есці смачна,
Яго штурхалі на забойства. Сёння
Я атрымала ліст. Сястра мне піша
Пра гэту зграю жудасныя рэчы
І папярэджвае мяне, што скора
Яны ўваляцца ў мой дом. Не буду
Я з імі жыць!

КОРНУАЛ

Я гэтак жа, Рэгана.—
Ты, кажуць, Эдмунд, выратаваў бацьку,
Рызыкаваў сабой? Хвалю, хвалю.

ЭДМУНД

Я выканаў свой абавязак, сэр.

ГЛОСТЭР

Ён выкрыў подступ злодзея. Глядзіце,
Як хлопцу беднаму руку пасеклі.

КОРНУАЛ

Пагоня выслана?

ГЛОСТЭР

Паслалі, сэр.

КОРНУАЛ

Абы схапілі! Тут жа і расправа,
Каб больш не шкодзіў. Я вас падтрымаю
Усім маім аўтарытэтам.— Эдмунд,
Нам падабаецца твая адданасць.
Рэкамендацый іншых нам не трэба,
Ты будзеш наш, цябе мы далучаем
Да нашай світы. Мы высока цэнім
Натуры маладыя з мужным сэрцам.
Заўжды захоўвай вернасць.

ЭДМУНД

Рад служыць вам,
Святлейшы сэр.

ГЛОСТЭР

Удзячны вам за сына.

КОРНУАЛ

А знаеце, чым выклікан візіт наш...

РЭГАНА

У гэты позні час, глухою ноччу?
Шаноўны Глостэр, важныя прычыны
Прымусілі нас выехаць паспешна
Да вас у замак. Бацька і сястра
Абое пішуць нам, што ў іх нязгода,
Я ім хацела з дому даць адказ,
Але рашыла мець нараду з вамі.
Ганцы іх тут. О добры даўні друг наш,
Уцішце сэрца боль і вашы думкі
Скіруйце ў бок нялёгкай справы нашай.
Парайце нам.

ГЛОСТЭР

Я ваш слуга, мілэдзі.
Прашу ў пакоі, дарагія госці.

Сцэна другая

Перад замкам Глостэра.

Уваходзяць Кент і Освальд, з розных бакоў.

ОСВАЛЬД

Добры вечар, дружок. Ты тутэйшы?

КЕНТ

Тутэйшы. Але я табе не дружок.

ОСВАЛЬД

Куды б гэта коней паставіць, мілы чалавек?

КЕНТ

У лужыну.

ОСВАЛЬД

Які ты? Я да цябе з любоўю, а ты з нейкай фанабэрыяй.

КЕНТ

Пляваць мне на тваю любоў!

ОСВАЛЬД

Падумаеш, які зух!

КЕНТ

Шкада, што ты не ў хляве, вяпрук,— закалоў бы я цябе на сала.

ОСВАЛЬД

Што ты маеш да мяне, чалавеча? Я цябе не ведаю.

КЕНТ

Затое я цябе ведаю.

ОСВАЛЬД

А хто я, па-твойму.

КЕНТ

Гультай, шэльма, блюдаліз; нізкая, тоустая, доугая, дваццаціпудовая кормная свіння. Брудная жывёліна ў штанах і панчохах, што сядзіць перад люстрам, любуецца на свой лыч і сама сябе чухае. Сербахлёб па чужых памыйніцах. Ненажэрнае горла, варэпаўка пузатая, вош куслівая, паразіт. Круцішся на вачах у паноў, зараза, пакуль выспятка не далі. Халоп ты спрадвечны, і дзяды твае і прадзеды. У-у-у, брыдота! Па натуры воўк, а баязлівы, як заяц. Не рохкай, не рохкай! Чаго вытрашчыўся? Слухай, што табе людзі кажуць. Што? Не пазнаў сам сябе? Закуска не падабаецца? Я з цябе фарш зраблю, свіное ты рыла; так дам, што завішчыш не сваім голасам.

ОСВАЛЬД

Адкуль узялося гэта страшыдла? Напасці на незнаёмага чалавека і так аблаяць ні з таго ні з сяго!

КЕНТ

Я табе дам «ні з таго ні з сяго»! Кароткая памяць у цябе, абармоцкая твая храпа! Забыў, як два дні таму назад паставіў я цябе дагары нагамі ў прысутнасці караля і як ты выпаўзаў ад яго на карачках, франт з паліваным носам? Вымай меч, паскуда! Нічога, што ноч, мне і месяц пасвеціць. Я спушчу з цябе юху чарцям на падліўку, сабачая твая печань! Вымай меч!

(Вымае меч.)

ОСВАЛЬД

Адыдзі ад мяне! Чаго ты да мяне прычапіўся!

КЕНТ

Вымай меч, падлюга! Вазіць даносы на караля! Зневажаць яго вялікасць! Пасол ад бабскае спадніцы! Вымай меч, а то будзеш, як рэшата. Вымай меч, ягоднік!

ОСВАЛЬД

А мамачкі! Ратуйце! Гвалт! Гвалт!

КЕНТ

Вымай, гад! Абараняйся! Куды ўцякаеш, падла?

(Б'е яго.)

ОСВАЛЬД

А мамачкі! Забіваюць!

Уваходзяць Эдмунд, Корнуал, Рэгана, Глостэр і слугі.

ЭДМУНД

Прэч! Я вам пакажу! Што тут такое?

КЕНТ

Зялёны ты яшчэ, хлопча, мне паказваць. Ідзі сюды, падужаемся, я цябе трошкі прывучу да сырога мяса.

ГЛОСТЭР

Мячы ў руках! Чаго вы? Што за сварка?

КОРНУАЛ

Спыніць! Хто варухнецца, той не ўстане.
Што тут у вас?

РЭГАНА

Ганцы ад караля

І ад сястры.

КОРНУАЛ

Чаго не падзялілі?

ОСВАЛЬД

Сэр, я ледзьве дыхаю, сэр.

КЕНТ

Засопся, даганяючы сваю храбрасць. Што, шэльма, баішся за свой трыбух? Прырода не магла стварыць такую дрэнь. Мабыць, цябе шыў кравец з гнілое матэрыі гнілымі ніткамі.

КОРНУАЛ

Дзіўныя словы! Калі гэта было, каб кравец шыў чалавека?

КЕНТ

Толькі кравец, сэр. Яны ўсе партачы. Ні маляр, ні муляр такога паскудства не зробяць.

КОРНУАЛ

Чаго вы завяліся? Што ў вас выйшла?

ОСВАЛЬД

Святлейшы сэр, вось гэты грубіян,
Якога я, шануючы яго
Сівую бараду, пашкадаваў,
Якога я...

КЕНТ

Я, я... Затычка ты паскудная! Першая літара ад хваста! Ён мяне пашкадаваў? — Дазвольце, мілорд, я растаўку яго ў ступе і вымажу смердзюхом гэтым сцены ў нужніку.— Жаба надзьмутая! Кулік балотны!

КОРНУАЛ

Маўчы, халоп! Знай, перад кім стаіш.

КЕНТ

Я знаю, сэр. Але я повен гневу.
Гарыць нутро маё.

КОРНУАЛ

Чаго ты ўз'еўся?

КЕНТ

Што гэты раб, як рыцар, носіць меч,
А гонару не мае ні на волас.
З ухмылачкай такія пацукі
Гатовы перагрызці ўсякі вузел,
Любую сувязь між людзьмі. Цалуюць
Бізун у кулаку гаспадара,
Раздзьмухваюць распалены пажар,
На вушка шэпчуць, божацца і хлусяць
І, праглынуўшы ў свой жывот сумленне,
На свеце множаць ліха. Падхалімы!
Падлізнікі! Сабачыя натуры!

Чуму ім чорную ў тупыя морды! —
Не смейцеся! — Чаго, гусак, гагочаш?
Папаўся б ты мне на Сарэмскім полі,
Загнаў бы я цябе ў Камлот.

КОРНУАЛ Ты што,
Здурэў, стары?

ГЛОСТЭР Чаго ты ўзбушаваўся?

КЕНТ
Я ненавіджу подласць. Я і ён —
Дзве процілегласці.

КОРНУАЛ
Ты кажаш: подласць?
Чым ён перад табою правініўся?

КЕНТ
Мне твар яго агідны.

КОРНУАЛ Твар агідны?
(Паказваючы на Эдмунда і на Рэгану.)
Дык, можа, і яна, і я, мы ўсе
Табе не даспадобы?

КЕНТ
Сэр, прабачце,
Я чалавек праўдзівы і скажу:
Даводзілася бачыць мне ў жыцці
Людзей намнога лепшых.

КОРНУАЛ Вось як? Смела!
Мы хамаў ведаем. Даволі раз
Іх пахваліць за прастату, яны
Вас аплююць сваёю прастатою.
Ліслівіць ён не хоча, рубіць праўду
Ў брыво, у вока, ў лоб — яму ўсё роўна,
Ён — шчыры. Знаем вас, прахвостаў шчырых!
У вашым праўдалюбстве, як у багне,
Гнюсоты і каварства ў сто разоў
Таіцца больш, чым у душы халопа
Пакорнага, услужлівага.

КЕНТ Сэр,
У трапятанні здзіўленага сэрца
Перад бліскучым вашым хараством,
Што зіхаціць у німбе залатым,
Як сонечная калясніца...

КОРНУАЛ
Што?

КЕНТ
Нічога, сэр. Прабую адвыкнуць ад простай мовы, якая

вам не да густу. Шліфую свой шурпаты язык. Калі той хам, пра якога вы гаворыце, вас аплявaў прастатою, на тое ён і хам. Не, сэр, я не з такіх людзей, хоць вам і вельмі хочацца, каб я быў такім.

КОРНУАЛ

(да Освальда)

Чым ты яго пакрыўдзіў?

ОСВАЛЬД

Я? Нічым.
Не так даўно кароль, яго ўладар,
Быў не ў гуморы і мяне ударыў.
І вось, жадаючы унаравіць
Яго благім настроям, ён зайшоў
За спіну мне, збіў з ног і над ляжачым
Чыніў і глум, і здзек. Яго учынак
Кароль адобрыў. Маючы падтрымку,
Нахабнік гэты гордасці набраўся
І сёння зноў, угледзеўшы мяне,
Накінуўся, як тыгр.

КЕНТ

Паслухаць шчанюка, што брэша з будкі,
Дык ён герой, храбрэйшы, чым Аякс.

КОРНУАЛ

Падаць калодкі! — мы цябе правучым,
Махляр стары!

КЕНТ

Сэр, позна мне вучыцца.
Калодкамі не пагражайце. Я —
Пасол яго вялікасці. Прыехаў
Па даручэнні караля. І вы,
Караючы мяне злым самаўпраўствам,
Яго асобу ганьбіце.

КОРНУАЛ

Калодкі!
Клянуся гонарам, ты прасядзіш
У іх да поўдня.

РЭГАНА

Што? Да поўдня? Мала.
Хай дзень сядзіць і ноч сядзіць.

КЕНТ

Мілэдзі,
Каб я быў бацькі вашага сабакам,
І то на ласку меў бы права.

РЭГАНА

Сэр,
Вас трэба лашчыць кіем.

Прыносяць калодкі.

КОРНУАЛ

Бунтаўшчык!
Відаць, адзін з тых самых, пра якіх
Сястра пісала нам.— Надзець калодкі!

ГЛОСТЭР

Святлейшы мой, прашу я вас, не трэба.
Ён нагрубіў, і добры наш кароль
За гэта не даруе. Але кара,
Якую вы у мэтах выхавання
Мяркуеце ужыць, даецца толькі
Істотам нізкім, подлым, за крадзеж
І дробныя правіннасці. Балюча
І крыўдна будзе каралю старому.
Уважце, сэр.

КОРНУАЛ

Адказваць буду я.

РЭГАНА

Мая сястра пакрыўдзіцца яшчэ больш,
Што джэнтльмен яе, пасланы к нам,
Меў непрыемнасць.— Ушчаміце ногі!
Няхай сядзіць.

Кента садзяць у калодкі.

Хадзем адгэтуль, друг мой.

Выходзяць усе, апроч Глостэра і Кента.

ГЛОСТЭР

Шкада цябе мне, братка; герцаг наш
Суровы чалавек, круты, няўмольны.
Але ты не бядуй, я заступлюся.
Пачну хадайнічаць.

КЕНТ

Не трэба, сэр.
Змарыўся я з дарогі і не спаў:
Пасплю гадзінку, потым пасвішчу.
Хто ведае, дзе захавана шчасце.
Да пабачэння.

ГЛОСТЭР

Нядобра робіць герцаг, ох, нядобра!
(Выходзіць.)

КЕНТ

Кароль мой, праўду прыказка гаворыць:
Змяніў ты рай на пекла.
Глянь на мяне з вышынь, маяк нябесны,

Дай мне св[illegible]б мог я прачытаць
Весць радасную.— Толькі у нядолі
З'яўляюцца нам дзівы.— Не забыла
Кардэлія пра нас, пісьмо прыслала;
Дачулася, што мы ў бядзе вялікай,
Дазналася, дзе я. Збавенне прыйдзе.
Засну, самкну стамлёныя павекі,
Каб знік з вачэй ганебны гэты дом.
Фартуна, усміхніся мне яшчэ раз!
Спакойнай ночы.
(Засынае.)

Сцэна трэцяя

Дзікае поле.

Уваходзіць Э д г а р.

ЭДГАР

Я чуў свой вырак.
Ледзь-ледзь уратаваўся ад пагоні,
Схаваўшыся ў дупле. Няма дзе дзецца.
Узброеная варта раз'язджае
Па ўсіх кутках. Да мора не падыдзеш,
Адразу зловяць. Трэба нешта думаць.
Змяню аблічча. Беднасць і нядоля
Звярамі робяць нас. Што ж, апушчуся
На тое дно, дзе тонуць адшчапенцы:
Абмажу брудам твар, парву адзежу,
Ўскудлачу валасы, на паясніцу
Дзяругу начаплю і, як бяздомак,
Бадзяцца буду пад дажджом і ветрам.
Наш край кішыць вар'ятамі, жабрацтва
Усюды, скрозь. Па сёлах і па фермах,
Па выганах, каля млыноў і рэк
Блукаюць з енкам гіблыя істоты,
Яны працягваюць худыя рукі,
Панатыкаўшы ў іх цвікоў, калючак,
І, жудасныя, з рогатам шалёным
Альбо малітвай ціхай, просяць хлеба.
О бедны Том! О бедны Тэрлігод! —
Вас ведаюць, шкадуе вас народ.
А Эдгара ніхто не ўспомніць.
(Выходзіць.)

Сцэна чацвёртая

Перад замкам Глостэра.

Уваходзяць Лір, блазен і рыцар.

ЛІР

Тут нешта ёсць. Чаго было ім ехаць?
Ганца майго не адаслалі...

РЫЦАР

Сэр,
Магу вам далажыць: яшчэ учора
Ніхто з іх не збіраўся ў падарожжа.

Уваходзіць Кент.

КЕНТ

Вітаю вас, вялікі уладар.

ЛІР

А! Гэта ты? Што за ганебны жарт!

КЕНТ

Які тут жарт!

БЛАЗЕН

Ха-ха-ха! Хто гэта ўдружыў табе драўляныя чобаты? Коням надзяюць аброць, сабакам і мядзведзям ашыйнікі, малпу прывязваюць за тулава, а чалавеку ўшчамляюць ногі, каб сядзеў і не рыпаўся. Дзе ты дастаў такі раскошны абутак?

ЛІР

Хто мог абважыцца? Што гэта значыць?
Хто пасадзіў цябе сюды?

КЕНТ

Ваш зяць
І вашая дачка.

ЛІР

Няпраўда!

КЕНТ

Праўда.

ЛІР

Ілжэш!

КЕНТ

Не.

ЛІР

Быць не можа!

КЕНТ

Праўда, сэр.

ЛІР

Юпітэрам клянуся, не.

КЕНТ

Юпітэрам клянуся, так.

ЛІР

Яны не зробяць гэтага, не могуць,
Рука ў іх не падымецца. Ды гэта ж
Горш, чым забойства. Кроўная абраза.
Хутчэй расказвай, што ты натварыў,
За што яны цябе. Кажы парадкам.

КЕНТ

Мой уладар, з'явіўшыся ў іх дом,
Пачціва я укленчыў і падаў
Ад вашае вялікасці пасланне.
І не паспеў я ўстаць, як убягае,
Задыханы, увесь абліты потам,
Ганец ад Ганерылы і, нахабна
Мяне спыніўшы, ім падсунуў ліст.
І ліст той быў прачытаны адразу.
Пасля чаго яны сазвалі дворню
І выехалі, загадаўшы мне
Халодным тонам: быць непадалёку.
Чакаць, пакуль іх светласці адпішуць.
І тут ізноў папаўся мне на вочы
Той самы пасланец, юрлівы шкоднік,
Які нядаўна вас пасмеў зняважыць
І ўсюды лезе першы. Гнеў ударыў
Мне ў галаву, і памутнеў мой розум.
Схапіў я меч. А ён як закрычыць,
Падняў усіх. Дачка ваша і зяць
Знайшлі патрэбным пакараць мяне,
Як бачыце.

БЛАЗЕН

Не ў той бок паляцелі гусі.
Э, да вясны яшчэ далёка.
Было ў бацькі шмат дабра,
Ён падабаўся дочкам,
А як раздаў усё, з двара
Пайшоў у свет з кіёчкам.
Няма удачы бедняку:
Усюды дзверы на замку.
Эх, кум, набраўся ты ліха на цэлы год.

ЛІР

Як сэрца наліваецца тугою!

О роспач, роспач! Не паддамся смутку!
Уцішся, боль! Дзе гэтая дачка?

КЕНТ

У замку графа, сэр.

ЛІР

Пабудзьце тут,
Адзін пайду.
(Выходзіць.)

РЫЦАР

І больш нічога? І за гэта кара?

КЕНТ

За гэта кара.
Чаму у караля так мала світы?

БЛАЗЕН

За такое пытанне я б на цябе начапіў калодкі яшчэ большыя, пудоў на дваццаць.

КЕНТ

За што ж гэта, дурань?

БЛАЗЕН

Ты хоць бы ў мурашак павучыўся: яны зімой не працуюць. Кожны шукае цяплейшага кутка: хто відушчы — вачамі, а хто сляпы — той вобмацкам; і што гэта за нос, які не чуе смуроду ад падлы. Не чапляйся, калі кола з гары коціцца — карак скруціш; чапляйся, калі ўгору імчыць,— сам на гары будзеш. Няхай табе разумны дасць лепшую параду, а мне, дурню, аддай маю: ёю будзе карыстацца шэльма — яны дурняў любяць.

Той, хто, віляючы хвастом,
Падлізваўся ўвесь час,
Калі над вамі грымне гром,
Пакіне першы вас.
Я — дурань, да ўсяго прывык,
Ад вас не пабягу,—
Магу быць дзёрзкім на язык,
Быць подлым не магу.

КЕНТ

Спяваеш, дурань?

БЛАЗЕН

А чаго мне плакаць, дурань? Я ж не ў калодках.

Уваходзяць Лір і Глостэр.

ЛІР

Прыняць не могуць, кажаш? Захварэлі?
Здарожыліся? Ехалі ўсю ноч?

Хлусня! Непаслушэнства! Адгаворкі!
Схадзі яшчэ раз.

ГЛОСТЭР Дарагі кароль мой,
Вы знаеце, які гарачы герцаг,
Які ён наравісты і упарты
Ў сваіх рашэннях.

ЛІР Смерць! Чума! Пагібель!
Упарты? Наравісты? — Глостэр, Глостэр,
Каму ты гэта кажаш? Далажы ім,
Што я жадаю бачыць іх. Ты чуеш?

ГЛОСТЭР
Я ім дакладваў, вашая вялікасць.

ЛІР
Дакладваў? — Мабыць, ты не ўсё дакладваў.
Мяне ты разумееш?

ГЛОСТЭР Разумею.

ЛІР.
Кароль жадае герцага пабачыць,
Дачку абняць жадае родны бацька,
Чакае ласкі і прывету. Глостэр,
Ты гаварыў ім гэта? — Кроў мая!
Часціна майго цела! — Наравісты,
Гарачы герцаг! Дык пайдзі скажы
Гарачаму ты герцагу, што я...
Не, не, нічога. Мала што бывае.
Мо сапраўды ён занядужаў. Нельга
На хворых гневацца. Калі прырода
Нам пасылае боль, то чалавеку
Тады нішто не міла, і душа
Ў замарачэнні. Пацярплю.
(Глядзіць на Кента.)
Д'ябальства!
Ганец мой у калодках. Ясна ўсё.
Яны з намерам выехалі. Хітрасць!
Шукаюць дурняў! — Вызваліць яго! —
А ты ідзі, скажы, каб безадказна,
Каб зараз жа з'явіліся абое.
Пагавару я з імі. А не выйдуць,
Пачну у дзверы барабаніць так,
Што мёртвыя прачнуцца.

ГЛОСТЭР
Хоць бы ж яно наладзілася, ох!
(Выходзіць.)

ЛІР

Не вытрываю! К сэрцу падкаціла.

БЛАЗЕН

А ты па ім стукні палкай і крыкні, як тая кухарка на ўюноў, калі кідае іх жывымі ў цеста: «Ціха вы, рызыканты». А то яшчэ быў у тае кухаркі брат, ён так любіў свайго каня, што даваў яму сена з маслам.

Уваходзяць Корнуал, Рэгана, Глостэр і слугі.

ЛІР

Дзень добры вам.

КОРНУАЛ

І вам таксама, сэр.

Кента выпускаюць.

РЭГАНА

Я рада бачыць вашую высокасць.

ЛІР

Ты рада бачыць? Думаю, што рада:
На гэта ёсць прычыны. Калі б ты
Не рада мне была, то я б развёўся
З магілай мацеры тваёй, прызнаў бы
Яе за шлюху.
(Кенту.)
А, устаў нарэшце?
Пра гэта потым.— Любая Рэгана,
Твая сястра — зладзейка. О, Рэгана,
Яна мяне параніла сюды...
(Паказвае на сэрца.)
Змяя няўдзячная! Не маю слоў,
Каб выказаць табе, мая Рэгана,
Як горна мне і крыўдна. Ах, Рэгана!

РЭГАНА

Сэр, супакойцеся. Не веру я,
Каб абавязак свой сястра забыла.
Вы мала цэніце яе фатыгу,
Я так мяркую.

ЛІР

Я не разумею.

РЭГАНА

Яна аб вас клапоціцца. Але ж
У вашай свіце завялося хамства,
Прыйшлося абмяжоўваць. Што ж такога,
Ды гэта ж толькі на карысць, і крыўды
Ніякай тут няма.

ЛІР

Праклён ёй!

РЭГАНА

Сэр,
Вы чалавек стары, на схіле веку,
Адольвае вас немач. Неабходна,
Каб розум свежы вамі кіраваў,
Такі, што ведае натуру вашу
Лепш, чым вы самі. Я вам раю, сэр,
Вярнуцца да сястры і перад ёю
Прызнаць віну сваю.

ЛІР

Перапрашаць?
Каго? Яе? Наш род яшчэ не гнуўся.
(Становіцца на калені.)
Укленчыць і сказаць ёй: «Дарагая
Дачка мая, прымі мяне назад;
Стары я стаў, нікому не патрэбны,
Даруй мне, калі ласка, дай прытулак,
Вады і хлеба».

РЭГАНА

Перастаньце, сэр!
Трымайцеся прыстойна! Я вам раю
Усё ж вярнуцца.

ЛІР

Нізашто, Рэгана!
Яна апалавініла мне свету,
Абмежавала ўсе мае уцехі,
Яна мяне у сэрца укалола
Злым языком сваім. О помста неба,
Удар і пакарай яе за гордасць!
Няхай сухотка ўлезе ёй у косці,
Каб корчылася крукам!

КОРНУАЛ

Тфу, тфу, тфу!

ЛІР

Хай высмаліць ёй вочы бліскавіца!
Няхай ліхая пошасць ад балот,
Паднятая увысь магутным сонцам,
Усочыцца ў нутро ёй маладое,
Каб адцвіла без цвету!

РЭГАНА

Што я чую!
Вы будзеце і мне жадаць таго ж
У час нядобры?

ЛІР

Не, мая Рэгана.
Мае праклёны на цябе не лягуць.
Ты — далікатная, твая натура
Да жорсткасці не здатна. Лютым зверам
Яна глядзела на мяне; твой позірк
Пяшчотны, ласкавы, мяне ён грэе,
Не будзеш ты мае забавы ганьбіць,
Сварыцца, разганяць маіх людзей,
Не будзеш папракаць, што многа трачу.
І замыкаць на ключ свае пакоі,
Каб я не дакучаў. Ты так не зробіш,
Сардэчнае прыхільнасці да бацькі
Не заглушыла ты, маё дзіця.
Табе я даў палову каралеўства,
Ты гэта помніш.

РЭГАНА

Сэр, бліжэй да справы.

Трубы за сцэнай.

ЛІР

Хто пасадзіў майго ганца ў калодкі?

КОРНУАЛ

Хто трубіць там?

РЭГАНА

Прыехала сястра;
Яна пісала мне, што будзе ў госці.

Уваходзіць Освальд.

Скажыце, ваша лэдзі з вамі?

ЛІР

Вось ён,
Той подлы раб, што гонар свой пазычыў
З дзіравае кішэні паискай.— Вон,
Паскуда!

КОРНУАЛ

Сэр, што гэта значыць?

ЛІР

Хто закаваў майго слугу? — Рэгана,
Пра гэта ты не ведала, я знаю.

Уваходзіць Ганерылья.

Хто там ідзе? Яна ідзе.— О неба,
Калі ты любіш і шануеш старасць,
Калі ў тваіх прасторах ёсць спагада,

Калі ты вечнае, то заступіся,
Укрый мяне!
(Ганерылы.)
І як табе не брыдка
Глядзець мне ў твар? — Няўжо, Рэгана, ты
Дасі руку ёй?

ГАНЕРЫЛЬЯ

А чаму ж не даць?
Віны ў мяне ніякай. Вось яшчэ!
Не ўсё — ліхое, што ліхім здаецца
Старэчай дурасці.

ЛІР

О мускул сэрца,
Які ты жылісты! Ніяк не лопнеш.—
Хто пасадзіў майго ганца ў калодкі?

КОРНУАЛ

Я, сэр. За непачцівасць і буянства.
Спагнанне лёгкае занадта.

ЛІР

Ты?
Твая работа?

РЭГАНА

Бацька, я прашу вас,
Не трэба абурацца, спакайней.
Сястра вас прыме, раю вам вярнуцца,
Без лішняй світы толькі, дажывіце
Свой месяц у яе і прыязджайце
Да нас у замак. Тут выгод няма,
Ды і запасаў мала. Мы — не дома.

ЛІР

Вярнуцца да яе? Паменшыць світу?
Я лепш бадзяцца буду ў дзікім полі,
На ветры мерзнуць, ꞑокнуць пад дажджом.
Я лепей з лютым воўкам пасябрую,
З начной савой.— Васцёр нядолі зуб!
Жыць разам з ёю? Гэтага не будзе.
Ды я хутчэй паеду да Француза,
Што без пасагу ўзяць пагарачыўся
Малодшую дачку маю, укленчу
І, як васал, пачну прасіць падачкі,
Каб не памерці з голаду.— Вярнуцца! —
Мо ты параіш мне быць канюхом
У гэтага халопа?
(Паказвае на Освальда.)

ГАНЕРЫЛЬЯ

Воля ваша.

ЛІР

Дачка, паслухай, не даводзь мяне!
Я трачу розум... Што ж, бывай, дзіцятка!
Не буду замінаць табе, не буду
Хадзіць па сцежках вашых, мы — чужыя,
І ўсё ж ты мне радня, ты — кроў мая,
Плод немачы маёй, мая балячка,
Карбункул гнойны на маіх грудзях.
Я не кляну цябе. Надыдзе час —
І сорам прыйдзе сам. Я на цябе
Не скарджуся перад прастолам Зеўса
І вышняй кары не прашу. Стань іншай.
Калі ты можаш, у душу зірні,
Мо там дзе-небудзь ёсць яшчэ сумленне,
А я тым часам буду жыць з Рэганай,
Я і сто рыцараў.

РЭГАНА

О, што вы, сэр!
Я не магу трымаць такую колькасць,
Не маю сродкаў, я вас не чакала.
Сястра вам слушна прапануе. Кожны,
Калі глядзець на ваш запал спакойна,
Вам скажа, што старыя вы. Сястра —
Практычная, яна ўсё з толкам робіць.

ЛІР

Так думаеш?

РЭГАНА

І гавару у вочы.
Паўсотні чэлядзі хіба вам мала?
Нашто вам больш, дазвольце запытаць?
І гэта многа. Жарты, пяцьдзесят!
Выдаткі лішнія і небяспечна.
Не могуць столькі слуг ужыцца мірна
Ў адным двары у двух гаспадароў.
Не абярэшся клопату.

ГАНЕРЫЛЬЯ

Мілорд,
Чаму б вам не згадзіцца ўзяць абслугу
Яе альбо маю?

РЭГАНА

Я той жа думкі.
Калі пакрыўдзяць вас, мы з іх спагонім,
Мы іх правучым. Вось што я скажу,
Калі мяркуеце вы жыць са мною,

А я прадбачу гэта, я прашу вас,
Пакіньце дваццаць пяць.

ЛІР

Я вам усё аддаў...

РЭГАНА Пахвальны ўчынак.

ЛІР

Аддаў уладу вам, маё багацце
З умоваю, што пры сабе пакіну
Сто рыцараў. Няўжо мяне ты прымеш
З такой мізэрнай світы? Дваццаць пяць!
Я, можа, не дачуў?

РЭГАНА О не, мілорд,
Вы правільна пачулі. Дваццаць пяць.

ЛІР

І злая баба перад бабай злейшай
Здаецца добраю.
(Ганерылі.)
Хай будзе так.
Паеду да цябе. Паўсотні слуг
Усё ж не дваццаць пяць. Ты любіш болей.

ГАНЕРЫЛЬЯ

Па-мойму, сэр, і дваццаць пяць вам многа.
Нашто вам дзесяць, пяць, калі ў нас слуг
Сваіх хоць адбаўляй. Належны догляд
Мы вам дадзім.

РЭГАНА

І аднаго не трэба.

ЛІР

Што значыць — трэба? Тое, што нам трэба,
І ў самых бедных ёсць. Жабрак апошні —
І той дастатак мае ў неабходным.
Абмежаваць прыроду чалавека,
Спыніць яго імкненні — і жыццё
Звярыным стане. Ты вось — герцагіня,
У пышным плацці ходзіш, хоць убор твой
Цябе не грэе, нам жа трэба толькі
Крыху цяпла і сонца.— Што мне трэба?
О божа, божа, мне цярпенне трэба.
Ці чуеш ты мяне, слабога старца,
Раздаўленага горам і гадамі?
Ці бачыш ты маё няшчасце? Неба,
Калі азлобіла ты гэтых дочак,
Што бацьку мучаць, катуюць,— даволі!
Не здзекуйся, каб я трываў пакорна,

А запалі ва мне высокі гнеў!
Пазбаў мяне жаночай зброі — слёз,
Дай мужнасці! — Не, ведзьмы, не!
Я вам адпомшчу, я вам так адпомшчу,
Што ўся зямля... О, я зраблю такое!..
Я сам не ведаю, але ўвесь свет
Ад жаху здрыганецца. Я не плачу.
Не думайце, што я заплачу!
Мне ёсць аб чым заплакаць, але сэрца
Хутчэй расколецца, крывёю пырсне
У вочы вам, чым я заплачу! — Блазен,
Я вар'яцею.

Выходзяць Лір, Глостэр, Кент і блазен.

КОРНУАЛ
Хадзем адгэтуль, будзе навальніца.

Чуваць далёкія грымоты.

РЭГАНА
Малы ўсё ж дом. Няма дзе размясціць
Старога і людзей.

ГАНЕРЫЛЬЯ
Сам вінаваты.
Не захацеў спакою, дык няхай,
Шалёны, каецца.

РЭГАНА
Яго самога
Я прыняла б ахвотна, але толькі!
Без світы.

ГАНЕРЫЛЬЯ
Безумоўна, я таксама.
А дзе граф Глостэр?

Уваходзіць Глостэр.

КОРНУАЛ
Вось ён, тут;
Старога выправаджваў за вароты.

ГЛОСТЭР
Кароль у лютым гневе.

КОРНУАЛ
А куды ж ён
Мяркуе ехаць?

ГЛОСТЭР
Загадаў сядлаць.
Куды сабраўся, да каго сабраўся,
Не ведаю.

КОРНУАЛ

Хай едзе — свет вялікі,
Затрымліваць не будзем.

ГАНЕРЫЛЬЯ

Цалкам згодна.
Падумаеш! Не нам яго упрошваць.

ГЛОСТЭР

Ноч набліжаецца. Халодны вецер
Пранізвае наскрозь. На многа міль
Хоць бы дзе дрэўца.

РЭГАНА

Граф, людзям свавольным
Бяда, накліканая імі ж, будзе
Служыць навукаю. Замкніце браму!
Сярод мяцежных рыцараў ён можа
Схіліць сваё падатлівае вуха
На ўсякі нагавор. Нам трэба быць
Напагатове.

КОРНУАЛ

Дзверы на завалу!
Якая ноч! Рэгана раіць слушна.
Перачакаем навальніцу ў замку.

Выходзяць.

АКТ ТРЭЦІ

Сцэна першая

Дзікае поле.

Бура з громам і бліскавіцамі.
Уваходзяць з розных бакоў Кент і дваранін.

КЕНТ

Хто тут блукае ў буру?

ДВАРАНІН

Чалавек,
Як гэта бура, неспакойны духам.

КЕНТ

Я вас пазнаў. А дзе кароль?

ДВАРАНІН

Змагаецца з разгневанай стыхіяй.
Ён просіць вецер, каб здзьмухнуў у мора
Зямлі нікчэмны шар альбо падняў
Слуп вадзяны, шпурнуў яго на сушу
І, змыўшы нечысць, перайначыў свет.
Рве валасы сівыя, і без жалю
Іх расцярушвае халодны вецер.
Сячэ мячамі дождж, пярун грукоча,
А ён слабою сілай чалавечай
Перамагчы імкнецца бунт нябёс.
Ў такую ноч ляжыць у берлагу
Галодная мядзведзіца; і леў,
І воўк худы мачыць не будзе шэрсці.
Як прывід, з непакрытай галавой,
Ён бегае у роспачы па полі.

КЕНТ

Хто з ім яшчэ?

ДВАРАНІН

Нікога, толькі блазен
Стараецца яго адчай развеяць
Сваімі жартамі.

КЕНТ

Я знаю вас.
І вам, мілорд, магу даверыць тайну
Для ўсіх нас важную. У неладах,
Хоць гэта і не кідаецца ў вочы,
Альбані з Корнуалам. Ёсць у іх,
Як і у кожнага, хто ўзняты лёсам
Высока над людзьмі, сярод прыдворных
Разведчыкі-шпіёны. І французам
Вядома ўсё, што дзеецца у нас:
Грызня паміж наследнікамі трона,
Нялюдскі гвалт і здзекі з караля.
Ёсць, мабыць, і глыбейшыя прычыны,
Адкуль бярэ свае вытокі смута,
А толькі факт бясспрэчны, што французы
На нас ідуць вайной. Нядбайнасць наша,
Драбленне ўлады і падзел зямель
Дазволілі ім высадзіцца ўпотай
У нашых лепшых гаванях, і хутка
Яны адкрыта выступяць. Дык вось,
Даверыўшыся вам, я вас прашу
Як найхутчэй накіравацца ў Довер,

Там знойдзеце прыхільнікаў, якія
З падзякай выслухаюць слова праўды
Аб жудасных пакутах караля.
Я — кроўны дваранін, адной мы думкі,
І гонар ваш — гарантыя, што справа
Ў руках надзейных.

ДВАРАНІН

Я хацеў бы з вамі
Пагаварыць яшчэ.

КЕНТ

Няма патрэбы.
А ў пацвярджэнне шчырасці маёй
І знатнасці пад вопраткаю простай —
Вазьміце ўсё, што ў гэтым кашальку.
Калі вам давядзецца мець размову
З Кардэліяй, а вы яе, напэўна,
Пабачыце, то пакажыце ёй
Мой персцень, і яна вам растлумачыць,
Хто я такі і што за чалавек.
А бура не сціхае. Дзе ж кароль?

ДВАРАНІН

Дазвольце, сэр, паціснуць вам руку.
Што маеце дадаць?

КЕНТ

Дадам нямнога.
Шукайце караля, ідзіце ў той бок,
Я ў гэты бок, і хто раней натрапіць
На след яго, хай першы адгукнецца.

Разыходзяцца.

Сцэна другая

Другая частка дзікага поля.

Бура не сціхае.
Уваходзяць Лір і блазен.

ЛІР

Дзьмі, вецер, дзьмі, пакуль не лопнуць шчокі!
Шумі, бушуй, як з прорвы ліся, дождж,
Каб патанулі замкі, вежы замкаў
Да самых шпіляў! Серныя агні,

Лятучыя, як думка, вестуны
Дубадрабільных стрэлаў перуновых,
Узвейцеся над галавой маёй!
О суд нябесны, справядлівы гром,
Удар, раструшчы тоўсты шар зямны,
Разбі прыроды формы, задушы
Зародкі подласці, ўсё злое племя
Людзей няўдзячных.

БЛАЗЕН

Эх, кум, памяняў бы я цяпер гэтыя дажджавыя рэкі на святую вадзічку і цёплы куток! Дзядзечка, хадзем. Пакайся, старэнькі, перад дочкамі. У такую ноч і разумнаму і дурню — усім холадна.

ЛІР

Рыгай, плюй, грукачы на ўвесь жывот!
Ні дождж, ні гром, ні вецер — мне не дочкі,
За вашу лютасць я вас не кляну,
Я не дзяліў вам царства, я не зваў вас
Сваімі дзецьмі, у маім падданстве
Вы не былі. Што ж, цешцеся цяпер!
Адзін я перад вамі, я — ваш раб,
Нядужы, кволы валацуга-старац.
Гэй, вы, ліхія служкі подлых дочак,
Вы ў змове з імі, каб мяне згубіць!
Вы радуецеся майму няшчасцю!
Губіце, біце! О! Як вам не сорам!

БЛАЗЕН

Хоць бы якая тычка над галавою! Ніякага парадку ў прыродзе.
Жыў-быў на свеце Сіваграк,
Меў ён дупло і грошы,
Як ажаніўся Сіваграк,
Яго заелі вошы.
Пайшоў упрочкі Сіваграк,
Блукае ў паняверцы,
Нацёр сабе ён мазалі
На пятах і на сэрцы.
Не зважай, кум. Кожная краля крыўдзіцца на сваё люстэрка.

Уваходзіць Кент.

ЛІР

О не, цярпеннем я яшчэ багаты.
Ні слова больш!

КЕНТ

Хто тут?

БЛАЗЕН

Што? Не пазнаў? Накалі вочы на спіцу. Кароль і аслі-
ныя вушы. У мудраца два рубца, а ў дурня адзін.

КЕНТ

Вы, вы, мой уладар! Эх! І начніцы
Бягуць перапалоханыя. Ярасць
Стыхій нябесных заганяе ў нетры
Звяроў і птушак. Як жыву — не помню,
Каб гэтак выла, бушавала бура;
Такога ліўня, яркіх бліскавіц,
Такіх грымот не чуў я і не бачыў.
Страх агартае чалавека.

ЛІР

Богі,
Хто вораг ваш? Грымі, святая кара!
Суд адбываецца. Дрыжы, злачынец,
Не вырвешся, закон з цябе спагоніць!
Рука крывавая, згінь, згінь у змроку!
Ага, папаўся, сыты блудадзей,
Бляднееш, круцішся! І ты тут, гад,
Што зубы натачыў цішком на брата? —
Грызі зямлю, выпручвайся, канай!
Распаліся скляпенні таямніц,
І агаліўся грэх. Плач, енк і скогат.
О неба, злітуйся! Даруй мне грэх мой!
Я — чалавек, але вялікай крыўды
Нікому не зрабіў.

КЕНТ

Мой уладар,
Прастудзіцеся вы. Тут ёсць будан,
Схавацца можна ў ім ад навальніцы.
Вам трэба адпачыць. А я пайду
Зноў стукацца ў той ненавісны дом,—
Я быў там, вас шукаў, не адчынілі.
Не ўчуюць людзі, дык пачуюць сцены,
Ўварвуся сілаю.

ЛІР

Мой розум гасне.—
Хадзем, мой хлопчык. Як тваё здароўе?
Па-мойму, ты азяб. І я азяб.—
Скажы мне, дружа, а там ёсць салома? —
Калі бяда спасцігне чалавека,

Ён і малому рад.— Вядзі ў будан.—
Мой бедны блазен, мой пацешнік горкі,
Ты не нудзіся, я цябе шкадую.

БЛАЗЕН

(спявае)

Хто мае і розум і волю,—
Гэй-то, дождж шуміць, дождж шуміць,—
Той не наракае на долю,
Хоць бы ён і вымак наскрозь.

ЛІР

Праўду кажаш, мой хлопчык.— Хадзем у будан.

Выходзяць Лір і Кент.

БЛАЗЕН

Бррр! Выгнаць бы цяпер гуляшчую дзеўку з цёплай пасцелі, от бы ляскала зубамі. На развітанне скажу вам прароцтва:
Калі папоў не будуць людзі слухаць,
А карчмары ваду у піва бухаць,
Калі ў судах звядзецца ашуканства
І беднякоў не будзе крыўдзіць панства,
Падавіцца на слове злоязыкі,
Скасуюць і арэнды і пазыкі,
Калі зладзеі перастануць красці,
А ліхвяры у куфар грошы класці,
Калі паліць не будуць недаверкаў
І шлюхі ў складчыну збудуюць цэркаў,—
Тады ўвесь Альбіён ахопіць змрок,
Зямля павернецца у іншы бок,
Запалыхае неба дзіўным знакам,—
Хто дажыве, не будзе поўзаць ракам.
Гэта вам прадкажа чарадзей Мерлін, які народзіцца пасля мяне. *(Выходзіць.)*

Сцэна трэцяя

Пакой у замку Глостэра.

Уваходзяць Глостэр і Эдмунд.

ГЛОСТЭР

Бяда, бяда, Эдмунд! Не па сэрцы мне гэта ліхая справа. Я папрасіў у іх дазволу прыняць яго ў свой дом — яны мне адмовілі. Яны адабралі ў мяне маё права на

гасціннасць і, пад страхам вечнай няласкі, забаранілі мне не толькі дапамагаць яму, а нават і ўспамінаць пра яго.

ЭДМУНД

Якая дзікасць! Якая бесчалавечнасць!

ГЛОСТЭР

Маўчы, не гавары нікому. Герцагі пасварыліся, але гэта не ўсё. Уночы я атрымаў пісьмо — ціха, аб гэтым ні слова — яно ў мяне пад замком у шафе. Крыўда, якую церпіць кароль, выклікала вялікае абурэнне, рыхтуецца помста. Мы павінны стаяць за караля. Я знайду яго і ўсё, што ў маіх сілах, зраблю прыватным парадкам. А ты ідзі да герцага, падтрымлівай з ім размову, каб ён не заўважыў маёй адсутнасці. А калі надумае спытацца, дзе я, скажы, што я хворы, што я ў пасцелі. Можа, мяне чакае смерць, як ён мне пагражаў, але я не магу дапусціць, каб стары кароль, мой гаспадар, блукаў без прыстанішча. Чорныя хмары навіслі над краінай нашай. Сынок мой, будзь асцярожны.

(Выходзіць.)

ЭДМУНД

Закаркаў грак. Аб гэтым спачуванні
Даложым герцагу: не будзе больш
Хаваць ён шкодныя лісты у шафу.
Прычына добрая, каб выгнаць з дому.
Прэч, труп стары! Дарогу маладому!

(Выходзіць.)

Сцэна чацвёртая

Дзікае поле. Будан.

Уваходзяць Лір, Кент і блазен.

КЕНТ

Вось і будан. Заходзьце, уладар мой,
Нягоды гэтай жудаснае ночы
Хто можа выцерпець?

Бура не сціхае.

ЛІР

Пакінь мяне.

КЕНТ

Мой уладар, заходзьце, я прашу вас.

ЛІР

Разбіць мне хочаш сэрца?

КЕНТ

Я гатоў
Сваё разбіць. Заходзьце, уладар мой.

ЛІР

Ты думаеш, мне страшны гэты лівень?
Ты, можа, і баішся, але там,
Дзе боль бязмежны, дробная пакута
Не адчуваецца. Ты пабяжыш,
Наткнуўшыся у лесе на мядзведзя,
Але, убачыўшы перад сабой
Раз'юшанае мора, ты адступіш
І кінешся назад — мядзведзю ў лапы.
Калі дух вольны, чулае і цела.
Ва мне ж усё бунтуецца. Мой дух
Надломлены, ўсё вырвана з карэннем,
І ў пустаце, там, дзе любіла сэрца,
Кроў капае. Аддзякавалі дочкі!
Кусаць руку, якая корміць вас?
Ды што ж гэта? О не, я ім адпомшчу.
Не трэба плакаць. У такую ноч
Прагнаць мяне! Хай хвошча дождж, хай мочыць,
Я выцерплю. Рэгана, Ганерылья,
Каго прагналі вы? Старога бацьку.
За што? За што? За дабрату маю.
Я не хачу вар'ятам быць. Даволі!
Маўчы, душа.

КЕНТ

Заходзьце, уладар мой.

ЛІР

Заходзь ты сам, шукай сабе палёгкі.
А я тут застануся, гэта бура
Мне не дае задумацца аб большым.
Але я ўсё ж пайду.
(Блазну.)
Мой бедны хлопчык,
Ты тут, дзіця маё? Жабрак бяздомны
Ты, як і я, ідзі. Я памалюся
І, памаліўшыся, таксама лягу.

Блазен уваходзіць у будан.

Няшчасны чалавек, дзе б ты ні быў,
Галодны, босы, ў лахманах дзіравых,
Пад гэтым чорным небам навальнічным
Як ты пакутуеш! Не думаў я
Раней аб простых людзях. О вялікі,
Вучыся, адчувай на ўласнай скуры
Боль бедняка! Раздай набытак лішні.
Хай меншыцца няроўнасць на зямлі!

ЭДГАР

(у будане)

Сажань з паловай, сажань з паловай! Бедны Том!

Блазен выбягае з будана.

БЛАЗЕН

А дзядзечка, не хадзі туды, там нячыстая сіла. Ратуйце! Ратуйце!

КЕНТ

Дай мне руку. Хто там?

БЛАЗЕН

Чорт, чорт. Ён кажа, што яго завуць бедны Том.

КЕНТ

Хто там рыкае ў саломе? Выходзь.

З будана выходзіць Эдгар у вопратцы вар'ята.

ЭДГАР

Прэч ад мяне! За мною чэрці следам.
«Дзьмуць, свішчуць вятры у цярновых кустах...»
М-м-м! Сагрэйся ў халоднай пасцелі.

ЛІР

Хіба ты маеш дочак? Хто прывёў
Цябе сюды?

ЭДГАР

А ці падасць хто што беднаму Тому? Нячыстая сіла гнала яго праз агонь, праз полымя, цераз вір, цераз брод, па балотах, па багнах, падкладвала яму нажы пад голаў, мышыную атруту ў міску, вяроўку пад лаўку, прымушала яго скакаць на гнядым кані цераз масток шырынёй вяршок, хапаючыся аберуч за свой уласны цень: стой, здраднік, не ўцячэш! — А дай вам, божа, здароўя! — Тому холадна. У-у-у-у! — Ратуй вас, божа, ад віхраў, ад ураганаў, ад пошасці зорнай, ад пошасці азёрнай. Падайце, калі ласка, беднаму Тому. Злы дух яго мучыць. Я мог бы яго злавіць. І тут... і тут... і тут.

Бура не сціхае.

ЛІР

Хто абабраў яго? Напэўна, дочкі.
Усё для іх. Што ж ты сабе пакінуў?

БЛАЗЕН

Дзяругу, каб не так было сорамна.

ЛІР

Хай мор, няхай балячкі, што з паветра,
Як чэрві, сыплюцца на кару нам,
Падушаць тваіх дочак!

КЕНТ

Мой уладар, у яго няма дочак.

ЛІР

Ілжэш, ёсць дочкі, ёсць. Прыроду ганьбіць
Так могуць толькі ліхадзейкі-дочкі.—
Скажы, выгнаннік-бацька, як ты можаш
Так абыходзіцца з няшчасным целам?
А што ж? — і справядліва. Не пладзі
Пачвар доўгавалосых.

ЭДГАР

Пілікок, на купіне Пілікок!
У-у-у-у!..

БЛАЗЕН

Ну і ноч! Сапраўды здурнець можна.

ЭДГАР

Асцерагайся чорта, слухайся бацькоў, дарэмна не бажыся, трымайся слова, не спакушай чужых жанок, не чапляй на сябе пышных убораў, не заводзь фанабэрыі. Тому холадна.

ЛІР

Кім ты быў раней?

ЭДГАР

Кавалерам. Драў нос угору, а сэрца яшчэ вышэй. Завіваў кучары, на капелюшы насіў рукавічку, дагаджаў капрызам сваёй дамы і тварыў з ёю ўночы грэх. Клятвы і прысягі выляталі з мяне, як птушкі, на ўсё мне было начхаць, чхаў я на неба і трымаўся за зямлю. Кладучыся спаць, выдумляў сабе распусту на заўтра, а прачнуўшыся, смакаваў яе. Выпіць любіў страшэнна, у косці гуляць — страшэнна, а што да жанчын, то майму гарэму султан турэцкі пазайздросціў бы. Меў сэрца лжывае, вушы шырокія, рукі крывавыя, быў ляны, як свіння, хітры, як ліса, прагавіты, як воўк, шалёны, як сабака, люты, як леў. Не дапускай, каб рыпучымі чаравічкамі і шалясценнем шоўку тваё беднае сэрца ўзяла пад уладу

жанчына. І блізка не падыходзь да вясёлага дома, не ацірайся каля спадніцы, не падпісвай вэксаляў, змагайся з нячыстаю сілай.
Дзьмуць, свішчуць вятры у цярновых кустах...
Зум-зум, гэй, ф'ю, с-с-с!
Сынок мой, дафін мой, на рэзвым кані...
Прэч, прэч!..

Бура не сціхае.

ЛІР

Лепш табе ляжаць у магіле, чым выстаўляць сваё голае цела пад бізуны нябёс.— Вось перад вамі чалавек, які ён ёсць. Глядзіце! Няма на ім ні шоўку ад чарвей, ні скуры ад звера, ні воўны ад авечак, ні парфумы ад мускуснай кошкі.Так! Мы трое — не людзі, мы — лялькі. Вось ён чалавек без прыкрас: бедная голая жывёла на дзвюх нагах.— Не хачу насіць чужое, крадзенае. Драць, драць! — Адшпіліце мне!

(Рве на сабе адзенне.)

БЛАЗЕН

А дзядзечка, а родненькі, супакойся! Ты ж не збіраешся плаваць. Раскласці б нам з табою цяпло, маленькі агеньчык у полі, ён быў бы, як сэрца старога бабніка: пасярэдзіне жар, а навокал сцюжа.— Ой, гляньце, агонь да нас сам ідзе!

ЭДГАР

Гэта д'ябал Фліберціджыбет, ён выходзіць звечара і вандруе да першых пеўняў, насылае бельмы, касавокасць, заечую губу, псуе жыта ражкамі, кожнаму, каго ні стрэне, робіць шкоду.
І тройчы руку святы Вітальд прасцёр,
Сустрэўшы Мару і яе сясцёр.
— Сястрыцы, едзьма.
— Згінь, злая ведьма!
Згінь, згінь, згінь!

КЕНТ

Што з вамі, уладар мой?

Уваходзіць Глостэр з паходняй.

ЛІР

Хто гэта?

КЕНТ

Хто ты? Каго шукаеш?

ГЛОСТЭР

А вы хто будзеце? Што вы за людзі?

ЭДГАР

Бедны Том, які глытае жаб, апалонікаў, яшчарак і ў ярасці сэрца, калі пачне бушаваць у ім нячыстая сіла, збірае лапухі з-пад каровы і жуе іх замест салаты, глытае пацукоў, жукоў, здохлых сабак, п'е зялёную ваду ў стаячым балоце. Дзе б ён ні з'явіўся, усюды яго б'юць, у турму валакуць, у калодкі садзяць, а былі ў яго тры гарнітуры і шэсць перамен бялізны, і конь і меч.
Няшчасны Том з'еў многа жаб
І вось за сем гадоў аслаб.
Ратуйце, тут мой мучыцель. Ціха, Смолкін. Згінь, злы дух!

ГЛОСТЭР

Нягожа быць вам, вашая вялікасць,
У гэтакай кампаніі.

ЭДГАР

А Сатана хіба не дваранін?
Ёсць між чарцей і князь, завецца — Модус.

ГЛОСТЭР

Здрабнелі людзі, ўсё ідзе на звод:
Мы ненавідзім тых, хто парадзіў нас.

ЭДГАР

Беднаму Тому холадна.

ГЛОСТЭР

Хадзем, мой уладар. Не ў сілах я
Прымаць удзел у іхняй жорсткай справе.
Хоць мне і загадалі вашы дочкі
Замкнуць вароты і пакінуць вас
Уночы аднаго у чыстым полі,
Але я смеласці набраўся выйсці
На пошукі. Прашу вас да цяпла.
Вячэра вас чакае.

ЛІР

О, я сыты.
У нас тут гутарка.
(Да Эдгара.)
Скажы, філосаф,
Адкуль бярэцца гром?

КЕНТ

Мой уладар,
Прыміце прапанову. Вы прамоклі.

ЛІР

Маўчы. Мне трэба вырашыць пытанне
З фіванскім мудрацом.— Што ставіш мэтай?

ЭДГАР

Паразганяць чарцей і выбіць гадаў.

ЛІР

Цішэй; у нас сакрэтная нарада.

КЕНТ

О сэр, упрошвайце яго, вядзіце;
Ён непрытомны.

ГЛОСТЭР

Што ж, я не дзіўлюся:
Прагналі бацьку дочкі. Бедны Кент,
Дзе ён цяпер? Ён гэта ўсё прадбачыў.
Ты кажаш: непрытомны? Ах, мой дружа,
Мой розум гэтак жа зайшоўся з гора.
Я сына меў і ад яго адрокся.
Мой сын жадаў мне смерці. Дружа мілы,
Хіба ж я не любіў яго? Ах, божа,
За што ты нас караеш?

Бура не сціхае.

Цёмна, страшна.
Хадзем адгэтуль, вашая вялікасць.

ЛІР

Прашу прабачыць, я загаварыўся.—
За мною, паважаны мой філосаф.

ЭДГАР

Тому холадна.

ГЛОСТЭР

А ты залазь у свой будан і грэйся.

ЛІР

І я з табой.

КЕНТ

Сюды, мой уладар.

ЛІР

О не, ў будан, у госці к мудрацу.

КЕНТ

Мілорд, пацешце караля, вазьміце
З сабой і гэтага.

ГЛОСТЭР

Няхай ідзе.

КЕНТ

Вылазь, жабрак, ідзі і ты за намі.

ЛІР

Хадзем, шаноўны мой афінец.

ГЛОСТЭР

Ціха,

Ступайце асцярожна.

ЭДГАР

Да чорнае вежы пад'ехаў Раланд.
— Ух, ух! — закрычаў людаед.—
Сягоння ў нас будзе мясны абед:
Запахла брытанскаю кроўю.

Выходзяць.

Сцэна пятая

Пакой у замку Глостэра.

Уваходзяць Корнуал і Эдмунд.

КОРНУАЛ

Не выеду адгэтуль, пакуль з ім не распраўлюся.

ЭДМУНД

Ваша высокасць, мяне могуць абвінаваціць у тым, што я абавязак стаўлю вышэй пачуццяў роднасці. Мяне гэта непакоіць.

КОРНУАЛ

А я раблю вывад, што твой брат не ад злое натуры шукаў яму смерці, а, маючы пахвальную мужнасць, не мог цярпець яго нізасці і подласці.

ЭДМУНД

О я няшчасны! Як мне цяжка быць справядлівым! Вось тое пісьмо, аб якім я гаварыў. Яўны доказ, што ён шпіёніў на карысць французаў. О неба, і нашто яму было ўмешвацца ў гэту здраду! Каго я выкрываю? Роднага бацьку.

КОРНУАЛ

Хадзем да герцагіні.

ЭДМУНД

Калі тое праўда, што ў пісьме, колькі ў вас будзе турбот, святлейшы герцаг!

КОРНУАЛ

Праўда ці няпраўда, але гэта пісьмо зрабіла цябе графам Глостэрам. Знайдзі бацьку, мы яго зараз жа арыштуем.

ЭДМУНД

(убок)

Вось каб ён папаўся з каралём, гэта б яшчэ больш падліло б масла ў агонь.

(Корнуалу.)

Я не сыду з дарогі, на якую паставіла мяне вернасць і служба, але маё сэрца абліваецца кроўю.

КОРНУАЛ

Не сумнявайся, будзь заўсёды цвёрды.
Мая любоў табе заменіць бацьку.

Выходзяць.

Сцэна шостая

Пакой на ферме каля замка.

Уваходзяць Глостэр і Кент.

ГЛОСТЭР

Тут вам будзе лепей, чым на двары. І за гэта дзякуй богу. А я пайду прынясу сёе-тое, каб вам было ўтульна і выгодна. Я доўга не забаўлюся.

КЕНТ

Удар быў такі моцны, што розум яго падаўся. Добры вы чалавек, сэр. Дзякуй вам.

Глостэр выходзіць.
Уваходзяць Лір, Эдгар і блазен.

ЭДГАР

Паклікаў мяне Фратэрэта і кажа, што ў пекле на беразе чорнага возера сядзіць Нерон і вудзіць рыбу. Маліся, дурненькі, не вер злому духу.

БЛАЗЕН

Дзядзечка, скажы мне, хто вар'ят: пан ці мужык?

ЛІР

Кароль, кароль.

БЛАЗЕН

Няпраўда; мужык, сын якога вылез у паны і сеў бацьку на карак,— тут нехаця звар'яцееш.

ЛІР

Хай тысячная зграя ўсіх нячыстых
Падыме іх на вілы агнявыя
І з рогатам шпурне у пекла!

ЭДГАР

Ой, нячысцік укусіў мяне ў спіну.

БЛАЗЕН

Дурны той, хто верыць рахманаму воўку, конскаму здароўю, каханню недаростка і клятвам гуляшчай дзеўкі.

ЛІР

Пачнём хіба. Вось лава для падсудных.
(Эдгару.)
Садзіцеся, вучоны пракурор.
(Блазну.)
Вы будзьце членам, паважаны сэр.—
Падаць сюды лісіц.

ЭДГАР

Мадам, прашу не выскаляцца! —
Вы на судзе, і мы не кавалеры.
Дык плыві, мая ты Бэтсі,
Падплывай жа, мілачка.

БЛАЗЕН

Бэтсін човен вады повен,
У тым чоўне дзірачка.

ЭДГАР

Адзін чорт салаўём спявае; а каторы чорт Хопданс, той пішчыць у Тома ў жываце, каб даў селядца. Не брыкайся, не стукай капытамі: чым я цябе накармлю, калі я сам нічога не еў.

КЕНТ

Аб чым вы думаеце, уладар мой?
Вы ляжце, адпачніце, вось падушка.

ЛІР

О не, судзіць, судзіць! Паклічце сведак.
(Эдгару.)
Ты ў мантыі, дык будзь за старшыню.
(Блазну.)
Ты побач сядзь, за пракурора будзеш.
(Кенту.)
Сядай, юрыст.

ЭДГАР

Прыступім да разгляду.
Ой не спі, пастух вясёлы,
Дзе твае авечкі?

Засвісталі пасвісцёлы
Ў лузе каля рэчкі.
Псік, шэрая кошка!

ЛІР

Вядзіце яе сюды. Гэта Ганерылья. Панове суддзі і ўся высокая грамада, прысягаю і даказваю, што яна выгнала з дому беднага караля, свайго бацьку, голага, як стаіць.

БЛАЗЕН

Падыдзіце бліжэй, мілэдзі. Гэта вы будзеце Ганерылья?

ЛІР

Яна, яна.

БЛАЗЕН

Прабачце, я памыліўся, я думаў, што вы табурэтка.

ЛІР

Вось і другая спадылба глядзіць,
Пабліскваe драпежнымі вачамі.
Яе злачынства выкрыта. Трымайце!
Бяжыце ўслед! Да зброі! Здрада, здрада!
Хто выпусціў яе? Суд падкупілі.

ЭДГАР

(убок)

Прасвятлі яго, божа!

КЕНТ

Не вытрываць! О гора! Уладар мой,
Дзе ж вашае хвалёнае цярпенне?

ЭДГАР

(убок)

Ад жалю не магу стрымаць слязы.
Баюся, што сябе я выдам.

ЛІР

Гляньце,
Мае сабачкі тут: Трэй, Бланш і Ласка.
Чаго яны так брэшуць на мяне?
Не прызнаюць мяне ўжо і сабакі.

ЭДГАР

От я ім дам гэтым сабакам!
Галава мая — гарбуз.
Як шпурну ў іх галавой,
Што тут будзе — о-ё-ёй!
Сквіл падняўшы шматгалосы,
Кінуцца ўцякаць барбосы,
Таксы, мопсы, выжлы, догі,

Фокстэр'еры і бульдогі —
Ўся сабачая сям'я.
А за ёю следам я.
Гэй, гэй, гэй! — у мястэчка на кірмаш на прастольнае свята.— Апаражніў Том свой капшук.

ЛІР

Запрасіце хірургаў. Няхай разрэжуць Рэгану і паглядзяць, што ў яе каля сэрца. Нам трэба ведаць, ад якой прычыны цвярдзее чалавечае сэрца.
(Эдгару.)
Выбіраю вас маім рыцарам і далучаю да сваёй сотні. Толькі мне не падабаецца фасон вашага адзення. Вы скажаце, што гэта ўбор персідскі. Раю вам яго перамяніць.

КЕНТ

Прыляжце, адпачніце, уладар мой.

ЛІР

Без крыку, без крыку! Завесьце ложак. Так, так, так. Павячэраем заўтра раніцай.
(Засынае.)

БЛАЗЕН

А я высплюся ў поўдзень.

Уваходзіць Глостэр.

ГЛОСТЭР

Хадзі сюды. Хутчэй. Дзе наш кароль?

КЕНТ

Ён тут, але яго вы не трывожце.
Ён непрытомны, толькі што заснуў.

ГЛОСТЭР

Вазьмі яго на рукі, добры дружа.
Падслухаў я іх змову. Караля
Збіраюцца забіць. Насілкі там.
Паложыш на насілкі і ў дарогу.
Не трацьце часу, бо праз паўгадзіны
І ён, і ты, і прыяцелі вашы,
Ўсе будуць злоўлены. Ратуй яго,
Кіруйся ў Довер, знойдзеш там прытулак
І абарону. Я падрыхтаваў
Праваднікоў і харч. Хутчэй, хутчэй.

КЕНТ

Спіць стомлены пакутнік. Хай жа сон
Уцішыць боль і праясніць твой розум!
(Блазну.)

Чаго задумаўся? Бяры, нясі
Свайго гаспадара. Не адставай.

ГЛОСТЭР

Хутчэй, хутчэй.

Выходзяць Кент, Глостэр і блазен, выносячы Ліра.

ЭДГАР

Калі ў няшчасці блізкі, дарагі,
Не адчуваеш так сваёй тугі.
З самотаю ж сябруе толькі рэха,
Былая радасць сэрцу не уцеха,
Ад гора не схаваешся нідзе,—
І ўсё ж лягчэй цярпець у грамадзе.
Што сумаваць! На свеце крыўды многа.
Зламала крыўда караля старога.
Ён меў дзяцей, а я меў бацьку, дом.
Дык прывыкай да бур жыццёвых, Том!
Хай неба хмурыцца, глядзіць варожа,
Надыдзе час, і праўда пераможа.
(Выходзіць.)

Сцэна сёмая

Пакой у замку Глостэра.

Уваходзяць Корнуал, Рэгана, Ганерылья, Эдмунд і слугі.

КОРНУАЛ

Вяртайцеся хутчэй да вашага мужа, пакажыце яму гэта пісьмо. Французскае войска высадзілася.— Знайсці здрадніка Глостэра!

Выходзяць некалькі слуг.

РЭГАНА

Удавіць яго тут жа!

ГАНЕРЫЛЬЯ

Выкалаць яму вочы!

КОРНУАЛ

Пакіньце яго мне на расправу.— Эдмунд, ты будзеш суправаджаць нашу сястру. Нягожа, каб помста, якую

мы намераны ўчыніць над тваім бацькам, адбывалася ў тваёй прысутнасці. Прапануй герцагу, да якога паедзеш, тэрмінова падрыхтавацца, мы гэтак жа прымем меры. Наладзім пастаянную сувязь і будзем абменьвацца ганцамі.— Бывайце, дарагая сястра наша.— Бывай, граф Глостэр.

Уваходзіць Освальд.

Што з каралём?

ОСВАЛЬД

Збег, вашая высокасць.
Граф Глостэр дапамог яму схавацца.
А за варотамі яго сустрэлі
Не менш як трыццаць рыцараў, заядлых
Прыхільнікаў улады каралеўскай.
Былі сярод іх і васалы графа.
Яны паспешна рушылі у Довер,
Мяркуючы знайсці там падтрыманне
Людзьмі і зброяй.

КОРНУАЛ

Хутчэй сядлайце коней для мілэдзі.

ГАНЕРЫЛЬЯ

Бывайце, мілы герцаг і сястра.

КОРНУАЛ

Да пабачэння, Эдмунд.

Выходзяць Ганерылья, Эдмунд і Освальд.

Сюды яго! Злавіць! Звязаць! Прывесці!

Слугі выходзяць.

Караць яго нам нельга без суда,
Але законны гнеў наш топча права.
Хай праклінаюць злыя языкі,
Абы галовы гнуліся.

Слугі ўводзяць Глостэра.

У, здраднік!

РЭГАНА

Няўдзячная блудлівая лісіца!

КОРНУАЛ

Круціце вылюдку худыя рукі!

ГЛОСТЭР

Што трэба вашым светласцям? Вы ж госці,
Вы ў маім доме. Не жартуйце, герцаг.

КОРНУАЛ
Вяжыце! Так!..

Слугі вяжуць Глостэра.

РЭГАНА
Мацней, мацней! — Сабака!
КОРНУАЛ
Прывязвайце да крэсла! — Будзеш помніць.

Рэгана хапае Глостэра за бараду.

ГЛОСТЭР
А божачка! Што робіце? Як можна
Так зневажаць старога чалавека?
РЭГАНА
А, шэльма сівая! Стары сабака!
ГЛОСТЭР
Бязлітасныя людзі, кожны волас,
Які ты выскубаеш, ажыве
І закрычыць. Разбойнікі і тыя
Саромеліся б гвалт чыніць у доме,
Дзе ім далі прытулак і начлег.
Чаго вам трэба ад мяне?
КОРНУАЛ
З Французам
Ты маеш перапіску? Гавары.
РЭГАНА
Ды не хітруй, мы ведаем усё.
КОРНУАЛ
Намерыўся наш край прадаць чужынцам?
Спрыяеш ворагам? Вайны жадаеш?
РЭГАНА
Куды ты дзеў вар'ята-караля?
Што ж ты маўчыш?
ГЛОСТЭР
Я атрымаў нядаўна
Адно пісьмо, пісаў яго не вораг,
А чалавек нейтральны.
КОРНУАЛ
Хлусіш!
РЭГАНА
Брэшаш!
КОРНУАЛ
Куды справадзіў караля?

ГЛОСТЭР

У Довер.

КОРНУАЛ

Навошта ў Довер? Хто табе дазволіў?

РЭГАНА

У Довер? Бач! Кажы, навошта ў Довер?

ГЛОСТЭР

Я звязаны. Што хочаце рабіце.

РЭГАНА

Навошта ў Довер?

ГЛОСТЭР

Каб не глядзець, як будзеш ты, звярыца,
Сваімі кіпцюрамі выдзіраць
Яму старыя вочы, каб не бачыць,
Як дзікая сястра твая ўпускае
Свіныя іклы ў цела караля.
У ноч, у буру, з голай галавою
Блукаў ён, бедны. Мора бушавала,
Ляцелі пырскі аж да самых зор,
А ён дажджом ліў слёзы, небарака,
Пад цёмным небам безуцешна плакаў.
У гэты час, калі б ваўкі завылі
Пад замкаваю брамай, ты б сказала:
«Ідзі і адамкні ім, добры стораж».
Змякчыўся б ліхадзей! Але пабачу,
Яшчэ пабачу я над вамі кару,
Над гэтакімі дзецьмі.

КОРНУАЛ

Не пабачыш! —
Гэй, вы, трымайце крэсла! Вырву вока
І растапчу!

(Вырывае яму вока.)

ГЛОСТЭР

Ратуйце, хто жадае
Дажыць да старасці! Звер, звер! О божа!

РЭГАНА

Каб твар не быў крывы, рві і другое.

КОРНУАЛ

Ты хочаш кару бачыць?..

ПЕРШЫ СЛУГА

Стойце, герцаг!
Я вам служу з маленства і яшчэ раз
Хацеў бы верна паслужыць. Не трэба!
Стрымайце гнеў! Не трэба!

РЭГАНА

Гэта што?

Раб! Хам!

ПЕРШЫ СЛУГА

(Рэгане)

Каб з барадою вы былі,
Я б вывеў вас, за бараду схапіўшы.
Што вы надумалі?

КОРНУАЛ

О подлы раб!

(Вымае меч і кідаецца на слугу.)

ПЕРШЫ СЛУГА

Што ж, калі так, дакажам праўду кроўю.

(Вымае меч.)

Яны б'юцца, Корнуал паранены.

РЭГАНА

(другому слузе)

Дай мне свой меч! Што бачу? Хамскі бунт!

(Хапае меч, заходзіць ззаду і забівае слугу.)

ПЕРШЫ СЛУГА

О смерць мая! Яшчэ у вас ёсць вока,—
Глядзіце, граф! Ён — пакараны. О!

(Памірае.)

КОРНУАЛ

А не даждаў ты! — Прэч, агідны студзень!

(Вырывае Глостэру другое вока.)

Гнюсота! Фу!

ГЛОСТЭР

Мне цёмна, цёмна. Сын мой,
Сынок, сыночак, Эдмунд! Запалі
Увесь агонь сваёй любві адданай,
Адпомсці за знявечанага бацьку.

РЭГАНА

Вон здраднік! Не крычы! Сын не пачуе.
Такіх бацькоў, як ты, ён ненавідзіць,
Ён сам нам выдаў твой сакрэт зладзейскі,
Ён ад цябе адрокся.

ГЛОСТЭР

Ах, я дурань!
Дык, значыць, Эдгар мой не вінаваты.
О мілы божа, выратуй яго,
А мне даруй.

РЭГАНА

Вазьміце гэту падлу,
Шпурніце за вароты ў яму носам,
Хай нюхае дарогу ў Довер.— Любы,
Табе нядобра? Што з табою, друг мой?

КОРНУАЛ

Я ранены, і цяжка. Дарагая,
Пабудзь са мною.— Вывесці адгэтуль
Сляпога ліхадзея! Труп раба
На сметнік выкіньце! — Рэгана, я
Слабею, млосна мне, сплываю кроўю.
І трэба ж так не ў час! Дай мне руку.

Корнуал выходзіць
у суправаджэнні Рэганы.
Слугі развязваюць і выводзяць Глостэра.

ДРУГІ СЛУГА

Калі за гэта ім не будзе кары,
Я на грахі плюю.

ТРЭЦІ СЛУГА

Калі яна,
Пражыўшы век, памрэ сваёю смерцю,
Жанчыны чорту душу прададуць.

ДРУГІ СЛУГА

Нам трэба паспрыяць старому графу
І адшукаць яму ў правадыры
Якога-небудзь жабрака з Бедлама,
Хлапчыну спрытнага.

ТРЭЦІ СЛУГА

Ідзі. А я
Вазьму кудзелі і бялкоў яечных,
Каб да вачэй прыкласці невідушчых
І кроў суняць. Хай бог яму паможа!

Выходзяць.

АКТ ЧАЦВЁРТЫ

Сцэна першая

Поле.

Уваходзіць Эдгар.

ЭДГАР

Яно лепш ведаць, што бяздомак ты,
Чым жыць у пазалочанай няволі.
Бядняк уніжаны, з ярмом на шыі,
Жыве надзеяй і не мае страху.
Баіцца ўпасці той, хто ўзлез высока,
А хто упаў, той можа усміхацца.
Прывет табе, о вецер палявы!
Мяне на дно ты скінуў, як пушынку,
І бура мне цяпер не страшна.— Хто там?

Уваходзіць Глостэр,
яго вядзе стары селянін.

Мой бацька, з ім жабрак. О свет, свет, свет!
Калі б не пераменлівасць твая,
Не люты бой паміж дабром і ліхам,
Жадаў бы я жыць вечна.

СТАРЫ СЕЛЯНІН

А мой дарагі гаспадар, арандаваў я зямлю ў вашага бацькі, царства яму нябеснае, і тым часам у вас арандую. Восемдзесят гадоў жыву на вашай зямліцы.

ГЛОСТЭР

Ідзі адсюль, пакінь мяне, мой дружа.
Ты мне не дапаможаш, а сабе
Бяду наклічаш.

СТАРЫ СЕЛЯНІН

Сэр, ды вы ж дарогі
Не бачыце.

ГЛОСТЭР

Няма ў мяне дарогі,
І вочы не патрэбны мне. Відушчым
Я спатыкаўся. Так яно і выйшла:
Меў вочы — розуму не меў, сляпы стаў —
Знайшоўся розум.— Сын мой, мілы Эдгар,
Бязвінная ахвяра дурня-бацькі!

Каб мог я пальцамі цябе крануць,
Мой родненькі, я б ачуняў, здаецца.

СТАРЫ СЕЛЯНІН

А хто там ходзіць?

ЭДГАР

(убок)

Божа, хто дакажа,
Што ён за ўсіх няшчасней? Дзе мяжа
Няшчасцю чалавечаму? Вось мне
І горай стала.

СТАРЫ СЕЛЯНІН

Гэта бедны Том,
Вар'ят тутэйшы.

ЭДГАР

(убок)

Гора налілося,
Разбухла, і канца яму няма.
Канец — зямля сырая, маці наша.

СТАРЫ СЕЛЯНІН

Куды ідзеш ты, хлопча?

ГЛОСТЭР

Ён — жабрак?

СТАРЫ СЕЛЯНІН

Але, сэр, страціў розум і жабруе.

ГЛОСТЭР

Калі жабруе, розуму не страціў:
Змагаецца за існаванне. Мне
Мінулай ноччу ў буру давялося
Сустрэць адну істоту. Я падумаў:
Чым розніцца чарвяк ад чалавека?
І ўспомніў сына; на яго тады
Я ў гневе быў, цяпер я знаю праўду.
Мы для багоў, як мухі для дзяцей:
Ім наша смерць — забава.

ЭДГАР

(убок)

Што рабіць?
Прыкідвацца, быць блазнам перад горам —
Знявага людзям і сабе.— Дзень добры!

ГЛОСТЭР

Дык гэта ён, той самы, голы-босы?

СТАРЫ СЕЛЯНІН

Але, мілорд.

ГЛОСТЭР

Ідзі. Калі ў знак дружбы
Ты хочаш паслужыць мне, то дагоніш
Праз мілю нас на Доверскім шляху.
І прынясі адзежыну якую,
Каб мог прыкрыцца хлопец; я вазьму
Яго ў павадыры.

СТАРЫ СЕЛЯНІН

Ён жа вар'ят.

ГЛОСТЭР

Такі наш час: сляпых вядуць вар'яты.
Зрабі, што я прашу, альбо як хочаш.
Бывай здароў, ідзі.

СТАРЫ СЕЛЯНІН

О, гаспадар мой,
Ды я аддам свой гарнітур найлепшы.
Не памінайце ліхам!

(Выходзіць.)

ГЛОСТЭР

Жабрак, ідзі сюды.

ЭДГАР

Тому холадна.

(Убок.)

Як цяжка строіць блазна! Сэрца плача!

ГЛОСТЭР

Ідзі, не бойся.

ЭДГАР

(убок)

Але я павінен.—
Мір акрываўленым вачам тваім!

ГЛОСТЭР

Скажы, ты ведаеш дарогу ў Довер?

ЭДГАР

Ведаю ўсе лазы і пералазы, дарогі конныя і сцежкі пешыя. Адбілі Тому памаракі. Не давядзі, божа, табе, добры чалавек, знацца з нячыстаю сілай. Напала на беднага Тома пяцёра д'яблаў: Абідзікут — чорт юру і свербу, Хабідзіданс — князь нямых і без'языкіх, Маху — злодзей, Модус — забойца, а яшчэ Фліберціджыбет — чорт-малпа, той самы, што найбольш круціцца каля ахмістрынь і служанак. А не дай табе, божа, такога сяброўства.

ГЛОСТЭР

Вось кашалёк, вазьмі яго сабе,

Бядняк, пакрыўджаны людзьмі і небам.
Няхай бяда мая табе дасць шчасце.—
Ушчунь жа, неба, ўсіх багатыроў,
Што, заляжаўшыся ў пярынах мяккіх,
Сумленне страцілі! Бі іх няшчадна,
Каб ведалі, які ў нядолі смак!
Тады падзеліцца багацце роўна
І кожны будзе сыты.—
Ты быў у Доверы?

ЭДГАР

А як жа, сэр.

ГЛОСТЭР

Там ёсць скала высокая над морам,
Вяршыняй грознаю глядзіцца ў вір.
Мяне ўзвядзеш на гэтую скалу,
Паставіш над абрывам, і цябе
Я адпушчу, аддзякаваўшы шчодра.
Адтуль я не вярнуся.

ЭДГАР

Дай руку.
Ідзі за бедным Томам.

Выходзяць.

Сцэна другая

Перад палацам герцага Альбані.

Уваходзяць Ганерылья і Эдмунд, насустрач ім Освальд.

ГАНЕРЫЛЬЯ

Вось мы і дома. Але я дзіўлюся,
Што мой ласкавы муж нас не страчае.—
Дзе гаспадар?

ОСВАЛЬД

Ён у сваіх пакоях.
І што за перамена ў чалавеку?
Я далажыў, што вораг наступае.
Ён толькі усміхнуўся. Я сказаў,
Што вы прыехалі. Ён мне на гэта:

«Тым горш». А калі я пачаў расказваць
Пра здраду Глостэра і пра адвагу
Іх светласці, які ўсё гэта выкрыў,
Ён дурнем абазваў мяне, сказаў,
Што я не ўмею разбірацца ў справах.
Ліхія весткі радуюць яго,
А добрыя — гнявяць.

ГАНЕРЫЛЬЯ

Ах, так!
(Эдмунду.)
Чакайце!
Цялячы дух яго агорнут страхам.
А калі крыўда вымагае помсты,
Патрэбны тут не вялыя натуры.
Усё, аб чым мы думалі дарогай,
Збываецца. Вяртайцеся у Корнуал,
Збірайце войска і вядзіце ў бой.
Мне прыйдзецца самой за зброю ўзяцца,
А мужу ў рукі даць верацяно.
За сувязнога будзе мой дварэцкі,
Ганец праверaны, і вельмі скора,
Умейце толькі смелым быць, пісьмо
Вы атрымаеце ад вашай лэдзі.
Насіце гэту памятку.
(Дае яму стужку.)
Ні слова!
Нагніцеся.— Каб пацалунак мой
Мог гаварыць, душа б твая ўзляцела
У высі шчасця.— Помні і бывай!

ЭДМУНД

Я твой — да смерці.

ГАНЕРЫЛЬЯ

Мілы, мілы Глостэр!

Эдмунд выходзіць.

Як розніцца мужчына ад мужчыны!
Адзін прывабны, сэрца так і млее,
А мне дастаўся ёлуп.

ОСВАЛЬД

Ваша светласць,
З'явіўся герцаг.
(Выходзіць.)

Уваходзіць Альбані.

ГАНЕРЫЛЬЯ

Мілая сустрэча!
Удзячна вельмі. Ні фанфар, ні бубнаў.
Што, прызнаваць не хочаш?

АЛЬБАНІ

Ганерылья,
Дарожны пыл, што на тваім абліччы,
Чысцей, чым ты. Мне страшна за цябе.
Натура, што губляе чалавечнасць,
Знішчае пад сабою корань свой.
Галіна, адламаная ад дрэва,
Без сокаў сохне — на агонь яе
Кладуць як непатрэбную.

ГАНЕРЫЛЬЯ

Даволі!
Прашу мне вашых баек не вычытваць.

АЛЬБАНІ

Дабро і мудрасць — дрэнныя для дрэнных.
Бруд любіць сам сябе. Што вы зрабілі!
О выродкі! О лютыя тыгрыцы!
Велікадушнага старога бацьку,
Якога сівізну мядзведзь лізаў бы,
Вы да вар'яцтва давялі, згубілі
Сваім дзікунствам.
Як мог такое дапусціць мой брат,
Мужчына, герцаг, караля наследнік!
І калі неба вам даруе гэта,
Не пакарае вас за ваш учынак,
То чалавецтва, страціўшы сумленне,
Да людаедства дойдзе.

ГАНЕРЫЛЬЯ

Баязлівец!
Твая шчака чакае аплявухі,
Лоб доўбні просіць. Што ты плюшчыш вочы?
Не бачыш ты, дзе гонар твой, дзе ганьба.
Слімак ты, калі ворагаў шкадуеш:
Іх трэба загадзя знішчаць, не даўшы
Агледзецца. Не чую барабанаў!
Французскі сцяг нахабна паказаўся
Над мірным краем нашым, і забойцы,
Пярнатыя шаломы начапіўшы,
Ідуць на нас, а ты глядзіш спакойна,
Бязвіннае дзіця, адно ўздыхаеш:
Чаму ды што?

АЛЬБАНІ

Глянь на сябе, пачвара!
Не так агідны валасаты чорт,
Як д'ябал у спадніцы.

ГАНЕРЫЛЬЯ

Дурань! Ёлуп!

АЛЬБАНІ

І сораму ў цябе няма, звярыца!
Не перакошвай твар! Каб я даў волю
Сваім рукам, паддаўшыся пачуццям,
Я разарваў бы ўсю цябе на часткі,
Змяшаў бы косці з мясам, але ты,
Хаця і чорт, а ўсё-такі жанчына,
Прыходзіцца улічваць.

ГАНЕРЫЛЬЯ

Ну, нарэшце,
Знайшлася храбрасць.

Уваходзіць ганец.

АЛЬБАНІ

Што новага?

ГАНЕЦ

Святлейшы уладар,
Сканаў раптоўна герцаг Корнуал;
Яго забіў слуга ў час самасуду
Над Глостэрам, якому рвалі вока.

АЛЬБАНІ

Што ты гаворыш?

ГАНЕЦ

Абураны расправаю слуга
Не выцерпеў і, выхапіўшы меч,
Хацеў спыніць злачынную руку,
І тут жа ўпаў, праколаты наскрозь.
Але і герцаг доўга не пражыў,
Памёр ад ран.

АЛЬБАНІ

Святая справядлівасць!
О, ёсць на небе суддзі, што караюць
За ліхадзейства. Бедны, бедны Глостэр!
Гаворыш, вока вырвалі?

ГАНЕЦ

Абодва;
Аслеп навекі.— Вам пісьмо, мілэдзі,

Ад вашае сястры. Яна прасіла,
Каб тэрмінова быў адказ.

ГАНЕРЫЛЬЯ

(убок) Навіны
Прыемныя, але ёсць небяспека:
Цяпер яна ўдава, пры ёй мой Эдмунд,
І ўвесь будынак мар маіх жыццё
Зрабіць салодкім — можа разваліцца.
І ўсё ж я рада.— Зараз прачытаю
І дам адказ.

(Выходзіць.)

АЛЬБАНІ

Скажы, а дзе ж быў сын?
Як дапусціў ён гэта?

ГАНЕЦ

З вашай лэдзі;
Рабіў ёй провады.

АЛЬБАНІ

Што, ён быў тут?

ГАНЕЦ

Быў, ваша светласць, паскакаў назад.
Мы размінуліся дарогай.

АЛЬБАНІ

Ён пра злачынства ведаў?

ГАНЕЦ

Ведаў, сэр.
Ён сам, не хто другі, ім выдаў бацьку;
І, каб вальней іх лютасць бушавала,
Паспешна выехаў.

АЛЬБАНІ

Ты чуеш, Глостэр?
Праславім жа любоў тваю да Ліра!
Жадаю жыць! Я спаганю з іх кроўю
За вочы бедныя твае.— Хадзем,
Раскажаш мне ўсю праўду.

Выходзяць.

Сцэна трэцяя

Французскі лагер каля Довера.

Уваходзяць Кент і дваранін.

КЕНТ

Ці не скажаце вы мне, чаму французскі кароль так раптоўна вярнуўся ў Францыю?

ДВАРАНІН

Ён адлучыўся, не закончыўшы важных дзяржаўных спраў. Тым часам высветлілася, што каралеўству пагражае сур'ёзная небяспека і неабходна яго асабістая прысутнасць.

КЕНТ

А хто замест яго кіруе войскам.

ДВАРАНІН

Французскі маршал, пан Лафар.

КЕНТ

Скажыце,
Калі пісьмо чытала каралева,
Было ёй цяжка?

ДВАРАНІН

Вельмі цяжка, сэр.
Яна пры мне пісьмо чытала ваша:
І слёзы ціха, за слязой сляза,
Каціліся з вачэй яе прыгожых.
Але яна перамагала сум,
Што, як бунтар, схапіў яе за сэрца.

КЕНТ

Была усхваляваная?

ДВАРАНІН

Не бурна.
Цярпенне і туга чаргой сугучнай
Падкрэслівалі толькі харство.
Вы бачылі калі-небудзь вясною
Пры сонцы дождж? Свяцілася праз слёзы
Ў ёй дабрата. І кволая усмешка
Чароўных вуснаў нібы і не знала
Пра тых гасцей, што напаўнялі вочы
І падалі на дол, як дыяменты.
Любіць бы можна сум, як рэдкі дар,
Калі б ён гэтак красіў чалавека.

КЕНТ

Яна не размаўляла з вамі?

ДВАРАНІН

Не.

А толькі прашаптала: «Бацька, бацька»,
Ўздыхнуўшы жаласна, а потым: «Сёстры!
Жанчыны! Сёстры! І не сорам вам!
Кент! Бацька! Сёстры! Як? Уночы? Ў буру?
Няма на свеце літасці!»,— і слёзы
Нястрымна хлынулі з крыніц блакітных,
Заліўся плачам крык яе душы.
Тады яна пайшла ад нас, каб з горам
Адной астацца.

КЕНТ

Кіруюць лёсам зоркі, бо іначай
Яднанне двух узвышаных істот
Ніколі б не магло стварыць такога
Непадабенства ў дзецях. А яшчэ што
Яна казала?

ДВАРАНІН

Больш нічога, сэр.

КЕНТ

Кароль французскі быў пры вас?

ДВАРАНІН

Паехаў.

КЕНТ

Няшчасны Лір знаходзіцца ўжо тут.
Парой, у прасвятленні, ўспамінае,
Дзе ён і што, але дачку пабачыць
Упарта ухіляецца.

ДВАРАНІН

Чаму?

КЕНТ

Яго сумленне мучыць. Дараваць
Не можа ён сабе, што гэтак жорстка,
Пазбавіўшы благаслаўлення, выгнаў
Любімае дзіця, паверыў дочкам
З сабачым сэрцам.

ДВАРАНІН

Бедны чалавек!

КЕНТ

Ці выступілі Корнуал з Альбані?

ДВАРАНІН

Ідуць сюды, вядуць з сабою войска.

КЕНТ

Хадзем, на вас хачу пакінуць Ліра.

Не адлучайцеся і наглядайце.
Я вымушан таіць сваё імя.
Прычына ёсць. Дазнаецеся, хто я,—
Лічыце другам. Пойдзем, калі ласка.

Выходзяць.

Сцэна чацвёртая.

Французскі лагер. Палатка.

Уваходзяць Кардэлія, лекар, афіцэр і салдаты.

КАРДЭЛІЯ

Ах, гэта ён! Яго сустрэлі ў полі
Шалёнага, як мора ў непагоду,—
Хаваўся ў жыце і спяваў. На ім
Вянок з чартапалоху, крапіва,
Куколь, валошка, дзікія званочкі,
Балігалоў і ўсякая трава,
Што глушыць збожжа.— Выдзеліце сотню.
Няхай агледзяць поле, абшукаюць
Усе куткі і прывядуць яго.

Афіцэр выходзіць.

Якія сродкі ад хвароб душэўных
Ёсць у навуцы? Выратуй яго,
Табе я ўсё аддам.

ЛЕКАР

О каралева!
Навука-медыцына мае сродкі.
Найпершы наш збавіцель — гэта сон.
Галоўнае, што ён не спіць. Ёсць зёлкі,
Якія твораць цуд: ён вып'е зёлак,
Уціхне і засне.

КАРДЭЛІЯ

Ўсе таямніцы
Нявыведаных сіл зямлі і неба,
Паўстаньце ад слязы маёй, вярніце
Яму здароўе і спакой.— На пошук!
Знайсці абавязкова! Бо іначай

Ён можа з роспачы і адзіноты
Пакончыць самагубствам.

Уваходзіць ганец.

ГАНЕЦ
Каралева,
Дакладваю: брытанцы недалёка.
КАРДЭЛІЯ
Я гэта ведаю, мы іх чакаем.—
О бацька мой, о дарагі мой бацька,
Іду, каб заступіцца за цябе.
Кануты слёзнай просьбаю маёй,
Кароль французскі пасылае войска.
Паднята зброя наша не для славы:
Любоў і гнеў вядуць у бой крывавы.
Хутчэй бы з ім пабачыцца!

Выходзяць.

Сцэна пятая

Пакой у замку Глостэра.

Уваходзяць Рэгана і Освальд.

РЭГАНА
А герцаг, брат наш, войска выслаў?
ОСВАЛЬД
Выслаў.
РЭГАНА
Паехаў сам?
ОСВАЛЬД
Паехаў сам, мілэдзі,
Хаця і неахвотна. Герцагіня,
Сястра ваша, намнога лепшы воін.
РЭГАНА
А што рабіў граф Эдмунд? Меў размову
Ён з вашым герцагам?
ОСВАЛЬД
Не давялося.
РЭГАНА
Дык, значыцца, ў цябе пісьмо да графа.
А што ў пісьме?

ОСВАЛЬД

Не ведаю, мілэдзі.

РЭГАНА

Паехаў ён адсюль па пільнай справе.
Было памылкай пакідаць жывым
Сляпога Глостэра! Прагнаны з дому,
Ён супраць нас пачне ўзбунтоўваць людства.
І Эдмунд, літасць маючы, рашыў
Прыкончыць старца, на той свет справадзіць,
Каб нам не замінаў, і заадно
Разведаць сілы ворага.

ОСВАЛЬД

Мілэдзі,
Перапрашаю, я павінен ехаць.

РЭГАНА

Куды? Чаго? Мы заўтра выступаем.
Паедзеш заўтра з намі. Небяспечна
Быць аднаму ў дарозе.

ОСВАЛЬД

Выбачайце,
Я слова даў, мой абавязак, гонар...

РЭГАНА

Аб чым пісаць ёй Эдмунду? Цікава?
Тут нешта ёсць.— Паслухай, а на словах
Ты мне не перакажаш? Грошай дам.
Я толькі гляну.

ОСВАЛЬД

Не магу, мілэдзі.

РЭГАНА

Яна не любіць мужа, гэта факт.
Калі яна была тут, то ўвесь час
На графа кідала агністы позірк,
Прываблівала вокам. Ты ў яе
Даверaны па справах сэрца?

ОСВАЛЬД

Я?

РЭГАНА

Кажу, бо гэта так, не адпірайся.
Дык вось, мая табе парада, думай:
Мой муж памёр, мы з Эдмундам у згодзе,
І лепей быць яму маім законна,
Чым у сястры ў любоўніках. Узваж.
Сустрэнеш графа, перадай яму
Мой падарунак. А сястры скажы,

Каб у чужое рук не запускала.
Няхай астыне трошкі. Можаш ехаць.
Калі дзе зловіш здрадніка сляпога,
Сячы, рубі і галаву ў мяшок,
За галаву яго — кішэня грошай.

ОСВАЛЬД

Адно каб ён папаўся мне, мілэдзі,
Жывым не выпушчу.

РЭГАНА

Да пабачэння.

Выходзяць.

Сцэна шостая

Мясцовасць каля Довера.

Уваходзяць Глостэр і Эдгар, адзеты ў сялянскую вопратку.

ГЛОСТЭР

Калі ж мы узбяромся на гару?

ЭДГАР

Мы узбіраемся. Уздым круты.

ГЛОСТЭР

А мне здаецца, роўна.

ЭДГАР

Што вы? Круча.
Вы чуеце шум мора?

ГЛОСТЭР

Не, не чую.

ЭДГАР

Тады у вас баляць не толькі вочы,
А вушы і ўсё цела.

ГЛОСТЭР

Мо і праўда.
І голас у цябе перамяніўся,
І мова складная.

ЭДГАР

Падман пачуццяў.
Я толькі ў новай вопратцы.

ГЛОСТЭР

Магчыма,
Магчыма, але ты гаворыш лепей.

ЭДГАР

Трымайцеся, ўзышлі.— Якая круча!
Зірнуць уніз, аж сэрца замірае.
Вароны, галкі кружацца пад намі,
Як чорныя жукі, і чалавек,
Адважна учапіўшыся за выступ,
Павіс між небам і зямлёй:
Збірае кроп. Жахлівая работа!
Як дзіўна меншацца усе прадметы!
Вунь рыбакі праходзяць чарадою,
Драбнейшыя, чым мышы. Карабель
Стаіць на якары, зусім як лодка,
А лодка з паплавок, ледзь-ледзь прыкметна.
Высокі вал бяжыць, у бераг плешча,
Шаруе шэры камень, але гул
Сюды і не даносіцца.— Даволі!
Мне млосна робіцца. Яшчэ раз гляну́ць,
І я сарвуся ў прорву.

ГЛОСТЭР

Пастаў мяне туды, дзе ты стаіш.

ЭДГАР

Бярыцеся, сэр, за маю руку.
Вы на краі прадоння. Ой, як страшна!
Я б не саскочыў нізашто на свеце.

ГЛОСТЭР

Пусці ж мяне цяпер і не трывож.
Вось кашалёк яшчэ, ў ім дыямент:
Для беднякоў, як ты — вялікі скарб.
Хай духі светлыя табе спрыяюць!
Ідзі сабе. Забудзь усё ліхое!
Ідзі, каб я пачуў.

ЭДГАР

Мой добры сэр,
Бывайце, шчыра дзякую.
(Адыходзіць на некалькі крокаў.)

ГЛОСТЭР

Шчасліва!

ЭДГАР

(убок)
Клін выб'ю клінам. З горам не жартуюць.

ГЛОСТЭР

О богі моцныя ў прасторах вечных!
Адрокшыся ад свету, перад вамі
Складаю я сваю тугу і боль.
Не маю сіл трываць. Бунтуе дух мой.
Даруйце мне, што я не дачакаўся,
Пакуль жыцця майго агарак чадны
Пагасне сам.
Благаславіце Эдгара, сыночка! —
Ну, дружа мой, бывай!

ЭДГАР

Пайшоў. Бывайце!

Глостэр кідаецца і падае.

(Убок.)
Гавораць, што і думка забівае,
Калі няма жадання жыць. Каб ён
Быў там, дзе думаў, быў бы ён нябожчык.
(Мяняючы голас.)
Жывы ці мёртвы? Сэр, што з вамі? Сэр?
Сэр, адгукніцеся! Скажыце слова! —
Відаць, разбіўся.— Не, ён ажывае!
Адкуль вы? Хто вы?

ГЛОСТЭР

Прэч! Дай мне памерці.

ЭДГАР

Ты, чалавека, з пуху альбо з пер'я?
Звалiўшыся з такое вышыні,
Ты трэснуў бы, як яйка, ўвесь бы выцек.
Але ты дыхаеш, крыві ні знаку,
Здаровы, цэлы! Дзіва, проста цуд!
У дзесяць мачтаў не ўвабраць гару,
З якой ты паляцеў старчма ў прадонне.
Вялікі цуд! Яшчэ раз адгукніся.

ГЛОСТЭР

Я падаў ці не падаў?

ЭДГАР

Ты упаў
Са страшнай вапняковае скалы.
Зірні уверх. Сцяна падперла неба!
І жаўранка, што звонка славіць сонца,
Пачуць адгэтуль нельга. Паглядзі!

ГЛОСТЭР

Я, братачка, сляпы.
Няўжо няма канца маім пакутам?

І смерць забраць не хоча. Прабаваў
Бядняк зламаць ярмо, знайсці збавенне
Ад тыраніі панскае — не выйшла.

ЭДГАР

Дай мне руку. Устань. Ну, што? Як ногі?

ГЛОСТЭР

Стаяць-то я стаю.

ЭДГАР

Не даў бы веры,
Але сам сведка. Цуд! Скажы мне, старча,
А хто там быў з табою на гары,
Прывёў цябе?

ГЛОСТЭР

Жабрак адзін убогі.

ЭДГАР

А мне здалося знізу — нехта іншы.
Жах агарнуў мяне. Увесь у шэрсці,
Блішчалі вочы, як у поўню месяц,
І сто насоў жывым клубком звісалі,
Як гады, варушыліся, і рогі
Тырчалі пакручастыя. То быў,
Напэўна, д'ябал. О шчаслівы старац,
Падзякуй жа багам! Мяжы няма
Для волі найвышэйшай. Ты збавёны.

ГЛОСТЭР

Век буду памятаць. Што ж мне рабіць?
Зноў сваё гора пакладу на плечы
І панясу, пакуль яно само
Не крыкне: «Досыць!» І тады памру.
А я прыняў яго за чалавека.
Ён нездарма ўвесь час шаптаў мне ў вуха:
«Злы дух, злы дух». Павадыром быў чорт.

ЭДГАР

Цяпер ты можаш уздыхнуць свабодна.
А гэта хто яшчэ?

Уваходзіць Л і р, дзівосна прыбраны ў палявыя кветкі.

Здаровы розум
Не выдумаў бы гэткага убрання.

ЛІР

Не, не, яны мне не забароняць чаканіць чырвонцы.
Я — кароль.

ЭДГАР

О жаласны малюнак!

ЛІР

Прырода ў гэтай справе найлепшы мастак. Вось вам грошы, найміце салдат. Як ты трымаеш лук? Варона! Пудзіла! Нацягвай стралу як след! Гляньце, гляньце — мыш. А мы яе на сыр. Хап! Ёсць. Кідаю жалезную рукавіцу. Выклікаю на бой велікана. Падаць сюды алебарды! Трапна паляцела птушка. Ф'ю!.. У морду, у самую пысу.— Пароль?

ЭДГАР

Духмяны маяран.

ЛІР

Праходзь.

ГЛОСТЭР

Знаёмы голас!

ЛІР

А! Барадатая Ганерылья! — Абрасла? Пасівела? — Яны мяне гладзілі, як сабачку. Гаварылі: беленькі, сівенькі! Ці ж я ўвесь час быў сівенькі? Маладосці не меў? Што б я ні сказаў, на ўсё яны — так, так, так альбо — не, не, не. Гэта не па-сяброўску: і хвастом віляць і кусацца. Вось як прамачыў мяне дождж, як заляскаў я зубамі ад холаду, загадаў грому спыніцца, а ён не паслухаўся, тады я зразумеў, убачыў іх наскрозь. Ёсць людзі шчырыя і няшчырыя. Яны мне казалі, что я магутны. Хлусня! Я не магу абараніцца ад прастуды.

ГЛОСТЭР

Я добра ведаю, чый гэта голас.
Ці не кароль?

ЛІР

Кароль, кароль ад галавы да пят.
Ад позірку майго ўсё халадзее,
Дрыжаць рабы.— Хто там укленчыў? —
Дарую вам жыццё. У чым віна?
За блудадзейства?
За гэта вешаць? Не, ты не памрэш.
І верабей, і залатая мошка
Без сораму адкрыта твораць грэх.
Пладзіцеся! Сын Глостэра пабочны
Дабрэйшы быў да бацькі, чым мае
Законныя дзве дочкі.
Распуста, радуйся! Больш, больш дзяцей!

Патрэбны мне салдаты.
Прашу зірнуць на гэту лэдзі: лёд,
Святая дабрачыннасць, твар адверне,
Пачуўшы слова «асалода»,
Але ні тхор, ні жарабец стаенны
Не паляцца так прагна.
Да пояса жанчына — чалавек,
Ніжэй — цэнтаўр, пачвара з капытамі;
Палова зверху — спадчына нябёс,
Спадыспаду — маёнтак чортаў:
Там пекла, змрок, смалы кацёл кіпучы,
Дым, чад, смурод, прадонне, прорва...
Тфу, тфу! Фэ! — Калі ласка, пане аптэкар, дайце мне унцыю мускусу асвяжыць мазгі. Толькі не ў крэдыт, калі ласка. Я заплачу.

ГЛОСТЭР

Дазвольце мне пацалаваць вам рукі.

ЛІР

Іх трэба выцерці, тухлінай пахнуць.

ГЛОСТЭР

Прыроды зруйнаваная часціна!
І свет увесь калі-небудзь таксама
Разваліцца дарэшты. А мяне
Вы помніце?

ЛІР

А як жа, добра помню.
Асабліва вочы. Чаго ты іх вытрашчыў, сляпы Купідон!
Не спакушай, усё роўна любіць не буду.— Выклікаю на паядынак, чытай; бачыш, як складна напісана.

ГЛОСТЭР

Каб літары свяціліся, як сонца,
Мне не разгледзець іх. Мой зрок пагас.

ЭДГАР

(убок)
Душа баліць, зайшлося з жалю сэрца.
Хто даў бы веры?

ЛІР

Чытай жа.

ГЛОСТЭР

Чым? Вачніцамі пустымі?

ЛІР

Ого! Знайшоўся і мне таварыш. Лоб дзіравы, кішэня распората, вочы пасеяў, галаву прапіў, а грошы дзын-дзын, гоп і пакаціліся. Ты бачыш, што робіцца на свеце?

ГЛОСТЭР

Я адчуваю.

ЛІР

Ты што, вяр'ят? Чалавек і без вачэй павінен бачыць, што робіцца на свеце. Натапыр вушы і глядзі. Злодзея прывялі да суддзі. Чуеш, як суддзя языком лапоча. Стой ціха. Я табе нешта пакажу. Раз, два! Суддзю за каршэнь, а злодзея ў крэсла. Цяпер угадай: хто з іх злодзей, а хто суддзя? А ці бачыў ты, як хутарскі сабака брэша на жабрака?

ГЛОСТЭР

Бачыў, сэр.

ЛІР

А як жабрак уцякае ад сабакі, ты бачыў? Дык вось запомні: і сабака начальнік, калі ён на службе. Не пярэч і не супраціўляйся.
Ліхі цівун, за што лупцуеш дзеўку?
Прэч рукі, кат! Падстаў сваю спіну.
Ты сам бы да яе ў пасцель палез,
Звярынаю ахвотаю наліты.
Ліхвяр павесіў шэльму: праз рыззё
Свіціцца цела, сіняе, худое.
Пад футрам і парчой грэх у цяпле.
Закуй злачынства ў панцыр залаты —
І не праткне яго кап'ё закона,
Але няшчаснага ў сарочцы зрэбнай
Уколюць і саломкай. Я кажу вам,
Я ведаю: няма ў нас вінаватых!
Я апраўдаю ўсіх. Мая улада!
Пазатыкаць раты ўсім трапачам!
Мой друг, купі сабе шкляныя вочы,
Надзьмі жывот і, як палітык дрэнны,
Хоць і не бачыў, гавары, што бачыў.—
Бярыся за мой бот, цягні. Ну, ну.
Натужся! Так.

ЭДГАР

(убок)

Бязглуздзіца і сэнс!
Вар'ят — ён гэтак жа свой розум мае.

ЛІР

Калі ты без вачэй не можаш плакаць,
Вазьмі мае, паплач над нашай доляй.
Цярпі, пара прывыкнуць. Кожны з нас
Радзіўся з плачам, наглытаўся слёз,

Не паспытаўшы малака. Дык слухай,
Скажу табе ўсю праўду.

ГЛОСТЭР

Горыч! Горыч!

ЛІР

Дзіця крычыць: не хочацца дзіцяці
Іграць камедыянта сярод дурняў.—
Які выдатны капялюш! — Ага!
Пушчуся я на хітрасць. Падкую
Ўсіх коней лямцам, выеду уночы,
Падкрадуся паціху да зяцёў
І буду біць іх, біць, біць, біць, біць, біць.

Уваходзяць дваранін і слугі.

ДВАРАНІН

Сюды, сюды! Ён тут. Бярыце.— Сэр,
Дачка ваша...

ЛІР

Ратуйце! Я ў палоне.—
Куды ні кінуся, кругом няўдача.—
Я выкуп дам. Мяне вязаць не трэба.
Паклічце доктара. Я вельмі хворы:
Паранены ў мазгі.

ДВАРАНІН

Сэр, будзе ўсё.

ЛІР

Адзін... Нікога блізкага... Адзін...
Салёнымі слязамі паліваю
Дарогі пыльныя.

ДВАРАНІН

Высокі сэр...

ЛІР

Хачу памерці горда. Як жаніх,
Спраўляю баль. Звон келіхаў і кубкаў.
Заходзьце, калі ласка. Я — кароль.
Нахмурыліся? Не пазналі?

ДВАРАНІН

Вялікі уладар, мы вашы слугі.

ЛІР

Тады не ўсё прапала. Даганяйце!
Лавіце! Ха-ха-ха-ха-ха!
(Выбягае.)

Слугі за ім.

ДВАРАНІН

Уніжаны, зняважаны, прагнаны!
І хто? Кароль Брытаніі. О жудасць!
Ёсць у цябе дачка: яна прытуліць,
Падыме бацьку з рову утрапёных,
Куды яго сапхнулі дзве зладзейкі.

ЭДГАР

Дзень добры, пане!

ДВАРАНІН

Добры дзень! Што трэба?

ЭДГАР

Хачу спытацца ў пана пра вайну.
Ці чулі вы што-небудзь?

ДВАРАНІН

Факт бясспрэчны.

ЭДГАР

Паважуся яшчэ спытаць у пана:
А ці далёка вораг?

ДВАРАНІН

Недалёка.

ЭДГАР

Ага. Цікава! — Вельмі вам удзячны.

ДВАРАНІН

Хаця яе вялікасць каралева
Сама тым часам тут, але наперад
Паслана сіла войска.

ЭДГАР

Дзякуй пану.

Дваранін выходзіць.

ГЛОСТЭР

О богі міласэрныя, спыніце
Маё дыханне, выбаўце ад д'ябла,
Каб ён не спакушаў мяне парушыць
Святую вашу волю. Богі, богі,
Прашу ў вас смерці!

ЭДГАР

Добрая малітва.

ГЛОСТЭР

А хто ты будзеш, дружа мой?

ЭДГАР

Ды так.
Хаджу па беднасці, шукаю шчасця;
Травой кармлюся, горам запіваю,

І сэрца стала мяккае, як воск.
Дай мне руку. Я завяду цябе
У двор альбо на ферму.

ГЛОСТЭР

Дзякуй, дружа.
Няхай цябе узнагародзіць неба!
Свет не без міласці.

Уваходзіць О с в а л ь д.

ОСВАЛЬД

Ага! Знаходка!
Жывыя грошы! — Стой, не варушыся,
Бязвокая трухліна! — Мне шанцуе:
Як па ступеньках вылезу угору.—
Сагні калені, здраднік! Кайся, кайся!
Меч выняты, канцы табе!

ГЛОСТЭР

Мой дружа,
Ты толькі лёгенька, адным ударам.

Эдгар заступаецца за Глостэра.

ОСВАЛЬД

Ты што, мужык? Абараняць злачынца?
Бяжы, пакуль не позна! Засяку!
Пусці!

ЭДГАР

(выдаючы сябе за селяніна)

Вы, пане-ягомасць, не вельмі. Цішэй трошкі.
Чалавека я ў крыўду не дам.

ОСВАЛЬД

Засяку!

ЭДГАР

А мой панок, ідзі ты па сваёй дарозе па шырокай, а мы, бедныя людзі, пойдзем па сваёй па вузенькай, не чапай нас. Не падох я на тым тыдні, то як-небудзь пратрымаюся і на гэтым. Адкасніся, навалач, ад старога чалавека! Крані толькі, раструшчу дубінаю чэрап, і не войкнеш.

ОСВАЛЬД

Прэч, смурод!

ЭДГАР

От ты які. Ну то пабачым, ці такія ў цябе моцныя зубы, як ты іх вышчарыў. Ды не махай так сваёю бляшанаю цацкай, мы не баязлівыя.

Б'юцца. Эдгар валіць Освальда.

ОСВАЛЬД

Раб, ты забіў мяне. Вось кашалёк,
Там золата, бяры, лічы, любуйся.
За гэта пахавай мяне. А пісьмы,
Каторыя пры мне, хай прачытае
Граф Эдмунд Глостэр, занясі яму
Ў брытанскі лагер, гэта вельмі важна.
Ох, неахвота паміраць.

(Памірае.)

ЭДГАР

Падлюга!
Знаёмы твар: крывавай Ганерылі
Крывавы прыхвасцень, яе брыдот
Агідны выканаўца.

ГЛОСТЭР

Што? Памёр?

ЭДГАР

Вы, бацька, сядзьце, адпачніце,—
Я зараз гляну, што ў яго за пісьмы,
Магчыма, і спатрэбяцца.— Ён мёртвы.
Шкада, што разлучыў яго са светам
Не кат, а я.— Хаця і непрыстойна
Ламаць пячаці, трэба распячатаць.
Каб выявіць, што ў ворага на думцы,
Дзяруць і скуру часам. Што папера? —
Папера скардзіцца не будзе.

(Чытае.)

«Помні нашы ўзаемныя клятвы. Яго жыццё ў тваіх руках. Не аслабляй рашучасці, дабірай момант. Калі маеш жаданне, то знойдуцца і сродкі. Якая мне карысць з таго, што ён вернецца пераможцам! Ён мне зноў звяжа свет. Прыйдзі, прыйдзі, мой збаўца, адчыні акно маёй душнай цямніцы, каб я магла падняцца з пастылага ложка і кінуцца ў твае дарагія абоймы. Твая (жонка, хацела б я сказаць) з любоўю, Ганерылья».

Вось і ўгадай, чаго жанчына хоча!
Дамовілася мужа загубіць.
Каб апрасталася пасцель каханку.—
Старайся, Эдмунд, брат! — героем будзеш.—
Ганец ліхіх распуснікаў, твой труп
Пяском засыплю, дагнівай, ляжы!
А ліст, ганебны доказ цёмных спраў,
Дастаўлю сёння ж герцагу Альбані.

Пара канчаць! Напоўнілася мера.
Ніякай ласкай не сунімеш звера.
(Выходзіць, выцягваючы труп.)

ГЛОСТЭР

Кароль — вар'ят. Што ж я не звар'яцеў:
І разумею ўсё і адчуваю.
За што мне гэта цяжкае мучэнне!
О, закруціцца б у шалёным віхры,
Згубіўшы памяць, на свой боль забыцца,
Тугу сваю у марах патапіць!

Вяртаецца Э д г а р.
Здалёк чуваць барабаны.

ЭДГАР

Трывога! Чуеце, б'юць барабаны?
Хадзем. Я завяду вас да сяброў.

Выходзяць.

Сцэна сёмая

Палатка ў французскім лагеры.

Л і р у пасцелі, спіць, каля яго л е к а р, д в а р а н і н і с л у г і.
Ціхая музыка.
Уваходзяць К а р д э л і я і К е н т.

КАРДЭЛІЯ

Мой добры Кент, чым я табе аддзячу?
Жыццё маё кароткае, і сродкаў
Маіх не хопіць.

КЕНТ

Вашая вялікасць.
З мяне даволі ласкавага слова,
І найвышэйшы дар — прызнанне ваша.
Я расказаў вам праўду, не прыбавіў
І не ўтаіў нічога. Так было.

КАРДЭЛІЯ

Пераадзенься, скінь убор убогі,
След цяжкіх дзён.

КЕНТ

Прабачце мне, мілэдзі,
Я вымушаны да пары да часу
Не выдаваць сябе.

КАРДЭЛІЯ

Хай будзе так.

(Лекару.)

Што з каралём?

ЛЕКАР

Яшчэ ён не прачнуўся.

КАРДЭЛІЯ

Няхай пашлюць яму здароўя богі,
Каб праяснілася яго душа.
І думак бунт, і сэрца плач пакутны
Хай згінуць, як ліхая хмара! Бацька,
О бедны мой, ты — як дзіця малое!

ЛЕКАР

Калі жадае вашая вялікасць,
То мы яго разбудзім. Ён спаў доўга.

КАРДЭЛІЯ

Рабіце так, як раіць вам навука,
Мяне вы не пытайце. Ён адзеты?

ДВАРАНІН

О так, мілэдзі. З соннага знялі
Ўсю тую вопратку. Ён спіць у чыстым.

ЛЕКАР

Мадам, прашу сюды.
Бліжэй да ложка. Зараз ён прачнецца.
Даю гарантыю, ён будзе ціхі,
Ніякага буянства.

КАРДЭЛІЯ

Вельмі добра.

ЛЕКАР

Яшчэ бліжэй! — Музыкі, грайце гучна.
Прашу што-небудзь радаснае.

КАРДЭЛІЯ

Бацька,
Мой родны, дарагі! Жадала б я
Мець для цябе лякарства на губах,
Каб пацалунак мой мог загаіць
Тваё параненае крыўдай сэрца.
Эх, сёстры, сёстры!

КЕНТ

Зоранька мая!
Мая ты каралева!

КАРДЭЛІЯ

Калі вам
Ён стаў чужы, уважылі б хоць старасць!
Трапала бура белы волас твой,
Халодны дождж хвастаў у твар, і гром
Пад крыжавыя выбліскі маланак
Цябе аглушваў грукатам. Мой бедны,
У полі, без прыстанішча, адзін,
Як кволая трысціначка! Ды я
Сабаку злога, што мяне ўкусіў,
Не выгнала б, дазволіла б яму
Ў такую ноч каля камінка грэцца.
А ты валяўся на гнілой саломе
З бадзягамі, са свіннямі. Мой божа!
Узяў ты розум, а жыцця не ўзяў:
Хвала хоць і за гэта.— Ён прачнуўся.
Пагаварыце з ім.

ЛЕКАР

Не, лепей вы.

КАРДЭЛІЯ

Як адчуваеце сябе, кароль мой?
Ці адпачылі, вашая вялікасць?

ЛІР

Нашто мяне з магілы падымаюць?
Ты— райская душа, а я прыкован
Да агнявога кола аблівацца
Свінцовымі пякельнымі слязьмі.

КАРДЭЛІЯ

Кароль не пазнае мяне?

ЛІР

Пазнаў.
Ты — здань нябесная. Даўно памерла?

КАРДЭЛІЯ

Ён не пры памяці.

ЛЕКАР

Уплывы сну.
Вы не хвалюйцеся. Працэс нармальны.

ЛІР

Дзе гэта я? Дзе быў я? — Сонца свеціць? —
Як я пакрыўджаны! Каб так другога,
То, глянуўшы, памёр бы я ад жалю.—

Што мне сказаць? — Мая рука ці не? —
О! Шпілька колецца. Рука мая.—
Аднак жа мне не верыцца.

КАРДЭЛІЯ

Кароль мой,
Благаславіце, гляньце на мяне,
Хай наша шчасце вернецца.— Ой, што вы!
Не трэба кленчыць.

ЛІР

Я вас так прашу,
Не насміхайцеся. Я — адзінокі,
Стары, дурны, нікчэмны чалавек.
Мне восемдзесят год.
А мо і болей, я свой век пражыў
І, можа, нават, шчыра вам скажу,
Не ў сваім розуме. Здаецца мне,
Што я вас недзе бачыў... і яго.
Аднак не маю пэўнасці. Ніяк
Не уяўляю, дзе я. І уборы
На мне чужыя. Не магу прыпомніць,
Дзе начаваў я. Думаецца мне...
Здаецца мне... што гэта людзі —
Дзіця маё, Кардэлія.

КАРДЭЛІЯ

Я! Я!
Мой родненькі!

ЛІР

Якія слёзы мокрыя! Вада.
Не плач! Не плач! А дай мне лепш атруты,
Каб я напіўся. Ты мяне не любіш,
Я ведаю. Бо ад тваіх сясцёр
Я меў так многа гора. А ў цябе
Прычына ёсць.

КАРДЭЛІЯ

Няма, няма прычыны!

ЛІР

Дзе я? У Францыі?

КЕНТ

У сваёй дзяржаве,
Мой уладар.

ЛІР

Ашукваеш. Няпраўда.

ЛЕКАР

Мадам, уцешцеся. Ўсё будзе добра.

Як бачыце, прыпадак злы мінуў
І роспач уляглася, але я
Павінен папярэдзіць: успаміны —
Рэч вельмі шкодная. Я раю вам
Прайсціся з ім на свежае паветра.
Крыніца аднаўлення сіл — прырода.

КАРДЭЛІЯ

Ці не жадае вашая вялікасць
Пайсці гуляць?

ЛІР

Не асуджай сурова.
Даруй мне, дзетка. Я стары і дурань.

Выходзяць Лір, Кардэлія, лекар і слугі.

ДВАРАНІН

Ці праўда, сэр, што герцаг Корнуал
Забіты?

КЕНТ

Гэта праўда.

ДВАРАНІН

Хто ж цяпер
У іх там за начальніка?

КЕНТ

Гавораць, Эдмунд, Глостэраў байструк.

ДВАРАНІН

А Эдгар дзе, яго законны сын?
Я чуў, гавораць, разам з графам Кентам
Хаваецца ў Германіі.

КЕНТ

Не знаю.
Ці мала ўсякіх чутак. Час падумаць
Аб болей важным. Армія брытанцаў
Пад Доверам.

ДВАРАНІН

Гарачы будзе бой. Бывайце, сэр.
(Выходзіць.)

КЕНТ

Трубі, трубач, крывавых спраў ганец!
Чакаць нядоўга, блізіцца канец.

Выходзіць.

АКТ ПЯТЫ

Сцэна першая

Брытанскі лагер каля Довера.

Уваходзяць з барабанамі і сцягамі Эдмунд, Рэгана, афіцэры і салдаты.

ЭДМУНД

(афіцэру)

Спытайцеся, чаго жадае герцаг?
Не адмяніў ранейшага рашэння?
Ніякай пэўнасці! Адны хістанні!
Хай выкажацца цвёрда і дакладна.

Афіцэр выходзіць.

РЭГАНА

Няйначай з пасланцом маёй сястры
Што-небудзь здарылася.

ЭДМУНД

Мабыць, так.

РЭГАНА

Мой мілы граф, вы ж ведаеце, я
Не раўнадушна к вам: скажыце праўду
З усёю шчырасцю, без ашуканства,
Вы любіце маю сястру?

ЭДМУНД

Шаную.

РЭГАНА

А вы не прабавалі адамкнуць
Сваім ключом чужыя дзверы?

ЭДМУНД

Што вы?
Адкуль такая думка?

РЭГАНА

Мне здаецца,
Вы з ёю вельмі зблізіліся.

ЭДМУНД

Не,
Даю вам слова гонару, ніколькі.

РЭГАНА

Я б не сцярпела гэтага. Ах, Эдмунд,
Не верце ёй.

ЭДМУНД

Не бойцеся, мілэдзі.
Я цалкам ваш.— А вось і герцаг з жонкай.
Увага.

Уваходзяць з барабанамі і сцягамі Альбані, Ганерылья і салдаты.

ГАНЕРЫЛЬЯ

(убок)

Бач, бач, нахабніца, яна з ім побач!
Лепш бой прайграць, чым уступіць ёй, подлай.

АЛЬБАНІ

Вітаю вас, шаноўная сястра! —
Сэр, чуў я, што кароль каля дачкі
І з ім усе, каго тыранства наша
Пакрыўдзіла. Я не магу быць храбрым,
Калі не бачу праўды.
Не жадаю,
Каб нашы землі вытаптаў француз,
Гатовы біцца з ім, але ніколі
Я не пайду супроць свайго народа,
Не падыму мяча на караля.

ЭДМУНД

Сэр, вы гаворыце велікадушна.

РЭГАНА

Але марнуеце дарэмна час.

ГАНЕРЫЛЬЯ

Мы з вамі аб'ядналіся для бітвы
З агульным нашым ворагам, і спрэчкі
Сямейныя тут ні пры чым.

АЛЬБАНІ

Я склікаў
Ваенную нараду. Абмяркуем
Парадак бою дэталёва там.
Прашу ў палатку.

ЭДМУНД

Зараз я прыйду.

РЭГАНА

Сястра, ты з намі?

ГАНЕРЫЛЬЯ

Не.

РЭГАНА

Ты што, сястрыца?
Трымай сябе прыстойна, пойдзем разам.

ГАНЕРЫЛЬЯ

(убок)

У, гадаўка, наскрозь відна.— Хадзем.

Уваходзіць Э д г а р у сялянскай адзежы.

ЭДГАР

Калі не грэбуе святлейшы герцаг
Маёй убогай вопраткай, дазвольце
Сказаць вам слова.

АЛЬБАНІ

Слухаю, кажы.

(Да іншых.)

Я не забаўлюся.

Выходзяць усе, апроч Альбані і Эдгара.

ЭДГАР

Вось вам пісьмо;
Перад пачаткам бітвы прачытайце.
Калі вам суджана перамагчы,
Трубіце зычна ў рог — і я з'яўлюся.
Пры ўсім мізэрным выглядзе сваім,
Я выстаўлю вам рыцара, ён кроўю
Пацвердзіць тое, што ў пісьме. Калі ж
Бяда спасцігне вас, тады — канец
І вам, і вашым клопатам, і крыўдзе.
Хай вас палюбіць лёс!

АЛЬБАНІ

Што тут такое?
Я прачытаю. Пачакай! Пастой!

ЭДГАР

Няма калі. Усё ў свой час і тэрмін.
Пачуўшы кліч герольда, я вярнуся.

(Выходзіць.)

АЛЬБАНІ

Што за папера? Што ў ёй можа быць?

Уваходзіць Э д м у н д.

ЭДМУНД

Праціўнік блізка ўжо. Выводзьце войска.
Вось вам паведамленне ад разведкі
Аб колькасці варожых сіл. Рашучасць
І націск перш за ўсё.

АЛЬБАНІ

Я з вамі згодзен.

(Выходзіць.)

ЭДМУНД

Абедзвюм сёстрам кляўся я ў каханні.
Яны адна другую ненавідзяць,
Грызуцца між сабой, як дзве гадзюкі.
Каторую ж узяць? Адну? Абедзвюх?
Мо лепей ні адной? На дзве прынады
Не зловіш шчасця. Выбраць удаву?
Ад зайздрасці ўсшалее Ганерылья.
А у тае ёсць муж. Які мне выйгрыш
Любіцца ўпотай? Выцягнем з яго
Усё для перамогі. Ну, а там
Няхай яна сама шукае спосаб,
Як ад яго пазбавіцца. Ён хоча
Памілаваць Кардэлію і Ліра.
Абы яны папаліся мне ў рукі,
Я пакараю смерцю без вагання
Іх абаіх. Такі закон змагання.
(Выходзіць.)

Сцэна другая

Поле паміж двух лагераў.

За сцэнай шум бітвы. З барабанамі і сцягамі праходзяць Лір, Кардэлія і іх войска. Уваходзяць Эдгар і Глостэр.

ЭДГАР

Сядзь, бацька, у цяньку пад гэтым дрэвам
І памаліся горача за нас,
За справу справядлівую. Калі
Вярнуся я жывы, то прынясу
Табе уцеху.

ГЛОСТЭР

Дай вам, божа, шчасця.

Эдгар выходзіць.
Шум бітвы ўзмацняецца.
Крыкі, потым адступленне.
Уваходзіць Эдгар.

ЭДГАР

Бяда, стары, бяжым хутчэй адгэтуль!
Кароль разбіты, узялі ў палон
І Ліра і Кардэлію. Бяжым!
Дай мне руку.

ГЛОСТЭР

Куды мне бегчы, я і тут згнію.

ЭДГАР

Адкінь ліхія думкі! Чалавек
Не волен паміраць, як і радзіцца.
Цярпі, на ўсё свой час.

ГЛОСТЭР

Гаворыш праўду.

Выходзяць.

Сцэна трэцяя

Брытанскі лагер каля Довера.

Урачыста, з барабанамі і сцягамі,
як пераможца ўваходзіць Эдмунд;
следам вядуць палонных Ліра і Кардэлію.
Афіцэры, салдаты ды іншыя.

ЭДМУНД

Вазьміце іх! Трымаць пад моцнай вартай
Да выяўлення волі і рашэння
Вышэйшых суддзяў.

КАРДЭЛІЯ

Мой ты небарача,
Хіба нам першым у жыцці няўдача?
Плюе на дабрату людскую лёс.
Шкада мне старасці тваёй да слёз!
Я — маладая, выцерплю, а ты...
Дзе дочкі гэтыя, дзе тыя сёстры,
Хоць бы сустрэцца з імі?

ЛІР

Нізашто!
Не, не, не, не! Лепш пойдзем у турму:
Там будзем мы спяваць з табой на пару,
Як птушкі ў клетцы. Калі ты папросіш
Майго благаслаўлення, пакланюся

Табе я ў ногі, на калені стану:
Даруй, прабач, забудзь! Мы будзем жыць,
Глядзець на легкакрылых матылькоў,
На пчолку залатую, на чмяля.
І будзе ў нас размова з беднякамі
Пра ўсё, што дзеецца на белым свеце:
Хто ў ласцы, хто ў няласцы, хто і чым
Сябе праславіў. Будзем выяўляць
Таемны сэнс і сутнасць кожнай з'явы,
Як сведкі божыя. Так у цямніцы
Перачакаем мы з табою ціха
Ўсю гэту мітусню князёў зямлі,
Што як прыліў і спад.

ЭДМУНД

Вядзіце іх!

ЛІР

Такім ахвярам, дзеткі, як твая,
І богі пазайздросцяць. Ты пры мне,
Мая Кардэлія! Хто нас разлучыць?
Хіба украдуць бліскавіцу з неба
І выкураць агнём нас, як лісіц.
Не плач! Няхай іх выкурыць чума,
Хай выгрызе з іх мяса і вантробы!
Яны нас не прымусяць плакаць. Не!
Палопаюцца, паздыхаюць! Пойдзем.

Выходзяць пад вартай Ліра і Кардэлія.

ЭДМУНД

Паслухай, капітан... Вазьмі запіску.
(Дае афіцэру запіску.)
Праводзіш іх да самае турмы.
Табе павысіў чын я. Зробіш так,
Як тут напісана, і шлях да славы
Перад табой. Ідзі услед за векам.
І памятай, што сэрца у салдата
Павінна быць, як камень. Даручэнне
Табе даецца важнае. Выконвай
І не пытайся.

АФІЦЭР

Ёсць выконваць, сэр.

ЭДМУНД

І не марудзь, а то упусціш шчасце.
Яно — тваё. Старанне мы ацэнім.
Раз-два, махнуў — і ўсё ў парадку.

АФІЦЭР

Ёсць.

Не конская работа, маю спрыт.
(Выходзіць.)

Трубы.
Уваходзяць Альбані, Ганерылья, Рэгана, афіцэры і світа.

АЛЬБАНІ

Тым часам, сэр, вас можна віншаваць.
Вы біліся з натхненнем, і фартуна
Была ў саюзе з вамі. Вораг здаўся.
Мы прапануем выдаць нам палонных
Пад наш нагляд і пад ахову нашу,
Як вымагаюць гэтага іх годнасць
І наш інтэрас.

ЭДМУНД

Сэр, я палічыў
Разумным немачнага венцаносца
Ўзяць пад канвой і вывесці адсюль.
Чаруе многіх старасць, а яшчэ больш
Высокі тытул. Адстаўны кароль
Пачаў гарнуцца да грудзей народных,
Даволі іскры, каб раздзьмуць пажар,
І пікі, ашчаціненыя бунтам,
Павернуцца супроць улады нашай.
Пры ім і каралева. Хай сядзяць!
Бяспечней будзе. Калі ваша светласць
Жадае вынесці ім прыгавор,
То можна заўтра альбо іншым разам.
Цяпер жа мы абліты потам, кроўю,
Яшчэ на полі не астылі трупы,
І самы лепшы бой ані не цешыць
Таго, каму зірнула ў вочы смерць.
Пытанне Ліра і яго дачкі
Не тэрміновае.

АЛЬБАНІ

Сэр, выбачайце.
Хто вы такі? Вы — воін, вы — начальнік,
Але вы нам не брат.

РЭГАНА

Сэр, збаўце тон.
Спачатку трэба ведаць нашу думку,
А потым гаварыць. Для нас ён брат.

Ён замяшчаў мяне, маю асобу,
Ён войска вёў маё і можа смела
Раўняцца з вамі.

ГАНЕРЫЛЬЯ

Астудзі запал!
Ён сам сабой выдатны, без тваіх
Паслуг і міласцей.

РЭГАНА

Маёю воляй
Падняты ён аж да ступеней трона.

АЛЬБАНІ

Мілэдзі, вы яму не жонка часам?

РЭГАНА

Сэр, жарт ваш можа спраўдзіцца.

ГАНЕРЫЛЬЯ

Ого!
Не выйдзе — вочы косыя.

РЭГАНА

Сястра,
Знайшлася б у мяне табе адповедзь,
Але я нездарова.— Генерал,
Бяры салдат маіх, палонных, скарбы,
Бяры усё. Валодай, я — твая.
Здаецца крэпасць. Прызнаю публічна
Цябе сваім гаспадаром і мужам.

ГАНЕРЫЛЬЯ

Мядку салодзенькага захацела?

АЛЬБАНІ

Дазволу у цябе пытаць не будуць.

ЭДМУНД

І ў вас таксама, сэр.

АЛЬБАНІ

Ілжэш, байструк!

РЭГАНА

(Эдмунду)

Бі ў барабан, апавясці свой тытул.

АЛЬБАНІ

Не выйдзе! Ты арыштаваны, Эдмунд.
Я заяўляю, ты — дзяржаўны здраднік.
(Паказваючы на Ганерылью.)
А гэтая бліскучая змяя —
Твая хаўрусніца. Арыштаваць!
(Рэгане.)
А вашыя прэтэнзіі, мілэдзі,

Я вымушаны адхіліць. Юнак
Упадабаўся вельмі нашай жонцы.
Спазніліся, вакансія занята.
А калі так не церпіцца вам замуж,
Я прапаную пакахаць мяне.
Чым я не кавалер?

ГАНЕРЫЛЬЯ

Камедыянт!

АЛЬБАНІ

Стой, Глостэр, зброя пры табе.— Трубіце! —
Калі ніхто не з'явіцца на покліч,
Каб даказаць пры ўсіх судом крыві
Тваё каварства, прагнасць, хітрасць, здраду,—
Вось мой заклад.
(Кідае на зямлю пальчатку.)
І не ўкусіўшы хлеба,
Я сам насмерць з табою буду біцца
І напішу мячом на чорным сэрцы,
Што ты — падлюга.

РЭГАНА

Млосна, млею, ох!

ГАНЕРЫЛЬЯ

(убок)
Ага, такі атрута разбірае.

ЭДМУНД

Прымаю выклік.
(Кідае на зямлю пальчатку.)
Хто б ні быў той злоснік.
Што смее ганьбіць гонар мой і вернасць,
Я рот заткну яму і заганю
Хлусню у печань.— Гэй, трубач, трубі! —
Выходзьце, хто жадае. Пагаворым
На паядынку моваю мяча:
З любым і кожным буду біцца так,
Што ад удараў неба задрыжыць.

АЛЬБАНІ

Герольд, сюды!

ЭДМУНД

Герольда! Гэй, герольда!

АЛЬБАНІ

Адзін ты, спадзявайся на сябе.
Народ змагаўся ад майго імя,
Пад мой штандар збіраліся брытанцы,

Я склікаў іх, і я іх распушчу.
Ты больш не генерал, а самазванец.

РЭГАНА

Ох, млосна мне! Нядобра мне! Ратуйце!

Уваходзіць г е р о л ь д.

АЛЬБАНІ

Адвесці хворую ў маю палатку.

Р э г а н у выводзяць.

Сюды, герольд! Трубі! Чытай уголас,
Каб кожны чуў.
(Дае герольду паперу.)

АФІЦЭР

Трубі!

Трубы.

ГЕРОЛЬД

(чытае)

«Калі хто з рыцараў альбо з дваран нашага войска пажадае даказаць Эдмунду Глостэру, які называе сябе графам, што ён найвялікшы здраднік, хай з'явіцца пасля трэцяй трубы. Праціўнік у баявой гатоўнасці».

ЭДМУНД

Трубі!

Першая труба.

ГЕРОЛЬД

Яшчэ раз.

Другая труба.

І яшчэ раз.

Трэцяя труба.

За сцяной адгукаецца труба.
Уваходзіць Э д г а р, узброены;
наперадзе ідзе т р у б а ч.

АЛЬБАНІ

Спытай, хто ён, хто гэты невядомы
Адважны рыцар?

ГЕРОЛЬД

Хто ты, смелы рыцар,
Як зваць цябе, чаму рашыўся выйсці
На трубны кліч?

ЭДГАР

Імя сваё я страціў,
Яго загрызла, праглынула здрада,

Але я роду знатнага, такога ж,
Як вораг мой і ваш.

ГЕРОЛЬД

Хто гэты вораг?

ЭДГАР

Граф Эдмунд Глостэр.

ЭДМУНД

Я — граф Эдмунд Глостэр.
Што маеш мне сказаць.

ЭДГАР

Вымай свой меч!
І калі я цябе зняважу словам,
Праверым нашы сілы на мячах.
Мой гонар, мой зарок, маё сумленне
Даюць мне права заявіць, што ты,
Нягледзячы на мужнасць маладую,
На тытул твой і першай славы бляск,
Агідная драпежная істота.
Наскрозь фальшывы, з галавы да ног,
Прадаў ты бацьку, брата і багоў,
І герцагу, прызнанаму народам,
Капаў ты яму. Ты па трупах лез
На свой прастол, хацеў арлом падняцца,
Але ўпадзеш, як жаба. Адшчапенец,
Ты не адмовіш страшнай горкай праўды
Таго, што я сказаў. Мая рука,
Мой добры меч, мой гнеў, мая нянавісць
Табе дакажуць гэта. Кроў за кроў!

ЭДМУНД

Хаця па праву рыцарства я мог бы
Ад бойкі з невядомым ухіліцца,
Але ты маеш гордасць дварaніна
І выгляд воіна. Хто ты — ўсё роўна.
Я слабасці не праяўляў ніколі
І асцярожным не жадаю быць.
Нахабнік, забірай назад, давіся
Тым, што ты выплюнуў. Твая хлусня
Не апаганіла мяне нікалькі.
З тваіх даспехаў я зраблю труну
І твой паклёп пякельны пахаваю
У нетрах сэрца дзёрзкага.— Трубіце.

Трубы. Бойка. Эдмунд падае.

АЛЬБАНІ

Не дабівай!

ГАНЕРЫЛЬЯ

Падстроілі! Падман!
Ах, Глостэр, і навошта ты згадзіўся
На гэты паядынак? Ён — чужынец.
Хто гэта б'ецца з невядомым? Гвалт!
Не па закону! Гвалт.

АЛЬБАНІ

Маўчы, змяя!
Заткні свой рот паперай гэтай.
(Эдгару.)
Стойце!
(Эдмунду.)
Чытай любоўны ліст! Чытай, зладзюга!
(Ганерылі.)
Не рваць! Што, пазнаеш? Тваё пісанне?
(Аддае пісьмо Эдмунду.)

ГАНЕРЫЛЬЯ

А хоць бы й так. Каму мяне судзіць?
Я уладарка, я, не ты.— Пусціце!

АЛЬБАНІ

Пазнала сваю подласць, людаедка?

ГАНЕРЫЛЬЯ

Прэч ад мяне! Нічога я не знаю.
(Выходзіць.)

АЛЬБАНІ

(афіцэру)
Пры ёй пабудзь. Яна сябе не помніць
Ад роспачы і злосці.
Афіцэр выходзіць.

ЭДМУНД

Вялікая мая віна, і многіх
Пакрыўдзіў я. Ўсё высветліцца з часам.
Ты перамог, і мая песня спета.
Скажы ж мне, хто ты, о шчаслівы рыцар,
Каб мне было лягчэй? Калі мне роўны,
Давай памірымся.

ЭДГАР

За ласку ласка.
Я роду гэтакага ж, як і ты,
А калі вышай, тым цяжэй твой грэх.
Я — Эдгар, брат твой. Богі справядлівы:
Распушчанасць сама знаходзіць кару.
Вачамі расплаціўся бацька твой,
Жыццё ліхому сыну даўшы.

ЭДМУНД

Праўда.
Мой круг закончыўся: я на зямлі.

АЛЬБАНІ

О, я пазнаў цябе. Я прадчуваў.
Героя выдае яго фігура.
Дазволь абняць цябе. Павер, ніколі
Не быў табе я ворагам, і сэрца
Маё з табою.

ЭДГАР

Дарагі мой герцаг!

АЛЬБАНІ

То дзе ж ты прападаў? Як ты дазнаўся
Пра бацькаву бяду?

ЭДГАР

Ён быў пры мне.
Я раскажу вам коратка. Даруйце,
Не вытрываць, сціскае грудзі боль.
Дачуўшыся, што мне рыхтуюць гібель,
Каб уцалець — о слодыч існавання! —
Мы паміраем кожны дзень і час,
Але аддаць сваё жыццё баімся.
Я лахманы вар'ята начапіў
І ў дзікіх пустках стаў блукаць, як прывід.
Сабакі уцякалі ад мяне,
Шарахаліся ўбок, не то што людзі.
І вось аднойчы я убачыў бацьку.
Яго вачэй крывавыя пярсцёнкі
Былі без дыяментаў. Я зрабіўся
Яго павадыром, выпрошваў хлеба,
Карміў яго, абараняў ад ліха,
Але, на жаль, не смеў яму адкрыцца.
І толькі сёння перад паядынкам,
Не ўпэўнены, што буду мець удачу,
Я папрасіў яго благаслаўлення
І расказаў пра ўсё. Удар быў моцны.
Не вынесла узрушанае сэрца
Змагання паміж радасцю і горам,
І ён, прыпаўшы да майго пляча,
Памёр з усмешкай.

ЭДМУНД

Ты мяне расчуліў.
Магчыма, і к дабру. Кажы далей.
Відаць, не ўсё ты выказаў.

АЛЬБАНІ

Не трэба.
Даволі смутку! Плавіцца мой дух,
Як мяккі воск.

ЭДГАР

І гэтага замнога
Для тых, хто гора бачыць не прывык.
Але канец аповесці маёй
Яшчэ больш жаласны. Калі рыдаў я
Над целам бацькі, выйшаў чалавек.
Ён знаў мяне раней, як жабрака,
І мною грэбаваў, але цяпер,
Даведаўшыся, хто я, абшчапіў
Мяне за шыю дужымі рукамі,
І, страшным крыкам скалануўшы неба,
Ў слязах упаў на труп, і расказаў мне
Такое, чаго свет не чуў, пра Ліра
І пра свае нягоды. З кожным словам
Яго туга расла, і струны сэрца
Ў ім абрываліся. У гэты час
Зайгралі трубы. Я яго пакінуў
У непрытомнасці.

АЛЬБАНІ

Хто гэта быў?

ЭДГАР

Кент, сэр, выгнаннік Кент. Змяніўшы выгляд,
Служыў ён Ліру, ворагу свайму;
Як верны раб, з ім падзяляў няшчасце —
Каго любіў, таму аддаў сябе.

Убягае дваранін
з акрываўленым нажом у руках.

ДВАРАНІН

Ратуйце! Памажыце!

ЭДГАР

Што такое?

АЛЬБАНІ

Дзе ўзяў ты нож?

ЭДГАР

Кроў капае з нажа.

ДВАРАНІН

Ён цёплы, з сэрца вырваны. Ратуйце!
О жах! Яна памерла.

АЛЬБАНІ

Хто памёр?

ДВАРАНІН

Сэр, жонка ваша, жонка. Атруціла
Сястру спачатку і, калі канала,
Прызналася ва ўсім.

ЭДМУНД

Прасватаны абедзвюм я, і смерць
Вянчае нас траіх.

ЭДГАР

Граф Кент з'явіўся.

АЛЬБАНІ

Нясіце іх сюды, жывых і мёртвых.
Вяршыцца суд нябесны. Страшна, страшна!
Але ў нас літасці няма.

Дваранін выходзіць.
Уваходзіць Кент.

Граф Кент,
Імпэт падзей не дазваляе нам
Вітаць вас як належыць.

КЕНТ

Прыйшоў я пажадаць уладару
І каралю майму спакойнай ночы.—
Ён тут, у вас?

АЛЬБАНІ

Важнейшае забылі:
Кардэлію і Ліра.— Дзе яны?
Адказвай, Эдмунд.

Прыносяць трупы Ганерылы і Рэганы.

Кент, ты гэта бачыш?

КЕНТ

Што робіцца?

ЭДМУНД

Яны мяне кахалі.
Меў сілу Эдмунд, мог прычараваць.
Сястра сястру згубіла праз мяне,
Пасля сама сябе нажом.

АЛЬБАНІ

Жахліва! —
Накрыйце іх.

ЭДМУНД

Мне болей не падняцца.
Хоць гэта і не ў звычаі маім,

Але зраблю дабро.— Бяжыце ў крэпасць! —
Я загадаў Кардэлію і Ліра
Забіць.— Спяшайцеся, ратуйце іх.
Хутчэй, бо будзе позна!

АЛЬБАНІ

Што я чую? —
Хутчэй у крэпасць.

ЭДГАР

Да каго ж мне бегчы?
(Эдмунду.)
Каму ты загадаў? Дай знак адмены.

ЭДМУНД

Вазьмі мой меч, пакажаш капітану.

АЛЬБАНІ

Хутчэй! Хутчэй!

Эдгар выходзіць.

ЭДМУНД

Яму я даручыў,
Па просьбе жонкі вашае, павесіць
Кардэлію ў турме, зрабіўшы так,
Каб гэта выглядала самагубствам.

АЛЬБАНІ

О неба, падымі над ёю шчыт! —
Забраць яго!

Эдмунда выносяць.
Уваходзіць Лір з мёртвай Кардэліяй
на руках; за ім Эдгар, афіцэры,
салдаты і народ.

ЛІР

Рыдайце, галасіце! — Вы не людзі,
Вы — камень. Каб я столькі меў вачэй
І столькі языкоў, ад слёз і енку
Абрушылася б неба! — Нежывое...
Дзіцятачка! — О, я магу адрозніць
Жыццё ад смерці! — Як зямля.— Прашу вас
Прынесці мне люстэрка. Я праверу.
Калі на шкло туман дыхання ляжа,
Тады надзея ёсць.

АЛЬБАНІ

Ці не збылося
Напісанае ў кнігах?

ЭДГАР

Напамінак!

АЛЬБАНІ

О жах! О жах! Знішчэнне. Змрок. Канец.

ЛІР

Пяро заварушылася.— Жывая! —
О, калі так, то ўсе мае пакуты
Акупяцца хвілінай шчасця...

КЕНТ

Мой любы! Уладар мой!
(Падае на калені.)

ЛІР

Адыдзі!

ЭДГАР

Ды гэта ж Кент, ваш верны друг.

ЛІР

Злачынцы!
Забойцы! Здраднікі! Чума на вас!
Я ж мог не дапусціць. Вам нельга верыць!
Яе няма: сышла ад нас праклятых.—
Кардэлія, Кардэлія, дзіцятка,
Пабудзь са мною, пашкадуй мяне! —
Што ты сказала? — А? — Ў яе быў голас,
Як музыка: пяшчотны, мілагучны,—
Акраса надзвычайная ў жанчыне.—
Таго раба, які цябе павесіў,
Забіў я.

АФІЦЭР

Так, забіў сваёй рукой.

ЛІР

Што, мо няпраўда? — Ох бы паскакалі
Яны ў мяне! Быў час, мячом булатным
Крышыў я злыдняў здорава. Цяпер
Стары я стаў, скрозь высмактаны горам
І, шчыра вам кажу, слабы на вочы.—
Хто тут? — Я недабачваю.— Ты мне
Кагось нагадваеш.

КЕНТ

Было нас двое
Абраннікаў і мучанікаў лёсу.

ЛІР

Тут вельмі цёмна.— Ты, па-мойму, Кент.

КЕНТ

Я — Кент. А помніце, такі быў Кай
На службе ў вас. Дзе ён?

ЛІР

Памёр і згніў.
Яго я помню, слаўны быў хлапчына,—
Умеў даць здачы гадам.

КЕНТ

Гэта ж я!

ЛІР

Наўрад ці ты. Падумаю.

КЕНТ

За вамі
Ішоў я ўслед цярністым вашым шляхам.

ЛІР.

Прыемна пазнаёміцца.

КЕНТ

Нікога,
Апроч мяне, у вас няма — адны мы.
Навокал смутак, смерць,— пустыня душ.
Старэйшых вашых дзве дачкі з адчаю
Пакончылі з сабою.

ЛІР

Мабыць, так.

АЛЬБАНІ

Не ведае, што кажа, і не варта
Яму пра ўсё нагадваць.

ЭДГАР

Марны клопат.

Уваходзіць афіцэр.

АФІЦЭР

Сканаў граф Эдмунд.

АЛЬБАНІ

Нам не да яго.—
Увага! Лорды, джэнтльмены, людства!
Жадаем мы апавясціць намер наш.
Усё, што ў нашых сілах, мы учынім,
Каб аблягчыць малую рэшту дзён
Вялікага пакутніка. Мы згодны
Наш трон і абсалютную уладу
Яму здаць пажыццёва.
(Кенту і Эдгару.)
Вам вяртаем
Усё, што вамі страчана дагэтуль,
І больш яшчэ узвысім вас за вашы
Заслугі неацэнныя. Хто друг нам,

Хай спажывае ад пладоў сваіх,
А ліха — нашым ворагам.— Што бачым?

ЛІР

Павесілі цябе, маё дзіцятка!
За што жыццё забралі? Як жа так?
Чаму жывуць сабакі, коні, мышы,
А ты мяне пакінула навек?
Навек, навек, навек, навек, навек! —
Прашу вас, калі ласка, адшпіліце
Мне гузікі,— мне душна.— Дзякуй, сэр.—
Глядзіце... бачыце... глядзіце... вусны! —
Мая ты родненькая!..
(Памірае.)

ЭДГАР

Абамлеў.—
Кароль мой! Уладар мой!

КЕНТ

Рвіся, сэрца!

ЭДГАР

Кароль мой, падыміце галаву!

КЕНТ

Пакінь! Не муч яго! Хай спачывае!
Бо толькі кату радасна глядзець
На чалавечыя пакуты.

ЭДГАР

Мёртвы.
Не дыхае.

КЕНТ

З вышынь на дол звалiўся,
Зламаны бураю, магутны дуб.

АЛЬБАНІ

Нясіце іх адгэтуль.— Абвяшчаем
Жалобу ўсенародную на тыдзень.
(Кенту і Эдгару.)
Сябры душы маёй, вы — мне апора.
Няхай цвіце наш край! Даволі гора!

КЕНТ

Прабачце, герцаг. Ныюць мае косці:
Пара і мне да караля у госці.

ЭДГАР

Сваіх пачуццяў стрымліваць не будзем.
Стары ўсё выцерпеў. Нам, новым людзям,
Наўрад ці давядзецца столькі жыць,
І гэтак мучыцца, і так тужыць.

Выходзяць пад гукі жалобнага маршу.

КАМЕНТАРЫІ

САНЕТЫ

Санеты Шэкспіра напісаны ў 1592—1598 гг. У 1609 г. выдавец Т. Торп апублікаваў 154 санеты Шэкспіра асобнай кнігай, да якой дадаў прысвячэнне: «Таму адзінаму, каму абавязаныя сваім з'яўленнем наступныя санеты, містэру W. H. усякага шчасця і вечнага жыцця, якіх зычыў яму наш бессмяротны паэт, жадае зычлівец, які меў рызыку выдаць іх». Перад даследчыкамі санеты Шэкспіра паставілі шэраг пытанняў, адказаў на якія не знойдзена: каму прысвечаны санеты; хто той сябар, якога апявае ў іх Шэкспір; хто такая «Смуглая лэдзі санетаў» — каханая паэта і г. д.

Тэкст друкуецца па выданні: Шэкспір Вільям. Санеты. Пераклаў з англійскай мовы Уладзімір Дубоўка, Мінск, выдавецтва «Беларусь», 1964. Ва ўступным артыкуле Пятрусь Броўка зазначыў: «Чытач, уважліва прачытаўшы санеты Шэкспіра і, трэба сказаць, у выдатным перакладзе Уладзіміра Дубоўкі, адчуе ў іх усю веліч змагання вялікага генія за маральнае ачышчэнне і ўдасканаленне ўсяго чалавецтва». Паасобныя санеты Шэкспіра таксама перакладалі на беларускую мову Юрка Гаўрук, Язэп Семяжон і Рыгор Барадулін.

Стар. 26. *Санет 19.* Фенікс — у старажытнагрэчаскай міфалогіі птушка, якая згарала ў полымі, а потым зноў адраджалася.

Стар. 39. *Санеты 44 і 45.* У іх Шэкспір выкарыстоўвае старажытнае павер'е, нібыта чалавек складаецца з чатырох стыхій ці элементаў: агню, паветра, зямлі і вады. Вышэйшыя — агонь і паветра — вызначаюць духоўнае жыццё чалавека, а ніжэйшыя — зямля і вада — утвараюць яго цела.

Стар. 43. *Санет 53.* Адоніс — у старажытнагрэчаскай міфалогіі сын цара Кіпра, у якога безнадзейна закахалася багіня прыгажосці Афрадыта; узор мужчынскай прыгажосці.

Гелена — у старажытнагрэчаскай міфалогіі дачка смяротнай Леды і вярхоўнага бога Зеўса, жонка спартанскага цара Менелая, за якую пачалася Траянская вайна; узор жаночай прыгажосці.

Стар. 51. *Санет 68.* У часы Шэкспіра была распаўсюджана мода на валасы залацістага, бялявага колеру. З гэтае прычыны абстрыгалі валасы ў нябожчыкаў і рабілі з іх парыкі тагачасным модніцам.

Стар. 57. *Санет 80.* Шэкспір нагадвае паэта-саперніка, які таксама прысвячаў вершы «Смуглай лэдзі санетаў». Мяркуюць, што ім быў паэт Джордж Чапмэн (1559—1634). Гл. таксама санеты 82—86.

Стар. 68. *Санет 102.* Філамель — салавей. У старажытнагрэчаскай міфалогіі Філамель — дачка афінскага цара Пандзіёна, якую аганьбаваў яе зяць Тэрэй і зрабіў яе нямой, каб яна не змагла расказаць пра яго злачынства. Уцякаючы ад Тэрэя, яна ператварылася ў салаўя.

Стар. 70. *Санет 107* Аўгур — у старажытнарымскай міфалогіі жрэц, які валодаў дарам прарока і прадказваў людзям іх лёс па палёце птушак.

Стар. 83. *Санет 132.* Мілавіца — беларуская народная назва зоркі Венеры.

Стар. 84. *Санеты 135 і 136.* У іх Шэкспір выкарыстоўвае гульню слоў, пабудаваную на тым, што яго памяншальная імя «Will» — амонім (пішацца і гучыць аднолькава) слова «will», якое азначае «жаданне» і «воля».

Стар. 89. *Санет 145* напісаны чатырохстопным ямбам, паменшаны на адну стапу ў адрозненне ад астатніх санетаў. Даследчыкі лічаць, што ён належыць да юнацкай лірыкі Шэкспіра і прысвечаны яго жонцы Эн Хэтэўэй: у заключным двухрадкоўі змешчаны празрысты каламбур — словаспалучэнне «hate away», сугучнае дзявочаму прозвішчу яго жонкі «Hathaway».

РАМЭО І ДЖУЛЬЕТА

Трагедыя «Рамэо і Джульета» напісана ў 1594—1595 гг., упершыню надрукавана ў 1597 г. Сюжэт узяты з апублікаванай у 1562 г. аднайменнай паэмы Артура Брука, крыніца якой — навела італьянскага пісьменніка Матэо Бандэла (1485—1561). Гэты самы сюжэт вядомы і па навеле італьянскага пісьменніка Луіджы Да Порта (1485—1529) «Гісторыя двух высакародных каханкаў» (1524).

Тэкст трагедыі «Рамэо і Джульета» ў перакладзе Кандрата Крапівы друкуецца па выданні: Шэкспір Вільям. Трагедыі, Мінск, Дзяржвыд БССР, 1954.

Значнай падзеяй у тэатральным жыцці Беларусі была пастаноўка трагедыі «Рамэо і Джульета» ў 1946 г. Беларускім тэатрам імя Я. Купалы — рэжысёр Л. Літвінаў, мастак У. Дзмітрыеў, у галоўных ролях Б. Платонаў і І. Ждановіч, іншыя ролі выконвалі П. Пекур (Меркуцыо), В. Пола (Кармеліца), С. Бірыла (брат Ларэнца). У рабоце над спектаклем непасрэдны ўдзел браў вядомы савецкі шэкспіразнавец М. Марозаў. «Рамэо і Джульета» таксама ставілася ў Гомельскім абласным драмтэатры (1962, рэжысёр Л. Эльстан), Магілёўскім абласным драмтэатры (1972, рэжысёр У. Караткевіч), Беларускім тэатры імя Я. Коласа (1986, рэжысёр В. Мазынскі).

Стар. 98. Эскал — імя персанажа паходзіць ад прозвішча Барталамео дэла Скала, які ўладарыў у Вероне на пачатку XIV ст., калі, паводле легенды, адбываліся падзеі, апісаныя ў трагедыі.

Стар. 99. *Пралог.*— Уступную прамову, напісаную ў форме санета, выконваў акцёр, названы Хорам паводле традыцыі антычнага тэатра, у якім Хор меў аналагічную функцыю — каменціраваў падзеі, што адбываюцца ў п'есе. Гл. таксама Пралог да другога акта.

Стар. 103. *Падаць мой доўгі меч.*— Намёк на стары ўзрост Капулеці, які карыстаецца баявым доўгім мячом — сярэдневяковай зброяй, што выйшла з ужытку ў часы Шэкспіра.

Стар. 104. Вілафранка — невялікі гарадок каля Вероны.

Стар. 105. *Аўрорынай пасцелі змрочны полаг...*— Аўрора — у старажытнарымскай міфалогіі багіня світання.

Стар. 109. *Ёй чатырнаццаць год яшчэ няма.*— У тыя часы дзяўчынкі такога ўзросту ўжо лічыліся нявестамі.

Стар. 117. *На пацяруху труць чарот нагамі.*— Падлогі ў дамах знатных асоб засцілалі звычайна цыноўкамі з чароту.

Ах, светач...— Меркуцыо называе Рамэо «светачам», гэта значыць «факельшчыкам»: баль адбываўся вечарам, і наперадзе кожнай групы гасцей ішоў факельшчык.

Стар. 118. М а б — паводле старажытных кельцкіх павер'яў, імя феі, якая была здатная на розныя махлярствы і хітрыкі, спрыяла нараджэнню сноў, падменьвала дзяцей, якія толькі што нарадзіліся, пярэваратнямі.

О л д э р м э н — член гарадскога савета.

...чарвяка, што ў дзеўкі-гультая суставы точыць.— Паводле тагачасных забабонаў, у лянівых дзяўчат у суставах пальцаў заводзіліся чэрві.

І людзям каўтуны яна камячыць...— Паходжанне каўтуноў у народзе тлумачылі чарамі царыцы Маб, таму расчэсваць каўтуны лічылася справай небяспечнай.

Стар. 119. М а к а ц ё р.— Камічныя персанажы, блазны, слугі ў Шэкспіра маюць англійскія імёны і мянушкі нават тады, калі дзеянне п'есы адбываецца ў іншай краіне. Далей сустракаецца імя Потпэн, якое складаецца з двух англійскіх слоў «гаршок» і «патэльня», ці прозвішча Грайндстан, якое перакладаецца як «жарон» і г. д.

Стар. 137. *...кашэчы цар Тыберт* — персанаж англійскага варыянта сярэдневяковага жывёльнага камічнага эпасу «Рэйнеке Ліс». Жарт пабудаваны на гульні імёнаў «Тыбальт» і «Тыберт».

Стар. 138. *...згубіцель гузікаў, што на канцы рапір.*—Каб засцерагчы ад небяспекі ўколу рапіры ў фехтавальных паядынках, на вострыя канцы рапір прымацоўвалі абшытыя шаўковым матэрыялам гузікі.

...такія сквапныя да новых убораў, што ім на старых лаўках і сядзець у іх нязручна.— У часы Шэкспіра сярод знатнай моладзі пашырылася мода на французскія штаны — кароткія і падобныя на два надзьмутыя балоны. Аднойчы здарылася так, што члены палаты лордаў, сярод якіх былі маладыя франты ў французскіх штанах, не змясціліся на сваіх традыцыйных старадаўніх лаўках.

П е т р а р к а Франчэска — італьянскі паэт-гуманіст (1304—1374), які ў вершах услаўляў сваю каханую Лауру.

Д ы я н а — у старажытнарымскай міфалогіі багіня месяца, палявання і дзявочай чысціні.

К л е а п а т р а — егіпецкая царыца (69—30 да н. э.), славутая сваёй прыгажосцю; гераіня трагедыі Шэкспіра «Антоній і Клеапатра».

Г е р а — у старажытнагрэчаскай міфалогіі сястра і жонка вярхоўнага бога Зеўса, царыца багоў.

Стар. 144. Р а з м а р ы н — азначаў вернасць у каханні, згодна агульнапрынятай у той час сімволіцы кветак.

Стар. 151. *...я хачу толькі ўзяць адно жыццё з тваіх дзевяці жыццяў.* Працягваючы жарт, заснаваны на гульні імёнаў «Тыбальт» і «Тыберт» (прозвішча ката), Меркуцыо карыстаецца англійскай прыказкай: «У ката дзевяць жыццяў».

Стар. 155. Ф а э т о н — у старажытнарымскай міфалогіі сын бога сонца Феба. Аднойчы бацька дазволіў яму кіраваць сонечнай каляскіцай, але Фаэтон разагнаў яе так хутка, што не здолеў стрымаць коней, каляскіца перакулілася, і сонца ледзь не спаліла зямлю, ператварыўшы частку Афрыкі ў пустыню. Джульета хоча, каб хутчэй настала ноч, калі на спатканне з ёй прыйдзе Рамэо.

Стар. 157. **Васіліск** — казачны звер, які быццам быў здольны забіваць адным сваім позіркам.

Стар. 158. *Гарэлкі мне хутчэй!* — Гарэлка ў тыя часы лічылася лякарствам і прадавалася ў аптэках.

Стар. 168. *Вачамі з жабай памяняўся ён...* — Па народным павер'і, вялікія і прыгожыя вочы жабы ўзяты ёю ў жаваранка. Калі б яны памяняліся яшчэ і галасамі, як жадае Джульета, то ў той час гучаў бы голас жабы, а не спеў жаваранка, і быў бы вечар, а не світанне, і ёй не трэба было б расставацца з каханым Рамэо.

Стар. 175. *Так хоча Капулеці — бацька мой.*— Парыс называе бацькам свайго будучага цесця. Па-англійску «цесць» — «father-in-low», што літаральна азначае «бацька па законе».

Стар. 183. *...як стогны мандрагоры.*— Корань мандрагоры вельмі нагадвае з выгляду чалавечую фігуру. На гэтым падабенстве заснавана народнае павер'е: быццам корань мандрагоры здольны стагнаць, калі яго вырываюць з глебы.

Стар. 189. *«Калі душу гнятуць цяжкія мукі...»* — цытата з англійскай «Цудоўнай новай балады пра двух закаханых».

«Дык музыкі сярэбраныя гукі...» — Радкі верша Рычарда Эдвардса — паэта-сучасніка Шэкспіра.

Стар. 191. *У крамцы ж чарапаха, бачыў я, вісела і напханы алігатар...* — У тыя часы ў вокнах аптэкарскіх крам для прывабліванне пакупнікоў выстаўлялі чучалы чарапах, кракадзілаў і іншых дзівосных жывёл.

ГАМЛЕТ, ПРЫНЦ ДАЦКІ

Трагедыя «Гамлет, прынц Дацкі» напісана і пастаўлена ў 1600—1601 гг. Упершыню надрукавана ў 1603 г. Прататып Гамлета — напаўлегендарны прынц Амлет сустракаецца яшчэ ў ісландскіх сагах Сноры Стурласана. У кнізе «Гісторыя датчан», напісанай каля 1200 г. на лацінскай мове, сярэдневяковы дацкі пісьменнік Саксон Граматык (1150—1220) адносіць гісторыю прынца Амлета да паганскіх часоў, да ўвядзення хрысціянства ў 827 г. Мяркуюць, непасрэднай крыніцай шэкспіраўскай трагедыі была аднайменная п'еса яго папярэдніка Томаса Кіда (1557—1594), але Шэкспір творча перапрацаваў тыповую для Кіда «трагедыю помсты», напоўніўшы яе глыбокім філасофскім зместам, даўшы высокамастацкую распрацоўку характараў.

Тэкст друкуецца па выданні: Шэкспір Вільям. Гамлет, прынц Дацкі. Пераклад з англійскай мовы Юркі Гаўрука, Мінск, выдавецтва «Беларусь», 1964. Першы варыянт перакладу гэтай трагедыі, зроблены Ю. Гаўруком, быў надрукаваны без прозвішча перакладчыка: Шэкспір Вільям. Трагічная гісторыя пра Гамлета, прынца Дацкага, Мінск, 1935. Ёсць яшчэ адзін пераклад трагедыі «Гамлет» на беларускую мову Віталя і Артура Вольскіх, які змешчаны ў кнізе: Шэкспір Вільям. Трагедыі, Мінск, Дзяржвыд БССР, 1954.

Значная падзея ў тэатральным жыцці нашай рэспублікі — пастаноўка «Гамлета» ў перакладзе Ю. Гаўрука ў Беларускім тэатры імя Я. Коласа рэжысёрам В. Бебутавым з П. Малчанавым у галоўнай ролі (1946), іншыя ролі выконвалі М. Звездачотаў (Клаўдзій), А. Радзялоўская (Гертруда), А. Ільінскі (Палоній), М. Бялінская (Афелія), А. Шэлег (Лаэрт), Ф. Шмакаў (Гарацыо). У 1984 г. «Гамлет» пастаўлены ў Рускім тэатры БССР імя М. Горкага — рэжысёр В. Маслюк, мастак Ю. Тур, у ролі Гамлета А. Франскевіч, сярод іншых выканаўцаў — Э. Гарачы

(Гарацыо), А. Кармунін (Лаэрт), У. Шэлестаў (Озрык), Ю. Сідараў (Палоній), А. Клімава (Гертруда) і В. Бандарэнка (Клаўдзій).

Стар. 206. Эльсінор, дакладней, Хельсінгёр — горад у Даніі на востраве Зеландыя за 38 км на поўнач ад Капенгагена на беразе праліва, які аддзяляе Данію ад Скандынавіі. У 1573—1584 гг. у Эльсіноры на марскім узбярэжжы пабудаваны замак Кронберг, дзе адбываюцца падзеі трагедыі. У 1585 і 1586 гг. у Эльсіноры гастралявала трупа англійскіх акцёраў, некаторыя з іх потым працавалі разам з Шэкспірам.

Стар. 210. Нарвежац — нарвежскі кароль.

Паляк — польскі кароль.

Стар. 211. Юлій Цэзар — дзяржаўны дзеяч, палкаводзец і пісьменнік старажытнага Рыма (12.7.100—15.3.44 да н. э.). Забіты ў Капіторыі змоўшчыкамі на чале з Брутам і Касіем. Герой аднайменнай трагедыі Шэкспіра.

Нептун — у старажытнарымскай міфалогіі бог мора. Месяц названы «Нептунавай дзяржавы ўладаром», бо, як вядома, ён уплывае на прылівы і адлівы мора.

Стар. 212. Алебарда — кап'ё з шырокім лязом у выглядзе сякеры.

Стар. 216. Вітэнберг — нямецкі горад, дзе ў 1502 г. быў заснаваны славуты Вітэнбергскі універсітэт. Месца вучобы Гамлета і Гарацыо выбраны Шэкспірам нездарма, бо менавіта гэты універсітэт быў адным з еўрапейскіх цэнтраў навукі эпохі Адраджэння.

Стар. 217. Гіперыон — у старажытнагрэчаскай міфалогіі адзін з тытулаў бога сонца Феба, перакладаецца як «найвышэйшы».

Сатыр — у старажытнагрэчаскай міфалогіі спадарожнік бога расліннасці, вінаградарства і вінаробства Дыянісія — хвастатая істота з чалавечай галавой і з казлінымі нагамі.

Ніабея, Ніоба — у старажытнагрэчаскай міфалогіі фіванская царыца, якую пакаралі за непаслушэнства і непакорнасць багі Апалон і Артэміда, забіўшы яе мужа, сямёра дочак і сямёра сыноў. З гора Ніабея ператварылася ў скалу, якая вечна лье слёзы. Вобраз Ніабеі — увасабленне тугі маці і жонкі.

Стар. 228. Датчанін — кароль Данії.

Стар. 231. Лета — у старажытнагрэчаскай міфалогіі рака ў падземным царстве. Той, хто акунуўся ў яе, забывае сваё мінулае.

Стар. 233. Таблічкі — У часы Шэкспіра запісы для памяці рабіліся на васковых ці касцяных таблічках.

Хіло, хо-хо! — кліч сакольнікаў.

Стар. 249. Фартуна — у старажытнарымскай міфалогіі багіня лёсу, якую ўяўлялі ў вобразе жанчыны з павязкай на вачах.

Стар. 250. *Бо што такое субстанцыя амбіцыі...* — Гамлет іранізуе з сярэдневяковай схаластычнай філасофіі.

Стар. 252. *Але, на бяду, завялася там чарада дзяцей...* — У канцы XVI ст. у Англіі ўзнікла тэатральная трупа хлопчыкаў-акцёраў, якая карысталася поспехам у публікі і канкурыравала з прафесійнымі тэатрамі. Гэтая праблема хвалявала і Шэкспіра, як драматурга і акцёра тэатра «Глобус», на будынку якога стаяла скульптурная фігура Геркулеса з зямным шарам на спіне. Ніжэй Шэкспір вуснамі Разенкранца скардзіцца на дзяцей-акцёраў: «Захапілі Геркулеса разам з глобусам».

Стар. 253. *Маё абыходжанне з камедыянтамі...* — Пад «камедыянтамі» Гамлет разумее прыдворныя колы на чале з Клаўдзіем.

Стар. 254. Росцый (каля 130 — каля 62 да н. э.) — славуты акцёр-комік у Старажытным Рыме.

...сцэн падзельных і сцэн непадзельных.— Пад «сцэнамі падзельнымі» Гамлет разумее п'есы, у якіх захоўваюцца тры адзінствы (часу, месца і дзеяння), а пад «сцэнамі непадзельнымі» — тыя п'есы, дзе гэтага адзінства няма.

Сенека (каля 4 да н. э.— 65 н. э.) — старажытнарымскі драматург, аўтар трагедый.

Плаўт (250—184 да н. э.) — старажытнарымскі камедыёграф.

Іефай — паводле біблейскай легенды, правадыр і вярхоўны суддзя ізраільцян. Перад паходам на аманіцян Іефай даў абяцанне богу Ягову, што калі той даруе яму перамогу над ворагам, то першы, хто яго сустрэне пасля перамогі, будзе прынесены ў ахвяру. Першая сустрэла пераможцаў дачка Іефая, і ён мусіў выканаць абяцанне і прынесці яе ў ахвяру Ягове. Гамлет цытуе старажытную англійскую баладу пра Іефая.

Стар. 255. *Мая панначка, мая паненачка!* — Так Гамлет звяртаецца да акцёра, які выконваў жаночыя ролі. У часы Шэкспіра мужчыны ігралі ролі жанчын.

Энеева апавяданне Дыдоне.— П'еса, пра якую ідзе гаворка, не знойдзена. Герой Траянскай вайны Эней расказвае карфагенскай царыцы Дыдоне пра падзенне Троі (гэты эпізод узяты з паэмы Вергілія «Энеіда», з песні 11-й).

Прыям — цар Троі, бацька Гектара, муж Гекубы.

Пір — сын Ахіла, які забіў Гектара на полі бою, забівае бацьку Гектара Прыяма.

Стар. 256. Гірканскі звер — тыгр (Гірканія — вобласць у Персіі на паўднёвым усходзе ад Гірканскага мора, як у тыя часы называлася Каспійскае мора).

Ілiён — другая назва Троі.

Цыклопы — у старажытнагрэчаскай міфалогіі аднавокія волаты.

Стар. 257. Марс — у старажытнагрэчаскай міфалогіі бог вайны.

Стар. 262. *...глядзі ў кнігу...*— Афелія трымае ў руках малітоўнік.

Стар. 263. *...мілае суквецце слоў...*— вершы на памяць.

Стар. 264. *Ідзі ў манастыр.*— У часы Шэкспіра «жаночы манастыр» быў сінонімам публічнага дома.

Стар. 266. Партэр.— У тагачасных тэатрах у партэры былі самыя танныя стаячыя месцы.

Стар. 267. Тэрмагант — лютае магаметанскае божышча, якое фігуравала ў сярэдневяковых сарацынскіх п'есах і песнях пра барацьбу з «няверными».

Ірад — біблейскі персанаж, цар Іудзеі, тыран і злачынец, які забіў свайго дзеда, бацьку, брата; герой сярэдневяковага народнага тэатра.

Стар. 269. *Харчуюся, як хамелеон. Ем паветра...*— Па народным павер'і лічылася, што хамелеон харчуецца паветрам.

Вы калісьці ігралі ва універсітэце.— У часы Шэкспіра студэнты англійскіх універсітэтаў Оксфарда і Кембрыджа ставілі п'есы пераважна на лацінскай мове.

Стар. 271. Калядны конь — лялька каня, якую чапляў на сябе акцёр,— адна з фігур народнага тэатра, які праследаваўся пурытанамі, як паганскі звычай.

Стар. 272. *Надпіс на пярсцёнку.*— У тыя часы на пярсцёнках выразалі кароткія выслоўі ў вершаванай форме.

Стар. 274. *Вы добра замяняеце хор, мой прынц.*— Афелія мае на ўвазе тое, што Гамлет добра каменціруе п'есу, якую разыгрываюць перад імі акцёры.

Стар. 275. Г е к а т а — у старажытнагрэчаскай міфалогіі багіня ночы і месяца, апякунка ведзьмаў і нячыстай сілы.

Змрок душ, спрыт рук, і шклянка...— Менавіта гэты маналог Луцыяна, які супадае з расказам Здані пра зладзейскае забойства бацькі, Гамлет дапісаў ва ўстаўную п'есу.

Ёсць такая навела...— Італьянская навела, на аснове якой напісана ўстаўная п'еса,— невядома.

Стар. 276. *...куст пер'я на галаву...*— звычайны ў тагачасным тэатры капялюш з пер'ем у акцёра-трагіка.

...дзве праванскія ружы на разразныя чаравікі...— спражкі ў выглядзе чырвоных руж на чаравіках.

О мой Дамон...— Вобразы Дамона і Фіцыя ў антычнай літаратуры — увасабленне вернасці ў дружбе.

Рыфма к слову «ўсё» будзе «асёл» (Заўвага перакладчыка Юркі Гаўрука).

Стар. 278. *...гэтай парай хапуг і драпежнікаў.*— Гамлет мае на ўвазе свае рукі.

Стар. 280. Н е р о н — рымскі імператар (15.12.37—9.6.68), які праславіўся сваёй лютасцю. Яго ахвярамі былі маці, брат, жонка.

Стар. 281. *На мне ляжыць старэйшае праклянне...*— Клаўдзій мае на ўвазе забойства брата. Паводле біблейскай легенды, першым забойцам на зямлі быў Каін, які забіў свайго брата Авеля.

Стар. 293. *Гоп, гоп, ліска! — Гайня блізка.*— Словы з дзіцячай гульні, распаўсюджанай у тагачаснай Англіі.

Стар. 301. *Валянцінаў дзень* —14 лютага. Згодна з народнымі павер'ямі, першы, каго сустрэне дзяўчына ў гэты дзень, стане яе абраннікам на ўсё жыццё, яе Валянцінам.

Стар. 304. *Чаго ты ўзбунтаваўся, як гігант?* — Маюцца на ўвазе гіганты, якія, згодна з старажытнагрэчаскім міфам, паўсталі супраць багоў Алімпа.

Стар. 305. *Як самаахвярны пелікан, аддам ім кроў сваю.*— Паводле народнага павер'я, пеліканы нібыта кармілі сваіх птушанят сваёй крывёю.

Стар. 306. *Вось размарын...* — Кветкі, магчыма, уяўныя, якія раздае Афелія, мелі пэўныя сімвалічныя значэнні: размарын — верная памяць, кроп — ліслівасць і фальш, казялец — здрада, рута — раскаянне і сумныя ўспаміны.

Стар. 315. *Уваходзяць два блазны.*— Ролі двух далакопаў выконвалі акцёры-комікі (у арыгінале «two clowns» — «два клоўны»). У іх дыялогу — пародыя на дыспуты схаластычных філосафаў і кручкатворства тагачасных юрыстаў.

Стар. 316. *Самыя даўнія дваране — садоўнікі, грабары і магільшчыкі.*— Калі першы блазен даказвае, што Адам быў дваранінам, бо першы набыў узбраенне, ён выкарыстоўвае шматзначнасць англійскага слова «arms» — «узбраенне», «герб», «рукі».

Стар. 317. Ё г е н — імя ўласніка карчмы каля тэатра «Глобус».

Стар. 320. *...вось ужо трыццаць год, як я тут сторажам на цвінтары.*— Вышэй першы блазен сказаў, што ён пачаў працаваць магільшчыкам, калі нарадзіўся Гамлет, таму герою трагедыі Шэкспіра 30 год.

Стар. 322. А л я к с а н д р — маецца на ўвазе Аляксандр Македонскі (356—13.6.323 да н. э.), славуты старажытнагрэчаскі палкаводзец.

Стар. 323. П е л і ё н, А л і м п, і ніжэй на стар. 324. О с а — горныя вяршыні ў Грэцыі.

Стар. 328. *Паміж абраннем і маёй надзеяй...*— Гамлет меў надзею заняць бацькаў трон па спадчыне, але яго былі павінны яшчэ абраць каралём на савеце ўсіх феадалаў.

КАРОЛЬ ЛІР

Трагедыя «Кароль Лір» напісана ў 1605—1606 гг., упершыню надрукавана ў 1608 г. Легендарная гісторыя караля Ліра — адна з найбольш старажытных у Брытаніі, яна бытавала яшчэ ў кельцкіх сагах. Першая літаратурная апрацоўка яе зроблена англійскім летапісцам Джэфры Манмуцкім у яго лацінскай «Гісторыі каралёў Брытаніі» (1135). Асноўная сюжэтная лінія трагедыі Шэкспіра пра караля Ліра і яго дочак узята непасрэдна з «Хронік Англіі, Шатландыі і Ірландыі» Р. Холіншэда (1577) і з паэмы Э. Спенсэра «Каралева Фей» (1590), сюжэтная лінія пра Глостэра і яго сыноў запазычана з рамана Ф. Сідні «Аркадзія» (1590).

Існуюць два пераклады «Караля Ліра» на беларускую мову. Пераклад Язэпа Семяжона змешчаны ў кнізе: Шэкспір Вільям. Трагедыі, Мінск, Дзяржвыд БССР, 1954. Пераклад Юркі Гаўрука выйшаў асобным выданнем: Шэкспір Вільям. Кароль Лір. Трагедыя, Мінск, «Мастацкая літаратура», 1974. Тэкст друкуецца па гэтым выданні.

Трагедыя пастаўлена ў Рускім тэатры БССР імя М. Горкага ў 1953 г. рэжысёрам В. Фёдаравым у сцэнаграфіі мастака А. Грыгар'янца. Галоўную ролю ў спектаклі выканаў А. Кістаў, прызнаны адным з лепшых выканаўцаў караля Ліра не толькі ў савецкім, але і ў сусветным тэатры. Сярод іншых выканаўцаў — Г. Някрасаў (Эдгар), Я. Карнаухаў (Эдмунд), М. Сокал (Блазен), Г. Абуховіч (Ганерылья), А. Шах-Парон (Рэгана) і І. Лакштанава (Кардэлія). «Кароль Лір» быў таксама пастаўлены ў Беларускім тэатры імя Я. Коласа ў 1965 г. рэжысёрам А. Падабедам з А. Трусам у галоўнай ролі, іншыя ролі выконвалі М. Звездачотаў (Глостэр), Ф. Шмакаў (Эдгар), А. Ільінскі (Блазен), А. Шэлег (Кент). Г Маркіна (Ганерылья), Л. Мацісава (Рэгана), і Г. Каралькова (Кардэлія).

Стар. 342. Асобы:

Герцаг Бургундскі.— Бургундыя (правінцыя на ўсходзе Францыі) да 1477 г. была самастойным герцагствам.

Герцаг Корнуал.— Корнуал — герцагства ў паўднёва-заходняй частцы Англіі.

Герцаг Альбані.— Дакладней — Олбені, старажытная назва гарыстай паўночнай Шатландыі.

Граф Кент.— Кент — графства ў паўднёва-ўсходняй частцы Англіі.

Граф Глостэр.— Глостэршыр, графства ў паўднёва-заходняй частцы Англіі. Паводле феадальнай іерархіі, граф Глостэр — васал герцага Корнуала.

Ганерылья, Рэгана, Кардэлія.— Імёны дочак караля Ліра лацінскага паходжання і азначаюць адпаведна: ганарлівая, уладарка, сардэчная.

Стар. 347. *Дзікі варвар скіф...*— Паводле сведчання старажытнагрэчаскага гісторыка Геродота, у скіфаў бытаваў звычай з'ядаць сваіх старых бацькоў, а не дзяцей.

Стар. 357. *Вось яшчэ цемра людская!* — У гэтым маналогу Эдмунд здзекуецца з сярэдневяковых забабонаў астролагаў, паводле якіх лёс і характар чалавека залежаць ад размяшчэння зорак і планет, пад якімі ён нарадзіўся.

Дракон, Вялікая Мядзведзіца — назвы сузор'яў.

Стар. 358. Том з Бедлама — мянушка вар'ята ў тагачаснай Англіі. Пасля Рэфармацыі (1534) у былым каталіцкім Віфлеемскім манастыры (скарочана Bedlam — Бедлам) у Лондане быў заснаваны

вар'яцкі дом. Хранічных хворых адтуль выпускалі, дазваляючы ім займацца жабрацтвам.

Стар. 361. *...рыбы не ем.*— Выпад супраць католікаў. Кент мае на ўвазе, што ён не католік, бо не прытрымліваецца пастоў.

Стар. 364. *На табе, галубчык, гэту шапачку з вушкамі.*— Шапкі блазнаў былі з аслінымі вушкамі.

Стар. 367. Эпікурэйства — пропаведзь неабмежаваных пачуццёвых асалод, якую прапагандаваў старажытнагрэчаскі філосаф Эпікур (341—270 да н. э.).

Стар. 383. Сарэм (Сарм) — горад у Англіі, які ў шэкспіраўскі час славіўся птушкагадоўляй.

Камлот — замак казачнага караля Артура.

Стар. 384. Аякс — герой старажытнагрэчаскіх міфаў аб Траянскай вайне («Іліяда» Гамера).

Стар. 387. Тэрлігод — прозвішча аднаго вар'ята.

Стар. 399. Дувер, Дуўр — англійскі порт у праліве Па-дэ-Кале, найбліжэйшы да Францыі.

Стар. 403. Альбіён — старажытная назва вострава Вялікабрытанія.

Гэта вам прадкажа чарадзей Мерлін, які народзіцца пасля мяне.— Паводле кельцкіх легенд, Мерлін жыў у канцы V — пачатку VI ст. н. э., а кароль Лір, паводле Голіншэда — у IX ст. да н. э.

Стар. 407. *Пілікок, на купіне Пілікок.*— Эдгар недарэчна і неўпапад цытуе ўрыўкі з народных песень і балад, каб наўмысна паказаць сваё ўяўнае вар'яцтва.

Стар. 408. Д'яблы Фліберціджыбет, Смолкін ды іншыя нячысцікі ўпамінаюцца ў кнізе Харснета «Выкрыццё цудоўных папісцкіх махлярстваў». Некаторыя прозвішчы д'яблаў Шэкспір мог узяць таксама з народных павер'яў.

Святы Вітальд — галоўны заступнік ад нячыстай сілы, згодна народным павер'ям тых часоў.

Мара — паводле ўяўленняў шэкспіраўскага часу, ведзьма, якая насылае нядобрыя сны.

Стар. 410. Фіванскі мудрэц.— Лір мае на ўвазе старажытнагрэчаскага філосафа Дыягена (каля 412—323 да н. э.), які, згодна з легендай, жыў у бочцы, адмовіўшыся, як і Эдгар, ад усякіх жыццёвых выгод.

Стар. 412. Фратарэта — адзін з д'яблаў.

У пекле на беразе чорнага возера сядзіць Нерон і вудзіць рыбу.— У рамане Франсуа Рабле (1494—1553) «Гарганцюа і Пантагруэль» Нерон — старажытнарымскі імператар іграе на флейце, а на вуду ловіць жаб (а не рыб, як у Шэкспіра) імператар Траян.

Стар. 415. *Апарожніў Том свой капшук.*— Эдгар хоча сказаць, што ён вычарпаў увесь запас слоў для ролі вар'ята Тома з Бедлама.

Стар. 436. *Клін выб'ю клінам.*— Эдгар хоча з дапамогай моцнага псіхічнага ўзрушэння адвесці Глостэра ад празмернага смутку, ад думак пра самагубства.

Стар. 440. Купідон — у старажытнарымскай міфалогіі бог кахання. Меў выгляд хлопчыка з завязанымі вачамі, узброенага лукам і стрэламі.

Стар. 469. *Сваіх пачуццяў стрымліваць не будзем.*— Гэты маналог у асобным выданні трагедыі 1608 г. належыць герцагу Альбані, а ў Зборы твораў Шэкспіра 1623 г.— Эдгару.

ЗМЕСТ

Вадзім Небышынец. Уільям Шэкспір 5

САНЕТЫ 15
Пераклаў Уладзімір Дубоўка

ТРАГЕДЫІ 95

РАМЭО І ДЖУЛЬЕТА 97
Пераклаў Кандрат Крапіва

ГАМЛЕТ, ПРЫНЦ ДАЦКІ 205
Пераклаў Юрка Гаўрук

КАРОЛЬ ЛІР 341
Пераклаў Юрка Гаўрук

Каментарыі 470

Шэкспір У.
Ш 98 Санеты. Трагедыі: З англ./Уклад., прадм. і камент. В. Небышынца.— Мн.: Маст. літ., 1989.— 479 с., [8] л. іл.
ISBN 5-340-00286-1 (беларус.)
Шекспир У. Сонеты. Трагедии

У кнігу сусветна вядомага англійскага драматурга У. Шэкспіра (1564—1616) увайшлі найлепшыя яго трагедыі і санеты ў перакладах Ю. Гаўрука, У. Дубоўкі, К. Крапівы.

4703010300—163
Ш———————— 152—89 ББК 84.4Вл
М 302(03)—89

СКАРБЫ СУСВЕТНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Литературно-художественное издание
ШЕКСПИР УИЛЬЯМ
Сонеты. Трагедии.
Минск, издательство «Мастацкая літаратура»
На белорусском языке
Літаратурна-мастацкае выданне
ШЭКСПІР УІЛЬЯМ
Санеты. Трагедыі
Рэдактар В. С. Сёмуха
Мастак А. І. Цароў
Мастацкі рэдактар А. М. Малышава
Тэхнічны рэдактар Л. М. Шлапо
Карэктар І. М. Паланейчык
ІБ № 3119
Здадзена ў набор 31.08.88. Падп. да друку 26.08.89. Фармат 84×108$^{1}/_{32}$. Папера друк. № 1. Гарнітура тып Таймс. Высокі друк с ФПФ. Ум. друк. арк. 25,20 + 0,84 укл. Ум. фарб.-адб. 28,98. Ул.-выд. арк. 27,49. Тыраж 12 000 экз. Зак. 1785. Цана 2 р. 70 к.
Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.
Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.



УІЛЬЯМ ШЭКСПІР
САНЕТЫ ТРАГЕДЫІ